Уладзімір **А**рлоў

КАХАНАК
ЯЕ ВЯЛІКАСЦІ

Гістарычныя апавяданні
Эсэ

Менск
Логвінаў
2004

УДК 882.6
ББК 84 (4 Беи)
А 82

Шчырая падзяка фундатару кнігі
Андрэю Макагону.

А 82 **Арлоў Ул.**
Каханак яе вялікасці: Гістарычныя апавяданні, эсэ / Ул. Арлоў. — Мн.: І. П. Логвінаў, 2004. — 252 с.

ISBN 985-6701-43-0.

Уладзімір Арлоў лічыць, што гісторыя — гэта ўваскрашэнне. Сапраўды, уваскрашаючы падзеі мінулага, аднаўляючы нашу гістарычную памяць, мы, беларусы, і самі ўваскрасаем як еўрапейскі народ.

У кнігу папулярнага пісьменніка ўвайшлі ўжо вядомыя і новыя апавяданні, дзеянне ў якіх разгортваецца ў розныя эпохі. Сярод яе герояў — філосаф-вальнадумец Казімір Лышчынскі, паўстанцы 1863 года, забойца цара Аляксандра I Ігнат Грынявіцкі... Побач з гістарычнымі асобамі чытач сустрэне і тых, чые імёны не трапілі ў энцыклапедыі — напрыклад, беларускую гетэру часоў Інфлянцкай вайны Дамініку або полацкага шляхціча, што прабавіў ноч з расейскай імператрыцай і застаўся пераможцам ў іх своеасаблівай дуэлі.

Шэраг твораў, што склалі кнігу, уключаны ў школьныя праграмы.

УДК 882.6
ББК 84 (4 Беи)

ISBN 985-6701-43-0

© Уладзімір Арлоў, 2004
© Выдавец Логвінаў І., 2004

ЗМЕСТ

Маналог святога Пётры **5**

Кроніка Лаўрына Баршчэўскага **15**

Пішу вам у Масковію **31**

Тры мужы спадарыні Дамінікі **59**

Місія папскага нунцыя **89**

Міласць князя Гераніма **109**

Каханак яе вялікасці **133**

Пакуль не згасла свечка **154**

Пяць мужчын у леснічоўцы **176**

Рандэву на манеўрах **198**

Далёка да вясны **206**

Мой радавод да пятага калена, або Спроба пазбегнуць выгнання **222**

Маналог святога Пётры

Ачхі! Ачхі! Выбачайце, шаноўныя. Ачхі! Вось так і ачынаешся кожнае раніцы. Каб ён пра́жыўся ў апраметнай з самымі зацятымі грэшнікамі! Гэта я пра катар. Ачхі!

У якім жа гэта годзе прыстаў ён да мяне, не раўнуючы як святая доказная інквізіцыя да бязвіннае душы? Ачхі!

Праклятая чыхаўка вытрасла з маёй гарапашнай галавы, нібы зернейкі відуку, усе дарэшты даты. Затое, дзякаваць Богу, усё астатняе ў памяці трымаецца, быццам дзеялася не даўней за мінулую нядзелю. Вось як учора было, бачу праявы таго злашчаснага лета, калі ў наваколлі трывала гэткая сухмень, што ўвачавідкі жоўклі зялёныя сенажаці і пачыналі ўжо людцы паспалітыя загадваць, ці не давядзецца сёлета разгаўляцца грэшным чынам ката́мі ды кашчавымі сабакамі.

І прычыніўся той парою ў нашым касцёле нечуваны цуд. Аднойчы, прычакаўшы, пакуль арганісты ўзяў першы акорд і хор утрапёна зацягнуў «Ave Maria!», заступніца наша Маці Божая заплакала ў сваім алтары буйнымі, як боб, слязамі. Не дзіва, што падхапіў я тады пякельны катар, бо цэлы месяц ні на хвілю не зачыняліся касцельныя дзверы.

Адале, скажу вам, шаноўныя, прачуўшы аб наскіх дзівосах ды нагледзеўшыся на збоі вернікаў, што цягнуліся да нас, не стрываў, пусціў слязу Мікола-ўгоднік з праваслаўнай царквы, якая касавурылася на касцёл цераз пляц.

А там ва уніяцкім храме Звеставання, што каля торжышча, пачалі прамаўляць падчас ютрані прарокі Захарыя ды Ісая, і ўсё, кажуць, найчасцей гугнявым голасам бажавольнага Баўтрамея, што жыў за ярам у звярыным лагве.

Ведама ж, дакацілася пагудка пра небывалыя падзеі куды след, і разы тры ніштавата прычасціў сухую, як порах, зямельку дождж. А потым жыхары знакамітага нашага места ды сяляне паблізных вёсак і зусім паарлелі, убачыўшы, як папаўзлі з замкавае брамы вазы з соллю і княскія людзі сажань за сажнем сталі густа саліць брукаванку ўсцяж возера, паўз фару і да самага віленскага тракту.

Зноў заманулася яснавяльможнаму валадару праехацца ўлетку на санках, прамчаць новую каханку на мядзведжай запрэжцы. А людцам паспалітым таксама ўсцеха — да трэцяга калена сабранае солі стане.

Ачхі! Вы ўжо даруйце, шаноўныя, трэба начхацца ў запас, бо дзе гэта вы бачылі святога Пётру, які чхае на музейных наведнікаў?

Ну так, цяпер я экспанат. Але, калі хтосьці з вас скажа: «Sic transit gloria mundi»*, я запярэчу. Хіба рацыя наракаць мне на свой лёс? Было нас шасцёра братоў, а застаўся на свеце адно я. А ці не паважны век мае без малога чатырыста гадоў, пражытыя ў гэтых барочных мурах, што памятаюць ядры маскоўскага цара, шведскага караля і французскага імператара ды град нялічаных асколкаў ад нямецкіх бомбаў?

Часам я шкадую, што ў мяне драўлянае сэрца, а часам радуюся з тае самае прычыны, бо іначай яно не вытрывала б усяго, што мне выпала пабачыць. Але, відаць, яно не зусім драўлянае, бо такімі вось чыстымі вясновымі ранкамі, калі маладыя сонечныя промні запальваюць пазалоту капітэляў і гзымсаў, а на белыя сцены шматкалёрна кладуцца цёплыя водсветы вітражоў, я адчуваю, як маё сэрца прачынаецца і дзесьці там, у душы, нараджаецца ціхая музыка...

Ачхі! О жудлівае насланнё Люцыпара! Ачхі! Усё, апошні раз, бо вунь ужо ідзе Алена, як зазвычай, усмешлівая, лёгкая і пекная, што той анёлак.

Наша навуковая супрацоўніца стагоддзі на тры з паловаю маладзейшая ад мяне, аднак у яе галоўцы з дробненькімі залацістымі кудзеркамі змяшчаецца

* Так мінаецца зямная слава *(лац.)*.

гэтулькі імёнаў, падзей і, галоўнае, датаў, што нават я крышачку зайздрошчу ёй. Праўда, калі чытаеш пра ўчыненую стральцамі разню і калі на ўласныя вочы бачыш, як плыве цераз храм чырвонае ручво і ў ім кешкаецца немаўля, — гэта, прысягаю светлай памяцю майго бацькі, зусім розныя рэчы.

Ды лепей, шаноўныя, замест жудлівых прыгáдаў, пакуль Алена з экскурсіяй падыдзе бліжэй, намалюю я вам свой партрэт.

У мяне грубаваты, але мужны і нават паглядны твар з шырока пасаджанымі вачыма. Вятрыска жыццёвых нягодаў ваяўніча ўскудлаціў мае густыя валасы і бараду. На дужых рамёнах — апанча. Ці трэба дадаваць, што, як і належыць святому, трымаюся я з годнасцю. Тым больш, у маіх каструбаватых руках звыклага да працы чалавека не абы-што, а ключ ад райскае брамы.

Вам цікава, адкуль музейны экспанат гэтак добра ведае сваё аблічча, быццам штодня круціцца каля люстра, усё роўна як дзяўчына на выданні? А летась пашчасціла і мне глянуць у люстэрка, калі тыдні з два вылежваўся на стале ў рэстаўратараў, што няблага падлячылі мае старэчыя хваробы. Апроч, вядома, чыхаўкі, а прызнацца ў ёй перашкодзіла мая прыродная сціпласць.

— Перад вамі драўляная скульптура святога Пётры, — цурчыць Аленін галасок.— На жаль, гісторыя не захавала імя выдатнага майстра...

Антосем яго звалі.

Майго бацьку, чалавека, што выпусціў мяне на свет з невідушчага і глухога дубовага кругляка.

Ён быў каржакаваты, з цёмна-русымі доўгімі валасамі і рахманымі сінімі вачыма. У абліччы гэтага ціхмянага чалавека не было нічога нязвычнага, але калі Творца сапраўды існаваў, дык Антось быў вельмі падобны да яго. З каляных і пяшчотных Антосевых далоняў выпырхвалі драўляныя жаўрукі, ільвы на падлокніцах крэслаў, не паспеўшы нарадзіцца, хапалі зубамі разец, а па мядзведзю, якога мой бацька выштукаваў у паляўнічай зале, аднойчы пекануў з рушніцы зляканы княскі госць.

Але то былі нявінныя забаўкі, бо Антось не проста штукарыў, а аздабляў ва ўсім вялікім наваколлі храмы, і я на свае вушы чуў, як варшаўскі прыяцель нашага валадара аддаваў за бацьку табун арабскіх скакуноў.

Па Антосевых жылах бегла адважная кроў. Браты мае, яшчэ не агойтаўшыся як след пасля цеснае майстэрні ў новым шыкоўным жытле, ледзь не засталіся сіротамі, а маё жыццё дык наогул вісела на павучынцы. Хтосьці з добрых людзей нашаптаў айцу Геранімусу, што святы Пётра (гэта значыць я) задужа выдае з твару на княскага стайніка Сымона. Яшчэ паўбяды, каб гэты Сымон быў праўдзівае рымскае веры ці, на горшы выпадак, уніятам. А ён, як на тое, схізматык праваслаўны, які не верыць, што святы дух сыходзіць не толькі ад Бога-Бацькі, але і ад Бога-Сына.

Не Божы знак, а злачынныя падкопы заклятых ворагаў Пана Езуса ўгледзеў айцец Геранімус у гэткім дзіве. Дайшло, шаноўныя, да таго, што пробашч наш стаў у часе набажэнства збівацца, не раўнуючы як падгулялы шкаляр.

Угневаны князь загадаў мяне пашчапаць і спаліць, а бацьку майго Антося, каб мацнела ягоная вера, пасадзіць, не ўважаючы на былыя заслугі, у лёху да мядзведзя. Ды не паспелі замкавыя людзі спраўдзіць жорсткага княжага ўказу, бо прыступіліся да места царскія ваяводы з незлічоным войскам. Два тыдні бацька мой і ўсе мужчыны, чые рукі маглі трымаць зброю, не спускаліся з гарадскіх муроў. Забыўшыся на звадкі і варажнечу, каталікі, уніяты і праваслаўныя адным гуртам лілі на галовы абложнікам агнёвую смалу, скідвалі прыступныя драбіны ды секліся ў рукапашнай. Добра памяталі жыхары слыннага места, як адны хрысціяне выразалі ў памежным Мсціславе другіх хрысціянаў, не пакінуўшы на вуліцах і дзвюх жывых душ.

Адбараніліся на той раз мае землякі. А там ачахла і полымя княскага гневу. Лагадней стаў паглядаць на мяне і айцец Геранімус, балазе ненавісны вораг ягоны схізматык Сымон падчас вылазу ў варожы

табар налажыў галавою, і ўзнялася душа стайнікава прамютка на нябёсы.

О, чаму ніхто не ўклаў у мае драўляныя вусны Слова! Колькі маглі б яны распавесці вам, шаноўныя дбайцы аб роднай гісторыі! Свая адмысловая показка знайшлася б і дзеля кожнага, хто прыходзіць сюды проста падзівіцца.

Вось гэтым дваім, што даўно ўжо не слухаюць Алены, а шэпчуць адно аднаму пяшчотныя словы, якіх у сэрцах іхніх болей, чым у нашай царкве святых, я распавёў бы, як на гарадскім пляцы палілі чараўніцу.

А была яна, скажу вам, шаноўныя, такой самай чараўніцаю, як я — царом Саламонам. Адзінае, што было ў дачкі клепнара Лявона з Ціхай вуліцы чароўным, дык гэта яе хараство. Пабачылі б вы Хрысціну паставу — князёўна! А белы, як парцаляна, твар з танюткімі чорнымі бровамі, а гарэхавыя, жывыя, нібы міркіль, вочы, а вейкі, быццам мяккія крыльцы баечных мятлушак... Кажуць, калі Хрысціна прыносіла ў бацькаву майстэрню полудзень, малаточкі маладых чаляднікаў самі сабой выбівалі ў яе гонар сонечную мелодыю. А калі ў нядзелю яна ў сваім зялёным фаляндышавым саяне з кшталтам чорнага аксаміту прыходзіла разам са старым Лявонам на імшу, далібог, у касцёле ставала святлей і, палохаючы пацеры, па-над галовамі вернікаў луналі чароды грахоўных падумак.

Але яна, гэтая красуня з дзвюма цяжкімі смалянымі косамі, была незачэпаю.

Сам княскі медыкус, бялявы станісты прыгажунчык, што студыяваў ва ўлохскіх універсітэтах лекарскія і грахаводныя навукі, той самы медыкус, па якім сохла безліч жаночых сэрцаў у замку і месце, гэтым разам толькі аблізнуўся.

Не ведала, ой не ведала Хрысціна, што душа ў пана лекара чарнейшая за найчарнейшы атрамант, якім змацоўваюць дамову з д'яблам. І калі захварэла ўлюбёная князева дачка і не адпрэчылі ліхаманку заморскія пігулкі, абвясціў медыкус, што гэта наслала чары на высакародную кроў Лявонава Хрысціна...

Толькі для аднаго чалавека на ўсім белым свеце не была яна незачэпаю, і чалавек гэты стаяў у натоўпе і неўразуменнымі вачыма глядзеў, як чырвоныя языкі, перабягаючы з палена на палена, лісліва падкрадаюцца да босых Хрысціниных ног.

Божа, маліўся я, Ты нагадава́ў пяццю хлябамі пяць тысяч галодных! Ад Твайго слова засохла смакоўніца! Ад дотыку Тваёй рукі ў невідушчых расплюшчваліся вочы! Злітуйся над невінаватаю ні ў чым, апрача свае прыгажосці, дзяўчынаю! Уратуй яе ад ненажэрнага полымя! Ты чуеш, Божа?

А мо Ты хочаш узяць яе на неба? Тады пакарай яе катаў, пакарай медыкуса, бо грэх ягоны трыкроць варты смерці!

Новыя роспачныя малітвы вырываліся з маёй душы, але Ён не чуў, а мяне ўжо дапінала гарачае дыханне вогнішча. І тады я пачаў блюзнерыць і ў думках сваіх даходзіў да грахоў, адпусціць якія не можа нават самая дарагая прошча*. Але Ён застаўся глухі, і тады я ў адчаі звярнуўся да Яго астатні раз. Божа, папрасіў я, калі Ты ёсць, спапялі мяне.

І Ён зноў не пачуў.

А дым ужо ахінуў Хрысцінину постаць, і па-над пляцам разлёгся вусцішны крык звар'яцелага старога Лявона, і ў разнасцежаныя дзверы касцёла згледзеў я, як белыя галубы скінулі па пёрку на цёмнарусую голаў чалавека з неўразуменнымі вачыма. І быў гэты чалавек мой бацька Антось...

Ачуўшыся ад прыга́даў, я бачу поруч аточаную дзецьмі настаўніцу і чую штосьці пра цёмных продкаў і рэлігійную ачмару.

Як вы мяркуеце, шаноўныя, ці ўратавала б мяне гэтая кабета ў той даўні ўжо дзень, калі на цвінтары загарэлася вогнішча з абразоў і старадрукаў нашае друкарні, і на самым яго версе, быццам ерэтыкі, ляжалі мы з Паўлам і братамі Янам, Мацвеем, Маркам і Лукашом? У перадсмяротнай тузе я глядзеў, як полымя паспешліва гартае кнігі, ператвараючы словы

* Індульгенцыя.

ў тло, а калі агонь падышоў усутыч, я стаў развітвацца з сінім, нібы бацькавы вочы, небам, і апошняе, што ўбачыў, перш чым нізрынуцца ў нябыт, была кніга, якую святы Паўла трымаў ва ўзнятай над полымем руцэ.

Мяне выцягнуў з агню стары настаўнік, і па тым часе, шаноўныя, гэта быў не абы-які ўчынак. А ў дрывотні я пачуваўся, далібог, лепей, чым прарок Іёна ў чэраве ў левіяфана. Праўда, лекаванню чыхаўкі новы прытулак не спрыяў, ды затое майму ратаўніку ўдалося пераканаць усіх, што яму проста трэ было сухое дрэва на распалку ў печы.

Вы не ўяўляеце, як прыемна адчуваць, што вунь той модны танклявы юнак з рудымі вусамі зрабіў бы на месцы настаўніка тое самае. Ён яшчэ не наблізіўся, адно глянуў здаля, а маё драўлянае сэрца ўжо страпянулася, кранутае чыстым і цёплым струмком яго думак. А думкі ягоныя пра майго бацьку, пра безыменных мастакоў, што малявалі гэтыя дзівосныя абразы, пра зямлю, якая іх нарадзіла. (Ты маніў у сваім пасланні, мой аднайменнік святы Пётра, калі пісаў, што ўсякая плоць, як трава, і ўсякая слава чалавечая, як квет на траве; засохла трава, і квет яе апаў. Ты маніў.)

О не, шаноўныя, я не абмовіўся, што ведаю, аб чым думае гэты юнак.

За столькі гадоў кожны на маім месцы навучыўся б чуць думкі людзей не горш за іхнія словы. А ці трэба здзіўляцца таму, што я магу зазірнуць у кнігу чалавечага лёсу? Бачу ў ёй, што хлопец гэты — мастак, і свечка яго душы будзе гарэць моцна і роўна і не пагасне, пакуль ён не збярэцца ў сваю астатнюю дарогу.

Чаму пячатка маўчання ляжыць на маіх вуснах?! Я распавёў бы яму пра мастакоў, што размалёўвалі мой старадаўні прыстанак фрэскамі.

Іх было двох — бацька і сын, і яны гаварылі між сабою той моваю, што і Антось.

Цяпер на месцы фрэсак белая неруш тынку — сам Пан Бог не здолеў бы дапамагчы рэстаўратарам пасля таго, як на фрэскі гада́мі любаваліся вецер і дажджы. А тады...

Гэтыя двое, што пачыналі свой дзень з пацераў святому Лукашу*, былі праўдзівыя цудатворцы. Здавалася, іхнім пэндзлям аддалі барвы самыя зыркія і зіхатлівыя з вясёлак, што ад стварэння свету запальвала над гэтай зямлёю сонца. Здавалася, з вуснаў намаляваных імі сівабародых прарокаў вось-вось зляціць вешчае слова, а кветка ў руках у царыцы Саўскай была гэткай жывою, што на яе аднойчы ўсцешана апусцілася заляцелая ў храм пчала-медавіца...

Князь па-каралеўску адарыў мастакоў золатам з бяздонных сваіх скарбніц ды, мала гэтага, абвясціў наваколлю, што дае ў гонар слынных майстроў баль. Кажуць, болей за сотню суседзяў і васалаў сабрала ў замку тая бяседа, і на пачэсным месцы сядзелі мастакі ў дараваных князем адамашкавых з залатым тканнём каптанах, і слугаваў ім на знак асаблівае міласці адмысловы стольчы — накладаў на ўзорыстыя срэбныя споды дзічыну, падліваў у звонкія венецыянскія келіхі французскае віно. А ў глухім замкавым сутарэнні, куды знадворку не даляціць нават гарматнага стрэлу, ужо чакаў кат з гострым, бы асінае джала, кінжалам.

Ноч навылёт вірыла застоліца, а на світанні, у няпэўным святле аплылых свечак, трохі цверазейшыя з бяседнікаў змецілі, як бацька і сын заснулі ў высокіх, аздобленых разьбою крэслах, звесіўшы русявыя галовы на грудзі, і княскія людзі асцярожліва паднялі крэслы і панеслі некуды па заблытаных пераходах.

Напоеныя падступным зеллем мастакі ціха ўсміхаліся ў сне і не ведалі, што больш нідзе і ніколі не паўтораць свайго дзіва, бо з гэтае раніцы іх вочы будуць заўсёды бачыць адно цемру...

Зірніце, шаноўныя, як лазуркава, пунсова і бурштынава ўспыхнулі вітражы ў заходніх вакенцах! Гэта значыць, Алена пабегла ўжо на свае вечаровыя лекцыі на гістарычным факультэце, і хутка я застануся сам-насам з марудлівай паўнаватаю прыбіральшчыцай цёткай Ядвісяй.

* У сярэднявеччы апостал Лука лічыўся апекуном мастакоў.

Узнятыя ёю пылінкі будуць павольна танцаваць у стомленым сонечным промні, і, выбачайце, не будзе ўжо аніякае змогі ўтаймоўваць чыхаўку... Паглядзелі б вы, як пасля майго чыху цётка Ядвіся няўцямна-палахліва азіраецца на бакі і хапатліва жагнаецца на мяне і чамусьці на жалезнага рыцара, які вартуе ўваход. Ну даруйце мне, старому, гэтую бяскрыўдную забаву.

Недабудаваны гараж... Паўтары тысячы доўгу... Тэрмінова трэба майстар, каб змураваць на летніку камін... Цікава, якая нітачка прывяла яго сюды? Ага, хоча вызнаць, ці каштоўныя яго абразы, тыя дзве цёмныя дошкі, на якіх амаль нічога не відаць і якія ён забраў пасля хаўтураў з матчынай хаты. Мо пашэнціць каму-небудзь выгадна збыць, каб вярнуць пазычкі?

Гэты лысаваты дагледжаны чалавек прыпыняецца каля мяне, я на імгненне сустракаюся позіркам з мітуслівымі вачыма за круглымі шкельцамі акуляраў, і гэтага дастаткова, каб кінуць вока ў яго будучыню.

Ён яшчэ не ведае, што там засталося зусім мала дзён. Але журботна мне з іншае прычыны.

Ну што, скажыце, зменіцца, калі ён даведаецца пра пухліну, якая ўжо расце ў ягоным страўніку? Пачне бегаць, шукаць нейкія лекі...

Я хацеў бы, шаноўныя, каб ён пачуў пра друкароў з нашае друкарні, што стаяла водбліз гарадскога млына да таго страшнага пажару падчас даўняй вайны са шведамі.

Пра худога і цыбатага, нібы птушка жораў, манаха, які ўзімку і ўлетку хадзіў у адной лапленай сутане і які насмельваўся казаць непачцівыя словы самому князю, вінавацячы яго ў адступніцтве ад бацькоўскіх звычаяў і слова. Казалі, манах той быў заможным шляхцічам, ды змяняў поўны трыбух на друкарскі варштат, каб даць люду паспалітаму духоўную лусту, як запавечыў Францішак Скарына са слаўнага места Полацкага.

Згадаў бы я і аднаго ў друкарскіх справах майстра, чалавека простай сялянскай крыві, што, ратуючыся ад гневу маскоўскага патрыярха, вярнуўся на Бацьк-

каўшчыну, знайшоўшы прыстанак у княскай друкарні. Не ведаю ягонага аблічча, бо быў ён не рымскае веры і касцёл абмінаў, не перажагнаўшыся, але ведаю, што ў астатні свой дзень друкаваў ён лемантар на роднай мове, калі ворагі былі ўжо на вуліцах места, і астатні раз убачыў сонца, баронячы на парозе друкарні кнігі.

Лысаваты ўжо далёка адсюль — спяшаецца кудысьці ў вулічным збоі, а я па-ранейшаму думаю аб ім. Ці патрэбна яму тое, што я памятаю?

Раней я меркаваў, што яна, гэтая памяць, наогул не трэба нікому, апрача некалькіх дзівакоў, бо жыць без яе людзям больш зручна і ўтульна. Ды апошнім часам да мяне ўсё часцей прыходзяць іншыя думкі. Бо ёсць жа Алена, і той мастак з рудымі вусамі, і фацэтны паэт, што складае пра мяне паэму... А пакуль ёсць сейбіты, будзе і рунь. Хіба могуць вякі велічы, перамог і пакутаў пакінуць па сабе толькі тло?

Зрэшты, дбаннем рэстаўратараў стагоддзяў пяць жыцця мне яшчэ забяспечаныя.

Так што, шаноўныя, пагледзімо.

1982

Кроніка Лаўрына Баршчэўскага

Я, бакаляр у навуках вызваленых Лаўрын Баршчэўскі, пачынаю кроніку сваю лета ад нараджэння Сына Божага 1439 месяца жніўня ў дзень святога Варфаламея, маючы ў сэрцы надзею, што пачуюць слабы голас мой у славутым месце Віцебскім над Дзвіною, дзе я ўроджаны і ўскормлены есмь. А пішу я не дзеля славы і падзякі, бо, думаючы пра ўдзячнасць чалавечую, прыгадваю жабрачку, што падклала апошнюю вязку дроў у вогнішча, узышоў на якое пакутнік Ян Гус. Пішу дзеля таго, каб ведалі свайчакі і адназемцы мае, што не выракся я роднае зямлі і тыя, што пайшлі разам са мною біцца за Божую справу і ваявалі многія леты і склалі на чужыне галовы свае, таксама бацькоўскае зямлі не выракліся і вялікую тугу па ёй мелі.

У трывозе сэрца маё, бо паўдзённы вецер прынёс да нас чорную смерць, і невідочныя стрэлы яе працялі ўжо мастака Джакома, што размалёўваў капліцу святой Магдалены, і збройніка Федэрыга з сынам і трыма чаляднікамі, і шаноўны князь Гвальдоні, пад магутным крылом якога знайшоў я пяць летаў таму прыстанак, загадаў учора зачыніць браму і паставіць на муры варту, каб на палёт стралы не падыходзіла да замка аніводная жывая душа.

Раней ці пазней, пішацца ў прыпавесцях Саламонавых, ідзе чалавек у дом свой вечны, а сузор'і трэцюю ноч вяшчуюць благое, і калі наканавана мне ў гэтыя дні скончыць зямны шлях мой, няхай той, да чыіх рук трапіць гэты манускрыпт, паспрыяе, каб дапяў ён да роднага места майго над Дзвіною, званаю таксама на даўнейшых мапах Рубонам. Дзеля гэтага раблю я адпаведныя прыпіскі лацінаю, а таксама мовамі валоскаю, нямецкаю, чэшскаю, польскаю і габрайскаю, якія спасціглі мой розум і мае вусны. Самую ж кроні-

ку сэрца і розум мае загадваюць пісаць моваю, з якою пусціла мяне на свет маці, і малю Усявышняга, каб дазволіў давесці немудрагелістае апавяданне маё да астатняга слова.

Няхай жа будзе вам вядома, што нарадзіўся я ва ўстаноўлены Богам і прыродаю час у тое лета, калі вада ў Дзвіне зноў змяшалася з крывёю і гаспадар наш Вітаўт адабраў места Віцебскае ў стрыечніка свайго Свідрыгайлы. А праз дзве зімы быў у нашай зямлі такі голад, што людзі жывіліся лісцем, елі наўе і ішлі ў лясы на разарванне дзікім звярам; тады забрала неба маці маю, якую не забываюся я памінаць у малітвах штодзённых.

Бацька мой быў ганчар Арцём з Прабойнай вуліцы, і калі споўнілася мне восем летаў, аддаў ён мяне ў вучэнне пры царкве Іаана Багаслова, і манахі дзівіліся з мае рупнасці да кніжнае навукі. А калі споўнілася мне дванаццаць летаў, паралюшная Агата з Задзвіння напрарочыла мне смерць у далёкай старане не ад старасці, і не ад хваробы, і не ад сцюдзёнага жалеза ў сечы, а ад агню, і таму пешчу я ў сэрцы сваім спадзяванне, што абміне мяне чорная смерць і не скончыцца цяпер існаванне маё зямное.

Бацька ж мой, нябожчык, дарма што простага звання і невялікай навукі, чалавек быў любамудры і, круцячы каменны свой кружар, любіў паўтараць, што людзі — быццам тая гліна: нарадзілася малое, і пачалі яго, як гліну на кружары, абгладжваць і выцягваць: найперш бацькі, што жыццё яму далі, а затым і іншыя людзі; адзін самую драбніцу дадасць, другі — болей, а трэці — столькі, што пасля яго гаршчок ужо сушыць можна і ў печ на абпал ставіць. А таксама і іншае казаў мой бацька, бо пра ўсё на свеце меў ён сваю адмысловую думку, і дзе-небудзь у Гішпаніі і ў многіх іншых краінах хрысціянскіх надзелі б яму за гэта на галаву каўпак папяровы з д'ябламі, і падняўся б ён чорным дымам у неба; дзякаваць Богу, Віцебск наш не ў Гішпаніі, а ў Вялікім Княстве.

У тое ж лета, як гаспадар наш Вітаўт і кароль Ягайла каля вёскі, званае немцамі Грунвальд, а па-нашаму — Дуброўна, пабілі тэўтонаў і радасць сталася вялікая ў нашым месце і ва ўсёй дзяржаве нашай, быў ужо я памагаты бацьку майму ў майстэрні, гліну вымешваў, перадзіраў яе на тарках ды прывучаўся круціць кружар, стаўбункі ды латушкі выштукоўваючы. Дні складваліся ў месяцы, месяцы ў гады, і агортваў мяне почасту чорны смутак: не баяўся я працы, ды баяўся, што так вакол кружара жыццё маё і абернецца, а прасіў я ва Усявышняга інакшае долі, бо жыла ў сэрцы маім, быццам птах дзівосны ў клетцы, любасць нязводная да кніжнае навукі, і не адзін дубец зламаў бацька на спіне маёй, калі засынаў я над кружарам, праседзеўшы ноч у Багдана-перапісчыка ў келлі. Жылі ж мы з бацькам са свайго мазаля; вялікаму князю падатак заплоціш, царкве — дзесяціну, а яшчэ ардыншчыну з сярэбшчынай, вось і голы як бізун.

А калі мінула мне шаснаццаць летаў, даў мне Бог, акрамя кніг Багданавых, яшчэ адну радасць. Імя ёй было Міхаліна, і цяпер нават, калі ляжаць паміж мною і той парой незлічоныя вёрсты і дні і не ведаю я, ці жыве Міхаліна на свеце, прыходзіць яна ў сны мае і змушае мацней біцца сэрца, бо не было ў мяне большага шчасця, чым стаяць з ёю ў садку над Віцьбаю да самае дзянніцы. І паслаў бацька ў Спасаў дзень сватоў да Сцяпана-кушняра, ды вынесла ім Міхаліна са слязамі на вейках гарбуз; не хачу, сказаў Сцяпан, з галаштанцамі радніцца, і была ў словах ягоных праўда, бо на яго восем чаляднікаў спіну гнулі, але праўда гэтая была горшая за крыўду.

Міхаліну ж, каб не прычынілася якое ліха, аддалі скора за злотніка Міколу, і, як уведаў я пра гэта, стала ў мяне ўваччу, як ясачка мая ў вясельную ноч іншага разувае, ласкі ягоныя прымаючы, і нічога, апрача гэтага, вочы мае не бачылі. Выйшаў я на бераг за замкам, дзе самыя віры, і благую думку на камені пад алешынай задумаў. Да граху было, як да цёмнай вады, але пачуў я нейкі голас таемны. Няўжо ты, Лаўрын, голас гэты казаў, дзеля таго дасюль па зямлі хадзіў, каб кругі па рацэ пайшлі і рыба з цябе наедак мела? Ходзіш па зямлі, дык пакінь па сабе не адно гаршкі,

што ад любога каменя на чарапкі разляцяцца. І акрыяла душа мая, бо прыняў я голас як знак, што зменіцца жыццё маё.

І не зманіў той голас.

Лета ад нараджэння Сына Божага 1413 у месяц красавік прыйшлі па Дзвіне велікакняжыя стругі і ладдзі з войскам і почтам* і прысталі да берага проці Альгердавага замка. І спяшалі з двух бакоў насустрач ім людзі лацінскае веры і людзі нашай дзедаўскай веры са сваімі мошчамі і харугвамі. І пабачыў я гаспадара нашага Вітаўта, што трымаў пад рукою дзяржаву ад мора да мора; быў на ім панцыр з сабалінаю накідкаю і шалом з пяром паўлінавым, і меў гаспадар наш бараду, быццам срэбра, сівую, а веку — болей за шэсцьдзесят летаў, але відаць было, што не кожны яшчэ малады рыцар патрапіць яго з сядла выбіць. І пабачыў я разам з людам паспалітым места Віцебскага таго нашай крыві воя, што тры леты таму ў Грунвальдскай сечы ўваткнуў у гарляк тэўтонскаму магістру рацішча і адправіў душу ягоную ў пекла, а паказаў мне таго воя бацька мой, бо быў і ён у векапомнай сечы і меў напамінкам пра яе шнар безвалосы на галаве і не меў левага вуха. І была пагудка, што разам з княжымі людзьмі едзе муж вучоны Геранім Пражскі, пасланы ў нашу зямлю вялікім бязбожнікам Янам Гусам, якому паводле ўказу папы рымскага спявалі анафему ва ўсіх цэрквах Чэшскае зямлі.

Гаспадар жа наш Вітаўт на дзвінскім беразе лагадней на лацінцаў-аднавернікаў пазіраў і галавою ім ківаў ласкава. І прычынілася тады такое, што многія людзі хрысціцца пачалі, а біскупа віленскага ажно перасмыкнула, нібыта ён карэц палыновага адвару выпіў. Выступіў з княжага почту муж паважны ў карзне нетутэйшага крою і перад людам паспалітым лікам чатыры ці пяць тысяч мужчын, жанчын і дзяцей укленчыў і людзей нашай старой веры назваў добрымі хрысціянамі, а святыні нашыя назваў праўдзівымі святынямі; імя ж гэтаму мужу было Геранім.

* Світаю.

Успамінайце настаўнікаў вашых, вучыў апостал Павел, і часта ўспамінаю я Гераніма, бо, калі раўнаваць чалавека з глінаю на кружары, бачыць Бог, быў ён добры ганчар. Жыццё чалавечае мінулася з таго дня, як казаў ён нам казань сваю першую, я ж і цяпер яе чую, быццам зноў у храме Іаана Багаслова з бацькам маім стаю.

Нашаю моваю казаў ён, і хоць перакручваў на свой капыл словы, не смяяўся ніхто, бо словы тыя былі як зярняты, і надышла пара, калі прараслі яны ў душах і закаласіліся; і не смяяўся ніхто, бо казань тая была як бура над дзвінскаю плынню, і надышла пара, калі закінула бура гэтая многіх свайчакоў маіх далёка ад родных агменяў.

З усіх турботаў роду чалавечага самы вялікі клопат — аб Радзіме. Дзеля прышласці яе аддаюць людзі маетнасць і жывот свой і жывуць шчасліва, а пасля смерці славяць нашчадкі іхнія імёны. Так казаў вучоны чэх, і голас ягоны бунтаваў сэрцы, а вочы ягоныя над гарбатым носам гарэлі, як у юрода Апанаса з Заручаўя, але не шалам свяціліся яны, а вялікім розумам. Той жа, хто жыве салодка, вучыў ён, пазбавіцца і жыцця і імені. І казаў ён: браты-беларусіны! Чэхі і настаўнік наш Гус вераць, што ў ліхую часіну мячы вашы падымуцца супраць ворагаў разам з нашымі мячамі.

І яшчэ казаў ён, што ўладараць над зямлёй ягонаю немцы, і чыняць уціскі вялікія, і імкнуцца зрабіць, каб чэхі і думалі, і гаварылі па-тэўтонску, бо лягчэй тады будзе адбіраць набытак іхні. І казаў ён, што многія чэхі гавораць ужо напалову па-свойму, а напалову па-нямецку. І казаў ён, што ўладары павінны гаварыць з народам на ягонай мове. І казаў ён: самае вялікае злачынства перад Богам не тое, калі чалавека жыцця пазбаўляюць, а тое, калі цэлы народ з душою ягонай разлучыць хочуць. І казаў ён: сёння над маім народам смерць, нібыта каршун у небе, кружляе, а ёсць уладары — хочуць, каб і беларусінаў на свеце не было, каб дзеці вашыя мовы свае выракліся і на магілы продкаў плявалі. І казаў ён: з аднаго мы з вамі кораня, дык будзьма разам за праўду стаяць!

Да самага лета, пакуль вада ў Дзвіне не апала, казаў Геранім свае казані, і лацінцам насуперак адпусціў паводле наскага звычаю бараду, і не галіў танзуры, і адмовіўся ад апраткі клірыка, насіў жа такую, як у нас носяць. І кожны раз у царкве Багаслова людзей збіралася столькі, што пеўню не было куды дзюбнуць, і круціліся між імі віжы і асочнікі з касцёла францысканаў, бо не шанаваў вучоны чэх святароў сваіх лацінскіх і выкрываў нястомна грахі іхнія. І пачулі мы, што ў Чэшскай зямлі б'юць манахі на плошчах у бубны і прадаюць ілжывыя святыні і прошчу грахоў, і той нават можа купіць сабе прошчу, хто мае пажадлівасць да Маці Божай, і той, хто сабраўся забіць, таксама купляе гэтае д'яблава адпушчэнне і забівае бліжняга свайго. Святыя ж айцы ходзяць у дамы распусты да выляжанак, а адзін прайграўся ў косці і цераз усю Прагу бег дахаты ў чым Бог яго на свет пусціў. Дый не дзіва, што такое дзеецца, бо сам рымскі намеснік святога Пётры* быў некалі на моры расколам**, а цяпер чыніць смертазабойствы і творыць грэх пралюбадзейства з манашкамі і з жонкаю брата свайго. Нездарма круціліся ў храме віжы лацінскія, але і нашым бацюшкам былі Геранімавы словы не ялеем на сэрца, бо прамаўляў ён, што няможна збіраць царкве дзесяціну, таму што запавечыў Збавіцель апосталам не мець у па́сах ні золата, ні срэбра, ні медзі, а жыць у беднасці; кожны жа ведае, у якой злыбедзе нашыя папы жывуць.

Дзівіліся людзі места Віцебскага з розуму і вучонасці Геранімавай, і сам гаспадар наш Вітаўт літасціва яго слухаў, а птах той дзівосны, у жалезную клетку ў маіх грудзях замкнёны, усё мацней крыламі біў і на волю прасіўся. І, прычакаўшы аднойчы магістра Гераніма на цвінтары, скінуў я магерку і, не спытаўшы рады бацькавае, сказаў, што хачу спасцігнуць розныя навукі, каб прасвятліць розум свой, а таксама дзеля асветы адназемцаў маіх; горка цяпер сэрцу, што не

* У той час рымскім папам быў Іаан XXIII (Балтазар Коса), які выславіўся сваёй распустаю і злачынствамі.

** Піратам.

дало мне неба спраўдзіць словы мае, бо няма мне дарогі дадому, пакуль кідаюць там у цэлі і судзяць тых, хто чынам і словам сваім славіў імя пакутніка Гуса.

Сказаў магістр Геранім на словы мае, што дагодныя яны Богу, і наказаў вучыць мову лацінскую, бо ў Чэхах і ў іншых землях, сваёй навукаю знакамітых, вучацца шкаляры на лаціне, і назваў мне манаха з віцебскіх францысканаў, што па ягонай, Геранімавай, волі і па сваёй ахвоце будзе вучыць мяне мове гэтай.

Лета ж наступнага, пасля святых Калядаў, памінаючы добрым словам бацьку майго Арцёма, які заплакаў і абняў мяне, даўшы сваё блаславенне, і з якім ужо не даў мне Бог зноў перабачыцца, і манаха Марку, які навучаў мяне лаціне, пакінуў я роднае места маё Віцебскае разам з купцом Алехнам. Вёз Алехна ў Чэшскую зямлю гарнастаі і куны, а таксама замкі і бабровы струмень, і праз два месяцы, трыкроць адбіўшыся па дарозе ад ліхіх людзей, прыйшлі мы ў Прагу, дзе знайшоў я магістра Гераніма, як і было некалі між намі казана, і прыняў ён мяне міласціва і пасяліў у бурсу, званую Ерусалім, фундаваная ж яна была каралеваю Ядвігаю дзеля шкаляроў з Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Жылося мне ў бурсе так уежна, што почасту рабіў я лыжку з хлеба, з'ядаў гарох, а потым лыжкаю і прыкусваў, але радавалася сэрца маё, бо вучыў я сем навук вызваленых у славутай alma mater Пражскай, што завецца таксама Каралінеум, і многія прамудрасці адкрыліся розуму майму на лекцыях і ў доўгія гадзіны над кнігамі, калі былі суразмоўцамі маімі Арыстоцель і Платон і іншыя мужы мудрасці вялікай, а таксама на дыспутах і ў разважных гутарках з магістрам Амбражам з Пльзеня, які адарыў мяне сваёй увагаю і браў на вежу сачыць зоры. Ад яго ўведаў я шмат аб руху нябесных свяцілаў і, апрача астатняга, пачуў ад яго пра камень філасофскі, які простыя металы ў золата пераварочвае, і любую хваробу лекуе, і вечную маладосць даруе; тыя ж людзі, што шукаюць гэты камень, завуцца чарнадзеі, або алхімікі, і магістр Амбраж належаў да іх.

А ў Чэхах было неспакойна, і на вуліцах пражскіх і дзеці і людзі паважнага веку крычалі святарам: «У сак, мнісе, у сак!», і на вачах маіх разарвалі на рынку манахаў, што за сходную цану прапаноўвалі салому асла, на якім Ісус ехаў у Ерусалім, слёзы Марыі Магдалены, а таксама малако Багародзіцы і промні Віфлеемскае зоркі, што паказвала шлях вешчунам. І хадзіў я разам з іншымі шкалярамі па месце Пражскім у сціжме людзей, а наперадзе нас ішла выляжанка, усяму месту вядомая, і была яна ва ўборы папы рымскага і на пацеху народу раздавала ахвотнікам паперкі, званыя індульгенцыямі. І трывожна было ў сэрцах нашых, бо даходзілі чуткі, што судзіць будзе Рым заступніка чэхаў Гуса і сябра ягонага найадданейшага, а майго дабрачынца Гераніма, у доме якога заўсёды мог я тою парою насыціць голад...*

...а вялі яго туды паўз вогнішча, з кніг, ягонаю рукою напісаных, складзенае, і ўзышоў ён на сваю Галгофу вогненную з мужнасцю вялікай. Калі дагарэлі дровы, знайшлі сэрца ягонае жывое і білі яго кіямі, а затым працялі пожагам і засмажылі асобна. Прах жа ягоны, каб не засталося на зямлі магілы і не было куды людзям збірацца памінаць заступніка свайго, кінулі ў раку, а на агнішчы закапалі асла, што належаў нейкаму кардыналу, і зрабілі гэта, каб напалохаць людзей кепскім паветрам, але, бачыць Бог, спудлавалі яны, бо стаяў бы там большы смурод не ад няшчаснага стварэння Божага, а ад ягонага гаспадара. Вялікі ж князь наш Вітаўт, каб абараніць пакутніка Гуса, паслаў на сабор у Канстанс мітрапаліта свайго з біскупамі, ды спазнілася пасольства ягонае і вярнулася ў смутку.

На наступнае лета вытрымаў я экзамен, і ўзведзены быў у бакаляры, і надзеў шапку бакалярскую кантовую і карзно з чырвонаю на рукавах аблямоўкаю, але не было радасці ў сэрцы, бо таго ж лета схапілі слугі папскія дабрачынца майго Гераніма і паставілі ў вежы на калоду, і ногі прыкавалі цяжкімі кайданамі да калоды, а рукі да жалезных кольцаў у столі. Вісеў ён шмат дзён, і рукі і ногі ягоныя былі ў язвах гнойных, і пахіснулася вера ягоная, і выракся ён публічна вучэння настаўніка нашага Гуса, але Збавіцель у сваёй міласэрнасці даў яму сілы, і адмовіўся ён ад адрачэння, прыняўшы смерць у агні на тым самым месцы, дзе і нявінны Гус. Вялікая журба была тады ў Чэхах і ў іншых краінах, і ведаю я, што многія людзі ў месце Віцебскім, і ў Полацку, і ў Вільні таксама журбу чулі ў сэрцах сваіх, бо ведалі, што стаяў магістр Геранім калісьці перад людам віцебскім на каленях і вялікую ласку меў да народа нашага.

Няхай жа будзе вам вядома, што ў смутныя тыя часы прызваў мяне магістр Амбраж і абвясціў, што наблізіўся ён да таямніцы філасофскага каменя, званага яшчэ вялікі магістэрый, але век ягоны і сілы вымагаюць, каб узяў ён вучня, бо іначай пайсці можа праца рук ягоных тунна. І загарэлася сэрца маё, як сухая былінка, бо даўно ўжо перачытваў я пакрыёма кнігу вялікага чарнадзея Зосімы, і ведаў многія формулы, і спасцігаў таямніцы магніту і бурштыну. І ўвёў мяне магістр Амбраж у сутарэнне пад домам сваім, дзе быў куб перагонны, і горан, і ўсё, што трэба на доследы. Удвух пайшлі мы да цёмнага і невядомага праз яшчэ больш цёмнае і невядомае, і датыкаліся ў доследах да чорных сіл хаосу, і ў апантанасці сваёй прыраўноўвалі Хрыста да вялікага магістэрыя і вялікі магістэрый да Сына Божага, і, аддаўшыся роспачы, няраз здзіралі да крыві рукі аб каменныя сцены прыстанку нашага.

Два леты жылі мы, чужаючыся людзей, а на трэцяе лета замуравалі сябе, і ежу з вадою падавалі нам цераз атвор, і не ведалі мы, што чыніцца ў месце Пражскім і ва ўсёй Чэшскай зямлі. Але ў адзін з дзён быў пасланы нам знак, і ўбачылі мы на сцяне крывавую пляму, і, калі пахолак прынёс нам хлеб, парушыў я прысягу сваю і насуперак волі настаўнікавай загаварыў з пахолкам. І ўведалі мы, што Рым абвясціў чэхаў ерэтыкамі, і падняліся яны з імем Гуса супроць папы і няправедных уладаў, і бяруць места за местам. І сказаў магістр Амбраж на гэта, што няма нічога вы-

* У гэтым месцы пергамен абгарэў і тэкст нечытэльны.

шэй як ісціна, а ісціна ёсць вялікі магістэрый, усё ж астатняе — марнасць марнасцяў, і розум мой гатовы быў пагадзіцца з ягонымі словамі, ды не згадзілася сэрца. Тады ўзвысіў настаўнік голас і вінаваціў мяне ў адступе ад прысягі, і аблілося сэрца маё горыччу, але пакінуў я настаўніка, бо чуў у душы голас Геранімаў, што клікаў адназемцаў маіх узняць у ліхую гадзіну мячы свае разам з братамі-чэхамі. Было гэта ў лета, калі забраў Гасподзь душу старога караля Вацлава і не прызналі чэхі спадкаемца ягонага рудога Зыгмунда-імператара.

Тады ў месце Пражскім крышылі храмы і нішчылі абразы і стоды царкоўныя, а таксама выколвалі ім вочы і адсякалі насы, кажучы пры гэтым: калі ты бог або святы, адбараніся сам, і мы ўверуем у цябе. Тады ж сабраліся чэхі на гару, званую Табар, і збудавалі места новае, і не было дагэтуль такіх ні ў якой зямлі, бо багаты ў месце гэтым дзяліў ежу сваю з бедным, а хто прыходзіў туды з грашыма, апускаў іх у бочку, што стаяла дзеля гэтага на плошчы. Не было там таксама крадзяжоў, і не бавіў ніхто часу ў гультайстве, і ва ўсіх, як у апосталаў, было адно сэрца і адна воля, бо кожны дбаў найперш аб выратаванні душы сваёй. І вучылі там чытаць і пісаць па чэшскай Бібліі, і не трымаліся пастоў, і не верылі ў чысцец. Не пілі ж у месце Табары нічога, апрача вады, як гаспадар наш Вітаўт, і было гэта мне даспадобы, бо няма нічога агіднейшага за чалавека, што ад віна губляе розум свой, але няхай даруе мне Усявышні, усё ж праглася мне зрэдку прамачыць нутро добрым кухлем чорнага чэшскага піва. І слухаў я там святара, які вучыў, што прыйдзе хутка царства справядлівасці і не будзе на зямлі караля і валадароў, не будзе паншчыны і падаткаў, і людзі будуць жыць, як браты і сёстры. Два месяцы жыў я ў тым месце і бачыў, што думкі жыхароў ягоных і справы іхнія дагодныя Збавіцелю, бо ўсе людзі народжаныя роўнымі між сабою, і почасту сніў я места сваё роднае Віцебскае, нібы места Табар, і цешылі гэтыя сны душу маю; маліўся ж я паводле гусіцкага абраду.

Кароль Зыгмунд у тую пару прывёў войска незлічонае, і нечуваныя здзекі чыніла яно над гусітамі. Каля Кутнай Гары кідалі іх у капальні, і за кароткі час кінулі туды шаснаццаць сотняў мужчын і жанчын, так што нават ка́ты валіліся на зямлю ад стомы. Секлі рыцары дзецям і немаўлятам рукі і ногі, а мацярок іхніх гналі перад сабою і падвешвалі за персі, мёртвых жа мужчын клалі на жанчын, кажучы: злучайцеся і размнажайцеся. Паганцы ніколі не здзекаваліся так з целаў хрысціянскіх, як яны, і не прамінула неба паслаць ім кару за страшныя грахі іхнія, і разбілі гусіты войска рудога Зыгмунда на Віткавай гары, і тады ўзяў я ўпершыню зброю ў рукі свае.

І выправілі гусіты пасольства вялікае да гаспадара нашага Вітаўта, аддаючы яму карону чэшскую і чакаючы падмогі ад братоў сваіх па крыві. Богу ж было дагодна, каб у пасольстве гэтым ехаў і я, і радасць вялікая жыла ў сэрцы маім, бо меў я надзею пабачыць бацьку і места Віцебскае і прынесці адназемцам слова праўды...*

...Вітаўт не сам, а паслаў сыноўца свайго князя Жыкгімонта Карыбутавіча з рушэннем, і прыйшлі мы ў месяцы траўні ў Прагу, і прызналі чэхі князя Жыкгімонта валадаром; было гэта ў лета 1422. Беларусінаў прыйшло ў тым войску лікам да пяці тысяч, і ўсе біліся мужна, і многія заручыліся там з зямлёю. Не магу я сказаць пра кожнага, а таму скажу тут пра тых, хто пайшоў са мною з места Віцебскага, каб дзеці і ўнукі іхнія паміналі свайчакоў добрым словам у размовах і думках сваіх.

Быў з намі Якуб-мечнік, а прозвішчам Жаробка, бо еў, як пяць добрых кметаў, і сам князь падзівіцца прыходзіў на Якуба ў паходзе нашым. Але і ў сечы выславіўся Жаробка не горай, чым ля катлоў кухарскіх, і забраў яго Жыкгімонт, сабе на шчасце, у ахову сваю княжую. Часта прыгадваю я Якуба-мечніка, бо дзіўнаю была смерць ягоная. Адмовіўся ён перад днём сваім

* Тут у рукапісе няма двух аркушаў.

вячэраць, а калі прыступіліся да яго з роспытамі, бо большае гэта было дзіва, чым калі б Барысавы камяні па Дзвіне паплылі, прызнаўся Жаробка, што ўзяла яго за сэрца туга невыказная і хоча ён песню ўзгадаць, якую маці яму на сон спявала, калі малы быў, і як узгадае ён песню тую, так і туга адкаснецца, і есці ён зноў захоча. Многія тады ад слоў Якубавых бакі сабе рвалі і кпінкі з яго строілі. Назаўтра ж ішло войска па чэшскім мястэчку, князь Жыкгімонт з аховаю наперадзе ехаў, і як выкіравалі на пляц, гакнула з касцёла рушніца варожая. Якуб князя захінуць ірвануўся, проста паміж вачэй куля яму і ўвайшла, там, дзе бровы на пераноссі зрасліся. А са званіцы касцельнае арганістага сцягнулі, прызнаўся на прэнгу, што далі яму ксяндзы кулю срэбную асвячоную з пісьмёнамі і намовілі загубіць князя беларусінскага, дакляруючы за гэта царства нябеснае. Ці паспеў хоць тую песню матчыну Якуб успомніць, пакуль душа не адляцела?

Быў там і халоп нявольны баярына Завішы Цімошка Гром, празваны так за дурную звычку, якую не буду я тут узгадваць, але ваяр харобры; няраз з адной паліцаю ішоў на рыцара і перамогу меў над многімі. Сустрэў жа пагібель сваю Цімошка ў сечы векапомнай пад Маляшовам. Мы ў дзень той стаялі на гары, і, калі спешыліся ворагі нашы і рынулі на прыступ, гетман наш Ян Жыжка, які і безвач бачыў лепей, чым трое відушчых, махнуў рукой, і пакаціліся долу вазы цяжкія, каменнем наладаваныя, а калі пабеглі рыцары, ударылі ім у спіну гарматкі-тарасніцы, і паляцела ў пагоню конніца. Паўтары тысячы паноў і людзей моцных места Пражскага маліліся тады астатні раз Богу. Адзін жа з іх, чалавек небаязлівы і немалой сілы, распалавініў Цімошкаву галаву, як гарбуз, але сам пражыў Грома адно на міг, бо не паспеў узняць меч, як закіпела сэрца ягонае на маёй суліцы. Было гэта ў лета, калі забрала адважнага Жыжку чорная смерць і мы назвалі сябе сіротамі.

Пасля Маляшова ваявалі мы разам з чэхамі яшчэ дзесяць летаў і няраз білі і гналі, як парасятаў, самыя адборныя войскі, і няраз адно рыпенне баявых вазоў

і хваласпеў наш, што дагодны быў небу, змушалі ворагаў паказваць нам спіны. Так доўга ваявалі мы ў Чэшскай зямлі, што з'явіліся паміж нас такія, хто забываўся мовы сваёй, і вучыў іх я, што няможна чалавеку забываць, хто ён ёсць і з якога ён народа, бо за пашану да свайго будуць ганараваць нас людзі з іншых краёў, бязродных жа ніхто не ўшануе. І вучыў я іх, што нельга выракацца тае мовы, з якой ты на свет прыйшоў, бо пусціш у душу мову чужую, і душа твая зменіцца, і не станеш ужо тым, кім табе наканавана, а гэта грэх вялікі перад усім светам, бо не скажаш тады свайго слова запаветнага і не зробіш тое, што пасланы ты на зямлі зрабіць. Так казаў я, і многія слухалі мяне, бо ведалі, што спасціг я кніжную мудрасць, але стаў сярод іх простым ваяром і еў і піў разам з імі.

Былі ж і такія, што казалі: поле наша пустуе, а мы чужыя нівы баронім і не шкадуем жывата свайго за праўду чужую. І казаў я ім, што няма на свеце чужой праўды, ні чэшскай няма, ні беларусінскай, ні польскай, а ёсць адна праўда на ўсіх. І калі пайшоў князь Жыкгімонт Карыбутавіч з Чэхаў, многія адназемцы мае пайшлі з ім, а многія засталіся і, прыняўшы веру гусіцкую, біліся за справу Божую і за тое, каб места дзівоснае Табар, дзе людзі сябе братамі і сёстрамі называюць, на зямлі стаяла.

З Вялікага ж Княства даходзілі да нас весткі сумныя вельмі. Крывёю былі залітыя нівы нашыя, бо, як сышоў у магілу гаспадар Вітаўт, пачалася звада крывавая між князем Свідрыгайлам і князем Жыкгімонтам Кейстутавічам. Места ж Віцебскае адчыніла браму перад Свідрыгайлам і прызнала яго за князя свайго, бо заўсёды хіліўся ён да нашай дзедаўскай веры, дарма што ўзяў у хаўруснікі сабе лівонцаў і конніцу татарскую. І звёў князь Свідрыгайла ў Віцебску падрахункі з людзьмі Жыкгімонтавымі: князя Міхала Альшанскага загадаў пасадзіць у мех і кінуць у палонку, а князя Сымона Альшанскага загадаў скінуць у Дзвіну з Замкавае гары. У нашым жа месце Смаленску ўзялі мітрапаліта Герасіма, і спаліў яго князь Свідрыгайла ў Віцебску на вялікім камені пад зам-

кам, бо трымаў Герасім перавет на яго. Ваявалі князі зацята, дзелячы ўладу над краем, зямля ж наша і люд яе мелі з гэтага няшчасце і рабункі несканчоныя бедных двароў сваіх.

Не сказаў яшчэ я, што паміж тымі, хто прыняў веру гусіцкую, быў свайчак і пагодак мой, чаляднік бондара Міхея з Багародзіцкай вуліцы Юрка Батыніч, празваны Жаркім, бо рабіўся ён у сечы апантаны, і цэп ягоны, жалезам акуты, расколваў ворагам нашым галовы, не раўнуючы як лесавыя гарэхі. Пабраўся Юрка з чэшкаю Марыяй, і нарадзіўся ў іх сын, ахрышчаны на ўспамін пра Гуса-пакутніка Янкам. Калі ж вярнуліся мы з паходу ў польскія землі, уведаў Юрка, што наляцелі аднаго разу тэўтоны, і захапілі ў полі жанчын з дзецьмі, і над жанчынамі гвалт чынілі, а потым выраза́лі ім персі і рвалі дзідамі ўлонні, дзяцей жа і сярод іх Янку малога з залацістымі валосікамі кінулі ў агонь. З тае пары замаўчаў Юрка і маўчаў тры леты, робячы на цапільне страшнага цэпа свайго зацінкі, і была кожная напамінкам пра чорную душу ворага Хрыстовага, якога адправіў Юрка ў апраметную; набралася ж зацінак такіх больш за сотню. Маліў ён неба, каб хутчэй дало сустрэцца з жонкаю і сынам, але наканавана яму было помсціцца да самай бітвы на праклятым полі Ліпанскім, а была бітва гэтая ў лета ад нараджэння Сына Божага 1434.

Стаялі мы на тым полі тры дні і тры ночы, акурат у пару́, калі вясна з летам абдымаюцца, і салоўкі цёхкалі, і такая навокал лагода была, нібы хацеў сказаць Збавіцель людзям, каб не забівалі адзін аднаго, а нараджалі дзяцей і аралі зямлю. Але не маглі мы апусціць мячы і цапы свае, і кожны з нас паспавядаўся і прычасціўся, а паны ўсё не адважваліся напасці на нас, хоць і было войска іхняе большае трыкроць.

Не мелі мы страху ў сэрцах, ды страшнейшая за страх была паняверка, бо бачылі мы, як дужэюць з кожным годам ворагі нашы і ў самім месце Табары з'явіліся ўжо сярод братоў і сясцёр жабракі і людзі, што паслі чэрава сваё ў раскошы. Прысніў жа я перад сечаю сон дзівосны: нібыта ляжу на гарачым каменні

пад сонцам, ад спёкі канаючы, і бачу раку перад сабою ў зялёных берагах, да Дзвіны падобную, але не магу яе дапасці, каб смагу наталіць, і зразумеў я, што благі то знак.

А ў дзень пасля тае ночы, калі перайшло сонца на трэцюю гадзіну, разамкнулася кола вазоў панскіх, і сталі вазы іхнія баявыя шыхтавацца па адзінаццаць у рад, і налічылі мы радоў больш за пяць дзесяткаў. Былі ж вазы панскія, як папаўзлі на наш пагорак, да вялізнае вужакі падобныя, і на галаве вужака гэтая мела джалаў дзесяткі, а былі то тарасніцы і бамбарды. Бачыў я, як забіла ядром жанчыну, што мела ў чэраве сваім, але паспелі дзіця яе перахрысціць, каб трапіла душа ягоная на неба. Калі ж развеяўся дым ад стрэлаў, пабеглі нападнікі, і, адкінуўшы вазовыя шчыты, кінуліся мы ў пагоню, і здавалася, блізка ўжо была перамога, але ўдарыла з засады конніца панская і, здратаваўшы пагоню, наляцела на табар наш. Дарэмна чакалі мы падмогі, бо гетман Чапек, пад рукою якога былі коннікі табарыцкія, пакінуў нас на вырак лёсу. А следам за рыцарамі пайшлі на прыступ найміты-кнехты, і тады забраў Збавіцель душу Юркі Жаркага, і душу чэха Мікулаша, і душу паляка Франака, што ваявалі на возе нашым.

Зямля ў той дзень стамілася піць кроў чалавечую, і стаяла цёмная кроў у кожным следзе ад конскага капыта. А перад заходам сонца прайшлі ланцужна па полі Ліпанскім кнехты, і дабівалі яны даўгімі мячамі параненых, а наперадзе ішла з касою сама смерць у сталёвым панцыры. Багатым было жніво яе: болей за дзесяць тысяч ваяроў Божых засталіся навекі на тым полі, і няхай будзе вам вядома, што было паміж імі беларусінаў лікам да пяцісот. Мне ж паслаў Госпад сілу стрымаць крык у грудзях, калі ўкалоў мяне найміт мячом у калена, і прыняў ён мяне за мёртвага, хоць быў я адно паранены ў ногі. Ляжаў я ўначы на тым полі страшным, і крумкачы пільнавалі мяне, каб выпіць вочы мае, але адзін добры чэх простага звання ўратаваў мяне і загаіў мне раны; зваўся ён Марцінам, і часта малюся я за душу ягоную.

Разлучыўся з душою ў той сечы і Аўдзей Гуцька, несвіжанін. Быў ён чалавек вясёлы, штукар і гудошнік, дастаць мог з магеркі галубку, а з пустой торбы вытрасці зайца жывога, прыслоўе ж меў улюбёнае — а каб цябе ў раі камары таўклі. Затрымцелі ў грудзях ягоных дзве стралы зубчастыя, што ні выцягнуць, ні вырваць няможна, і, калі глядзелі ўжо вочы Аўдзеевы ў неба, пабачылі мы апошнюю штуку ягоную: выпырхнула з Гуцькавай запазухі ў небясную сінечу галубка, як снег белая. Была ж галубка гэтая, быццам праўда наша, якая датуль жыць будзе, пакуль хоць адзін ваяр за яе ваюе, хоць адно сэрца чалавечае да яе любасць мае.

Прычынілася гэта пяць летаў таму, а ў мінулую ноч зноў убачыў я смерць у панцыры, што ішла наперадзе кнехтаў, і сон гэты, як і сузор'і, паказвае на благое. Але dum spiro, spero*, і пешчу я надзею, што спраўдзіцца прароцтва старой Агаты з Задзвіння і не зачэпіць мяне крылом сваім чорная смерць. Калі ж станецца так, аброкся я пакінуць славутага князя Гвальдоні, сардэчна аддзячыўшы яму, і ісці ў места Страсбург, бо дайшлі да нас чуткі, нібыта атабарыўся ў месце гэтым вучоны немец Ёган Гутэнберг, што вымысліў варштат дзеля перапісвання кніг без пёраў і атраманту. Калі праўдзівая гэтая пагудка, падамся я да яго ў навуку, бо не пагас яшчэ ў душы маёй лятунак паслужыць асвеце люду нашага паспалітага.

Калі ж наканавана мне скончыць хутка зямны шлях мой, няхай дойдзе кроніка гэтая да бацькоўскае зямлі, каб не згубіліся ў бязмежным моры часу жыццё маё і жыцці адназемцаў маіх, што ваявалі ў далёкіх землях за Божую праўду, бо кожная справа чалавечая мусіць застацца ў памяці наступнікаў дзеля прыкладу і ўспаміну.

З гэтым сканчаю кроніку сваю і аддаю яе ў рукі Таго, хто ўладарыць над светам.

1986

* Пакуль жыву, спадзяюся *(лац.)*.

Пішу вам у Масковію

ГРАМАТА З МАГІСТРАЦКАГА АРХІВА

Паклон вам нізкі, ласкавыя мае бацюхна і матухна, ад сына вашага, якога ўжо колькі летаў вы перад вачыма сваімі не бачылі і які кожнага вечара за вас і за цябе, брат мой малодшы Глеб, моліцца, дом бацькоўскі ўспамінаючы, і ліпы нашыя, і як Глебушка малы з кацянятамі гуляў, і тое нават, як наш Малахвей брэша. Малю Госпада, каб ахаваў вас ад хваробаў, а найперш каб у смутныя гэтыя часы ад ліхіх людзей абараніў, якія ў нашай дзяржаве Маскоўскай уладу забралі і няправедны суд чыняць.

Цешуся надзеяю абняць вас, ды часта апаноўваюць мяне думкі, што разлучыліся мы ўжо да сустрэчы нябеснае. А пішу да вас з места старажытнага і слыннага Полацкага, дзе хутка ўжо як тры леты Божай воляю знаходжуся, і колькі яшчэ мне тут быць, аднаму Госпаду вядома.

Памятаеце вы, мусіць, бацюхна, як дом я родны пакідаў і сядзелі мы з вамі пры збане з трайным мёдам, ды не маглі горыч нашую падсаладзіць. Згадаліся нам тады словы вялікага князя маскоўскага Васіля Іванавіча, бацькі цяперашняга гасудара нашага, няраз ім моўленыя. «Дакуль конь мой хадзіць будзе і меч секчы, не дамо спакою Літве»,— любіў князь Васіль казаць, і сын ягоны таксама з юных летаў у той бок, куды сонца садзіцца, паглядаў і хацеў пад сваёю рукой мець і Полацк, і Віцебск, і іншыя гарады і землі, якія некалі Уладзімір Краснае Сонейка ваяваў, і пасля яго князі рускія з дружынамі ваяваць хадзілі, і якія потым вялікія князі літоўскія да сваіх вотчын прырасцілі.

Вядома вам, што сем летаў таму ўступіла наша войска з агнём і мячом у Лівонію. Напачатку фартуна цару Івану Васілевічу спрыяла, і занялі ваяводы нашыя Нарву і Юр'еў, наблізіўшыся да мора. Тады магістр

лівонскі пачаў шукаць падмогі ў вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта Аўгуста і даў яму спярша шэсць фартэцый, а потым і зусім пад ягоную ўладу аддаўся. Услед за тым войска гетмана Радзівіла Рудога ўвайшло ў Інфлянты, як тут Лівонію называюць, і на трэцім леце вайна Лівонская ў вайну Літоўскую ператварылася, а цар наш нямецкаму імператару пісаў, што трэба сілы злучыць і Польшчу з Літвою ім між сабою падзяліць і на векі вечныя ўпакорыць.

У лета 7070* хадзілі ліцвіны на Апочку, Невель ды Вяліж, а нашыя ваяводы зямлю Мсціслаўскую плюндравалі ды наваколле Воршы і Дуброўны палілі. Тады ж князь Андрэй Курбскі быў у паходзе на места Віцебскае, астрог узяў і папаліў і пасады ўсе і сёлы і людзей без ліку жыцця пазбавіў. Спаліў таксама, апрача лацінскіх, дваццаць чатыры храмы праваслаўныя і да палону не меў літасці, але цар і вялікі князь Іван Васілевіч скрыва на яго пасля паходу пазіраў і дакараў, што, пятнаццаць тысяч людзей маючы, не здолеў чатыры тысячы ліцвінаў пад Невелем разбіць.

«Уся Літва ёсць вотчына гасудароў маскоўскіх»,— цар на саборы сказаў, а дваране сказалі: «Мы, халопы царскія, за адну дзесяціну зямлі Полацкага або Азярышчанскага павета галовы скласці гатовыя». Сам я такое гатоўнасці ў душы не чуў, але і таго, якой крывёю тая царова нава́га скончыцца, не ведаў.

А зімою, у месяцы снежні, сабраліся палкі ў Мажайску і сам цар туды выехаў.

Але перш чым распавесці вам пра паход той, хачу я колькі слоў пра цара і гасудара Івана Васілевіча сказаць, хоць і рызыкую галавы свае пазбыцца. Вусцішна таго судзіць, хто самім Богам над намі пастаўлены, ды не дае мне спакою памяць пра незабыўнага настаўніка і апекуна майго Аляксея Фёдаравіча Адашава, блізкасць да якога мне з прычыны маладога веку ды становішча невысокага схаваць пашчасціла — быццам каменьчык на рачным дне, я ў царскім войску сярод ратных людзей згубіўся і смяротнае небяспекі пазбегнуў.

* Паводле сучаснага летазлічэння — 1562.

Ведаеце вы, бацькі мае ласкавыя, што дзесяць з лішнім летаў быў Аляксей Фёдаравіч Адашаў пры цару даверaным чалавекам і царства яго сваім розумам дзяржаўным мацаваў. Спрыяў ён прырашчэнню да нашых айчынных межаў княстваў Казанскага ды Астраханскага і перамовы няраз з Лівоніяй і з Даніяй вёў і з каралём польскім і вялікім князем літоўскім. Меў душу суворую ды ўладную, але пабожную і так, бывала, у малітву і ў пост улягаў, што цэлы дзень адною прасвіркаю жывіўся. Выславіўся ён і дабрачыннасцю вялікай: карміў пры доме людзей лёзных, а ў доме дзесяць струплявых трымаў, сваімі рукамі іх абмываючы.

Не хацеў муж гэты дбайны і любамудры вайны Лівонскае і адгаворваў цара ад паходу ў зямлю Полацкую. Разам з настаўнікам душы царовай Сільвестрам казаў апякун мой, што трэба спярша выкараніць няверных, злых ворагаў Хрыста і святой зямлі Рускай. Але не той ужо быў гасудар наш, не слухаў парадаў мудрых, а слухаў людзей злых і падступных. Загінуў Аляксей Фёдаравіч Адашаў разам з дабрачыннасцю царскай.

А трэба вам, бацюхна і матухна, і табе, брат мой Глеб, сказаць, што цёмныя ды варожыя сілы каля манарха нашага ад самых першых дзён царства ягонага стаялі і няспыннае змаганне за душу яго вялі. Застаўся ён у восем летаў круглым сіратою; сядзела на троне дзіця ў Манамахавай шапцы ды са скіпетрам і дзяржаваю, а баяры яму на каленях рукі цалавалі, вялікім князем і гасударом называючы — хто са шчыраю душой, а хто і крывадушна, так што, бывала, апекуны і пакарміць яго свойчас забываліся. Улада такая для малалетняй душы кволай гібельная вельмі, а нячыстаму — спадзяванне і ўсцеха.

Яшчэ дзіцем любіў цар Іван Васілевіч тым бавіцца, што з высокіх дахаў катоў ды іншых тварын бязмоўных скідваў, а летаў з пятнаццаці пачаў і чалавекаў з высачыні ўпускаць, таварышаў дзіцячых гульняў сваіх, і глядзеў з асалодаю, як яны ў смяротных курчах гінуць. Шмат грахоў учыніў гасудар яшчэ ў маладосці ранняй — да гульні ў зернь і іншых забаў

непрыстойных хіліўся, да зелля хмельнага быў ахвочы і на дзевак такі ласы, што схопіць у хораме сваім любу́ю за грудзі, акі тацъ татарскі, і ў спіжарню на забаву цягне. А колькі людзей чорных на вуліцах і на торжышчах маскоўскіх канём да смерці здратаваў! А павянчаўшыся на царства, маючы ад нараджэння семнаццаць летаў, дзікую расправу ўчыніў над пасланцамі пскоўскімі. Прыехалі да яго з чалабітнаю на намесніка свайго князя Турунтая-Пронскага семдзесят пскавічоў, людзей немаладых і шаноўных, цар жа Іван Васілевіч у нечуваную лютасць увайшоў, што простыя пасадскія людзі чалом біць на князя асмеліліся. Загадаў ён з тых людзей сівых адзенне сарваць і целяшом на сыры каменны дол пакласці, а сам віном гарачым* галовы ім паліваў і свечкаю валасы і бароды падпальваў. І не чуў у душы страху перад знакамі нябеснымі — ні тады, як вялізны звон у Крамлі сарваўся і на кавалкі разбіўся, ні тады, як пусціў Бог дымам на Вялікдзень усё жывое на рацэ Яўзе, ні тады, як Масква ў той самы год, як прыняў ён тытул царскі, ад Крамля да далёкіх прадмесцяў выгарала і бунт у народзе маскоўскім прычыніўся, і крычалі людзі, што царову бабку-сербіянку за ейныя чары вядзьмарскія смерцю караць трэба.

Але паслаў Бог гасудару маладую царыцу Настассю Раманаўну, стварэнне анёльскае, усіх убогіх ды пакрыўджаных заступніцу, і пачаў мяняцца Іван Васілевіч, закаваўшы ў кайданы дэманаў душы. Новыя храмы гасудар фундаваў і з царыцаю на багамолле ў Троіца-Сергіеву лаўру пешкі хадзіў, і маліўся там, і пасціў, і з браціяй паважную гаворку вёў. Але сілы д'яблавы тым часам да рашучае бітвы рыхтаваліся, і прыйшоў дзень, як вырваліся дэманы з ланцугоў на волю і заваладалі душой ягонай. З таго чорнага дня лютая жорсткасць яму, як ежа, неабходнаю зрабілася, як віно ды паветра, і нічога мілейшага сэрцу ягонаму не было, як чужыя пакуты бачыць — ці то чалавека, ці то жывёліны неразумнай.

* Спіртам.

Памятаю, прывезлі гасудару нашаму слана-звера з Персідскае краіны, і, як не стаў ён на калені на загад царскі, наказаў цар пасекчы неразумнае стварэнне на дробныя кавалкі. Ракою й нявінная кроў людская паплыла. Сільвестр, Божая душа, ад няміласці царскае зачыніўся ў манастыры, а настаўнік мой Адашаў ад'ехаў ваяводам у Лівонію, ды нядоўга пад небам хадзіць яму ўжо заставалася.

Забраў Госпад душу царыцы нашае, і нашапталі цару, нібыта звялі Настассю Раманаўну таемныя зласліўцы ейныя і чарнадзеі Сільвестр з Адашавым. Крычалі на судзе ворагі іхнія, смяротнае кары вымагаючы, а іншыя суддзі, вочы ў масніцы ўтупіўшы, маўчалі, адзін мітрапаліт Макарый сказаць цару адважыўся, што трэба і падсудных, вярнуўшы ў Маскву, выслухаць. Заківалі згодна пасля слоў гэтых разважных суддзі, але губіцелі апекуна майго да цара Івана Васілевіча лісліва загаварылі, што няварта злачынцаў у сталіцу заклікаць, калі іх сам цар маскоўскі наймудрэйшы і літасцівы асудзіў. Вось узор правасуддзя нашага, што не законам, а воляю ліхіх людзей кіруецца. Страшна пра тое думаць, колькі яшчэ летаў будзе суд наш маскоўскі найлепшых людзей у магілу зводзіць за адно толькі, што валадарам ды шаптунам іхнім і сябрам крывадушным не дагадзілі.

Цар пасля суда Сільвестра ў далёкую абіцель Салавецкую паслаў, што на выспе сярод Паўночнага мора, а да Адашава ў Лівонію адмысловыя людзі паехалі, і, вярнуўшыся, абвясцілі яны гасудару ўрачыста, што выкрыты ў грахах сваіх і падкопах здраднік, не стрываўшы ганьбы, сам сябе атрутаю вынішчыў. «З гнаішча я яго ўзяў, у гнаішча ён і вярнуўся»,— цар на гэта сказаў, хоць быў Аляксей Фёдаравіч Адашаў роду, што праўда, не знакамітага, ды ў нашай мінуласці прыкметнага.

Загубіўшы гэтага мужа дзяржаўнага, узяліся і сам дух ягоны адусюль вынішчаць. Як адышла на вечны спачын царыца, і тыдня ў палацах царскіх жалоба не трывала.

Выдумляліся штодзень новыя пацехі, Богу агідныя, дзе любую цноту і дабрачыннасць цар з новымі сяб-

рамі за непрыстойнасць мелі. У той час ратаваўся я ў сядзібе ў сябра сардэчнага вёрстаў за пяцьдзесят ад Масквы, але не чуўся і там у бяспецы, бо даходзілі і туды весткі, ад якіх дранцвелі мы ў жаху, не раўнуючы як звяры, на крывавым царскім паляванні зацкаваныя.

Як злятаецца адусюль крумкаччо пасля бітвы на баль свой, павылазілі на свет сціжмы слухачоў, віжоў і даказчыкаў, што на вуліцах і ў дамах размовы ціхія падслухоўвалі і ў твары людскія пільна ўглядаліся, пакрыёмыя думкі і злачынствы прыдумляючы. Паказалі шаптуны гасудару на адну жанчыну, слынную ў Маскве сваёй пабожнасцю і прыхільнасцю Адашаву, і вымыслілі з д'яблавае падказкі, нібыта баярыня гэтая хоча дзяцей царскіх чарамі загубіць, і пакаралі яе смерцю, ды не адну, а з пяццю сынамі.

Скоры і люты цароў суд быў. Князю Абаленскаму-Аўчыніну, які ўлюбёнцу гасудараваму Басманаву нелагоднае слова сказаў, усадзіў Іван Васілевіч сваімі рукамі нож у сэрца, і не ў цёмную ноч таемна, а на вачах ва ўсіх за бяседным сталом. Баярын жа, князь Міхайла Рапнін, убачыў у палацы, як цар, мёдам упіўшыся, з апівудамі ў масках сатанінскіх скача, і ад гора заплакаў. Хацеў цар і на яго тую лічыну агідную надзець, ды князь кінуў яе на дол, нагамі здратаваўшы, і запытаўся адважна: «Ці ж дазволена гаспадару зямлі Рускае скамарохам быць?» А праз колькі дзён, як стаяў ён на малітве, зарэзалі баярына проста ў храме Божым. А князя Юрыя Іванавіча Кашына, волю царскую выконваючы, на бабінцы ў сэрца кордам ударылі.

Сватаўся тады наш цар і вялікі князь Іван Васілевіч да дачкі Жыгімонтавай, атрымаў жа ад каралеўны гарбуза і лютаваў яшчэ болей. Тады і песню ў Пскове ды ў Ноўгарадзе пра цара шэптам спяваць пачалі:

У того царя да у Собаки
а окол двора да тын железный,
а на каждой-то на тычинке
по человечьей-то сидит головке.

Кожны дзень падалі з рамёнаў галовы, як быццам плады крывавыя цар з нейкага дрэва сатанінскага на пажыву дзікім звярам нястомна атрасаў. І казалі пошапкам, што Іван Васілевіч прылюдна рукі з кішэняў не дастае, бо не можа кроў з іх адмыць.

Абвянчаўся гасудар з хрышчонаю дачкою валадара чэркескага Цемрука, але марна да яе тыя прыглядаліся, што ў чэркешанцы другую Настассю Раманаўну, душу рахманую і пабожную, убачыць хацелі. Была паўдзённая князёўна норавам дзікая і сэрцам, як горы іхнія каменныя — адно ўмацавала цара ў грахах. А ён пра каралеўну і князёўну шкадаваў і да помсты Жыгімонту рыхтаваўся — і за нехаценне сватам стаць, і за Лівонію, што пад Жыгімонтаву руку перайшла. Можа, таму і прынялі многія вестку пра паход полацкі калі не з радасцю, дык з палёгкаю: мелі надзею, што ратныя клопаты лютасць царову да сваіх людзей утаймуюць. Як ліхі чалавек шукае прыстанак бяспечны ў тым самым доме, дзе зло ўчыніў, так і я падумаў, што лягчэй мне будзе затаіцца ад цара паблізу, хоць грэшна раўняцца мне з ліхадзеем, бо ніякага злачынства на душы не насіў, апрача любасці і шкадобы да настаўніка свайго.

Цяпер вярнуся да таго, як выехаў гасудар у месяцы снежні лета 7071 у Мажайск, дзе стаяла ўжо войска маскоўскае. Ехалі з ім цары казанскія Аляксандр і Сімяон, царэвічы Ібак, Тахтамыш, Бекбулат ды Кайбула, дванаццаць баяраў думскіх, пяць акольнічых і шаснаццаць дзякоў. Людзей вайсковых меў гасудар 200 тысяч конных, ды 60 тысяч пешых, ды людзей абозных тысяч 80. Кажуць, аднак, што разы ў тры, а мо і ў чатыры гэтую сілу прыменшыць належыць, каб супроць праўды не саграшыць, але ўсё адно здавалася, нібыта цэлая дзяржава Маскоўская на вайну сабралася. Мела войска 200 гарматаў, з якіх чатыры — сцены біць, 36 — такія, што агонь і камяні кідаюць, а яшчэ — абложныя, палявыя, паўгарматы і чвэрцьгарматы, фальканеты ды іншыя. Ішлі яшчэ з намі шэсць тысяч грабароў дарогі правіць. Было таксама колькі тысяч мяхоў, з радна пашытых, каб у іх зямлю ды жвір насіць і абложныя туры наладоўваць. А гарматы, і порах, і кулі, і ўвесь рыштунак везлі на сабе сорак тысяч чорных людзей, бо цар і вялікі князь загадаў коней берагчы.

І пайшла сіла нашая да літоўскіх межаў. З Мажайска на Тарапец пайшла, дзе некалі ва Уваскрасенскай царкве князь Аляксандр Яраславіч, пазней Неўскім названы, з полацкай князёўнаю Аляксандраю вянчаўся. З Тарапца рушылі мы на Вялікія Лукі, і цар загадаў дарогу перад сабою чысціць і на рэках масты ладзіць. З Вялікіх Лукаў на Невель пайшлі, а адтуль дарогаю лясною і цеснаю — на Полацк, места на той час у Вялікім Княстве Літоўскім найбуйнейшае і найбагацейшае, што на гандлёвай рацэ Дзвіне стаяла, якая з Варажскім морам каля Рыгі зліваецца. Так зрабілася вайна Літоўская вайною Полацкаю. Я ж сярод царскіх пісцоў і перапісчыкаў ехаў, таму шмат чаго мне ведаць дадзена было, ад іншых вачэй схаванага.

Лета 7071* студзеня 31 узялі мы галоўную цвярдыню варожую ў аблогу і адразу пачалі каля места вялікія туры ставіць, што ў лесе за тры вярсты адтуль зрабілі, і загадаў гасудар Іван Васілевіч дзецям баярскім з баярскімі людзьмі быць каля тураў і ягоную царову справу рабіць. І агонь з ядрамі праз сцены кідаць пачалі, так што назаўтра ўжо чорны дым над местам паплыў.

Бараніўся Полацк сілаю невялікаю, але мужна і ўмела, аднае начы палачане нават на вылаз адважыліся, каб гарматы ў нас адбіць, аднак няроўныя сілы былі, і хутка мы непрыяцеля назад утапталі. А ваявода полацкі Станіслаў Давойна спудлаваў ды нам, не хочучы таго, услужыў. Выправіў ён з места дзве тысячы сялянаў, што сцены мацавалі, нашыя ж людзі іх палавілі ды змусілі ямы паказаць, дзе палачане харч хавалі. А потым ваявода Давойна зноў безразважнасцю нам паспрыяў: людзей сваіх у замкі адвёў, а пасады падпаліў. Нашыя ж стральцы, і мне між іх быць давялося, у дыме густым у места ўварваліся і гарматы туды перацягнулі.

Вывелі мы ў той дзень палон — адзінаццаць тысяч чорных людзей. Цар і вялікі князь Іван Васілевіч загадаў той палон па князях, і баярах, і дзецях баярскіх, і па ўсіх прыказных людзях раздаць. Мне з царскае

* 1563.

ласкі дзесяць мужыкоў з жонкамі і з дзецьмі дасталося, якіх я слугам маім Сценьку Разносаву ды Фяську Сухарукаму да вас, бацюхна і матухна, у Суздальскую зямлю весці наказаў. Не ведаю, ці дайшлі яны тымі снягамі ды маразамі, бо ніякай весткі ад вас пра тое не маю, але і пры сабе пакінуць іх не мог, бо не меў ім корму. Калі ж дайшлі, прашу абыходзіцца з імі па-хрысціянску. Таму што адной яны з намі веры, толькі цэрквы іхнія канстанцінопальскаму патрыярху падлеглыя.

Пасля таго гарматы нашыя зусім блізка ад замкаў стаялі і білі ў сцены прыцэльна. Апрача таго, падвялі мы падкоп і вялікі прыпас парахавы ўзарвалі, так што трыста сажняў сцяны выгарала. А неўзабаве татары казанскія, што ў царскім войску былі, прывялі да гасудара двух ліцвінаў злоўленых — Марка Іваніча ды Фядка Хлябовіча, і тыя ліцвіны сказалі, што ідзе на падмогу Полацку гетман Мікалай Радзівіл, што даў каралю слова места абложанае ад ганьбы ўратаваць, і стаіць ужо з дваццаццю гарматамі пад Глыбокім. Пасланыя былі пераняць яго князі Юры Рапнін ды Сімяон Паліцкі, і не адважыўся непрыяцель на бітву, бо меў жаўнераў толькі тры з паловаю тысячы. Тым часам пустошыла наша воінства Полацкую зямлю і ад замка Дрысы да Дзісны ўсе воласці па Дзвіне выпаліла.

Цар і вялікі князь Іван Васілевіч стаяў тыя дні паблізу Спасаўскага манастыра, цвярдыні багатай і аздобнай, а фундаванай найпадобнейшаю Еўфрасінняю, прапрапраўнучкаю святога князя Уладзіміра Хрысціцеля. Вёз гасудар у скарбе сваім крыж, той ігуменняю Еўфрасінняй некалі ў манастырскім саборы пакладзены, а пазней смаленскімі князямі ўзяты і ад іх у Маскву вывезены. І загадаў ён, просячы ў неба перамогі, на належнае месца святыню вярнуць. Быў то чын дагодны Богу, ды хутка, як бы купіўшы сабе тым крыжам адпушчэнне грахоў будучых, узяў цар на душу новыя злачынствы крывавыя. Набліжаўся гасудар наш да веку Хрыстовага, але нават імя яго на пісьме побач з імем Збавіцеля ставіць мне боязна.

Лютага ў 14 дзень даў Іван Васілевіч загад князю Васілю Сярэбранаму з таварышамі біць па замках по-

лацкіх з верхніх гарматаў вогненных, і Божаю міласцю з-за бліжніх тураў за пяць гадзін да святла Полацк каля Вялікае брамы, а потым і ў іншых месцах мы запалілі. Дым палачанаў душыў, і прыпасу вялікага яны не мелі, і спадзяванні на падмогу Радзівілаву таксама дымам пайшлі, і пасля сёмага прыступу ваявода Давойна, і ваяводзіч віленскі Ян Глябовіч, і ўладыка полацкі Арсен з крыжам выйшлі з места і пачалі цару чалом біць, каб болей з гарматаў страляць не наказваў. Праўда, шляхта полацкая і пяць сотняў кароннага рыцарства, Давойну не паслухаўшы, пасля таго яшчэ дзень і ноч адбіваліся.

Гасудар Іван Васілевіч палачанаў прыняў літасціва і дакляраваў кожнаму вольнасць і багацце захаваць, ды, як у нас, у Масковіі, зазвычаена, слова дзяржаўнага не стрымаў. А ваявода Давойна, царскаму абяцанню паверыўшы, выступіў з замка з усім войскам і з артылерыяй, паміж двума шыхтамі нашых ваяроў прайшоў і на ўказанае месца стаў. Тут гасудар над вераю іхняю і пасмяяўся: загадаў трымаць непрыяцеля на гары пад моцнаю аховаю і пяць дзён ніякага харчу не даваць. А скарб дзяржаўны і ўласнасць людзей багатых, і купцоў, і шляхты цар забраў і прыўлашчыў. Таксама і месцічаў наказаў ён выгнаць на поле і пад вартаю трымаць. А праз пяць дзён учынілі агляд гэтым людзям і войску варожаму і ўсіх пайменна перапісалі.

Даў цар волю абяцаную толькі пяці сотням рыцараў польскіх, адарыўшы кожнага футрам і залатымі манетамі дзеля таго, каб яны на радзіму ад'ехалі і спавясцілі, што з Каронаю цар вайны не хоча, адно пра сваю вотчыну дбае і вярнуць яе рупіцца — і Валынь, і Галіччыну, і Вільню, на якую ад Полацка наша дваранская конніца пайшла. І цешыўся гасудар вельмі, што места Полацкае ён без папа і без сабакі Аляксея ўзяў — так ён духоўніка колішняга Сільвестра і дарадцу свайго, а майго настаўніка Аляксея Фёдаравіча Адашава называў. Цешыўся цар, ды новых перамогаў яму Бог не даў, але пра тое пасля распавяду.

Месяца лютага ў 18 дзень уехаў Іван Васілевіч у цвярдыню варожую над Дзвіною, прыняў тытул князя полацкага і пісаў мітрапаліту Макарыю: «Се нынче исполнилось пророчество, что вознесет Москва руки свои на плеща врагов ея. Господь наш Иисус Христос истинный Бог наш излиял на нас недостойных великого дара несказанную свою милость, вотчину нашу град Полтеск нам в руки дал». Ваяводу ж Давойну з жонкаю яго Пятроніяй, уроджанаю Радзівілаўнай, і з дзецьмі, і епіскапа полацкага Арсена, і шляхту, і мяшчанаў, і чорных людзей, што ў месце хаваліся, загадаў цар вязаць і да нас у Масковію весці. Было гэтага палону, кажуць, да пяці дзесяткаў тысяч, і пагналі яго, як юдэяў да Вавілона, не па-хрысціянску: і кабет, і дзяцей абы-як апранутых і вяроўкамі злыганых вялі, і пяць дзён ніякага харчовага прыпасу не давалі, так што людзі, як вераб'і, на лютым марозе падалі. Ваявода Давойна і цяпер у палоне ў Маскве ў кайданах сядзіць, жонка ж ягоная Пятронія недзе там і сканала. І ваяводзіча віленскага Яна Глябовіча дагэтуль у царскай вязніцы трымаюць; гасудар яго да нас, на службу маскоўскую, ісці схіляе, за гэта і Полацк, і Інфлянты, і польскую карону дакляруючы, ды ваяводзіч моцна на сваім стаіць.

Наракаю я, грэшны, матухна, на вас, што ўзгадавалі мяне з сэрцам мяккім, якое хоць і агрубела за гады гэтыя, але на пакуты чалавечыя адгукацца не развучылася. Прызнаю я, што жорсткасць і цвёрдасць сардэчная на вайне патрэбныя, ды паўстае душа мая, калі людзей мірных і бязвінных жывата пазбаўляюць. Губіў Іван Васілевіч у Полацку людзей кожны дзень сотнямі і ўсё ніяк смагі крывавае наталіць не мог. Прашу вас, бацюхна, або ты, брат мой Глеб, не чытаць матухне тое, што я зараз напішу, і надалей такое прапускаць, бо хочацца мне душу аблегчыць, а матухніна сэрца можа таго не стрываць.

Стогны і плач несціханы стаялі ў Полацку. Кабет паважных і дзяўчатак маладзенькіх у дамах і пад плотам, на снезе проста, стральцы гвалцілі ў мужоў і ў бацькоў на вачах, а хто бараніць кідаўся, таму галаву бердышом сціналі. Баярскі сын адзін спярша ўдаву злотніка, што ў аблогу галаву склаў, ссільнічаў,

а потым і дачку яе, і абедзвюх, на двор выгнаўшы, стральцам аддаў, а тыя па-ўсялякаму, і па двое, і па трое, горш за звяроў якіх, з адною і з другою цешыліся, пакуль не кінулася ўдава ў студню, а дачка таго не ўчыніла, бо пад стральцамі з душою развіталася.

Жыло ў месце Полацкім багата габрэяў-юдэяў, і хоць хацелі многія з іх прыйсці да цалавання на вернасць цару, загадаў Іван Васілевіч усіх чыста ў вадзе ўтапіць. Выганялі іх і са старымі, і з малалеткамі на Дзвіну ды на Валовую азярыну, лёд абсякалі і ў палонкі скідвалі. Памятаю, адна габрэечка маленькая ля самай ужо вады лялечку гліняную да сябе прыціскала і плакала, што холадна ў той вадзе ейнай лялечцы будзе.

Татары ж нехрысці, што ў нашым войску былі, загадам царовым пасеклі насмерць шаблямі полацкіх манахаў-бернардзінаў, а храм іхні спалілі. Наказаў гасудар Іван Васілевіч і манахаў-дамініканаў жывата пазбавіць, і ўсіх, хто не па-нашаму, не па-праваслаўнаму, моліцца. А іншаземцаў з палону полацкага клікаў цар на службу, і каторыя не захацелі яго гасударом прызнаць, таксама не вельмі літаваў. Найміту Андрэю Гесэ, што з дваццаццю рыцарамі ў аблогу прыпас вайсковы ахоўваў, загадаў гасудар абедзве рукі па локаць з рушніцы адстрэліць, адно вока выкалаць і палову барады выпаліць, а потым з жонкаю і з дзецьмі ў Маскву адвезці, каб там яго да смерці трымаць.

Зноў пачала ў цара на руках кроў выступаць, і зноў ён рукі ў кішэні футраў сваіх сабаліных глыбока хаваў, а калі трэба было да граматы пячатку прыкласці, выганяў усіх прэч, каб не ўгледзеў хто страху таго, але казалі, што потым з пячаткі ўсё адно кроў тачылася. Летапісец жа царскі так запісаў: «Божиим же неизреченным великим милосердием и государьскою теплою верою к Богу и его государьским умыслом в Полотцску в городе и в остроге ротмистров и королевских дворян и всяких воинских людей и черных из наряду много бесчисленно побили. И мы благодарим Бога и приснодевую Богородицу, заступницу христианскую, о даре их великом и будем молить их и святых великих чудотворцев за государя царя и великого князя Ивана

и за его царицу великую княгиню Марью и за детей его царевичей Иоанна и царевича Федора, дабы и впредь даровал нам победу над всеми врагами зримыми и незримыми и давал мир и тишину со всеми странами и на пользу всему православному христианству».

Ваяводы нашыя тым часам ішлі ў Самагіцію*, і да Мсціслава, і да іншых гарадоў, воласць Полацкую і сумежныя з ёю землі плюндруючы, бо гетман Радзівіл з войскам назад у Менск адышоў. І прыслалі вяльможы каралеўскія да гасудара цара Івана Васілевіча чалавека з лістом, просячы, каб кроў хрысціянскую болей не ліў і міру ды спакою з гаспадаром іхнім Жыгімонтам хацеў, а той паслоў сваіх прышле да Успення святой Багародзіцы. Цар адказаў, што пасла ні бізунамі не б'юць, ні сякераю не сякуць, і загадаў іншыя землі Вялікага Княства Літоўскага не ваяваць і, меч свой адклаўшы, даў ворагу замірэнне на паўгода.

Пасля таго гасудар у суботні дзень на Фёдаравым тыдні ў святой Сафіі памаліўся і да Вялікіх Лукаў пайшоў, дзе войска распусціў, а сам у Маскву ад'ехаў.

Полацк пакідаючы, наказаў цар равы паправіць, старыя пачысціць і новыя пакапаць, каб былі стромыя ды глыбокія; у астрозе за Палатою наказаў паглядзець і якое месца выгарала, тое да ладу прывесці, сцяны тры або чатыры зрабіўшы, і зямлёю засыпаць, і стральніцы ды вежы дзеля сценнага бою парабіць. Есці ў сухмень цар наказаў усім за местам у полі варыць, апрача адных толькі ваяводаў. А літоўскіх людзей прыезджых і тутэйшых, і шляхту, і баяраў, і чорных людзей адналічна ў замак не пускаць, а калі ў які дзень урачысты на вялікае свята папросяцца да Сафіі прамудрасці Божай, тады іх пусціць, ды не разам усіх, а купкамі малымі, але асцярогу ў месце ўчыніць і паўсюль стральцоў дабавіць.

А ведаць загадаў баярыну князю Пятру Іванавічу Шуйскаму браму Усціцкую, а баярыну князю Васілю Сямёнавічу Сярэбранаму браму Вялікую, а Пятру Сямёнавічу Сярэбранаму — Сафійскую, а баярыну

* Жамойць.

Івану Васілевічу Шарамецьеву — Багародзіцкую. Гараднічым жа Васілю Галавіну і Васілю Замыцкаму наказаў хадзіць па начах з ліхтаром, мяняючыся, па ўсіх вартах і места замыкаць, а ключы да баярына князя Шуйскага адносіць. Пры гэтым князю, слаўным заваёўніку Юр'ева, і я дзеля розных запісаў і іншых патрэбаў застаўся.

Цяпер скажу вам пра места Полацкае і пра людзей, сярод якіх мне Госпадам Богам ужо трэцяе лета жыць наканавана і якія хоць і не ганаруюць мяне, але ўсё ж не за звера ўважаюць і гаварыць са мною не баяцца.

Векам сваім і славаю места гэтае раўня Кіеву і Ноўгараду, і Сафія прамудрасці Божай у тыя самыя часы, што і кіеўская, тут над Дзвіною пастаўленая. Здавён Полацк, як пра тое летапісы кажуць, чужой улады не прымаў і то з Ноўгарадам, то з Кіевам ваяваў. Пяць таму стагоддзяў вялікі князь полацкі Усяслаў Чарадзей з наўгародскае Сафіі званы зняў, а потым у Кіеве ў порубе сядзеў, ды з той вязніцы земляной выйшаў і на кіеўскі пасад сеў. Пісана ў старых граматах і пра тое, што з Яраславам Мудрым і з Уладзімірам Манамахам полацкія князі ваявалі і вольнасць адстаялі. Пад татарынам зямля гэтая ніколі не была, а да Літвы сама адышла, вялікія прывілеі сабе пакінуўшы.

Завецца ж гэтая дзяржава, нам варожая, Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, а людзі тутэйшыя, што і ў Полацку, і ў Менску, і ў Вільні, скрозь да самае Самагіціі жывуць, называюцца па дзяржаве ліцвінамі або літоўцамі, гавораць жа на мове, што да нашае падобная, хоць, бывае, і нялёгка яе разабраць. Вось, да прыкладу, нашае слова «блага» ў іх зусім супраціўнае значыць. Памятаю, калі мы места забралі, пачалі да цара на цалаванне людзей вайсковых прыводзіць, і загадаў Іван Васілевіч непакорлівых на месцы жыцця пазбаўляць; аднаму рыцару-ліцвіну вантробы выпусцілі, а ён, ля ног царовых канаючы і вантробы свае назад у чэрава запіхнуць намагаючыся, усё крычаў: «Ой блага мне, Божа, ой блага», а мы дзівіліся, думаючы, чаму ён так перад смерцю крычыць, быццам сады райскія ўбачыў?

А яшчэ, што нам нязвычна, гады́ яны ад нараджэння Божага лічаць, як і ў Нямеччыне, і ў Чэхах, і ў Францыі, і ва ўсіх іншых краінах, а не ад стварэння свету, як мы, і з нас пасміхаюцца і наракаюць, што мы імя Хрыстовага не шануем.

Да вайны мела места гэтае шэсць пасадаў, з якіх адзін на выспе пасярод Дзвіны. Дворышчаў мяшчанскіх было ў пасадах паўтары тысячы, але болей тысячы ў аблогу выгарала. Замак жа полацкі галоўны на высокай гары самароднай паміж Дзвіной і Палатою стаіць, з хваёвага дрэва рублены і дзевяць вежаў перад аблогаю меў.

Ёсць у месце манастыроў паўтара дзесятка і шмат храмаў мураваных. І дзіўна нашаму чалавеку чуць, што маліліся тут праваслаўныя мірна побач з лацінцамі. Няможна такое ў нашай Айчыне, у Масковіі, і ў сне прысніць, каб побач з нашымі лацінскія цэрквы стаялі і дамы, дзе габрэі свайму Богу моляцца; а вядома мне, што ёсць у гэтай зямлі яшчэ і мірныя татары-магаметане, што свайму Алаху паклоны кладуць, і ўсе між сабою неяк ужываюцца. Па радзе айца свайго і багамольца Макарыя, мітрапаліта ўсяе Русі, і багамольцаў ягоных архіепіскапаў і епіскапаў і ўсяго сабора ўчыніў гасудар Іван Васілевіч у Полацку ў Сафіі прамудрасці Божай архіепіскапію, каб былі людзі полацкія маскоўскаму мітрапаліту падлеглыя, і пастаўлены быў на яе архіепіскап Трыфан, аднак месцічы царскага ўладыку не любяць і ў храм, дзе ён служыць, не ходзяць.

Дзіўлюся я і з таго, што не забыліся людзі полацкія на купаллі ды русаллі і вясну гукаюць ды іншыя старадаўнія святы памятаюць, якія ў нас у Масковіі і ўспамінаць баяцца, бо можаш за чарадзейства на дыбе павіснуць ды ў роспытнай хаце чырвонае жалеза сваім белым целам пачаставаць.

Вераць таксама полацкія месцічы ў розныя прыкметы і шмат тайніц ведаюць. Некалі вы, матухна, з нянькаю маёй Мікітаўнай, няхай будзе ёй зямля пухам, усё ўвечары пра ведзьмаў ды ведзьмакоў баялі, як і дзе іх распазнаць можна, а я пасля тых размоў засынаць баяўся. Дык тутэйшыя людзі кажуць, што,

калі сабраць з дзесяці цэркваў святую ваду і зварыць на ёй жур, неадменна ўсе ведзьмакі прасіць таго журу прыбягуць. І так яшчэ ведзьмака распазнаць можна: схаваць кавалачак сыру, што ядуць на загавінах перад вялікім постам, і насіць той сыр увесь час у мяшэчку пад пахаю. А на ютрані велікоднае, калі святар абвяшчаць будзе: «Хрыстос уваскрос!», трэба ўслед за ім прамовіць: «А ў мяне сыр ёсць», і тады ўсе ведзьмы і ведзьмакі сыру прасіць будуць.

Некаторыя людзі тут кажуць, што разумеюць мову звярыную і птушыную і кожны яе спасцігнуць можа, калі адмысловае стравы з вужовага мяса пад'есць. А як у каго дом загарэўся, дык у суседзяў, каб туды полымя не перакінулася, голая дзеўка ці маладзіца з поўным гарлачом малака вакол свайго дворышча аббягае і той гарлач у агонь кідае. Бачыў я колькі пажараў на свае вочы і сведчу: сродак гэты надзейны, нават калі заместа малака вады наліць, так што, калі ў вас там, крый Божа, загарыцца нешта, няхай Палушка ці Варварка, не баючыся сораму, тое ўчыняць.

Вераць тут і ў вадзяніка. Жыве ён у рацэ Палаце па вірах і крадзе людзей: мужчыны самі вадзянікамі робяцца, а жанчыны — русалкамі. Але гэты нячысцік не заўсёды ў вадзе сядзіць, бо яго Бог ганяе. Пасля Вадохрышча мусіць ён з вады ў лазу пераходзіць, адтуль у травы прыбярэжныя, а пасля Спаса дазволена яму бывае зноў у раку нырцануць.

Пра чорта кажуць, што лёгка яго ўбачыць, калі не баішся,— трэба адно ў віхуру плюнуць тры разы і прамовіць: «Чорт, чорт, пакажы хвост», бо калі па зямлі віхура ідзе — гэта чортава вяселле коціцца. У навальніцу чэрці нібыта ў крыжах на цэрквах хаваюцца, каб туды пярун біў, але я ў гэта не веру, бо нячысцікі крыжа больш за ўсё на свеце баяцца.

Асабліва ж вераць тут у ваўкалакаў-пярэваратняў. Гаварыў я, крыж на сябе паклаўшы, з адным чалавекам, які быццам бы сам пяць летаў ваўком быў. Павáдзіўся неяк з суседкаю, а тая яму сваімі чарамі і адпомсціла. Павёз з кумам у Дзісну тавар бандарскі прадаваць, распрэглі ў дарозе коней ды пусцілі пасвіц-

ца. І так таму чалавеку млосна зрабілася, і нудзіла яго і круціла, і прымроілася яму, што адзіны паратунак ад наслання — праз хамут пралезці. А як пралез — ваўком зрабіўся і ў лес пабег. Тры зімы і леты адзінцом бегаў, а на чацвёртае лета прынялі яго ваўкі ў гайню. Колькі ваўкалаку чараўнік начаруе, столькі ён у звярыным абліччы і хадзіць мусіць. Так той гаротнік з ваўкамі і жыў, пакуль яго аднаго разу, як цягнуў з чарады авечку, пастух дванаццаць разоў пугаю не перахрысціў, а пасля гэтага ваўчыная шкура адразу і злезла. Цяжка яму ў лесе жылося, ды яшчэ забыць баяўся, што не звер ён, а чалавек, а таму кожнае раніцы мыўся, пысаю па роснай траве водзячы, і ўвесну лапамі зямлю разграбаў, бо такой парою людзі аруць і сеюць. І казаў мне той ваўкалака былы, што як ні жудліва сярод ваўкоў жыць, а цяпер, калі цар наш Іван Васілевіч Полацк пад сваю ўладу забраў, ён, чалавек гэты, каб прымеў, зноўку ў лес вярнуўся б.

Месцічы полацкія ў розных рамёствах умелыя і абазнаныя, працаваць любяць, а пра лайдака ды чалавека няўмелага кажуць — перапрашаю, матухна,— што ў яго рукі ў срацы, і такіх яны за апошніх людзей маюць. І смяяўся адзін збройнік мне знаёмы, пра якога пасля скажу, з казкі нашай маскоўскай пра Ямелю, і дзівіўся, што мы гэтага Ямелю, які на печцы рукі склаўшы сядзіць, не ганім, а нібыта і любім. Працуюць жа майстры полацкія цяпер мала што не задарма на цара і вялікага князя Івана Васілевіча, а шмат якіх людзей рамесных у Маскву жывасілам павялі.

Народ гэты чысціню шануе, і вясёлы, і незлапомны, і гасцінны. Калі да каго госці прыйдуць, гаспадар кажа: «Госць у хаце — Бог у хаце» і ўсё лепшае на стол ставіць. Але занепадаюць іхнія звычаі адвечныя пад нашаю ўладаю, бо стральцы завядзёнку завялі ў чужыя дамы, як у свае, заходзіць і не толькі маетнасць чужую за сваю маюць, але і жонак чужых таксама. Дзіва што нас людзі полацкія, хоць і адной з намі веры, не ганаруюць і ўсё ўспамінаюць, як гасудар кроў ліў і габрэяў у Дзвіне падлёдным хрышчэннем хрысціў, бо яны з габрэямі зжыліся і не варагавалі.

Было ў месце Полацкім багата людзей у мовах замежных, і ў навуках багаслоўскіх, і граматычных, і рытарычных, і іншых абазнаных. Іх гасудар наказаў у Маскву адпраўляць, але і цяпер тут па манастырах такіх людзей даволі.

Паказваў мне адзін манах любамудры тое месца, дзе да вялікага пажару абложнага дом стаяў, у якім вучоны доктар Скарына на свет прыйшоў, той, што нашымі літарамі кнігі не перапісваць, а на варштатах ціснуць пачаў. Адціснуў ён Біблію і гнеў на сябе царкоўных валадароў наклікаў, бо пераклумачыў Святое Пісьмо на мову, простым людзям зразумелую, да таго ж кнігі свае ерэтычнымі малюнкамі аздобіў, дзе на адным сам Госпад Бог без німба, а на другім уласнае сваё аблічча гэты Скарына ў святой кнізе паказаць не збаяўся. Чуў я, што прывозіў ён кнігі свае да нас у Масковію яшчэ за бацькам нашага гасудара, за вялікім князем Васілём Іванавічам, і загадаў вялікі князь тыя кнігі, як спакусу д'яблаву, спаліць.

Адну з кніг таго вучонага доктара бачыў я ў Сафіі прамудрасці Божай, і шмат іншых кніг там, у саборы Сафійскім, ёсць, бо ад самога князя Усяслава Чарадзея манахі там летапісы пісалі і кнігі старадаўнія збіралі. Ёсць у ёй кнігі вучоных грэцкае царквы, спаміж якіх «Нябесная і царкоўная гіерархія» Дзяніса Арэапагіта, што вучнем у апостала Паўла быў, і кнігі святога Мяфодзія, апостала славянскага, ды брата ягонага, святога Кірылы. Усе яны на славянскай мове і не толькі рукою пісаныя, але і на друкарскіх варштатах ціснутыя. У Княстве Літоўскім ужо летаў з паўсотні, а ў іншых краінах, з ім сумежных, і больш за сотню летаў, як друкарні ёсць. У нас жа ў Масковіі толькі нядаўна варштаты друкарскія завяліся, і летась, чуў я, Пятро Цімафееў, родам мсціславец, з гэтае зямлі Літоўскае, ды разам з ім дыякан царквы святога Міколы Гастунскага Іван Федаровіч, таксама ліцвін, кнігу з дзеямі і пасланнямі святых апосталаў ціснулі. Пішу гэта найбольш дзеля цябе, брат мой малодшы Глеб, таму што хачу, каб быў ты чалавекам кніжным, а не да ратных справаў смертазабойчых гарнуўся.

Шмат дзён я ў Сафіі прамудрасці Божай сярод старых кніг сядзеў, бо прыйшоў ад цара Івана Васілевіча таемны загад летапісы полацкія ды граматы перагледзець і спіс скласці, каб потым іх у Маскву везці, а каторыя і агню аддаць. Уважае гасудар, што не трэба памятаць палачанам, як некалі сваю дзяржаву мелі, і як князі полацкія з візантыйскімі кесарамі раднілісся, і як сам Полацк з вялікімі вольнасцямі да Літвы адышоў. А чаму так гасудар уважае, зразумець няцяжка, бо людзі, якія даўніны свае не ведаюць, усё жыццё дзяцьмі застаюцца, і падмануць іх гэтаксама лёгка, як дзіця неразумнае.

Так прабыў я ў месце Полацкім вясну, і лета, і восень, а зімою прычынілася ў снежні залева нечуваная, і паводка пачалася, і на рэках з трэскам вялікім ільды паўзламала, так што па Дзвіне да самага Нараджэння Хрыстовага на караблях ездзілі. Таго ж месяца снежня, як вядома мне, прыйшлі да цара і вялікага князя Івана Васілевіча з Літвы староста бельскі пан Юры Аляксандравіч Хадкевіч, ды староста слонімскі пан Рыгор Багданавіч Валовіч, ды дзяк Міхайла Галабурда і з імі каралеўскае шляхты семдзесят чалавек і іншых людзей да дзвюх тысяч. І прасілі яны ў цара замірэння ад снежня да ліпеня месяца на паўгода. Як зазвычай, вымагалі паслы Жыгімонтавы ад нас Ноўгарада і Пскова, апрача ўсіх заваёў дзеда і бацькі цара нашага і земляў, ім самім да Маскоўскае дзяржавы прырошчаных. Баяры ж нашыя на гэта адказвалі, што трэба нам дзеля міру не толькі Кіеў ды Валынь з Падоліяй у Літвы ўзяць, але і Вільню, ды наракалі на караля, што не хоча Івана Васілевіча царом менаваць. Потым паменшылі цану і паслы і баяры, аднак гасудар загадаў паслам адмовіць, бо стаяла ўжо наша рацъ зімовая напагатове, у Літоўскую зямлю сабраная.

Наказаў гасудар так каралеўскім пасланцам сказаць: калі хочуць замірыцца, дык могуць тое і на дзесяць гадоў учыніць, абы воласць Полацкую ды Інфлянты нам адпісалі. І яшчэ сказаў Іван Васілевіч: «Не хоча мне кароль царскага імя даваць — вольнаму воля! Не маю патрэбы ў тытуле, бо ўсім вядома, што

род мой ад рымскага кесара Аўгуста, а дадзенага Богам чалавек не адбярэ». Паслы аб продках царовых спрачацца не сталі, але ні Полацка, ні Інфлянтаў пацвердзіць за намі не захацелі, а білі цару чалом, просячы прапускную грамату да Барысава, каб заставы ім ніякай крыўды не чынілі.

Думаю я, невялікая карысць дзяржаве нашай з таго, што гасудар сябе вышэйшым ад усіх іншых уладароў каранаваных уважае і манархаў не спадчынных, а на трон абраных абражае безразважна, паўтараючы, што ён цар паводле волі Божае, а не паводле шматмяцежнага хацення чалавечага. Няма разважання дзяржаўнага ў тым, што караля і вялікага князя Жыгімонта называе цар «паче худейша худейших рабов суща», а каралеву ангельскую Лізавету — пошлаю маладзіцаю. Суседа ж нашага караля шведскага, якога бацька быў не каралеўскае крыві, а просты дваранін, Іван Васілевіч сабе роўным не лічыць і ў лістах, якія мне Божай воляю перапісваць давялося, роспытамі даймае: «А ты скажы, бацька твой — чый сын, і з якімі гасударамі быў у сваяцтве, і якога ты роду гасударскага?» І смяяўся з караля, што ён, як маскоўскія купцы ў Швецыю сала і воск прывезлі, сам, рукавіцы надзеўшы, тавар гэты глядзеў і важыў.

У той жа час як паслы Жыгімонтавы з царскаю граматаю ад'ехалі, сканаў ад старасці мітрапаліт Макарый, і абралі замест яго першасвятаром маскоўскім інака Чудава манастыра Афанасія, духоўніка царскага. Кажуць, што выслухаў ён ад Івана Васілевіча вітальнае слова і багаславіў яго, просячы ў Госпада ўладару нашаму жыццёвае сілы ды перамогі, пра дабрачыннасць жа ўзгадаць святы айцец не наважыўся.

А ваяводы царскія збіраліся ўжо ў Вязьме, і ў Дарагабужы, і ў Смаленску. І полацкаму намесніку князю і гаспадару майму Пятру Іванавічу Шуйскаму наказаў гасудар ісці да Воршы і, не даходзячы да яе пяць вёрстаў, у пэўны дзень у сяле на Барані з ваяводамі вяземскімі князямі Сярэбранымі-Абаленскімі сустрэцца і ісці ад Воршы да Менска і да Наваградка, варожую краіну палячы.

Тады акурат, як загадаў князь Пятро Іванавіч да выступу рыхтавацца, чытаў я ў Сафіі прамудрасці Божай старадаўнія граматы і напаткаў між іх слова пра бітву, што за пяцьдзесят летаў перад тым пад Воршаю на рацэ Крапіўне прычынілася. Дзяржава нашая ў тыя леты таксама з Літвою ваявала, і мы з Божаю дапамогаю Смаленск узялі, і вялікі князь Васіль Іванавіч ужо загадаў ваяводам войска літоўскае ды польскае да Масквы, як быдла, пугамі прыгнаць. Вось там, пад Воршаю, нашыя ваяводы, 80 тысяч людзей маючы, з гетманам літоўскім Канстанцінам Астрожскім сышліся, у якога пад рукою 25 тысяч жаўнераў было, і той гетман нашае войска разбіў, ды так, што палова на полі палегла ды ў Дняпры і ў Крапіўне патанула, а ваяводы галоўныя Чаляднін і Булгакаў-Голіца, а з імі яшчэ восем ваяводаў, у палон трапілі. Прачытаў я тое, бацюхна і матухна мае, і ад чорнага прадчування сэрца затрымцела.

Выступіўшы з Полацка з дваццаццю з лішнім тысячамі войска, ішоў князь Пятро Іванавіч Шуйскі ў сваёй сіле пэўны і ворага не сцярогся, так што варты наперадзе не было і браню на санях везлі. А вялікі гетман літоўскі, ваявода троцкі Мікалай Радзівіл у Лукомлі стаяў; узяў ён адборных коннікаў і каля ракі Вулы, паблізу ад вёскі Іванск, на нас знячэўку ўдарыў — ні браню нашы людзі надзець не паспелі, ні ў палкі стаць. Дзве гадзіны сеча доўжылася, а надвечар адвярнуўся ад нас Бог, і пабеглі мы, увесь абоз кінуўшы. Непрыяцель да глыбокае ночы ў поўным месяцавым ззянні нас гнаў, і ўся зямля мёртвымі целамі заваленая была крумкаччу на ўсцеху. Дзесяць тысяч стральцоў нашых над Вулаю ад куляў, шабляў і дзідаў літоўскіх палегла і столькі сама ў рацэ патанула. Налажыў галавою і князь Пятро Іванавіч Шуйскі, а з ім чатыры князі і тры ваяводы. Забіты быў і Восіп Быкаў, муж высачэзны, росту на чатыры з паловаю локці, які нашаю артылерыяй загадваў. Абмыліўшыся, ліцвіны і некаторых жаўнераў князя Прапойскага пазабівалі, якія перад тым за колькі месяцаў на іхні бок перакінуліся, але ў маскоўскіх панцырах ваявалі.

Вялікі палон Радзівіл там узяў, і з тым палонам дванаццаць ваяводаў і шмат дзяцей баярскіх, і абоз з трох тысяч вазоў з харчовым прыпасам, і з футрам, і з посудам срэбным, і з панцырамі ды іншым рыштункам вайсковым на дзве тысячы воінаў. Была тая бітва лета 7072* месяца студзеня на 26 дзень.

Князя ж Шуйскага ў рацэ знайшлі, а забіў яго сякераю, калі ён паранены ўцякаў, просты селянін, бо мужыкі з паблізных вёсак таксама пасля сечы нас гналі і білі. Завезлі князя ў Вільню і там у царкве Прачыстай Багародзіцы з пашанотаю пахавалі, а гетман Радзівіл на ягоным кані ў места Віленскае ўрачыста ўехаў.

Ледзьве я, бацькі мае любыя і брат малодшы Глеб, у той бітве жывот свой уратаваў, але пасечаны быў і, Полацка дапяўшы, ад зімы да самае Сёмухі адлежваўся, зёлкамі сілу жыццёвую ў сабе мацуючы, і кожны дзень думкамі да вас і да дому бацькоўскага ляцеў, дзе я ўроджаны і ўзгадаваны і дзе хачу, калі будзе на тое воля Божая, аддаць душу ў рукі Ягоныя. А месцічы полацкія вельмі з перамогі Радзівілавай цешыліся і паміж сабою гаварылі, што добры ўрок даў гетман літоўскі, як маскавітаў біць, сыну Хрыстафору, яшчэ гадамі юнаму, які на Іванскім полі пры бацьку быў.

З паўгода пасля паходу няўдалага мы з ліцвінамі не ваявалі, пакуль улетку ваявода Юры Такмакоў з Невеля да Азярышча не пайшоў і перадавую дружыну непрыяцельскую не разбіў, а як падышло галоўнае войска літоўскае, адступіў і ўвесь свой палон перад гэтым усмерціў. І смаленскі ваявода Бутурлін з татарамі і з мардвою правы бераг Дняпра сплюндраваў і пяць тысяч палону вывеў.

А раней такое прычынілася, што несціханую трывогу нарадзіла ва ўсіх сэрцах, якія зямлю Маскоўскую яшчэ любіць не развучыліся. Перакінуўся да Жыгімонта адзін з найслаўнейшых ваяводаў нашых, дбайца вялікі аб славе Айчыны князь Андрэй Міхайлавіч Курбскі. Вялікая гэта страта дзяржаве нашай,

* 1564.

але не магу я, бацюхна мой, князя Андрэя здраднікам-пераветнікам назваць. Не было на славе ягонай ценю ніякага, ды знелюбіў яго цар за сяброўства з Адашавым. Быў князь ваяводам ў Юр'еве і ўведаў там, што рыхтуе яму цар падступна згубу. Пасадзіў ён, кажуць, аднае начы жонку сваю любую насупроць сябе і пытаецца: хоча яна над мёртвым над ім галасіць ці з жывым да скону дзён развітацца? Жонка ж адказала: адно хоча ведаць — што ён хоць на краі свету, ды жывы. Тады багаславіў ён сына, а двое коней яго за брамаю ўжо чакалі.

Ад ліцвінаў, што ласкава яго прынялі і шчодра надзялілі, напісаў ён, душу адкрыўшы, цару Івану Васілевічу, абяцаючы таму суд нябесны. У Маскве на Чырвоным ганку падаў слуга князеў ліст, пячаткаю запячатаны, самому гасудару, і той у лютасці вялікай князевага вернага чалавека вострым жазлом выцяў, ды слуга, крывёю сплываючы, пакуль ліст цару чыталі, стаяў і ні слова не вымавіў і потым, як мучылі яго і жалезам ірвалі, не сказаў нічога, адно гаспадара славіў. Пасля гэтага пачалі гасудару ўсе людзі знаныя таемнымі аднадумцамі князя Андрэя Міхайлавіча здавацца, і ўсё больш даносаў цар на радасць паклёпнікам вымагаў.

Казалі людзі, з Масквы ў Полацк да нас прыезджыя, што ставілі на ўказ цара і вялікага князя перад Крамлём плахі, і ка́ты пры іх з сякерамі станавіліся, і сам цар Іван Васілевіч у чорным уборы на вараным кані выязджаў і глядзеў, як паводле спісу знакамітых мужоў смерцю караюць. Найбольшую ж меў усцеху, з полацкім вайсковым палонам расправу чынячы, які па маскоўскіх сутарэннях сядзіць. Аднаго разу проста з бяседнае вячэры кінуўся цар з застоліцаю ў крамлёўскія лёхі вязняў полацкіх біць, і тады толькі здаволіліся, калі болей за сотню, як авечак, зарэзалі, а пасля зноў за хмельныя сталы вярнуліся. Нейкі шляхціч полацкі падчас той разні ў Івана Васілевіча дзіду выхапіў і ледзьве не працяў цара, ды Бог ягоную руку адвёў, каб новыя выпрабаванні дзяржаве нашай паслаць.

Ад вестак гэтых горкіх я над кнігамі ў Сафіі прамудрасці Божай ратаваўся, і прызнаюся вам, бацькі мае

ласкавыя ды брат Глеб, яшчэ адну суцеху меў. Звалася яна Еўдакія і красы была такой, што глянеш на яе — і нібыта віна кубак выпіў: тварам — як кужаль белая, каса — як бярэзінка ўвосень, залатая, а вочы — быццам Дзвіна ў пагодны дзень, чыстыя і ці то зялёныя, ці то блакітныя, разабрацца няможна. І душу мела такую, што вам, матухна і бацюхна, добраю б нявесткаю быць магла. Праўда, роду была не шляхецкага, але ў Полацку паважанага, а бацька ейны Валодша збройнік быў слынны, той самы, што з нашае казкі пра Ямелю смяяўся. Няраз я ў доме ў іх бываў, і стральцам наказваў іхняе дворышча не чапаць, і праз князя Пятра Іванавіча Шуйскага, няхай супакоіць Госпад душу ягоную, два разы Еўдакію з бацькам яе ратаваў, калі полацкіх людзей майстравітых у Маскву на вечнае пасяленне выводзілі, і яшчэ раз Валодшу ад вернае смерці ўратаваў, калі пасля бітвы на рацэ на Вуле двое сыноў баярскіх намесніку чалом білі, што той Валодша-збройнік панцыры ім, як і яшчэ некаторым, зрабіў важкія, але ад дзідаў і ад іншае зброі ненадзейныя.

Цяжка мне пра Еўдакію пісаць, бо няма ўжо ні яе, ні Валодшы на свеце. Ратаваў я іх ад жыцця на чужыне, ды ад пошасці ўратаваць не здолеў, што за месяц палову месцічаў полацкіх гэтаю зімою выкасіла і нашых людзей нямала. Калі руку на сэрца пакласці, дык шкадую я часам, што і мяне Бог не забраў, бо тут, у Полацку, мы быццам на бочцы з парахавым прыпасам седзімо.

Няма і не будзе нам на чужой зямлі спакою. Расце вакол нас дзень пры дні нянавісць, так што і мне, які злога полацкім людзям не чыніў, кажуць у вочы, не тоячыся: «Паедзеце хутка ад нас, як князь Скіргайла некалі паехаў, і горш ад яго, бо князя мы жывога выпусцілі, адно да каня спінаю наперад прывязалі, а вас нежывых прывязваць будзем». То і праўда, што нічога мы, апроч няшчасця, воласці Полацкай не прынеслі. Зямля ворная лесам зарастае, пошасць людзей косіць так, што святароў не хапае нябожчыкаў адпяваць, а па Дзвіне на пострах жывым мерцвякі плывуць, бердышамі стралецкімі пасечаныя і да бёрнаў прывязаныя. І бітву над Вулаю мы не праз нядбальства нашае прайгралі, а ліцвіны не адной толькі доблесцю перамаглі, бо сама зямля гэтая супроць нас паўстае.

Але ж і з Айчыны нашай страшнае чуваць. Мусіць, і вам вядома ўжо, што, ад'ехаўшы за месяц да Божага Нараджэння на багамолле, спыніўся гасудар Іван Васілевіч у старым велікакняжым сяле Аляксандравай слабадзе, там, дзе яшчэ бацька ягоны паляваннем бавіцца любіў. І прывёз адтуль ганец царскі ў Маскву дзве граматы, якія перад усім народам чыталі. У першай быў спіс здрадаў дзяржаўных; а паклаў гасудар гнеў на ўсіх — на епіскапаў і архіепіскапаў, на архімандрытаў ды ігуменаў, на баяраў сваіх, і на акольнічых, і на дзякоў, і на дзяцей баярскіх, і на ўсіх прыказных людзей. Адны, паводле яго, здрады і падкопы чынілі, скарб дзяржаўны раскрадалі і супроць непрыяцеля літоўскага ваяваць не хацелі, а другія вінаватых ад яго, гасударавага, слова баранілі. Таму ён з вялікім жалем у сэрцы, не хочучы гэтых здрадаў трываць, царства пакінуў і паехаў у свет вочы, на Божую параду спадзеючыся. А другая грамата ўсяму праваслаўнаму пасадскаму люду сталічнаму пісаная — каб ніякага сумневу ў душах не мелі, бо гневу царскага і апалы на іх няма.

Ведама ж, увесь народ маскоўскі закрычаў, каб прасілі баяры гасудара вярнуцца, а хто будзе за ліхадзеяў і здраднікаў стаяць, яны тых самі пацярэбяць. Паехалі тады выбранцы ад баяраў і ад духоўных у Аляксандраву слабаду, і вялі іх да цара пад вартаю, як варожых выведнікаў. Цар Іван Васілевіч свае крыўды паўтарыў і на царства вярнуцца згадзіўся, але з той умоваю, каб ворагаў па сваёй волі смерцю караць і апрычніну завесці. Ад усёй зямлі Маскоўскай адрэзаў гасудар сабе апрычнае і войска сваё з верных людзей завёў, каб суд правіць. Даюць апрычнікі цару асобую прысягу і пасля яе ніякіх справаў з земскімі, нават і з найбліжэйшымі сваякамі, ужо мець не могуць, апрача справы гасударавай. І носяць усе аднолькавую вопратку, кшталтам той, у якой чарнарызцы ходзяць, а на вопратцы гэтай адмысловыя знакі: мятла — каб здраду вымятаць, і галава сабачая — каб выгрызаць. І шмат каго ў апрычнікі гасудар, успамінамі цешачы-

ся, з тых людзей узяў, што Полацк бралі і волю ягоную крывавую там чынілі.

У той Аляксандравай слабадзе цяпер не раўнуючы як манастыр нейкі сатанінскі і сам цар за ігумена: то з хаўруснікамі віно дарагое п'е, то на малітве ночы навылёт стаіць і тамсама, у храме Божым, каго забіваць, а каго літаваць загадвае. А паміж бяседамі застольнымі ды службамі царкоўнымі ходзіць гасудар у вязніцу і ніколі весялейшы не бывае, чым тады, калі на катаванні сядзіць і пакуты людскія да васьмі гадзін назірае. У Маскве, кажуць, і песню такую пяюць:

А какой улицей ты ехал, батюшка,
Всех сек, и колол, и на кол садил.

Ды самае страшнае, што пяюць яе людзі пасадскія не з жудою халоднаю ў сэрцы ад таго, што найлепшыя людзі гінуць, а з радасцю дзікай і цёмнай. Ад плахаў кроў ручаямі на пляцах цячэ, а гасудар да народа, што на крывавы чын паглядзець прыйшоў, крычыць: «Адкажыце, ці справядлівы суд мой?» І народ у тысячу глотак справядлівасць царскую славіць.

Сякуць у нашай Айчыне галовы так лёгка, як блазнюкі дручкамі шышкі з бадзякоў збіваюць, у пацешную вайну гуляючы. Гасудар верных заве пераветнікамі, хрысціян — чарадзеямі, а святло — цемраю. Дзяцей непаўналетніх на бацькоў даносіць прымушаюць, а потым і забіваюць у мацярок на вачах. Усіх князёў ды баяраў ужо змусіў цар халопамі ягонымі называцца ды падпісвацца, але мала яму гэтага прыніжэння і страху. Стукаюць уначы слугі царскія ў дзверы, і без следу людзі прападаюць, а шмат хто ў адзенні і спаць кладзецца, сваёй долі чакаючы.

Кажуць, і з аблічча цар перамяніўся: злосць ды смага крывавая з'елі ўсе чыста валасы на галаве, а вочы ў цемры, як у звера, свецяцца. Харчуецца гасудар чалавечаю плоццю ды крывёю, не толькі пра пост, але і пра Бога забыўшы. Дый тое, мусіць, вам лепей за мяне вядома, аднак чую і я ў душы патрэбу сваё слова сказаць.

Трывожуся за вас, матухна мая і бацюхна і ты, брат мой Глеб, і думаю ў страху: ці не намысліў гасудар

Іван Васілевіч новую пароду людзей у нашай дзяржаве вывесці? Такіх людзей, якія да штодзённых стратаў прылюдных і здзекаў таемных з істоты чалавечае прывычныя будуць, і да таго, што жыццё людское меней за медны грош каштуе, такіх, што без даносаў адзін на аднаго жыць не змогуць, такіх, што казаць будуць не тое, што думаюць, а думаць не тое, што сказалі, такіх, што з рабствам сваім так зжывуцца, што мацней за волю яго палюбяць, такіх, што смерць будуць прымаць і ў курчах смяротных за катаў сваіх маліцца, як той баярын, які, на палю бязвінна пасаджаны, яшчэ цэлы дзень жыў і, пакуль душа не адляцела, паўтараў: «Жыццё маё — нішто, толькі б цар-бацюхна жывы быў!»

Калі ж удасца цару і вялікаму князю Івану Васілевічу такую пароду людзей у Айчыне нашай завесці, будуць яны і гасудароў сабе паводле свайго рабскага разумення хацець, так, што, калі й пашле нам Бог цара розумам светлага і дабрачыннага, не здолее ён ужо гэтага народа змяніць, а хутчэй сам народ яго на свой капыл пераробіць.

Пішуць пра гасудара летапісцы крывадушныя, што муж ён дзіўнага розуму, у навуцы кніжнай абазнаны і красамоўны вельмі. Але слёзы бязвінных ахвяраў рыхтуюць ужо кару мучыцелю свайму. Загубленыя ім жывуць на небе і ля пасада Гасподняга патрабуюць адплаты. Не будзе гасудару нашаму ні даравання, ні літасці на Страшным Судзе, чакаюць яго ў апраметнай саганы са смалою і агонь вечны.

Набліжаецца грамата мая, няраз слязьмі краплёная, да заканчэння, і хачу вам на адвітанне тое сказаць, што нікому болей даверыць не магу. Чуюся я, бацькі мае любыя і брат малодшы Глеб, як паміж двух агнёў: і тут заставацца ад нянавісці людзей полацкіх боязна, і ў Айчыну, якую гасудар крывёю залівае, вяртацца страшна. Таму малюся, каб не судзілі вы мяне сувора і за пераветніка не мелі, калі надумаю ў літоўскую старану падацца.

Ёсць на гэта і яшчэ адна прычына блізкая: узахвоціўся да мяне ні з пушчы ні з поля сын баярскі Мікалай Скапцоў з віном зялёным вечарамі заходзіць.

Сядзіць да позняга і ўсё размову на Аляксея Фёдаравіча Адашава пераводзіць ды на князя Андрэя Міхайлавіча Курбскага і гасудара без меры зласловіць. Вельмі мяне тыя размовы турбуюць, бо пачалі ўжо і ў нас, у месце Полацкім, людзі царскія служылыя прападаць, і часам здаецца ўначы, што і я нейкія крокі блізкія ды таемныя чую — ці то ліхі чалавек вакол дома ходзіць, ці то сама смерць. А паехаў я ўчора на чоўне самоў на смажаных жаб палавіць і вялікага страху нацярпеўся: зірнуў з чоўна, а там, пад вадою, пры беразе, сын баярскі Пятро Сівушын на поўны рост з каменем, да ног прывязаным, стаіць, і шчупакі ўжо твар яму пад'елі. Даруй, матухна мая, калі ўлякнуў цябе словамі гэтымі.

Так і жыву ў страху і грамату гэтую ад чужых вачэй у надзейным месцы перахоўваю, чакаючы, калі можна будзе яе з верным чалавекам пераслаць, і малюся, каб не трапіла яна да чужых рук, а як будзе на тое воля Божая, дык няхай лепей у рукі ворагаў нашых трапіць. І малюся за вас, любыя мае бацькі і брат Глеб, просячы Госпада даць вам жыццё доўгае і спакойнае, і сам у малітвах дух свой мацую і ад Усявышняга рады чакаю.

З тым і застаюся сын і брат ваш Аляксей.

Пісана ў месце Полацкім лета 7073, а ад нараджэння Божага 1565 месяца ліпеня.

1989

Тры мужы спадарыні Дамінікі

Мінулае начы ў табары зноў бачылі Белагаловую. Яна прыходзіла ўжо трэці раз і забрала трэцяе жыццё. Пярэпалах сярод нямецкіх наймітаў, прысланых маркграфам магдэбургскім, узняўся раніцою, калі недалічыліся рыцара Зігфрыда фон Бока. Ягоны намёт стаіць побач з абозам караля і вялікага князя, значыцца, Белагаловая прайшла зусім побач.

Першым і другім яе абраннікамі былі вугорцы. Тыя браты-блізняты, што не пахавалі Белагаловую разам з астатнімі, а павезлі яе ў лес.

У маім намёце напалена, але з-пад драўлянага насцілу падлогі цягне холадам і нязводнай вільгаццю. Калі прылегчы на край ложка і накінуць зверху ўлюбёную посцілку з павамі, робіцца прытульней.

Я апускаю павекі і вяртаюся ў той адвячорак, калі да Полацка нам заставаліся два дзённыя пераходы. Наперадзе, пракладаючы шлях у прыбярэжным зарасніку, ішла вугорская пяхота, але першымі ўбачылі плыты з людзьмі дазорцы полацкага кашталяна Юрыя Зяновіча. Нашы жаўнеры кінуліся ў ваду, не сыходзячы з коней, і хутка павыцягвалі малыя, на чатыры бервяны, плыты на бераг.

На плытах прыплылі два дзесяткі мерцвякоў. Яны ляжалі на беразе, зусім голыя або трохі прыкрытыя мокрымі лахманамі, з аднолькавымі смяротнымі ранамі злева, дзе сэрца. Гэта былі мужчыны — сівабародыя і бязвусыя, мажныя і сухарлявыя, цёмнавалосыя і русявыя. Кожны быў намёртва прыпяты да бёрнаў вяроўкаю з конскага воласу, нібыта яшчэ мог пасля ўдару ў сэрца ўваскрэснуць і ўратавацца. А можа, іх спачатку прывязвалі, а потым ужо разлучалі з жыццём?

Я паволі ехала ўсцяж вусцішнага тагасветнага шыхта, і мой малады буланчык палахліва раздзьмуваў ноз-

дры, усхрапваў і адварочваў галаву. На тварах і ў ашклелых вачах нябожчыкаў мой позірк не сустракаў ні страху, ні болю, ні благання пра літасць. Яны глядзелі на жывых спакойна і без ніякае зайздрасці — пэўна, па дарозе паспелі прывыкнуць да свету мёртвых.

За гэтыя гады я звыкла да жахаў вайны. Я бачыла целы без скуры, бо немцы часта здзіралі з забітых чалавечы тлушч, маючы яго за найлепшы сродак гаіць раны. Я бачыла закатаваных маскавітамі немцаў: звязаўшы палонніку рукі, стральцы ранілі яму жывот і ўсё цела так, што ўтвараўся суцэльны панцыр з ранаў. Мне даводзілася бачыць касцякі палонных, якіх маскоўскія ваяводы загадалі зварыць жыўцом у вялізных саганах. Пад Дзісною пан Каспар Бекеш паказаў мне жудлівую грону павешаных на запаведным дубе маладзіц, на якіх царскія татары практыкаваліся страляць з арбалетаў, цаляючы ў грудзі і ў пупок.

Чалавек да ўсяго прывыкае, але ў тую хвіліну, каля плытоў на дзвінскім беразе, нечая невідочная рука так перацяла мне горла, што я не адразу здолела выдыхнуць. Ад краю, поруч з маладзёнам, якога перад смерцю катавалі, бо ён не меў левага вуха, а правая яго рука выдавала на крывавую аладку, поруч з гэтым маладзёнам, на вуснах якога застыгла ўсмешка нянавісці, ляжала прывязаная да таго самага плыта маладая жанчына.

Мусіць, то вялікі грэх, але я падумала, што яна, гэтая жанчына ці мо дзяўчына, бо шлюбнага пярсцёнка на руцэ ў яе не было, прыгажэйшая за мяне. На яе зусім жывым твары яшчэ не пагас румянак. Саскочыўшы з каня, я нахілілася і, намагаючыся не глядзець на маленькую ранку пад левай грудкай, зазірнула ў яе зялёныя расплюшчаныя вочы. Яны дзівілі глыбінёю і глядзелі ў неба ўважліва і спакойна.

У надзвычай светлых, быццам прыпудраных мукою, валасах, густых і даўгіх, падобных гэтым да падводнае травы, якую ў нас называюць русалчынымі косамі, заблыталася серабрыстая рыбка. Рыбка была жывая, і мне заманулася вызваліць яе і выпусціць у ваду, аднак мая рука спынілася. Здалося, што гэта

не проста рыбка, што ў серабрыстай бліскаўцы тоящца апошнія кроплі дзяўчынінага жыцця.

На Белагаловай, як і на іншых, не было адзення, і я падумала, што ў нас з ёю падобныя постаці, адно яна трошкі вузейшая ў клубах. І зноў мяне ўтнула адчуванне грахоўнасці параўнання. Я зняла сваю адамашкавую накідку; яе хапіла, каб прыкрыць Белагаловую ад налітых высокіх грудзей да костачак.

Якраз тады і пад'ехаў кароль з почтам. Віленскі ваявода Мікалай Радзівіл запытаўся, ці не мелі нябожчыкі выпадкам пры сабе якіх-небудзь пісаных іхнімі забойцамі граматаў, а тады распарадзіўся пахаваць усіх, паклікаўшы ксяндза, бацюшку і кальвінскага святара, бо ў адных прыплылых былі на шыі крыжыкі праваслаўныя, у другіх — рымскія, а трэція, як Белагаловая, не мелі ніякіх. Ніхто не сумняваўся, што плыты — з Полацка, а пусцілі іх насустрач нашаму войску царскія ваяводы.

Нехта з жаўнераў-палачан пазнаў сярод забітых суседа, а нехта — роднага брата. У закатаванага брата былі адсечаныя на руках усе пальцы, і жывы брат прысягнуў на крыжы, што за кожны палец маскавіты заплоцяць галавой.

Але найстрашнейшая навіна прыйшла ў мой намёт назаўтра. Юста, якая прыслугоўвае мне ад пачатку паходу, расказала, што на берагавой строме пахавалі не ўсіх людзей з плытоў. Пакуль чакалі святароў, двое вугорцаў-блізнятаў забралі Белагаловую і выправіліся ў лес. Увечары яны хваліліся, што нацешыліся лепей, чым з жывою, і пакінулі яе на начлег, прывязаўшы ад звяроў на бярэзіне, каб уранні наведацца туды зноў. Толькі раніцой аднаму з іх ужо нічога не жадалася, бо яго знайшлі каля вогнішча цэлага-цалюткага, без драпінкі, але нежывога. Не зважаючы на гэта, ягоны брат-блізнюк усё адно вырушыў з сябрукамі ў лес, ды Белагаловай на дрэве яны не знайшлі. Затое сустрэлі на сцежцы сляды босых ног.

Другога вугорца Белагаловая забрала ўжо тут, у нашым вайсковым табары пад Полацкам. Трэцім стаўся немец фон Бок. За што гэткі лёс напаткаў нямец-

кага рыцара? Юста кажа, што ў Дзісне ён хацеў узяць на гвалт жонку майстра-залатара. Той стаў на парозе са зброяю і склаў галаву пад двухручным рыцарскім мячом, але памёр з гонарам, абараніўшы сваю жанчыну ад знявагі.

Мой гаспадар, мой трэці нявенчаны муж, кароль і вялікі князь Стэфан, не верыць у Белагаловую, але ж хіба не сам апавядаў пра ўваскрэслых наўцоў, якіх у яго на радзіме, у Семіграддзі, гэтак шмат, што, бывае, у самога трансільванскага князя збіраецца на балю поўны чортаў тузін. Нездарма ж яго мосць паўсюль возіць з сабою вялікі вянок з часныку, што надзейней за любую малітву дапамагае ад пярэваратняў і вампіраў-крывасмокаў. Гэткі сама, толькі меншы вянок вісіць і над маім ложкам.

Не, я не баюся Белагаловай, але гэтымі днямі яна ўсё часцей заваладвае маімі думкамі.

Калі паміж маім і яе векам і ёсць розніца, дык усяго нейкі год ці два. Значыцца, малыя — каб ейныя бацькі таксама жылі ў Запалоцці — мы маглі разам гушкацца з заміраннем душы на той вярбіне, што каля бацькавага млына вымыкала над хуткай Палатой доўгую спружыністую галіну, або — сорам успомніць — маглі, прысеўшы на стромкім беразе, мерацца з хлопчыкамі, хто далей сікне ў рачную плынь.

Калі сталася вядома, што маскоўскі цар ідзе з незлічонай ардою на Полацк, я мела шэсць гадоў. Пасля Калядаў тата запрог коніка ў лёгкія сані, і прыцемкам гнеды ўжо хрумстаў авёс у татавага брата Ціхаміра. Дзядзька Ціхамір таксама трымаў млын, а жыў пры маёнтку пана Корсака за сорак вёрстаў ад Полацка, як ехаць старым Вітаўтавым шляхам на Вільню.

Дзядзька намаўляў тату, каб забіраў маю маму, Агату, і сам атайбоўваўся, пакуль мінецца ваеннае ліхалецце, у пана Корсака. Маўляў, як возьме маскоўскі цар Іван места Полацкае, літасці нікому чакаць не выпадае. Гэты цар і сваіх людзей без віны і суду карае, нават найзнатнейшых баяраў кліча халопамі і проста ў застоліцы сваімі ж рукамі, бывала, рэзаў да смерці.

Але тата не паслухаўся. Сказаў на братавы ўгаворы, што млын яго абароніць, бо мука трэба ўсім — і сваім, і чужаніцам. Ускудлаціў мне валасы, паабяцаў прыехаць на Вялікдзень і два разы з саней азірнуўся. Болей я ні таты, ні мамы не бачыла і, відаць, спаткаюся з імі ўжо ў чыстцы ці на небе. Калі не засталіся яны ў сумётах на тых зімовых дарогах, якімі гналі полацкі палон у Масковію, то ўсё роўна наўрад вернуцца. Нешта не чуваць, каб хтосьці з нашых адтуль вяртаўся. Адзін полацкі ваявода Станіслаў Давойна праз чатыры астрожныя гады выкупіўся за дзесяць тысяч чырвонцаў, жонка ж ягоная, Пятронія з Радзівілаў, так і загавела душой на маскоўскіх харчах у няволі.

Праз месяц, як тата пакінуў мяне, людзі з маёнтка пана Корсака ўбачылі аднойчы ўначы на небе ў тым баку, дзе Полацк, крывавую паланіцу. Толькі на трэцюю ноч неба пагасла, а раніцой змораны конь прывёз па Вітаўтавым шляху ўчарнелага з твару чалавека, што, ссунуўшыся з сядла, адразу заснуў на руках у слугаў. Спаў цэлы дзень і цэлую ноч, а прачнуўшыся, папрасіў есці і, выпіўшы мёду-трайняку, нарэшце загаварыў.

Цар Іван здабыў Полацк пасля двух тыдняў аблогі і, парушыўшы абяцанне, палоннымі абвясціў не адных вайсковых, а ўсіх палачанаў. Месцічаў рымскае веры стральцы пасеклі, юдэяў патапілі пад лёдам у Дзвіне і Валовай азярыне, а праваслаўных узяліся выводзіць у няволю.

У той дзень цётка Арына карміла мяне салодкімі наліснікамі і называла дачушкай, а я злавалася і казала, што няпраўда: маці маю завуць Агатаю, а бацьку — Цыпрыянам.

Мінуўся Вялікдзень, на Сёмуху патрусілі ў хаце падлогу пахкім аерам, а бацька па мяне ўсё не ехаў. Перад яблычным Спасам дзядзька Ціхамір сеў на свайго дэраша і вырушыў у той бок, адкуль узыходзіла сонца.

Не знайшоў ён у Полацку ні нашага млына, ні маіх бацькоў і сказаў, што буду я цяпер за дачку ім з цёткай Арынаю, якім сваіх дзяцей Бог не даў.

Адтуль сплыло шаснаццаць гадоў, а я дагэтуль памятаю смак сваіх слёз і печаных яблыкаў, якія тады ела.

Плакала, але ела, бо надта ж любіла такія яблыкі, асабліва калі цётка Арына палівала іх ліповым мёдам.

Дождж цурболіць за скураю намёта, не даючы сабе ні хвіліны спачыну.

За ўсе дні аблогі сонца так і не выбліснула. Лужыны стаяць нават у сенатарскіх намётах. Яго мосць кароль і вялікі князь кажа, што дождж трапляе жаўнерам у кроў і робіць яе радзейшаю.

Па табары паўзуць чуткі, быццам залевы насылаюць нанятыя царом маскоўскія чараўнікі. Пяцёра з іх ужо разлучыліся з жыццём. А можа, гэта былі гэткія самыя чараўнікі, як той, якога ўчора злавілі каля свайго абоза палякі? Юста чула, як ён бажыўся, нібыта ніякі не царскі вядзьмак, а тутэйшы чалавек. І сапраўды, гаварыў чыста па-наску і да апошняй сваёй хвіліны чытаў пацеры. Яго мосць Мікалай Дарагастайскі, едучы паўз абоз, спрабаваў заступіцца за нешчасліўца, ды палякі не паслухаліся полацкага ваяводы-кальвіна*. Праўда, пастанавілі абысціся без катаванняў — сцягнулі адным вузлом рукі з нагамі і ўкінулі ў Палату, каб сам Пан Езус разабраўся, дзе гэтай душы месца: у пекле ці ў раі...

А на дварэ тым часам лінула як з цэбра, быццам сапраўды цвердзь нябесная раскалолася.

Зноў будуць захрасаць у глыбачэзнай гразі вазы з харчам і гінуць у балотах абозныя коні. Ніхто не памятае такіх коштаў на правіянт і фураж. Асьміну аўса прадаюць за дзесяць талераў, і хутка будуць купляць яго толькі каралеўскім каням. Вільня не можа прысылаць правіянту, бо замак Суша на Віленскім шляху яшчэ трымаюць маскоўцы. У руках у царскіх людзей застаецца і замак Сокал, адкуль вораг робіць вылазы на Дзісенскую дарогу. Сам кароль, апрача таго, што ядуць простыя жаўнеры, дазваляе сабе адно пару яек.

У табары пахне голадам. Кажуць, палякі паціху пачынаюць есці конскую падлу. Немцы-найміты, што звыклі ваяваць на ўрадлівых землях сярод багатых гарадоў, пакутуюць найболей і спрэс хварэюць на крыўку. Нашы, ліцвіны, трымаюцца стойка, але вытрываласцю пераўзыходзяць усіх вугорцы пана Каспара Бекеша. Ён днюе і начуе каля сваіх гарматаў, там есць, спіць і заўсёды ў такой небяспецы, што няраз бываў абпырсканы крывёю тых, хто гінуў побач.

Днямі ён прыязджаў да караля і прывёз мне барылку чырвонага вугорскага віна, якое добра піць у такое надвор'е гарачым, зварыўшы з цукрам, гваздзікай ды лаўровым лістам і абавязкова дадаўшы шчопаць цынамону. Твар у пана Каспара зжаўцеў, як стары пергамен. На пытанне караля пра здароўе сказаў, што ніколі не пачуваўся лепей і што ягоная пяхота рвецца на прыступ. Але маю душу сціснулі кіпці благога прадчування — не так праз пергаменавыя лоб і шчокі, як праз некалі бяздонныя вочы пана Каспара, дзе я раптам убачыла зусім блізкае дно, гэткае ж, як некалі ў маладога пана Багуслава, майго першага нявенчанага мужа.

Юстына, Юста, клічу я і загадваю пахолцы згатаваць гарачага віна, каб выпіць за супакой душы майго Богуся, а таксама за душы цёткі Арыны і дзядзькі Ціхаміра, што пакінулі гэты свет яшчэ раней. Неба забрала іх, калі ў Полацкім ваяводстве лютавала занесеная маскоўцамі чума, што выкошвала цэлыя вёскі, і не хапала святароў, каб адпяваць нябожчыкаў.

Стары пан Літавор Корсак загадаў пасля дзядзькавай смерці забраць мяне ў маёнтак. Ім з пані Мальгрэтаю было сумна ў гасподзе без дзяцей. Адзіны сын вучыўся ў Італіі і вярнуцца абяцаў толькі праз два гады.

Вайна тымі часамі прыгасла. Маскавіты сядзелі ў Полацку ды па сваіх замках. Найбліжэйшы ад нас замак, Туроўля, стаяў за трыццаць вёрстаў, а гэтак далёка ў бок Вільні царскія ваяводы хадзіць пасля сечы на рацэ Вуле не наважваліся. Тады, праз год пасля страты Полацка, найвышэйшы гетман літоўскі Мікалай Радзівіл ушчэнт разбіў войска ваяводы Пятра Шуйскага. Дзесяць тысяч маскоўцаў палегла на берагах Вулы ад ліцвінскіх куляў і шабляў, ды не меней, казаў пан Літавор, патанула.

Жыццё ў маёнтку плыло спакойна, як вада ў Дзвіне. Я дапамагала пані Мальгрэце гаспадарыць. Увечары

* Кальвініста.

стары пан Корсак зазвычай ладзіўся пры каміне і прасіў пачытаць яму, каб уначы саснілася што цікавае. Я чытала «Баву-каралевіча», «Трышчана», а найчасцей — «Александрыю», кнігу пра македонскага цара, якому праглася зваяваць увесь свет.

Асабліва любіў пан Корсак слухаць аб прыгодах цара Аляксандра ў Індыі. Тая далёкая Індыя чамусьці ўяўлялася яму надта падобнай да Італіі. Відаць, пану Корсаку, які ніколі не ездзіў далей Вільні, прыемна было думаць, што сыну могуць выпасці гэткія ж дзівосныя авантуры, як і старажытнаму цару.

Чытаць і пісаць я навучылася яшчэ ў дзядзькавым доме, адтуль прынесла з сабой і кнігу, што дала мне першую навуку. Кніга называлася «Юдзіф» і пачыналася са страшнай рыцыны*, якой я, малая, доўга баялася. На рыцыне ўдавіца Юдзіф у адной руцэ трымала меч, а ў другой — адцятую галаву акрутнага вавілонскага намесніка Алаферна. Там была таксама пахолка, трохі падобная да маёй Юсты, што падстаўляла пад вусцішную галаву мех. Разоў колькі той малюнак мне сніўся, палохаючы яшчэ болей. У сне рыцына ажывала: Юдзіф з пахолкаю выходзілі з яе, не раўнуючы як з карэты, а вусатая галава забітага вавілонца шалёна круціла налітымі крывёю вачыма і брыдка лаялася па-маскоўску.

Пэўна, дзядзькава кніга каштавала немалых грошай, бо пан Літавор забраў яе ў свой паляўнічы пакой, дзе на сценах былі паразвешаныя ласіныя ды турыныя рогі, а ў дубовай шафцы леваруч дзвярэй заўсёды стаяў поўны штораніцы і пусты надвечар штоф з вішнёўкаю.

Неяк стары Корсак, вярнуўшыся з Вільні, прывёз вучонага габрэя Гіршу, чалавека з сівымі пейсамі і маладымі вачыма. Гірша ўзяўся навучаць мяне нямецкай мове і лаціне. На той час мяне перахрысцілі ўжо ў рымскую веру, і з Домны я ператварылася ў Дамініку. Гірша і пачаў свае ўрокі лаціны з таго, што патлумачыў маё імя: Дамініка — значыць нядзеля. Пан

* Гравюры.

Багуслаў пазней і зваць мяне так будзе — спадарыня Нядзелька.

Мне споўнілася чатырнаццаць гадоў, і мае дабрадзеі Корсакі вырабілі паперы, што прымаюць мяне ў сям'ю на правах дачкі. Пані Мальгрэта пачала клапаціцца пра мае ўборы і сказала, што зробіць з мяне сапраўдную шляхцянку, якую не сорам будзе паказаць самому каралю і вялікаму князю Жыгімонту Аўгусту.

Юста нясе кубак гарачага духмянага віна. Налі сабе, Юста! Выпі за свайго Рыгора, што служыць у ваяводы Дарагастайскага.

У нашых гаворках Юста, трымаючыся старога ліцвінскага звычаю, аніколі не называе нарачонага на імя. Калі мужчына на вайне, лепей пакінуць ягонае імя адно ў думках, бо іначай ваяр пачуе яго ў небяспечную хвілю, азірнецца, забыўшыся на асцярогу, і спаткаецца са смерцю.

Ну, Юста, каб куля мінала і шабля не брала!

Віно грэе і трошкі кружыць голаў. Калі адкінуцца на падушкі і прымружыць вочы, зусім лёгка вярнуцца ў той дзень, як мы з панам Багуславам спаткаліся каля Вітаўтавых талерак. Так зваўся валун паблізу маёнтка. Там, на беразе возера, калісьці спыняўся палуднаваць гаспадар Вітаўт Кейстутавіч з войскам. Стуль нібыта і засталіся ў камені глыбокія ямкі-талеркі.

Я любіла гуляць пры Вітаўтавых талерках — і малая, і калі падрасла. Там хораша было плесці вянкі з красак, або ўяўляць высокага дужага князя Вітаўта ў рыцарскім панцыры, або проста, схаваўшыся ад усяго свету, мроіць пра нешта такое, чаму ў чалавечай мове яшчэ няма наймення. Цёплыя дажджы напаўнялі каменныя талеркі вадой, і туды можна было пускаць апалонікаў і плямістых жабак. Або можна было проста глядзецца, як у люстэрка, хоць у тую пару такога люстэрка мне ўжо не хапала.

За вясну і лета я дзівосна перамянілася. Грудкі нібы прачнуліся: выраслі, яблычна акругліліся і, як у Юдзіфі з маёй кніжкі, прасіліся са шнуроўкі на волю. Клубам было цесна ў старых сукенках і андара-

ках. Мая скура зрабілася ядвабнаю, а постаць як быццам да краёў налілася сокам.

Уранні і ўвечары я зачынялася ў спачывальні на зашчапку і з усцешлівым недаверам разглядвала сваё новае цела ў срэбным люстэрку. Я любіла лашчыць яго рукамі, асцярожліва дакранаючыся да смочак і да пупка, у якім затаілася радзімка. Аднойчы рука слізганула ніжэй, туды, дзе пасля зімы з'явіўся густы светлы пушок, і яшчэ ніжэй, дзе было горача і вільготна і дзе звіло гняздо салодкае чаканне.

Молячыся перад тым, як легчы ў ложак, я прасіла ў Дзевы Марыі спакойных і чыстых сноў, але і сны да мяне прыходзілі новыя, і ад іх я почасту прачыналася сярод ночы і ўжо не магла заснуць, пакуль пальцы самі сабой не апыналіся ў трапяткім міжножжы...

Такою я была ў тое лета, калі адышоў у лепшы свет пан Літавор Корсак і з Італіі вярнуўся малады пан Багуслаў.

Тады таксама канчаўся жнівень, але цёплы, з зарніцамі і зарападамі. У той дзень недзе ў пушчы за далёкім азёрным берагам спела, грукочучы невідочнымі жорнамі, навальніца. Яе начная папярэдніца да краёў наліла Вітаўтавы талеркі, і я раз-пораз пырскала з іх сабе ў твар, каб змыць хваляванне, што не пакідала мяне ад самае раніцы.

Калі я адыходзіла з дому, пан Багуслаў, скрыжаваўшы, паводле завядзёнкі, рукі на грудзях, глядзеў мне ўслед з адчыненага вакна. Ягоны позірк не адпускаў і цягнуўся па-над утравелаю сцежкай, нібы нітка з клубка ў маім кошыку.

Я ведала, што па гэтай невідочнай нітцы ён пойдзе шукаць мяне і неадменна знойдзе.

Прыхінуўшыся да нагрэтага сонцам валуна, я, здаецца, на хвіліну задрамала, а калі прахапілася, ён ужо стаяў насупроць у высокай траве сярод рамонкаў. Ён вельмі нагадваў князя Вітаўта з маіх мрояў, толькі заміж рыцарскага панцыра на ім была белая, як лебядзінае пяро ў яго на стале, расшпіленая на грудзях кашуля і нетутэйшыя шчыгульныя нагавіцы з зялёнага фаляндышу. Каб не разарвацца, маё сэрца падзялілася на безліч маленькіх сэрцаў, якія калаціліся ў розных кутках мае істоты, што была перапоўненая і сілаю і знямогай.

Пан Багуслаў апусціўся побач на траву, узяў мяне за руку і сказаў заплюшчыць вочы. Далей усё адбывалася так, быццам перад маім высокім люстэркам, толькі мяне распраналі і лашчылі ўжо не мае, а мужчынскія рукі. Яны аднекуль ведалі, што смочкам даспадобы, калі іх трошачкі сціснуць. Яны хутка знайшлі схаваную ў пупку радзімку. Яны казыталі пушок унізе жывата і прабіраліся далей. А потым мяне пакінула разуменне таго, што адбываецца, бо цела трапіла ва ўладу ўжо не рук, а ягоных вуснаў, якія паўтаралі ўвесь шлях, пройдзены рукамі...

У той дзень я стала пану Багуславу нявенчанай жонкаю.

Дадому мы вярнуліся разам. Трапіўшы пад навальнічную залеву, прамоклі да апошняй ніткі, і гэта дапамагло мне збольшага адолець сорам, хоць на вячэры я баялася сустрэцца вачыма і з панам Багуславам, і з пані Мальгрэтаю, якая, мне здавалася, усё чыста разумела, ды так яно, пэўна, і было.

Уначы навальніца вярнулася, і, калі першыя кроплі залапаталі па лісці старой яблыні-пепінкі пад маім акном, дзверы ў спачывальню адчыніліся. Пан Багуслаў прысеў на ложак, запытаўся, чаму я не зашчапіла дзверы, і ціха засмяяўся.

У далёкіх краях разам з сямю вызваленымі навукамі ён спасцігаў і навуку любоўную. Ужо ў нашу першую ноч не розумам, але сваёй жаночай існасцю я зразумела, што такі мужчына — як дарагі падарунак Фартуны.

Пан Багуслаў расказваў мне пра італійскага мастака Рафаэля. Той кахаў жанчыну, якую ўсе звалі Фарнарына, што значыць булачніца, хоць яна мела і прыгожае сапраўднае імя — Маргарыта. Яна нарадзілася ў простай сям'і, аднак мастак, роўнага якому знайсці амаль немагчыма, маляваў з Фарнарыны мадоннаў. Калі яе не было побач, Рафаэль не мог закончыць ні карціны, ні фрэскі. Але Фарнарына не

ведала, што такое стома ў любоўных уцехах, і слабы на здароўе мастак увачавідкі таяў і сканаў, не дажыўшы да сарака гадоў.

Маладому пану Корсаку такая смерць не пагражала. Я не Фарнарына, аднак я таксама любіла гэтую асалоду, у якой растаеш, быццам кінутая ў студню драбінка солі.

Яму падабаліся мае грудзі, і ён зваў іх то вінаграднымі гронкамі, то танкаруннымі козачкамі, то келіхамі з амброзіяй. Ён кожны раз доўга цалаваў іх — і проста так, і змазаўшы смочкі верасовым мёдам, якім аднаго разу напоўніў мне найпатаемнейшае месца, каб выпіць яго і давесці мяне да салодкага нябыту толькі вуснамі і языком.

Удзень ложам служыла нам трава каля азёрнай затокі са сціжмаю сініх, смарагдавых і бурштынавых стрыбавак. Неяк ён зрабіў з белых лілеяў каралі і надзеў мне на шыю. «Ты русалка, а русалак трэба любіць вось так». Сказаў і, ласкава павярнуўшы да сябе спінаю, рассунуў мне крумянкі. Я думала, ён памыляецца, а ён хацеў менавіта гэтага...

А ноч зноў зводзіла нашы целы і душы — то ў маёй спачывальні, то ў ягонай, дзе драўляныя львы трымалі ў лапах старое люстра з вясёлкавымі разводамі. Пан Багуслаў падводзіў мяне да львоў і запальваў кандэлябру. «Ва ўсёй Італіі не знойдзеш карціны прыгажэйшай...»

Там, перад люстрам, ён зазвычай і пачынаў любіць мяне. Гэта было дзівосна: бачыць яго маладую постаць і набрынялую жаданнем плоць, назіраць і адчуваць, як ён уваходзіць у мяне, бачыць на сваіх клубах або на грудзях ягоныя прыгожыя ўмелыя рукі... Ён любіў, калі я цалавала яго мужчынскае месца і высмоктвала з яго белую кроў, якую ён называў эліксірам маладосці.

Часам ён палохаў мяне, кажучы, што там, у глыбіні люстраў, нараджаюцца прывіды...

Ён клікаў мяне то Нядзелькаю, то Домначкай, як мама ў дзяцінстве. Як і той італійскі мастак са сваёй каханкаю, ён не любіў разлучацца са мною.

Упершыню ён узяў мяне з сабою ў Вільню на рыцарскія баі. Тады ў нашу ліцвінскую сталіцу з'ехаліся рыцары з дзесяці краінаў. Пан Багуслаў перамог паляка і немца, аднак не адолеў француза, што выбіў яго з сядла, моцна пагнуўшы прылбіцу. Праз гэта мой Богусь цэлы тыдзень хадзіў змрочны, як на памінках, і адпусціўся ўжо дома каля сваіх ільвоў. На паядынак выходзіў і сам вялікі князь і кароль Жыгімонт Аўгуст.

Але найцікавейшым і найвесялейшым стаўся жартоўны бой, дзе адразу з двума ліцвінамі білася ў поўнай рыцарскай брані віленская дзеўка-выляжанка Зоська Доўгая.

Перад тым падарожжам мы заручыліся. Пані Мальгрэта пакрысе рыхтавалася да вяселля, але Богусь хацеў дачакацца канца вайны.

Дзесьці паблізу намёта ўсчынаецца вэрхал і разоў колькі спалохана бахае рушніца. Няўжо прыйшла госця з зялёнымі вачыма і маленькай ранкаю пад сэрцам? Каго і за якія грахі яна забярэ цяпер?

Не, трывога ў табары хутка ўтаймавалася, але ўсе мае думкі ўжо пра яе, Белагаловую.

Юста заснула на сваім куфры каля ўвахода, і я сама падліваю ў кубак віна. Я не страшуся Белагаловай, бо не чую за сабой аніякага граху перад ёю. Не можа ж яна пакараць за таго баярскага сына, ад якога смярдзела зялёным віном і псінаю і які пасля маёй пачосткі заснуў вечным сном.

Тады прыдаўся пярсцёнак, што пакінуў мне перад сконам мой першы нявенчаны муж, мой незабыўны Богусь.

Не трэба баяцца Белагаловай. Трэба маліцца, каб яна пакінула наш стан і пайшла ў Полацк. Каб помсцілася там. Каб знайшла забойцаў — сябе самой і таго бязвусага маладзёна са знявечанай рукою, з якім плыла па Дзвіне на адным плыце. Яны маглі кахаць адно аднаго, і той юнак мог дарыць Белагаловай такую ж асалоду, як мне мой Богусь. Мо яны былі разам і тады, калі на дзвінскім беразе ўжо чакалі плыты, а царскія стральцы гойсалі па полацкіх вуліцах, шукаючы ахвяраў.

Я пачуваюся вінаватаю перад Белагаловаю, бо ўсе гэтыя гады жыла на волі і пачала забываць Полацк і бацьку з маці, хоць аніколі не заснула, не памаліўшыся за іх. І горад, і твары бацькоў, і скляпенні святое Сафіі, куды мы хадзілі на Вялікдзень, паўстаюць увачча ўжо быццам праз слюдзяное вакенца або праз пералівістае мярэсціва, што некалі вісела ў скварныя дні над маім запаветным каменем каля возера.

Мне мроіцца, што Белагаловая пражыла ў захопленым горадзе частку жыцця, наканаванага мне, і наўзамен мяне спаткала там смерць. Цяпер замест яе засталася жыць я. Але і яна пакуль не пайшла з гэтага свету назусім. Яна недзе блізка, і я прашу яе ісці ў Полацк і дапамагаць нам за гарадскімі сценамі.

Пакарай ваяводаў, што пусцілі па Дзвіне страшныя плыты! Пакарай пастаўленага Масквой епіскапа Кіпрыяна, што загадаў паліць старыя полацкія кнігі і граматы, якія бераглі ў Сафійскім саборы з часоў ігуменні Еўфрасінні!

Ты чуеш мяне, Белагаловая? Цяпер тваё месца ў Полацку. Хадзем, я пакажу табе дарогу! Ужо развіднела, але ж табе не трэба чакаць цемры, каб схавацца ад варожых вачэй.

Вартавыя не заступаюць шляху, а жаўнеры, што даўно не бачылі жанчын, не распранаюць нас прагнымі позіркамі. Я дала Белагаловай сукенку з кармінавага люндушу, што пан Багуслаў падараваў мне ў Вільні, выйграўшы бой у нямецкага рыцара.

Я вяду яе ад Дзвіны да Валовае азярыны, праз нямецкі і прускі абозы. За азярынаю, дзе некалі, кажуць, стаялі паганскія бажніцы Перуна і Бабы Ягі, пачынаецца каралеўскі стан. Я паказваю Белагаловай, дзе жывём мы з Юстай, дзе намёт караля і вялікага князя Стэфана, вакол якога густа, у тры рады, пашыхтаваліся сенатарскія намёты.

Жаўнеры не адрываюцца ад клопатаў — хто гуляе ў косці, хто чысціць рушніцу або гострыць клінок,— і я разумею, што яны нас проста не бачаць, як не бачыць і надворны маршалак Радзівіл Сіротка, што кіруе ў паходзе каралеўскім двароем. Белагаловая зрабіла

невідочнай для чужых вачэй і мяне. А вось коні яе чарам непадуладныя, бо маршалкаў конь незадаволена пырхае.

Мы мінаем польскую конніцу і лёгка выходзім за звязаныя ланцугамі вазы, што ахоўваюць каралеўскі абоз. Далей стаяць ліцвіны яго мосці Мікалая Радзівіла. Наскую гаворку змяняе вугорская. Тут, насупроць Запалоцця, трымае аблогу Бекешава пяхота, і я паказваю Белагаловай гарматы, адкуль пан Каспар б'е па полацкіх сценах агнявымі кулямі.

Мне карціць пабачыць пана Каспара, ды замест яго насустрач ідзе вугорскі ваявода Мадазы з падкручанымі ўгору чорнымі да сінечы вусамі. Чалавек ён адукаваны: заўсёды загаворвае да мяне на лаціне і, згадваючы траянца Парыса, называе сармацкаю Аленаю. Цяпер жа і Мадазы праходзіць паўз нас, не звёўшы сваім адзіным вокам.

Мы ідзём па шматмоўным, шматаблічным табары, што сабраў і тых, хто прыйшоў вызваляць свой горад, і тых, каго вабіць толькі вайсковая здабыча, і я нарэшце выводжу Белагаловую да адзінага моста праз Палату, які не сарвала высокая ад дажджоў вада. Вунь там, воддаль, знаёмая да балючай стрэмкі ў сэрцы вярба, ды няма ні бацькавага млына, ні нашага дома, і я намагаюся не глядзець туды, у невараць.

Далей Белагаловая мусіць ісці адна. Я бяру яе за руку. Яе рука халодная, але жывая, яна сціскае маю і хутка сагравацца. Я хачу, каб Белагаловая штосьці сказала мне на адвітанне, хачу пачуць яе голас, бо яна пакуль не прамовіла ні слова.

Гэтаксама моўчкі яна ступае на хісткі мост. Вада паднялася вышэй насцілу, і Белагаловая прыўзнімае падол сукенкі.

Яна ўжо прайшла больш за палову моста, і тут я спахопліваюся, што не ведаю яе імя. «Як цябе завуць?» Вецер падхоплівае і даносіць мае словы да Белагаловай. Яна аглядаецца і ў нерашучасці спыняецца. «Не вяртайся! Ідзі!» Але Белагаловая паварочвае назад. Яна падыходзіць усё бліжэй, адпускае падол і працягвае да мяне рукі...

Я прахопліваюся ад уласнага крыку. Над ложкам — сонная зляканая Юста. Па намёце хвошча дождж. Мне холадна, і, угамаваўшы сэрца, я кажу Юсце нагрэць яшчэ віна і кінуць туды болей цынамону.

Аднавокі Мадазы тры дні таму быў забіты маскоўскімі кулямі, калі раіўся пры гарматах з польскімі ваяводамі. Тады сама кавалак дрэва з гарадской сцяны параніў у галаву маршалка Радзівіла, якога мы з Белагаловай сустрэлі на кані ў добрым здароўі. Выходзіць, я вяла яе да Палаты не сёння, а раней, і яна вярнулася, каб забраць рыцара фон Бока...

Гэта сон, ды пан Богусь вучыў мяне, што сон — працяг жыцця, а жыццё — працяг сну і не заўсёды чалавеку дазволена ведаць, дзе сон пачынаецца і дзе канчаецца, сніцца ўсё гэта яму ці ён сам разам са сваім жыццём сніцца камусьці іншаму, пакуль той не прачнецца.

Пан Богусь умеў добра тлумачыць сны. За колькі месяцаў наперад ён ужо ведаў пра смерць вялікага князя і караля Жыгімонта Аўгуста.

Гаспадар Жыгімонт памёр праз год па вяртанні Богуся з Італіі.

Стары пан Корсак апавядаў, што адразу пасля Люблінскага сойма, калі Вялікае Княства Літоўскае злучылася з Польскай Каронаю, яго каралеўская мосць выправіў з палаца жонку Кацярыну і папрасіў у папы рымскага разводу. Адны казалі, нібыта прычынаю было тое, што каралева не нарадзіла спадкаемца. Другія лічылі, быццам гаспадар напісаў у Рым, каб вальней амурыцца з тою, якую тады кахаў, бо яго мосць заўсёды шанаваў жаночыя павабу і ласку. Аднак калі атрымаў вестку пра жончыну смерць і клопат пра развод вырашыўся сам сабою, кароль заліўся слязьмі і хутка апынуўся ў кіпцюрах у хваробы, якая ўжо не адпусціла.

Хто асуджаў нашага гаспадара за амурныя справы, хто згадваў нешчаслівыя жанімствы яго мосці і найперш ягоную незабыўную Барбару, праз чыю смерць кароль, каб вярнуць каханую Басю хоць на дзень, быццам бы зблытаўся з самім д'яблам. Але і зычліўцы і зласліўцы сыходзіліся ў тым, што, займаючы велікакняскі пасад сорак гадоў, гаспадар Жыгімонт прынёс краіне дабра непараўнана болей, чымся шкоды. Ды найперш усіх займала, хто станецца пераемнікам яго мосці.

Загаварылі, што вялікім князем і каралём будзе малады ваявода Генрык Валезы, родны брат французскага караля Карла IX. Дзеля гэтага, праўда, Генрык мусіў пабрацца шлюбам з падстаркаватай Жыгімонтавай сястрою Ганнай Ягелонкай. А потым усё ледзьве не пайшло тунна, бо перад днём святога Барталамея католікі выразалі ў Парыжы начной парою болей за тры тысячы гугенотаў.

У нашай дзяржаве ўсхадзіўся тады вялікі неспакой — не таму, што баяліся сваіх закалотаў і разні паміж католікамі ды кальвінамі, а таму, што з Францыі даляцелі чуткі, быццам у тую вялікую кроў быў утручаны і сам Генрык. Па ўсёй Рэчы Паспалітай супроць яго падняліся шляхта і магнаты, якія адышлі да кальвінскае веры.

Але хітрамудры французскі пасланец біскуп дэ Манлюк, якога пасля перахрысцілі ў Манюку, пераканаў сенатараў і шляхту, што на Генрыку ніякай крыві няма і што ён ажэніцца з Ганнаю, як толькі прыедзе ў дзяржаву. Апрача таго, француза змусілі падпісаць артыкулы, што будзе берагчы ў краіне мір паміж рознымі верамі, а кіраваць стане пад апекаю шаснаццаці сенатараў. Чаго не дакляруе прагны да трона!

Усё гэта ў мяне ў памяці, бо мы з панам Багуславам былі ў Варшаве падчас элекцыйнага сойма, дзе гнезненскі арцыбіскуп абвясціў Генрыка вялікім князем літоўскім і каралём польскім з умоваю, што, калі новы гаспадар забудзе пра свой подпіс пад артыкуламі, усе жыхары Рэчы Паспалітай зробяцца ад вернасці яму вольнымі.

Мой Богусь вяртаўся з Варшавы не ў гуморы. Не знайшлі, казаў, гаспадара сярод сваіх, не будзе краіне выгоды і ад француза. Так яно і сталася. Жаніцца з Ягелонкаю Валезы занатурыўся, бо ніколі і не збіраўся, прагнучы за любы кошт пабрацца з іншаю паняй, якую завуць уладаю. Яе адну і любіў, а дзяржава наша была яму як заезны дом падарожнаму. Калі ў Францыі сканаў ягоны брат-кароль — відаць,

не дараваў яму Госпад рэкаў крыві, пралітай у Барталамееўскую ноч,— Генрык не захацеў затрымацца ў дзяржаве нават на дзень.

Сенат выдаў пастанову, што дазвол на ад'езд можа даць каралю адно вальны сойм. Валезы з пастановы пасмяяўся і ўначы падмазаў пяты. Шляхта наладзіла пагоню, падкаморы каронны Ян Тэнчынскі здагнаў уцекача, ды не дамогся нічога, апроч слова вярнуцца ў Рэч Паспалітую, як уладкуе свае французскія клопаты. Абяцанкі-цацанкі! У Парыжы Валезага абралі каралём, і наша краіна яго ўжо не абыходзіла. Так на ўцеху ворагам Княства і Кароны пачалося другое бескаралеўе.

Віленскі сойм пастанавіў абраць гаспадаром Эрнэста Габсбурга, ды тое засталося на паперы. Тады сенат абвясціў каралём і вялікім князем яшчэ аднаго немца, імператара Максіміліяна, але шляхта не пагадзілася і аддала галасы трансільванскаму князю Стэфану Баторыю, ці, як у нас яго завуць, Сцяпану Батуру. Дзеля трона мусіў ён воленс-ноленс пабрацца з той самай Ганнай Ягелонкаю, якой ішоў пяцьдзесят пяты год і якая была старэйшая за свайго нарачонага на цэлыя дванаццаць гадоў.

Тры гады таму Батура каранаваўся ў Кракаве, але наша шляхта прызнала яго вялікім князем толькі пасля таго, як выдаў грамату, што Карона і Княства — дзяржавы ва ўсім роўныя, што палякаў ваяводамі ў Княства прызначаць не будзе, а соймы будуць збірацца па чарзе то ў Польшчы, то ў нас, у Літве.

Як бы радаваўся пан Богусь, каб пачуў, што кароль Стэфан пацвердзіў Княству ўсе дзяржаўныя правы! Але яго, майго першага нявенчанага мужа і заступніка, ужо не было на свеце.

Падлі віна, Юста!

Трэцяе лета сыходзіць, як прывезлі пана Богуся зраненага і такога знябытага, што заносілі ў дом на руках. На Віленскім шляху ён запыніўся са сваімі людзьмі ў аўстэрыі і трапіў у маскоўскую засаду. Стральцоў з Тураўлянскага замка — спапялі яго сваім гневам, Госпадзе! — прыпадала на кожнага нашага па трое. Добра хоць, што здолелі адарвацца ад пагоні.

За колькі тыдняў мы са старой пані Корсакавай ды зялейніцай Грыпінкаю, што гатавала ўзвары і прымочкі, раны нашаму маладому гаспадару загаілі, але сіла да яго не вярталася. Грыпінка вызначыла, што стралецкае зялеза перацяла пану Багуславу жыццёвую жылу.

Збіўшыся з ліку дзён, я сядзела пры маім Богусю, то чытаючы яму, то вартуючы ягоны цяжкі сон і прыслухоўваючыся да слабога дыхання. Ён заставаўся ў ясным розуме і, калі пачуваўся трошкі мацней, браў мяне за руку і апавядаў пра Італію ды іншыя краі. Я чула розныя дзівосы: пра горы са снегавымі шапкамі, што не растаюць і ў самае спякотнае лета, пра горад, дзе заміж вуліцаў — рэкі і людзі ездзяць адзін да аднаго на лодках, а дамы вырастаюць проста з вады. Ён казаў пра звера малпу, што падобны да чалавека, але мае хвост і начуе на дрэвах, прывязаўшыся гэтым хвастом, як вяроўчынай, да галінаў. Побач з малпамі, далёка за морам, жывуць людзі з чорнай, як сажа, скураю. Ён расказваў і пра само мора, што мяняе колер, падымаецца і апускаецца, спакойна спіць і раз'ятрана разбівае караблі.

Мора здавалася мне найвялікшым дзівам, і пан Богусь абяцаў, што неадменна пакажа мне яго, але я ўжо не давала веры, што ён некалі ўстане. Дзень пры дні яго рука ставала ўсё слабейшаю, нібы жыццё выцякала з яе невідочным тонкім струмком.

Аднойчы ўвечары ён папрасіў мяне распрануцца і легчы з ім. Мне раптам здалося, што здолею абудзіць яго плоць і вярнуць майго Богуся да жыцця. Я лашчыла яго, як толькі ўмела: цалавала, пакусвала, як яму заўсёды падабалася, смочкі, прынікала вуснамі да таго, што калісьці гэтак хутка вырастала і запаўняла, здавалася, усю мяне...

Але яго плоць маўчала.

Некалі мае грудзі імгненна запальвалі яго, нават выснажанага шматдзённымі ловамі. Гэтым разам Богусева рука таксама, нібы ўзгадаўшы тыя дні, пацягнулася да грудзей, аднак яе дотык быў бязважкі — як быццам сеў, склаўшы на момант крылцы, матылёк.

Мяне працяла горкае веданне, што ён ужо ніколі не падвядзе мяне да люстра і не запаліць свечнік, не

абдыме, не зможа кахацца... Я зразумела, што ў яго ў вачах блішчэлі не водбліскі жадання, а слёзы.

Я не заплакала — абняла яго сама і чытала пацеры, пакуль не праваліласяў сон, а калі прачнулася, мой Богусь ужо схаладнеў.

Ён адышоў, не даведаўшыся, што ў мяне пад сэрцам варушыцца дзіця. Часам мне нясцерпна — так, што мусіла сціскаць вусны — хацелася сказаць пра гэта. Я думала, нашае пакуль не народжанае малое ўтрымае Богуся на свеце, ды знахарка Грыпінка ўгаворвала мяне маўчаць, каб — наадварот — душа майго мужа не паклікала следам душу дзіцяці.

Можа, дарма паслухалася Грыпінкі, хоць пан Богусь напраўду забраў з сабою яшчэ адну душу. Пасля хаўтураў пані Корсакава пачала таяць, як свечка, і сарака дзён па сыне ўжо не прычакала. Нейкая сіла не дазволіла мне адкрыцца і пані Мальгрэце, якая сышла ў магілу, не ўведаўшы, што будзе мець унука ці ўнучку.

Яна пакінула мне маёнтак, а пан Багуслаў — чатырыста чырвоных злотых ды ліст да віленскага шляхціча Якуба Неміровіча, з якім вучыўся разам у Італіі і якога прасіў узяць мяне ў сваю апеку. Апрача таго, у спадчыну ад Богуся застаўся вось гэты, ён у мяне і зараз на безыменным пальцы, пярсцёнак з тайніцай, што паспрыяў мне болей і за грошы і за ліст, бо пан Якуб апекавацца мною мог адно з нябёсаў: недзе пад Глыбокім маскоўская куля ўжо заручыла яго з зямлёй.

Стральцы з Тураўлянскага замка наляцелі, як шулякі, назаўтра пасля пахавання пані Мальгрэты. Той жах трэба зачыніць у памяці ў самай далёкай спіжарні на цяжкі замок і выкінуць ключ у бяздоннае возера.

Баярскі сын, што прывёў стральцоў, болей выдаваў на чалавека, які моліцца не Хрысту, а Алаху.

Ліхадзеі шнырылі па хлявах і свірнах, з конскім гігатаннем цягнулі ў адрыну маладую ахмістрыню Завею, ганяліся па двары за дзяўчатамі. Сам стралецкі верхавод, секануўшы шабляю фурмана Шэмета, што заступаў яму дарогу, уварваўся да мяне ў спачывальню. Вузкія сонныя вочы загарэліся юрам, а рэдкая рудая барада паказала ў пажадлівай ухмылцы жоўтыя зубы.

Я жагналася і прасіла не чапаць мяне, кажучы, што толькі днямі пахавала мужа і ягоную маці, ды мае благанні толькі распалялі баярскага сына. Ён ашчаперыў мяне, памацаў грудзі і крумянкі і, зацмокаўшы языком, паабяцаў забраць з сабою ў замак, а пакуль загадаў чакаць яго з лазні.

За дзвярыма тырчаў гэтаксама падобны да нехрысця вартавы. Адчыніла вакно — пад ім уладкаваўся яшчэ адзін барадаты бамбіза. Заплачу золатам, сказала я, паказаўшы жменю дукатаў. Ён імгненна згадзіўся, высыпаў грошы ў гаманец, а калі я села на падваконне, каб саскочыць у сад, зарагатаў і прыставіў мне да грудзей вастрыё алебарды. Каля ног у нелюдзя стаяў збан з медавухай, і як толькі мае вочы змецілі гэта, я ўжо ведала, што рабіць.

Лазня не змыла са стралецкага верхавода ні зладзейскага поту, ні нейкага саладкавага паху, пра які ў мяне мільганулася думка, што, можа, так пахне кроў. Масковец быў ужо моцна захмялелы і, угледзеўшы на стале штоф з мёдам-трайняком і дзве налітыя шкляніцы, аж закалаціўся ад радасці. Я не ведала, як хутка забівае атрута з майго пярсцёнка, а таму схавала пад падушкаю Богусеў італійскі корд з гострым, бы змяіны язык, джалам.

Усё ледзь не пайшло прахам. Заместа таго каб піць са шкляніцы, ён прысмактаўся да штофа, але, на шчасце, адляпіўшыся ад рыльца, перакуліў у рот і шкляніцу.

Баярскі сын паспеў зачыніць дзверы на засаўку і ступіць да мяне два крокі. Я сціснула пад падушкаю тронак корда, але трэці крок стаўся для маскавіта апошнім.

Атрута з пярсцёнка забівала без пакутаў.

Я асцярожліва зірнула ў вакно. Вартавы прыткнуў алебарду да сцяны і, ашчаперыўшы парожні збан з-пад медавухі, хроп, быццам ерыхонская труба. Пакуль апусцілася ноч, мне наканавана было пабачыць, як брыла, нібы непрытомная, з адрыны Завея і як на яблыні стральцы павесілі старога Гіршу. Выскачыўшы з вакна, я першы раз спынілася, каб звесці дых, толькі каля Вітаўтавых талерак.

Ты, Белагаловая, зрабіла б тады на маім месцы тое самае. Але ты не патрапіла ўратавацца…

Адкуль, з якога прытулку выходзіш ты ўначы? Каго пакінула на гэтым свеце? Ці даў табе Бог тваю крывінку, твой працяг?

Мой хлопчык, якога хацела назваць Багуславам, нарадзіўся ў Вільні нежывы. Лекар з Замкавай вуліцы, нечым падобны да кажана немец з сумнымі вачыма, сказаў, што — колькі б ні дзяліла я ложа з мужчынамі — болей дзяцей у мяне не будзе.

А дождж не сунімаецца, быццам няўцешна плача сама гэтая зямля. У намёце непрытульна, як у сутарэнні. Здаецца, сырым зрабілася ўжо і паветра, і сам час, у якім я чакаю яго мосць караля і вялікага князя. А можа, цябе, Белагаловая?..

Няўжо ты вярнулася з моста, каб забраць мяне за тое, што я забіла чалавека? Той жа баярскі сын быў ворагам. Мо гэта ягоныя людзі пазбавілі жыцця цябе і юнака з аднаго з табою плыта?

Якія яшчэ грахі ляжаць на маёй душы? Так, я нявенчаная жонка ўжо трэцяга мужчыны, але ці такая цяжкая гэта правіна, калі неба звяло мяне з самім каралём і не пакарала за два гады, пражытыя з панам Каспарам Бекешам, які ніколі не моліцца і не трымае посту, і, даруй, Госпадзе, кажа, што не Бог стварыў чалавека, а чалавек — Бога…

Ліст да пана Каспара даў мне стары Антон Неміровіч. Страціўшы сына, ён зрабіўся сівы як лунь і, заклаўшы сваю гасподу на Татарскай вуліцы, сам зазбіраўся на вайну, бо не хацеў ад жыцця ўжо нічога, апрача помсты.

Доўгія месяцы пасля нараджэння майго мёртвага хлопчыка я і сама чулася, як не дакапаная да вады студня, і калі ў Вільні, а потым у Горадні лавіла на сабе ўважлівыя мужчынскія позіркі, мая душа ўмомант ашчаціньвалася.

Тады я яшчэ болей прыахвоцілася чытаць. Пан Каспар меў добрую кніжніцу з лацінскімі і нямецкімі кнігамі. Сярод іх я знайшла выдрукаваную па-наску кнігу «Юдзіф» і сустрэлася з ёю, быццам са старой знаёмай.

Я перагортвала старонкі фаліянтаў пана Бекеша і ўчытвалася ў радкі, якія ён адкрэсліў для сябе зялёным атрамантам. Гэткім чынам я нібы зазірала свайму апекуну ў душу. Мне было цікава і трошкі ніякавата, быццам я займаюся нечым недазволеным.

У рымскага кесара Марка Аўрэлія пану Бекешу спадабалася думка, што ўсё ў жыцці мімалётнае: і той, хто памятае, і тое, аб чым памятаюць. У іншай кнізе — яе напісаў Эразм з Ратэрдама — пяро пана Каспара пазначыла словы: «Не плакаць, не смяяцца, але разумець».

Ён так і жыў, і не існавала, відаць, рэчы, якой бы мой апякун не разумеў ці не ведаў.

Напачатку пан Бекеш абыходзіўся са мною, як з дачкой, чаго і вымагалі ягоныя гады, бо яму пераваліла за пяцьдзесят пяць. Я чула да яго ўдзячнасць за такія стасункі. Мне было дастаткова маёй памяці пра Богуся.

Але аднойчы я змеціла, што пан Каспар глядзіць на мяне іншымі вачыма, і неспадзявана адказала на яго позірк. Мінуўся ўжо год, як адляцела душа пана Багуслава, і маё маладое цела прачыналася, як дрэва пасля зімы. Увечары, перад малітваю, я зноў, як некалі, падыходзіла да люстэрка і тады найбольш востра адчувала, як маім грудзям, маім клубам і ўлонню трэба мужчынскія ласка, цеплыня і сіла.

Была велікодная вячэра. Нашы з панам Каспарам келіхі з мальвазіяй сустрэліся над сталом уадначас з нашымі вачыма, і я ўжо ведала, што сёння ўначы ён прыйдзе да мяне.

Ён увайшоў у спачывальню з запаленым кандэлябрам у адной руцэ і зялёнай пляшкаю мальвазіі ў другой. Ад яго пахла духмянамі і нечым няўлоўна мужчынскім. Пан Каспар прамовіў: «Solus cum sola non cogitabuntur orare Pater noster»*, і мяне апякло адначасна холадам і гарачынёю. Гэтыя словы я чула калісьці ад майго Богуся.

Я яшчэ не ўяўляла, якія вусцішныя рэчы пачую ад пана Каспара пазней, у тыя вечары і ночы, калі ён будзе расказваць пра сябе, не хаваючы самага пакрыёмага.

* Застаўшыся сам-насам, не чытаюць «Ойча наш» (*лац.*).

Пан Каспар не вызнаваў аніякае веры. Гэта не было таямніцаю, але зямляцтва і даўняе знаёмства з каралём і вялікім князем ахоўвала яго ад гневу чорных сутанаў. На мае словы, што мы з ім жывём у граху, а таму душы нашы пасля смерці асуджаныя на пакуты, мой другі нявенчаны муж нязменна адказваў сваёй блюзнерскай малітваю, якую я таксама насуперак волі ведаю на памяць: «Не веру ў Бога, не прагну неба, не баюся пекла, не турбуюся пра Божы суд, не трывожуся пра цела, а пагатоў пра душу, якая памрэ разам са мною». Гэтую бязбожную малітву ён хоча бачыць на сваім надмагіллі, пра што зрабіў адмысловы запіс у тастаманце. Не ведаю толькі, які святар пагодзіцца яго хаваць. Дай Божа таму тастаманту пыліцца доўгія гады, ды маё сэрца прадчувае благое. Можа, тады, у Свіры, калі яго каралеўская мосць рабіў агляд ліцвінскае конніцы і радзіўся з ваяводамі, куды рухаць войска найперш — на Пскоў ці Полацк, пан Каспар ужо прадчуваў хваробу і падвёў мяне да караля і вялікага князя наўмысна.

У жылах у пана Каспара, гэтаксама як і ў яго каралеўскае мосці Стэфана Баторыя, бегла гарачая вугорская кроў. Некалі пан Каспар быў ягоным супернікам у змаганні за трансільванскае княжанне, а пазней стаўся сябрам і цяпер камандуе ў каралеўскім войску пяхотаю. Надзейнейшага супольніка наш гаспадар не меў ні ў аблозе Гданьска, ні тут, пад Полацкам.

Усплыло на памяць, як пан Каспар, вярнуўшыся з-пад Гданьска, да самае раніцы, пакуль пеўні не збіліся з ліку, кахаўся са мною, бы юнак, а калі на ложак лёг першы сонечны промень, раптам сказаў, што, калі забіваеш чалавека, кожны раз бывае па-іншаму, як кожны раз па-іншаму мужчына адчувае сябе з новай жанчынай. І, памаўчаўшы, дадаў: «І кожная жанчына, і кожны забіты назаўсёды застаюцца з табой».

Размовы з панам Каспарам штораз мяне палохалі. Я нібыта з галавою акуналася ў сцюдзёную цёмную ваду. Аднак — дзіўная рэч! — выходзіла з яе не са страхам, а з незразумелым спакоем, кшталту таго, што застаецца пасля споведзі. Хоць насамрэч спакой гэты

пэўна ж быў зусім інакшы, бо пан Каспар не адпускаў мне грахоў, а адно павялічваў іхні цяжар.

Але ён заўсёды спакойна глядзеў, як я ўкленчваю перад абразамі, і ані не кпіў з маіх малітваў. Аднаго вечара, калі ягоны сябар і гэткі самы бязбожнік рыцар Феранц, які больш за жанчын любіў юнакоў, убачыўшы мяне на малітве, загагатаў, пан Каспар гэтак глянуў на яго з-пад калматых броваў, што той падавіўся смехам. Не, пан Бекеш не пераварочваў мяне ў бязбожніцтва, ды з кутка мае душы раз-пораз даносіўся голас, які нашэптваў тое, што боязна паўтараць і ў думках.

Няўжо душа напраўду проста развеецца, запаветрае, як дымок ад ачахлага вогнішча? Тады, калі чалавечым душам не наканавана вечнага жыцця, я хачу, каб мая душа, назаўсёды разлучыўшыся з целам, паспела злётаць да мора, пра якое расказваў Богусь.

Мора... Яно такое, як тысяча нашых азёраў. Падобнае да бясконцага люстра пад ціхім сонечным небам і рабаціністае, знітаванае з нябесным скляпеннем тысячамі вадзяных струменьчыкаў — у дождж. Вось такое, як зараз.

Але ў гэтага мора зусім блізкія берагі. На выспе паміж імі стаіць Прадцечанскі манастыр. А на другім баку гэтага мора, які добра відаць праз дождж,— аточаны вячыстымі, густымі, як хмары, ліпамі драўляны кляштар францішканаў.

Ды то ж не мора, а наша Дзвіна! У мяне за плячыма — святая Сафія, куды хадзіла з бацькамі на ўсяночныя, а поруч са мною — Белагаловая. Яна прывяла мяне ў Полацк і кліча ў сабор. Толькі ці можна мне цяпер, калі я перайшла ў рымскую веру, маліцца там? У адказ Белагаловая смяецца гэтаксама, як калісьці пан Каспар.

Знаёмыя з дзяцінства, хоць і прызабытыя, святыя на сценах не адварочваюцца, ды ўсё роўна мне непрытульна. Полацкіх людзей у храме няма — адны маскоўскія стральцы пры зброі, і мне хочацца хутчэй вонкі.

Мы з Белагаловаю зноў сталіся нявідкамі. Яна вядзе мяне з Верхняга замка ўніз, у пасад, каб паказаць свой дом. Каб не стральцы, вуліцы былі б зусім пу-

стэльныя: нідзе ні старога, ні малога, не відно ні катоў, ні сабак, ні козаў.

Знячэўку на паваротцы каля Чорнага ручая мы ледзь не налятаем на казлабародага вузкавокага чалавека ў каптане крывавага колеру. Божа!.. Гэта ж той атручаны баярскі сын! Атрымліваецца, што атрута не ўзяла яго?

Ён, напалову татарын, напалову масковец, напалову чалавек, напалову звер, камандуе натоўпам стральцоў. Сяго-таго я ведаю. Вось той жлукта вартаваў мяне пад акном, пакуль не перакуліўся разам са сваім збаном. А тыя двое вешалі на яблыні каля лямуса настаўніка Гіршу.

Мы з Белагаловай прыціскаемся да паркана. Гэтым разам яна надзела маю кармінную мухаяравую сукню, першы падарунак пана Каспара. Сукня ляжала разам з іншымі строямі ў паходным куфры, на якім спіць Юста. Значыцца, Белагаловая ўжо прыходзіла ў наш намёт...

Але я не паспяваю дадумаць думку да канца, бо стральцы, за якімі мы ідзём вуліцаю ўніз да Дзвіны, пачынаюць урывацца ў дамы і выводзіць адтуль людзей. Іх, бедакоў, усё болей і болей, і раптам Белагаловая сціскае мне руку і паказвае заможны дом з зялёнымі аканіцамі і высокім ганкам пад стрэшкаю.

Стральцы выводзяць на ганак Белагаловую ў ільняной сукенцы з гафтам. З гэтага моманту Белагаловых дзве: адна ў маёй чырвонай мухаяравай сукні, другая — у кужэльнай белай. Тую, што прывяла мяне сюды, б'е дрыготка, якая праз руку перадаецца мне.

Казлабароды баярскі сын падымаецца на тры прыступкі, мацае ў той, другой, Белагаловай грудзі і вядзе яе назад у дом. Праз хвіліну дзверы адчыняюцца і ён, не раўнуючы як вялікі мех з мукой, выкідае на ганак цела немаладое кабеты. Маладзенькі стралец, амаль хлапчук, хапае яе за ногі і цягне долу. Сівая галава б'ецца аб прыступкі і чырванее ад крыві. Стралец кідае забітую пад вішняй і, задзёршы галаву, ласуецца ягадамі.

Збой абкружаных вартаю людзей, над якім разлягаецца жаночы плач, аддаляецца, а мы з Белагаловай

чакаем. Нарэшце на ганку зноў паказваецца баярскі сын. Ён махае рукой маладзенькаму стральцу, і той выводзіць з дома другую Белагаловую ў разадранай на грудзях сукенцы. Тым часам баярскі сын падыходзіць да студні з асверам і выцягвае вядро вады. Богусеў пярсцёнак пры мне. Я вомегам кідаюся да студні і паспяваю націснуць таемную спрунжынку і сыпануць у ваду зеленаватага пылку.

Казлабароды п'е, ідзе да брамкі, адчыняе яе ўжо не рукой, а ўсім сваім абмяклым тулавам, што падае ніцма і, тузануўшы нагамі, заціхае.

Мы з Белагаловай, той, што ў мухаяравай сукні, апынаемся на дзвінскім беразе. Я здагадалася пра ўсё яшчэ каля Чорнага ручая, як толькі сутыкнулася з уваскрэслым маскоўцам. На траве — два дзесяткі невялікіх плытоў, і стральцы чакаюць знаку, каб распачаць сваю крывавую працу. Маё вока імгненна знаходзіць у натоўпе знаёмага маладзёна. На ўзвозе паказваецца тая Белагаловая, якую вядзе стралец-хлапчук. Угледзеўшы яе, маладзён вылузваецца з натоўпу і кідаецца да шчыльнага кола стральцоў. Двое царскіх людзей заломваюць яму рукі і адцягваюць да вады.

Белагаловая ў ільняной сукенцы заўважае яго і бяжыць да плытоў. Стральцы адпускаюць маладзёна і дазваляюць Белагаловай абняцца з ім. «Апошні раз на гэтым свеце»,— з рогатам кажа адзін. Падобны да хлапчука масковец дастае з-за пояса нож і мякка ступае да каханкаў...

Неспадзявана я намацваю ў патайной сукні майго саяна Богусеў корд і з халоднай навагаю дастаю яго. Першым наканавана памерці маладзенькаму стральцу, што сёння апошні раз на гэтым свеце еў вішні. Я націскаю на тронак усім целам і адчуваю, як ягонае сэрца закіпае на сталёвым джале. Я гляджу ў яго вадзяніста-шэрыя вочы, з якіх імкліва ўцякае жыццё, і штосьці крычу, не чуючы ўласнага голасу...

На куфры варочаецца ў сне Юста.

Ці ж на месцы мая мухаяравая сукня?

«Поўнач! Поўнач!» — крычаць пад дажджом вартавыя.

Я ўжо зусім не баюся цябе, Белагаловая. Калі зойдзеш — налью табе віна і назаву сястрою. Цікава, у якой сукенцы ты будзеш — у зялёнай адамашкавай ці ў карміннай мухаяравай? Толькі зараз я чакаю не цябе.

Караля не было ўжо два дні. Маё цела засумавала, але найперш ягоны прыход трэба сёння не целу, а душы. Чаму сёння я, быццам кнігу, гартаю ўсё сваё жыццё? Да чаго рыхтуецца душа?

«Калі забіваеш, кожны раз бывае па-іншаму,— сказаў мне калісьці на світанні пан Каспар і дадаў: — Можа, калі-небудзь ты даведаешся сама». Дадаў, бо навучыў мяне абыходзіцца са зброяй і падараваў лёгкі рыцарскі панцыр.

Цяпер я ведаю: гэта сапраўды штораз бывае інакшай, нават калі забіваеш у сне.

Нядаўна, у Свіры, я гатовая была забіць атрутаю самога пана Каспара Бекеша. Мне здалося, ён аддаў мяне каралю як рэч, якой дасхочу нацешыўся і якой ужо няшкода пазбыцца, пагатоў калі можаш атрымаць за гэта падзяку ад самога гаспадара дзяржавы.

Ведаю, што памылялася. Тады, як кароль аглядаў ліцвінскую конніцу Радзівілаў ды Яна Кішкі і мы пад'ехалі да яго мосці, пан Каспар думаў не пра сябе.

Яго мосць кароль і вялікі князь паслаў па мяне ў той самы вечар, і я не наважылася адмовіцца. Пан Бекеш ужо вырушыў са сваімі жаўнерамі са Свіры да Дзісны, і я засталася толькі з Юстай.

На аглядзе войска пад Дзісной нашы з каралём коні ўжо прыхільна касавурыліся адзін на аднаго. Перад яго мосцю праходзіла з разгорнутымі сцягамі польскае войска. Сонца залаціла шышакі і панцыры вершнікаў. Кожны меў дзіду, палаш і дзве прывязаныя да сядла рушніцы. Следам ішла польская пяхота са стрэльбамі, за ёю — дзевяць сотняў нашае конніцы Яна Хадкевіча...

Кароль пакуль не ўмее гаварыць ні па-наску, ні па-польску. Але стары Гірша навучыў мяне лаціне, а яшчэ лепей — нямецкай мове, а яго мосць вучыўся ва універсітэце ў Падуі і тры гады быў у палоне ў немцаў. Ён любіць выпіць са мною ўвечары гарачага віна

і, калі ў гуморы, пачынае навучаць мяне па-вугорску, просячы, каб я называла яго Іштван ці, яшчэ лепей, Пішта, як некалі ў бацькоўскім доме. Я таксама спрабую яго вучыць па-нашаму, а аднаго разу так развесялілася, што нават заспявала:

Падымі кашульку,
Пакажу зязюльку...

Паблізу намёта чуецца гамана, і мой наструнены слых ловіць густы голас яго каралеўскае мосці. Я буджу Юсту і бяру ў рукі люстэрка, каб падвесці вусны і бровы. Душа ўсцешаная, аднак адначасна ў ёй шкрабецца і незадаваленне, што не хапіла часу дадумаць нешта важнае.

Кароль як быццам запаўняе сабою ўвесь намёт. Ён скідае заквэцаны гразёю кармазінавы жупан, вызваляе грудзі ад лёгкай кірасы і просіць у Юсты віна.

Жаўнеры, кажа ён, адмаўляюцца пакутаваць ад голаду ды залеваў і прагнуць вярнуць Полацк або загінуць. Заўтра герольды абвесцяць ягоны ўказ: хто здолее падпаліць замак, каб сцены не ўдалося патушыць, атрымае па-каралеўску шчодрую ўзнагароду. Сілы ў непрыяцеля канчаюцца. Ваявода Пятро Валынскі згодны скласці зброю, калі ён, Баторы, захавае ўсім маскавітам жыццё. З вежаў ужо спускаліся парламенцёры, ды вугорцы, не ўважаючы на загад Каспара Бекеша, пасеклі іх, бо разлічваюць на багатую здабычу. Праўда, сакратар яго каралеўскае мосці сцвярджае, што найкаштоўнейшы скарб, які яны могуць здабыць у Полацку,— гэта кніжніца Сафійскага сабора, дзе захаваныя кнігі, пісаныя яшчэ святымі братамі Кірылам і Мяфодам і полацкай ігуменняю Еўфрасінняй.

Заўтра вузел можа развязацца, і год 1579 ад увасаблення Сына Божага давеку застанецца ў полацкіх аналах. Каб яшчэ неба паслала сухі дзень...

Я лаўлю на сабе ўважлівы мужчынскі позірк яго мосці. Кароль пераводзіць яго на Юсту, і тая разумее без слоў: да раніцы яна вольная.

У верасні каралю споўніцца сорак шэсць, аднак ён бывае нецярплівы, як дваццацігадовы, і тады нагадвае мне пана Багуслава. Можа, таму, што таксама вучыўся ў Італіі, яго мосці даспадобы тыя ж салодкія штукі, што і майму першаму нявенчанаму мужу. Ён любіць адчуць на сваім мужчынскім жазле мае вусны. Любіць пакласці ніцма і развесці ногі і крумянкі... Любіць бачыць мяне і ніколі не тушыць свечак.

Ягонае вялікае дужае цела пахне дымам, дажджом і ветрам, а ў барадзе заблытаўся пах сена. Мы з ім смела ўваходзім у раку асалоды. Уваходзім усё глыбей і глыбей, і вось ужо пад нагамі няма дна. Я заплюшчваю вочы, і гэтая рака нясе мяне, вызваляючы ад страху, чакання і паняверкі.

Тут час ідзе зусім іначай. Тут вяртаецца з невараці і зноў абдымае і лашчыць мяне пан Багуслаў. Тут шукаюць мае патаемныя мясціны шурпатыя, але такія пяшчотныя рукі пана Каспара. Тут я раблюся спакойнай, упэўненай і нястрымнаю, як сама плынь, што нясе мяне.

Дзесьці ў гэтай рацэ ёсць выспа, на якой мяне чакае Белагаловая, мая сястра, частка мяне самой.

Табе засталося нядоўга чакаць. Мая прасвятлелая душа ўжо ведае: заўтра я надзену свае даспехі і вазьму ў рукі зброю. Я злучуся з табой, Белагаловая, і наша супольная моц будзе большаю, чым у любога ваяра-мужчыны. Заўтра мы з табою пойдзем на прыступ, каб перамагчы або загінуць. Каб адпомсціць і вырвацца з крывавага віру.

Гэта будзе заўтра, а пакуль дазволь мне плысці ў бяздоннай салодкай плыні. Можа, астатні раз. Можа, ужо заўтра мяне падхопіць іншая рака. Тая, што плыве да мора, у якім злучаюцца чалавечыя душы.

Тая, дзе я зноў сустрэнуся з табою...

1999

Місія папскага нунцыя

1

Трэці дзень нехта невідочны і агромністы раз'ятрана ляпаў ваканіцамі і шпурляў ва ўзорыстыя шыбы прыгаршчы каляных круп. Трэці дзень знадворку вокны былі завешаныя непрагляднаю белай апонай, і папскі нунцый Кантэльмі ніяк не мог пазбыцца адчування, што яго пакоі не на галоўнай вуліцы сталічнай Варшавы, а дзесьці ў самым глухім кутку гэтай велізарнай краіны.

Кантэльмі зябка паправіў накінутае на вузкія плечы куніцавае футра і пасунуў цяжкое крэсла з грыфонамі на падлокніцах бліжэй да каміна. Смуглявы і вузкі арыстакратычны твар нунцыя заставаўся, як заўсёды, непранікальным, і ўсё ж можна было змеціць, як недзе ў самай глыбіні разумных агатавых вачэй раз-пораз успыхваюць іскрынкі зласлівасці.

У якой іншай краіне могуць дазволіць сабе пазніцца да папскага прадстаўніка? Дзе яшчэ дваране насмельваюцца звяртацца да караля, каб вызваліць з-пад варты бязбожніка, вуснамі якога гаворыць сам д'ябал? О, як няпроста выконваць тут даручэнні яго святасці! Мінулася больш года, як у Рыме даведаліся пра злачынныя пісанні берасцейскага падсудка Лышчынскага, а ён хай сабе і скрозь краты, але яшчэ бачыць сонца. А цяпер шляхта Вялікага Княства Літоўскага нахабна патрабуе, каб гэты чалавек свабодна абараняўся перад судом усіх станаў. Аднак для яго, Кантэльмі, не бывае невыканальных даручэнняў. Ён пераможа, не зважаючы ні на што, у тым ліку і на маленькія іголкі болю, якія ад Калядаў завяліся ў левай нырцы і пра якія ён забывае толькі ў сне.

Нунцый адпіў са срэбнай, падобнай да паціра чары тры глыткі падагрэтых зёлак. Кажуць, ад ягонай хваробы можа памагчы ліцвінская лазня, але ён усё не наважыцца паспрабаваць гэтыя дзікунскія лекі, што, па чутках, вельмі нагадваюць пакуты, якія чакаюць

грэшнікаў у пекле. Мо рызыкне, калі сойм закончыць працэс і справа царквы пераможа. Прынамсі, будзе прыемна ўсведамляць, што яго пекла — не вечнае.

Ён прайшоўся па пакоі і, адчуваючы, як боль пакрысе адпускае, узяў са стала фаліянт у блакітным пераплёце.

Кніга, з якою нунцый зноў уладкаваўся ў крэсле, была не зусім звычайнаю кнігай. Ён задумліва гартаў жаўтлявыя, спісаныя рознымі почыркамі старонкі. «Жыццё чалавека — гэта сума яго ўчынкаў»,— усплыло ў памяці старажытнае выслоўе. Так, зараз перад ім усё жыццё гэтага бязбожніка, дзіўнае і непаслядоўнае да абурэння. Выдатная адукацыя, у трыццаць гадоў — прарэктар Берасцейскага калегіума. Наперадзе бліскучая будучыня, якой будзе спрыяць ордэн... І замест навуковых заняткаў — школка ў радавым маёнтку, дзе ён вучыў сялянскіх дзяцей чытанню, ліку і пісьму. Замест кар'еры — выхад з ордэна, які ніколі не даруе адступнікам. У той час трактат яшчэ не быў пачаты, але паводзіны ўжо выдаюць яго. Нунцый прабег вачыма старонку. «Пагарджаючы таемствам хрысціянскага шлюбу, выдаў дачку замуж за сваяка... На богаўгодныя справы выдаткоўвае не больш як тры фларыны на год... Склаў тастамант, дзе загадаў цела сваё пасля смерці спаліць, а попел пахаваць ля дарогі, зрабіўшы на магіле богазневажальны надпіс...»*

«Пасля смерці спаліць...— паўтарыў сам сабе нунцый.— Пасля смерці...» Сума ўчынкаў Лышчынскага павінна даць у выніку нуль, нішто, і яго, нунцыя, дбаннем так і будзе.

Вось яны, аркушы, якія адначасна з задаволенасцю заўсёды выклікаюць у яго і пачуццё гідлівасці. Браслаўскі стольнік Ян Бжоска аказаўся для ордэна сапраўдным дарункам лёсу. Сусед і сябра, які выкрадае злачынны трактат і яшчэ сёе-тое, неабходнае следству... А якім высакародным гневам, якой нянавісцю дыхаюць радкі ягонага даносу, гучна названага маніфестам! Ці не занадта лёгкае тлумачэнне — сто тысяч талераў, якія Бжоска вінен атэісту? Чалавечая натура не такая простая рэч. Браслаўскі стольнік цудоўна ведае, што Лышчынскі не з тых людзей, якія садзяць сяброў у пазыковую яму. Да таго ж і грошы гэтыя ў бязбожніка не апошнія, чалавек ён нябедны. Не, кожнае слова ў даносе шчырае, кожнае ідзе з душы. З душы добранадзейнай нікчэмнасці, якая будзе заўжды пякуча зайздросціць таленту.

О так, гэты Лышчынскі — чалавек незвычайны сваім розумам. Дні, праведзеныя за чытаннем яго трактата, ён, Кантэльмі, ніколі не назаве патрачанымі тунна. Калі б берасцейскі падсудак знайшоў лепшае дастасаванне сваім здольнасцям, яны ўдвух маглі б цікава гутарыць вечарамі за келіхам добрага віна. Аднак сёння шляхціч Лышчынскі — самы небяспечны з ерэтыкоў Рэчы Паспалітай, а магчыма, і ўсёй Еўропы, а ён — нунцый яго святасці папы рымскага, яго воля і розум належаць Богу і ордэну самых адданых слуг Хрыста. Ордэн патрабуе з коранем выполваць нават самыя кволыя парасткі вальнадумства, а тут, на гэтым кепска ўробленым палетку, паднялося сапраўднае дрэва з панаднымі, налітымі атрутаю пладамі. Але ён любіць мець справу з небяспечнымі ворагамі. Тады саладзейшы дзень перамогі. А гэты дзень для яго — не той, калі ў злачынцы адбіраюць свабоду ці жыццё, а той, калі ў яго, нунцыя, пад нагамі ляжыць зламаная воля ворага. Бо менавіта гэта і ёсць сапраўдная перамога.

Нунцый адпіў глыток лекавага адвару. Трэба будзе ўзяць у Рым запас гэтых зёлак з дзікунскаю назвай «мядзведжыя вушкі». Ён выбраў са срэбнага спода з валоскімі арэхамі самы буйны і з хвіліну, як быццам нешта загадваючы, пазіраў на адмысловыя арэхавыя клешчыкі ў выглядзе пашчы дзіка. І раптам зрабіў імі няўлоўны рух, і звярыныя іклы зашчоўкнуліся.

Арэх трапіўся поўны і прыемны на смак. Павольна жуючы, Кантэльмі падкінуў у камін бярозавых

* У матэрыялах судовага працэсу над Казімірам Лышчынскім захаваўся тэкст гэтага надпісу: «Падарожнік! Не абміні гэтых камянёў. Ты не спатыкнешся на іх, калі не спатыкнешся на ісціне. Спасцігнеш ісціну ля камянёў, бо нават тыя людзі, якія ведаюць, што гэта праўда, вучаць, што гэта хлусня. Вучэнне мудрацоў — свядомы падман».

круглякоў і скасіў вока на гадзіннік. Яшчэ толькі палова на пятую. Не, ён проста становіцца занадта падазроным. Відавочна, што ў яго сённяшняга госця і ў думках няма знарок пазніцца. Віною ўсяму жудасная гіпербарэйская завея.

Ён ведае, што чалавек, коні якога зараз прабіваюцца праз сталічныя сумёты, у душы мае сябе за тутэйшага Цыцэрона. І — небеспадстаўна, іначай іхняй сустрэчы проста не было б. Трэба прыняць пад увагу і яго судовую практыку. Сорак пяць гадоў, болей, чым ён, Кантэльмі, пражыў на свеце. І потым, інстыгатар* — асоба свецкая, а для шляхецкіх паслоў, што берагуць свае прывілеі, як зрэнку вока, гэта вельмі важліва. О, з яго дапамогаю Кантэльмі падрыхтуе сойму выдатнага траянскага каня.

Да чуйнага вуха нунцыя скрозь завыйныя ўздыхі ветру данёсся ледзь чутны перазвон шамкоў. Кантэльмі склаў далоні і, апусціўшы павекі, зашаптаў словы малітвы.

У пакой бязгучным ценем слізгануў і застыў каля парога манах-служка. Адчуўшы яго прысутнасць, нунцый запытальна расплюшчыў вочы.

— Інстыгатар Вялікага Княства Літоўскага, бакалаўр філасофіі і вольных мастацтваў Сымон Куровіч.

Кантэльмі няраз бачыў інстыгатара на сойме, але ягоная постаць, нейкім дзівам уціснутая ў ласіны жупан з залатымі гафткамі, зноў уразіла нунцыя сваімі памерамі і дрымотнаю дужасцю. Гэты беларусін, якому ідзе сёмы дзесятак, сапраўдны мядзведзь. Гаворыць, яшчэ летась ён адужаў на ловах свайго ляснога суродзіча.

Куровіч прынік да рукі нунцыя мяккімі мокрымі губамі, і той адчуў змешанае пачуццё агіды і гордасці ад улады над такім волатам.

У пакоі гусцела сутонне. Манах, з-пад сутаны ў якога ў тым месцы, дзе носяць корд, штосьці падазрона вытыркала, падышоў да вялікага масянжовага кандэлябра, але нунцый мяккім рухам спыніў яго.

* Абвінаваўца.

— Нам не трэба святла, брат Джузэпе,— сказаў ён па-італьянску.

Манах паставіў на нізкі столік два тонкія венецыянскія келіхі і срэбныя сподкі з разынкамі і цукатамі. У келіхі палілося густое і цёмнае, як кроў, віно.

— Пакінь нас, Джузэпе, і загадай, каб у дом нікога не пускалі.

Кантэльмі трохі паспешліва паказаў госцю на крэсла насупроць, бо нунцыю здалося, што інстыгатар ужо сам ладзіўся сесці. Яны занадта высокай думкі пра сябе, гэтыя беларусіны, падумаў ён, слухаючы, як пад вялізным целам Куровіча жаласна рыпіць дубовае крэсла.

— Шмат чуў пра пана інстыгатара,— загаварыў нунцый,— і надзвычай усцешаны чаканым знаёмствам.

Невялічкія гострыя вочы Куровіча паблісквалі насцярожана і хітра.

— І ўсё пачутае,— працягваў нунцый,— дазваляе з пэўнасцю сцвярджаць, што такі абаронца закону мог бы зрабіць гонар любой еўрапейскай дзяржаве. Найбольш адданыя прыхільнікі вашага юрыдычнага таленту параўноўваюць ваша красамоўства з цыцэронаўскім... Так-так, з цыцэронаўскім,— паўтарыў Кантэльмі, задаволена адзначаючы на льсняным голеным твары інстыгатара водсвет пацешанага самалюбства.

— Ваша правялебнасць, у кожнага чалавека са становішчам ёсць свае лісліўцы...

— Але з вуснаў нават няшчырых прыхільнікаў разумны чалавек пачуе больш праўды, чым з вуснаў адкрытых зласліўцаў, у якіх ёсць толькі чорны колер,— заўважыў нунцый.— Я прапаную падняць келіхі за вашы новыя перамогі. Учора я пісаў пра вас яго святасці ў Рым...

— Гэта вялікі гонар, ваша правялебнасць.— Высокі келіх цалкам схаваўся ў інстыгатаравай далоні.— Я губляюся ў здагадках, чым заслужыў яго...

— Мы, слугі Божыя, прывыклі цаніць людзей не толькі за іх былыя ўчынкі. Мы зыходзім з таго, што найлепшая справа кожнага дагоднага Усявышняму чалавека — не ў мінулым, а ў будучым, гэтаксама як у будучым і найгоршае злачынства кожнага з ворагаў

Хрыстовых. Да першых гэта будучыня павінна прыйсці, другіх неабходна як мага хутчэй пазбавіць яе.

— Мне заўсёды здавалася, што царкву больш цікавіць другі выпадак, бо сказана ў Святым Пісанні: і пакараныя яны будуць за беззаконне сваё.

— Вы разважаеце як юрыст...— Нунцый пагасіў у душы ўспышку ўкведенасці і, памачыўшы вусны ў духмяным віне, пацягнуўся да сподка з разынкамі.

У кутах загусла цемра. Пошугі полымя выхоплівалі з яе мудрагелістыя ўзоры на завешаных усходнімі дыванамі сценах.

— Буду з вамі шчыры. Рым вельмі занепакоены вальнадумствам, якое ўгнездавалася ў вашай краіне. Небяспечна памыляўся яшчэ ваш вучоны друкар Скарына. Дарэчы, святой царкве дагэтуль дакладна невядома, да якой канфесіі ён сябе далучаў. Mala herba cito crescit*. Пан інстыгатар, безумоўна, ведае і пра Сымона Буднага, які загубіў сваю душу, насмеліўшыся крытыкаваць Новы Запавет. Яшчэ сто гадоў таму ў дыспуце з прадстаўнікамі ордэна ў Полацку ён абараняў тэзіс, што душа памірае разам з целам і няма ні раю, ні пекла. Я ўпэўнены, ён даўно пераканаўся ў адваротным. Наш Збавіцель літасцівы, але я ўсё ж цешу сябе надзеяй, што там, дзе знаходзіцца цяпер гэты ерэтык, ён сустрэўся і са Скарынам, і з Цяпінскім, і з многімі іншымі...

Застылы, як манумент чалавечае магутнасці, інстыгатар нарэшце паварушыўся.

— Дазвольце зазначыць, ваша правялебнасць, што зараза вальнадумства закранула ўсе хрысціянскія краіны. Дастаткова згадаць вашых суайчыннікаў Джардана Бруна і Ваніні**...

Нунцый тонка ўсміхнуўся:

— Але мы бязлітасна вырываем куколь з нашае нівы, а ў вас ён квітнее.

Куровіч у згодзе нахіліў голаў.

Полымя ў каміне ачахла, чырвонае вуголле пакрылася мройнай чорнаю плеўкай. У пакоі зрабілася

* Дрэнная трава хутка расце (*лац.*).

** Джуліо Ваніні — італьянскі філосаф-атэіст. У 1619 г. быў спалены на вогнішчы.

зусім цёмна. Змрок праглынуў укрыжаванага Хрыста на сцяне.

— Я хацеў пагутарыць з вамі, пан інстыгатар, аб справе шляхціча Казіміра Лышчынскага...— Тут нунцый загаварыў шэптам, які амаль патанаў у голасе завеі...

2

Позіркі сотняў вачэй сышліся ў адной кропцы. Адны глядзелі з прагнаю ці ленаватаю цікавасцю, другія — са шкадобаю і яскай спагады, трэція — найбольш людзі ў сутанах — з непрытоенай нянавісцю. Вочы многіх імкнуліся сустрэцца з ягонымі, ды пагляд чалавека ў шляхецкім адзенні, якога вялі па праходзе да ганебнай лавы, быў скіраваны некуды вышэй мора галоў. Чалавек быў паджылы, высокі, але згорблены, з зусім белымі пасмамі ў даўгіх жарых валасах. Яго выцягнуты бледны твар з запалымі вачыма нёс адбітак пакуты і адлучанасці, аднак трымаўся ён з такой годнасцю, што выглядаў не падсудным, а адным з паважных паслоў сойма.

Свецкія паслы, не кажучы ўжо аб духоўных, не раз і не два чулі яго імя. Гэта той самы берасцейскі падсудак Лышчынскі, справа якога вынесена сёння на разгляд. Нават няўтомным прыхільнікам Бахуса, што ўвесь вольны ад дзяржаўных абавязкаў час не вылазяць з-за хмяльных сталоў, вядома, што ліфляндскі біскуп Паплаўскі прызначаны надзвычайным суддзёй. Яму даручана дапытаць падсудка, вывучыць ягоныя пісанні і вынесці прысуд. Кажуць, гэты Лышчынскі несамавіты блюзнер і бязбожнік, якіх свет не бачыў, але тое ўжо справа дзесятая. Царква судзіць свабоднага шляхціча! Замах на святыя вольнасці высакароднага стану!

З'яўленне надзвычайнага суддзі на подыуме сойм сустрэў зацятым маўчаннем. Пасля першых слоў дэкларацыі з прысудам маўчанне зрабілася наструнена-пагрозлівым. І раптам зала выбухнула гáласам.

— Такім чынам, памянёны Лышчынскі з'яўляецца ворагам Бога і прыроды! — намогся перакрыць паслоў Паплаўскі, але зычны біскупаў голас знік у абураным крыку, як зацягнутая ў вір трэска.

У момант вока паважны сойм ператварыўся ў местачковы кірмаш. Першыя паўскоквалі з месцаў паслы Вялікага Княства. Нейкі кажанаваты, чырванашчокі і віславусы шляхціч у зялёным каптане ўзлез на лаву і фальцэтам выгукнуў:

— З якіх часоў сутаннікі шляхту судзяць? Патрабуем новага разбору!

— Новага разбору! — нібы сурмы на ловах, зараўлі дзесяткі два загартаваных у соймавых баталіях глотак.

Свецкія паслы Кароны ўхвальна гулі. Паднялася ўся пасольская палата. Сябры сената ўстурбавана перагаворваліся. Спакойнымі сярод гэтай буры выдавалі двое — чалавек на лаве падсудных і папскі нунцый. Праўда, смуглявы твар Кантэльмі ледзь улоўна пабялеў: нават ён не прадбачыў такой аднадушнасці. Цёмны румянец вярнуўся на яго шчокі, калі на подыуме вырасла велічная постаць інстыгатара Куровіча. Па зале нібыта пакаціліся нябачныя хвалі, і кожная прымушала аціхнуць яшчэ некалькі тузінаў ратоў.

— Плач, залівайся слязьмі, мая няшчасная Айчына! — Куровіч узняў рукі ўгору.— Куколь, кінуты на нявінную зямлю д'яблам, даў багатыя ўсходы! Плач, мая Айчына, ты нарадзіла пачварнага вылюдка і таму вартая гэтых слёз!

Інстыгатар узвысіў голас, але нязвычны пачатак прамовы і без таго ўсталяваў у зале і, здавалася, ва ўсім палацы звонкую вусціш. Недзе ў далёкім пакоі біў гадзіннік, і ў яго прыцішаных ударах чулася штосьці жудліва-няўмольнае.

— Сваім ілжывым пяром,— цяжка, як камяні, падалі ў цішыню словы інстыгатара,— ён спісаў цэлыя тамы, у якіх даводзіў, што няма Бога ні на небе, ні на зямлі. Як і ўласціва найміту д'ябла, ён пісаў іх пакрыёма, тоячыся ад людзей у начным мораку. Але ён забыў, якія ахвярныя слугі ёсць у нашага Збавіцеля. Рупнасцю аднаго з іх следства мае пятнаццаць сшыткаў трактата пад назваю, якую адмаўляецца вымавіць язык хрысціяніна. Гэтая кніга, дзе сабраныя злачынныя выказванні розных аўтараў і заморскіх філосафаў, называецца...— Куровіч умела вытрымаў паўзу.— Яна называецца «Аб неіснаванні Бога».

Па зале праляцеў шолах. Нунцый знайшоў вачыма віславусага шляхціча ў зялёным каптане. Той сядзеў, унурыўшы голаў у плечы. Кантэльмі малітоўна склаў рукі на каленях і ўзняў позірк да плафона.

— Апроч трактата, які можна параўнаць толькі з вялізным кублом аспідаў, мы маем вось гэтую, узятую з бібліятэкі бязбожніка, кнігу.— Інстыгатар з грымасаю гідлівасці паказаў на том, які ляжаў на стальцы поруч з ім.— На палях кнігі рукою Лышчынскага накрэслены словы, што з абурэннем адрынае кожнае богабаязнае сэрца.— Куровіч так, быццам страшыўся апячыся, узяў кнігу і, трымаючы яе ў адстаўленай руцэ, прачытаў: «Значыць, Бога няма...»

А ён — актор, падумаў нунцый і пашкадаваў, што ў лісце ў Рым нельга будзе перадаць усіх адценняў прамовы. Ён перавёў позірк на падсуднага і прыкмеціў, што твар у Лышчынскага з адлучанага стаў засяроджаным. Цяпер ён адбіваў напружаную працу думкі, і ад гэтага адкрыцця павеяла лёгкаю трывогай.

— Хіба можам мы,— грымеў далей Куровіч,— назваць хрысціянінам і грамадзянінам чалавека, што лічыць Святое Пісанне зборам казак і паданняў, а шаноўных багасловаў называе рамеснікамі пустазвонства, паўзучымі змеямі і слепакамі, якія ашукваюць, гаворачы, што бачаць у цемры?..

Сёй-той са шляхцічаў, асабліва паміж беларусінаў і жмудзінаў, хаваючы ў рукаў усмешку, штурхаў пад бок суседа. Лавы з духоўнымі пасламі незадаволена загудзелі: ці не занадта далёка сягае красамоўства пана інстыгатара?

А мой мядзведзь не такі просты, больш з ухвалаю, чым з раздражненнем, зазначыў Кантэльмі. Але яго ўсё мацней займаў падсудны, які ўважліва слухаў прамоўцу і разам з тым вачыма як быццам шукаў кагосьці ў зале. Нунцый дорага даў бы, каб даведацца, аб чым думае зараз гэты чалавек. Адкуль такі спакой? Пакора лёсу? А мо ён падрыхтаваўся бараніць сваё жыццё, бо не можа не разумець, што тут пахне

самай жорсткаю карай? Ён, Кантэльмі, гатовы прысягнуць, што бязбожнік нешта наважыў.

Нунцый злавіў сябе на тым, што ад хвалявання пачаў пастукваць пальцамі па поручні. Маленькія вярэдлівыя іголкі ўваткнуліся глыбей.

— ...Заміж парадку, самім Панам Богам усталяванага ў выглядзе грамадскіх станаў, уладаў і каралеўстваў, ён хацеў мець свет без правіцеля, народы без валадароў, а капітоліі без суддзі...

Лёгкім рухам пляча Куровіч скінуў долу бабровую мантыю і карцінна падняў магутную, як па́ліца, руку.

— Я абвінавачваю яго ў тым, што на 265 старонках свайго трактата ён насмеліўся паказаць Бога як няіснае стварэнне фантазіі і зрынуў яго з недасяжнай вышыні, прыпісаўшы кіраванне зямлёй і небам натуральнай прыродзе. Самога ж Пана Бога ён назваў выдумкай і хімерай, якая не мае рэальнага быцця. Страшнае злачынства вымагае страшнага пакарання. Dixi*.

І зноў у запанавалай цішы недзе далёка ўпалі глухія ўдары гадзінніка.

— Шляхціч Лышчынскі! — прагучаў голас маршалка.— Зараз вам будуць паказаны паперы, якія высокі сойм мае падставы лічыць вашымі.

Зноў сотні позіркаў спыніліся на чалавеку з ганебнай лавы, але цяпер спагада і шкадаванне адных былі прытоеныя, а нянавісць другіх вырасла настолькі, што нібыта пачала разлівацца ў паветры.

Падсудны неяк беражліва паклаў далоні на стос сшыткаў у скураных вокладках і з хвіліну заставаўся нерухомы. Затым асцярожна перагарнуў некалькі старонак.

— Шляхціч Лышчынскі! Ці прызнаяце вы гэтыя паперы сваімі?

Падсудны, скрыжаваўшы рукі на грудзях, з годнасцю выпрастаўся.

— Прызнаю,— сказаў ён у застылую ў чаканні залу. Падобны на пошум дрэў пад ветрам гоман не паспеў аціхнуць, як Лышчынскі загаварыў зноў:

* Я сказаў (*лац.*).

— Але хачу паведаміць высокаму сойму,— нунцый увесь падаўся наперад,— што сабраныя тут думкі я збіраўся абвергнуць у другой частцы трактата, якую маю намер напісаць, каб даць у ёй новыя доказы існасці Хрыста...

Знячэўлены гэткім паваротам справы маршалак ударыў у гонг.

З соймавых лаваў з ліцвінскай шляхтай пачуліся выгукі:

— Няхай кажа! Права шляхціча!

— Паслы высокага сойма,— абвясціў маршалак,— выслухаюць вашы доказы.

3

— Ты можаш ісці, брат Джузэпе.

Кантэльмі адкінуў нагалоўнік простай манаскай сутаны. Тонкія малакроўныя вусны нунцыя ўсміхаліся зычліва і крыху па-змоўніцку.

Ён упершыню бачыў гэтага чалавека так блізка. Цёмныя правалы вачніц, злямчаныя валасы. Невялікі шнар над левым куточкам вуснаў. «Вызначыўся ў турэцкую кампанію,— узбег на памяць запіс у блакітнай кнізе.— Браў удзел у кампаніях маскоўскай і шведскай...» Зашмальцаваныя рукавы некалі багатага кунтуша. Пяцьдзесят пяць гадоў, а выдае цяпер на ўсе семдзесят. І зноў гэты спакой на твары. На што ён спадзяецца?

— Паверце,— мякка прамовіў Кантэльмі,— мой візіт выкліканы шчырым імкненнем дапамагчы вам. Ваша права сумнявацца ў маіх словах, але, застаўшыся з вамі сам-насам, я нават рызыкую.

— Чым? — у вачах у Лышчынскага загарэліся жарынкі кплівае цікавасці.

— На духоўную асобу, якая без сведкаў гутарыць са слугой д'ябла, незалежна ад яе сану падае цень падазрэння...

— Як вы сказалі? Са слугой д'ябла? — Лышчынскі голасна засмяяўся, і нунцыя непрыемна ўразіла, што смех не быў удаваны.— Ваша правялебнасць, я магу пайсці ў заклад на мой маёнтак пад Берасцем, што вы

самі не вельмі верыце ва ўсіх гэтых слуг д'ябла і ў самога анёла-адступніка, калі не сказаць больш... Няўжо вы меркавалі пачуць тут серны смурод?

Нунцый на імгненне сумеўся.

— Я разумею, доўгія месяцы зняволення...

— Незаконнага зняволення, ваша правялебнасць...

— ...не могуць не накласці адбітку на паводзіны і словы чалавека,— непарушна працягваў нунцый.— Але ваш розум варты таго, каб дараваць вам гэты... як у вас кажуць?.. выбрык.

Зыркія язычкі свечак затрымцелі, сцены вязніцы дыхнулі зімовай стыласцю. У куце, там, дзе стаяў тапчан, засланы тонкай шэраю посцілкай, размерана крапала з невысокіх, чорных ад куродыму скляпенняў. Кантэльмі прыслухаўся да хворай ныркі і шчытней захінуў сутану. Ад шчыліны ў сцяне поўз па падлозе белы пасак снегу.

— Цаню ваш учарашні ход. Ненапісаная частка трактата, дзе будуць абвергнуты высновы першай... Ардынарны розум на такое не здатны. Аднак вашы новыя доказы існавання Госпада выглядаюць... не зусім пераканаўчымі. Зрэшты, магчыма, я проста не ўсё як след зразумеў. Згадзіцеся, на сойме было даволі шумна...

Вязень дапытліва паглядзеў нунцыю ў вочы, але Кантэльмі ганарыўся тым, што мог вытрымаць любы позірк.

— Я сказаў,— трохі нервова загаварыў Лышчынскі,— што ў кожным родзе істот ёсць найбольш дасканалая. У Сусвеце найдасканалейшым і найважлівейшым з'яўляецца Сонца, у свеце жывёл — чалавек, а сярод разумных стварэнняў самая дасканалая істота — Бог.

— Вельмі, вельмі цікава. Але, прабачце,— вочы ў нунцыя металёва бліснулі,— вашы доказы, па сутнасці, з'яўляюцца нечым зусім процілеглым. Са слоў пана філосафа вынікае, што ён прымае небяспечную і асуджаную царквой тэорыю Мікалая Каперніка і ставіць Сонца ў цэнтр Сусвету, хаця бясспрэчна, што яго цэнтр — найдасканалейшая Зямля, населеная створанымі на вобраз і падабенства Божае людзьмі. Далей вы сцвярджаеце, што чалавек — найвышэйшая жывёліна. Ці не сведчыць гэта пра сумненні ў тым, што Адама і Еву стварыў Бог? Відаць, пан філосаф занадта старанна вывучаў сачыненні Арыстоцеля. Той, як вядома, лічыў, што людзі мусяць выводзіць сваю генеалогію ад малпаў. Ці можна ўявіць што-небудзь больш бязглуздае і недарэчнае? А чаго варты ваш трэці доказ, які зводзіць Госпада нашага да ўзроўню анёлаў і самога грэшнага чалавека!

— Заўважце,— сумна сказаў нунцый пасля цяглай пярэрвы,— не выключана, што мае словы не зусім адпавядаюць маім уласным поглядам. Але гэта пазіцыя царквы.— Ён узняў угару палец.— Паўтараю: царквы! На маёй радзіме, а таксама ў многіх іншых хрысціянскіх краінах любога з вашых доказаў было б дастаткова, каб адправіць чалавека на аўтадафэ. Вы хацелі абараніць сябе, але толькі пагоршылі сваё становішча.

— Я ведаю,— спакойна адказаў Лышчынскі,— што інквізітары паслалі на вогнішча мільёны людзей і праз менш важкія прычыны. На шчасце, на маёй радзіме інквізіцыя скасаваная яшчэ дзвесце гадоў таму*. Мяркуйце самі, ваша правялебнасць, у каго ў гэтым сэнсе большыя падставы ганарыцца радзімай.

Усмешку вязня падаўжаў шнар, і ад гэтага яна выдавала яшчэ больш саркастычнаю. Кантэльмі адчуў, як хворую нырку ўтнула новая іголка.

— Вам пагражае вогнішча...— нягучна вымавіў нунцый.

Страх! Хай толькі адно імгненне, але ён бачыў на твары ў гэтага чалавека страх!

— Вашы біскупы настойваюць менавіта на такім пакаранні. Баюся, што пасля прамовы інстыгатара Куровіча...

Белы снегавы пасак на падлозе пачаў ператварацца ў невялічкі сумёт. У вязніцы зрабілася зусім зімна. Са скляпенняў ужо не крапала.

* Уведзеная ў 1436 г. у Вялікім Княстве Літоўскім інквізіцыя праз 43 гады была зліквідаваная.

— Вы кажаце, вогнішча...— Лышчынскі паднёс азяблыя рукі да кандэлябра.— Вы верыце ў тое, што, спаліўшы чалавека, можна спаліць думкі, якімі ён набліжаўся да ісціны?

— Папера нядрэнна гарыць...

І зноў на бледным твары мільгануў страх. Зараз, падумаў нунцый, зараз!

— Заклінаю вас паверыць, я ваш сябра,— усхвалявана загаварыў ён.— Я хачу выратаваць вас. Я хачу выратаваць ваш трактат. Ён патрэбны будучым пакаленням. Вы будзеце жыць і атрымліваць ад жыцця ўсе яго асалоды... У вас будзе магчымасць пісаць кнігі...

На твары ў Лышчынскага змагаліся недавер і надзея.

— Вы павінны толькі... Гэта адзінае выйсце... Вы павінны... дзеля будучай перамогі ісціны... вярнуцца... у лона ордэна.

— Вярнуцца ў лона ордэна? — Вязень і яго вялізны згорблены цень на сцяне затрэсліся ад рогату, і нунцый спалохана адхіснуўся.— Вярнуцца ў лона ордэна! Каб глядзець на старшага, як на самога Хрыста? Каб аддацца ягонай волі, як труп, які можна паварочваць на ўсе бакі? Гэтага вы прагнеце? Альбо як там яшчэ ў трынаццатым параграфе? Каб ні ў чым не памыліцца, мы абавязаны верыць, што тое, што мы бачым белым, ёсць чорнае, калі такім яго называе царква...

— Цытуеце Лаёлу*...— ашчэрыўся нунцый.— Як я зразумеў, вы не гатовы прынесці ахвяру на алтар ісціны. Ну што ж, у такім разе царква паклапоціцца, каб пасля вас не засталося нічога. Нашчадкі не будуць ведаць нават вашага імя. Ваша жыццё скончыцца марна, як жыццё матылька ў полымі свечкі.

Надоўга павісла маўчанне. Двум мужчынам каля нехлямяжага стала ўжо не было аб чым гаманіць, але Кантэльмі парушыў цішыню:

— У вас ёсць яшчэ адна магчымасць палепшыць свой лёс.

Лышчынскі насмешліва ўскінуў брыво, і нунцыю

* Ігнацы Лаёла — заснавальнік Ордэна езуітаў. Лышчынскі цытуе «Духоўныя практыкаванні» Лаёлы, дзе выкладаліся прынцыпы паводзін сяброў ордэна.

здалося, што страх, які ён нядаўна бачыў у вачах у гэтага чалавека, яму толькі прымроіўся.

— У «Маніфесце» вашага суседа і сябра...— вусны нунцыя кранула ледзяная ўсмешка,— вашага сябра Яна Бжоскі я сустрэў вельмі цікавую мясціну. Ён піша, што вы шчодра дзяліліся сваімі поглядамі. «Ён заражаў гэтай навукай, як атрутнаю заразай, нявінныя розумы юнакоў і людзей сталага веку...» Вы не назвалі б мне некалькі імёнаў? Цана — надзейны схоў для вашага трактата. Скажам, стагоддзі праз тры яго нечакана знойдуць у бібліятэцы Віленскай акадэміі... Прыйдзе час, калі ваша alma mater будзе ганарыцца такім выхаванцам. Усяго некалькі імёнаў...

— Ваша правялебнасць, мне здаецца, сярод нас сапраўды ёсць служка Вельзевула...

У нунцыя адхлынула ад твару кроў.

— Вы забываеце, што святая царква мае сродкі развязаць язык самым зацятым!

Зняволены ўстаў.

— Наша шляхта можа аддаць галасы за вогнішча, але свае прывілеі яна будзе бараніць да апошняга. Шляхціча не выдадуць на катаванне. Нават калі ад яго пахне серай,— стамлёна скончыў ён.

— Запомніце...— прасычэў нунцый.— У вас быў адзіны шанец. Вас спаляць...

— Прынамсі, на колькі хвілін можна будзе сагрэцца.

— Вы... вы...— задыхнуўся Кантэльмі і раптам з бяссілай злосцю на сябе самога зразумеў, што разам з нянавісцю ён насуперак сваей волі адчувае да Лышчынскага і нешта зусім іншае.

Няўжо ён гутарыў з бязбожнікам не толькі дзеля справы ордэна, няўжо ў словах пра выратаванне быў хоць драбок праўды? — хутаючыся ў футра, думаў нунцый па дарозе дамоў.— Няўжо атэіст атрымаў над ім, прадстаўніком папы, нейкую ўладу? Не, гэта немагчыма...

4

— Расследаваўшы справу Казіміра Лышчынскага, абвінавачанага шляхцічам Бжоскам з шасцю сведкамі, роўнымі яму паходжаннем, мы пераканаліся, што

абвінавачаны заслужыў больш суровае пакаранне, чым за крымінальныя злачынствы, і вынеслі наступны прысуд...— Голас маршалка гучыць урачыста, амаль узнёсла.— Напісаныя Лышчынскім бязбожныя лісты аддаць агню пры выканаўцы правасуддзя ў яго правай руцэ на эшафоце, самога ж абвінавачанага спаліць і ператварыць у попел. Маёмасць канфіскаваць, падзяліўшы напалам паміж даказчыкам і скарбам. Будынак, у якім асуджаны тварыў ганебныя пісанні, разбурыць як прытулак вар'ята. Зямля яго маёнтка павінна навечна застацца пустэльнай і бясплоднай... Апавешчана року ад нараджэння Божага 1689, месяца марца, 28 дня...

Нунцый нібы зноў чуе, як на ўчарашняй сесіі сойма напышлівы маршалак Радзівіл чытае каралеўскі дэкрэт. Бязбожнік на лаве падсудных слухае прысуд не проста спакойна, а нават з нейкаю веліччу, і ён, Кантэльмі, зноў трапляе ў палон ужо знаёмай бяссілай зласлівасці...

Увесь сённяшні дзень ён змагаўся з хваравітым жаданнем яшчэ раз убачыць асуджанага, гутарыць з ім. Дзеля чаго? Каб хоць на хвілю зноў згледзець у яго ў вачах страх? Кантэльмі не здолеў бы адказаць з пэўнасцю і недзе ў глыбіні душы баяўся сустрэчы, але вазок ужо калываецца на выбоінах, а ў памяці чамусьці ажывае цырымонія ў касцёле святога Яна.

Лышчынскі ўслед за гэтым ліфляндскім вепруком Паплаўскім паўтарае словы адрачэння... Абрад адпушчэння грахоў — лёгкія ўдары лазінаю па аголенай спіне ерэтыка... Задаволеныя твары біскупаў. Цікаўнасць і тое ж задавальненне ў позірках караля і каралевы. І адзін ён, Кантэльмі, не адчувае сябе пераможцам.

Ён дагэтуль б'ецца над загадкаю: чаму Лышчынскі згадзіўся на адрачэнне? Ненадоўга заснула яго воля? Ці мо спадзяваўся на выратаванне? Тады, тры тыдні таму, прыняты прысуд яшчэ трымалі ў таямніцы. Не, ён не мог не ўсведамляць, што ягоны лёс вырашаны. А можа, у той дзень, у касцёле святога Яна, яго пакора была ўдаванаю, можа, адракаючыся ад сваіх злачынных памылак, ён адно здзекаваўся з усіх і з яго, прадстаўніка папы? Гэты чалавек здатны і на такое. Нездарма кіеўскі біскуп Залускі кажа, што ў Лышчынскага адамантавае* сэрца. Той самы Залускі, які запатрабаваў у сваёй прамове пакарання смерцю...

Вось і змрачнаватыя муры кляштара, дзе бязбожнік сустрэне апошняе світанне. Выходзячы з вазка, нунцый падняў вочы ўгору. Вакол крыжоў, уваткнутых у каламутнае звечарэлае неба, кружлялі гракі, і чорныя птушкі знячэўку ўявіліся Кантэльмі вялікімі хлапякамі попелу.

І зноў цяжкія, акутыя жалезнымі пасамі дубовыя дзверы, і зноў стыласць вязніцы і прыгорбленая постаць чалавека на тапчане.

— А я чакаў вас, ваша правялебнасць. Я ведаў, што вы прыйдзеце,— першы падаў голас Лышчынскі.— Спакусліва паназіраць, як паводзіць сябе за дзень да страты асуджаны?

— У мяне іншыя мэты...

— О, даруйце, ваша правялебнасць. Я зусім забыў. Вы, вядома, зноў вырашылі шчыра дапамагчы мне.

— Але. Мне здаецца, чалавеку заўсёды лягчэй развітвацца з гэтым светам, маючы хоць іскрынку спадзявання на літасць Збавіцеля.— Нунцый пераражагнаўся.— Я гатовы прыняць споведзь...

— Ці не ўважае ваша правялебнасць, што з самага пачатку размова становіцца марнай?

Які сарказм у гэтай усмешцы і пасаку шнара! Але ў яго, нунцыя, ёсць яшчэ адзін сродак прымусіць бязбожніка пахіснуцца.

— У такім разе,— Кантэльмі пазіраў на бурштынавыя пацеркі ў сваіх руках,— я паведамлю вам цікавую навіну. Сярод паслоў сойма мы знайшлі аднаго з вучняў і паслядоўнікаў пана філосафа... Памятаеце Мацея з Ружанаў, вашага сябра па калегіуму і акадэміі? Ён у нас у руках...

Нунцый кінуў маланкавы позірк на асуджанага. У вачах у таго было балючае хваляванне.

— Ён у нашых руках,— унікліва казаў нунцый,

* Алмазнае *(старабел.)*.

цяпер пазіраючы Лышчынскаму проста ў вочы,— але вы не павінны трывожыцца за лёс сябра. Ордэн нічым не дасць яму зразумець, што мы ведаем аб яго злачынствах перад Богам. Безумоўна, да канца дзён ён будзе пад таемным наглядам, аднак мы вырашылі пакінуць яго на волі. Мы вырашылі так пасля соймавага збору галасоў. Мацей выказаўся за ваша спаленне...

О, я бачу ў вас на твары боль...— Голас нунцыя гучаў роўна, у ім нельга было пачуць ні каліва радасці.— Але ж Мацей будзе жыць, па сутнасці, дзякуючы вам. Нявызнаныя шляхі Божыя...

— Мне здаецца, я пачынаю разумець, чаму вы прыйшлі зноў, ваша правялебнасць... Аднак ці не замалая цана — перамога над чалавекам, жыццё якога, паводле вашых слоў, скончыцца марна, як жыццё матылька ў полымі свечкі?

— Вы яшчэ сумняваецеся ў гэтым? — спытаў нунцый, уражаны пранікліваcцю асуджанага.— Сёння кат спаліў усе вашы творы. Што цяпер застанецца пасля вас?

— Я адкажу вам,— памаўчаўшы, прамовіў Лышчынскі.— Нядаўна мне прысніўся незвычайны сон. Напэўна, такія сны і бываюць усяго раз у жыцці... Я лётаў. Уцёк ад хатняга настаўніка лаціны, бег па цёплай зялёнай сцежцы і раптам — паляцеў...

Вочы зняволенага глядзелі ўжо не на нунцыя, а скрозь яго.

— Унізе маёнтак, нашы ліпы, куст каліны на раздарожжы, а я лячу ўсё далей і...— Вязень нечакана асекся і працягваў ужо зусім іначай: — Дык вось, ваша правялебнасць, пасля смерці кожнага чалавека застаюцца яго зямля і яго народ. І яны, а не ваш ордэн, вырашаюць, як чалавек пражыў адмеранае яму і чаго вартае яго жыццё.

— Народ... Не будзьце наіўным, пан філосаф. Ваш народ ужо напалову забыўся, хто ён. Усе заклапочаныя адно тым, каб набіць чэрава. Пройдзе яшчэ гадоў сто, і ваш народ знікне, растворыцца ў больш цывілізаваным...

— Маю зямлю шмат хто хацеў скарыць. Адны, бясспрэчна, з дазволу і ў імя вашага бога, мячамі адбіралі

ў яе людзей жыцці. Другія, разумнейшыя, атручвалі золатам і прыгожымі ліслівымі словамі душу і розум яе лепшых сыноў. Але мая зямля заўсёды падымалася, і яна яшчэ выпрастаецца, каб скінуць са сваіх рамёнаў усю набрыдзь, у тым ліку і такіх шчырых сяброў, як вы, ваша правялебнасць. Вось чаму ў мяне, асуджанага бязбожніка, які заўтра памрэ, няма зайздрасці да вас.

Па-ранейшаму размерана крапала са столі, па-ранейшаму трымцелі агеньчыкі свечак, але нунцыю здалося, што ў вязніцы нешта зыначылася. У яго мільганула вар'яцкая думка, што гэта не Лышчынскі, а ён чакае пакарання смерцю, што гэта яму чыталі ўчора прысуд. Няўжо ён не памыляецца, бачачы ў запалых гарачкавых вачах насупраць шкадобу?

На нунцыя раптам навалілася тупая стома, якая заглушыла нават боль у хворай нырцы. Ён цяжка падняўся і моўчкі рушыў да дзвярэй, аднак шматгадовая звычка пакідаць апошняе слова за сабой спыніла яго.

— Кароль замяніў вогнішча на адсячэнне галавы,— сказаў ён цераз плячо.

Лышчынскі кпліва ўсміхнуўся:

— Калі ў вас будзе нагода, перадайце манарху, што я заўсёды лічыў яго надзвычай высакародным чалавекам.

5

За ліловымі ўзорыстымі шыбамі згусае сутонне. Канец сакавіка. У Рыме і па ўсім Лацыю цвітуць сады, а тут яшчэ падае снег. Кроў на снезе... Калі гэта ён бачыў кроў на снезе?.. Перад Калядамі, на каралеўскім паляванні ў лясах пад Берасцем. Пад Берасцем, дзесьці там, адкуль гэты бязбожнік... На бялюткім снегавым палатне расплывалася з-пад забітага зубра вялікая пунсовая пляма. А чалавечая кроў? Снег ішоў усю ноч, значыць, эшафот таксама быў белы-белы...

Нунцый сядзіць у сваім кабінеце за сталом з багатым атрамантавым прыборам. У крылах вычварнай пазлачонай птушкі тырчаць загостраныя лебядзіныя пёры, і полымя каміна кладзе на іх чырвоны водцень.

Ці не таму ён марудзіць брацца за пяро? Якая недарэчная чуллівасць!

Ён устае і падыходзіць да вакна. Сёння той чаканы дзень, калі ён нарэшце паведаміць па́пу, што правасуддзе здзейснілася. А на душы, як і раней, звыклы ўжо верад, ад якога не памагае малітва. Можа, ва ўсім вінаватая яго хвароба, з надзеяй думае нунцый. А калі і не, дык вось зараз ён павернецца, зараз загаворыць Джузэпе, які маўкліва чакае ўжо цэлую хвіліну, і павінна прыйсці вызваленне ад гэтага цяжару. Ён проста выкрасліць бязбожніка з памяці.

— Ну? — патрабавальна кажа нунцый, па-ранейшаму стоячы спінай да слугі.

— Ваша правялебнасць, прысуд выкананы.

— Кажы...

— На пляцы Старога рынку кат сцяў яму галаву,— крыху здзіўлена працягвае Джузэпе.— Цела вывезлі за горад і спалілі. Попелам стрэлілі з гарматы.

— Як ён сустрэў смерць? — пытае нунцый, марна шукаючы ў душы нейкую палёгку.

— З годнасцю і паказаў сябе цалкам падрыхтаваным да яе, ваша правялебнасць.

— Ты можаш ісці.

Манах марудзіць.

— Што яшчэ, Джузэпе?

— Да вас інстыгатар Вялікага Княства Літоўскага Куровіч.

— Скажы, што мяне няма дома,— з несхаваным раздражненнем гаворыць нунцый і, хутка справіўшыся з сабой, ужо разважна дадае: — Не, лепей скажы, што пішу тэрміновае пасланне ў Рым. Перадай інстыгатару, што я чакаю яго заўтра.

1984

Міласць князя Гераніма

Мы, урад Крычаўскай магдэбургіі, выслухаўшы абодва бакі, вызначылі, што вышэйпамянёныя верхаводы чатыры гады цэлыя воласці бунтавалі, арданансаў яснавяльможнага князя Радзівіла не прызнавалі, а губернатараў і пастаўленых імі па фальварках падстарастаў выганялі, білі і мардавалі, маетнасць іхнюю рабавалі і сабе на пажытак забіралі і нарэшце на людзей пана свайго літасцівага яго мосці князя Гераніма Радзівіла, падчашага Вялікага Княства Літоўскага, двойчы, пад Крычавам і пад Царковішчамі, са зброяй у руках выступіць наважыліся.

Таму ў адпаведнасці з правам паспалітым раздзела I, артыкула 3 Статута року 1588 аб такіх самавольных купах строга апісанага, рупячыся, каб надалей падобнага не чынілася, прысуджаем і загадваем разбойнікаў Івана Карпача, Стэся Бочку, Васіля Ветра, Мікіту з Бароўкі, Івана Труса, Навума Буяна, Андрэя Костку, Васіля Пачаёнка і Васку Косціна жывых пасадзіць на па́лю; Івана Дакуку, Захарку Сямашку, Янку з Баранкова, Мікіту з Тупічына на шыбеніцы павесіць; Сымону Вароне, Ігнату Малунёнку, Івану Крывулю, Яну Галёнцы адсекчы галовы.

Справа гэтая перад бурмістрамі, а таксама райцамі, лаўнікамі і ўсім магістратам Крычаўскім вышэйпамянёным бунтаўшчыкам і разбойнікам абвешчана і да кніг магдэбургскіх запісана року ад увасаблення Сына Божага 1744, фебруарыя 22 дня.

Дык ведайце, што за адзін дзень і дзве ночы да страты яго мосць князь Геранім Радзівіл сказаў мне: «Слухай, Карпач, а калі загадаю пяць тваіх сяброў-баламутаў памілаваць, тады мы з табой піва зварым?» Я адразу і не ўцяміў, які гандаль ён пачынае, а князь: «Ну добра, хочаш патаргавацца — бяры яшчэ трох». Сказаў, быццам кінуў мне гэтыя тры душы, як пэйса-

ты Лейба кідае на шалі тры селядцы ў сваёй краме пад ратушай. «Пяць і яшчэ тры. Роўна палова. Падумай, гарматнік».

Даў мне князь ноч на роздум, і тая ноч сталася для мяне страшнейшаю за бітву пад Царковішчамі. Палкоўнік Пястжэцкі разбіў пад Царковішчамі нашую рацъ, але, далібог, там мне было лягчэй, бо там княжыя жаўнеры забівалі нас, а мы — жаўнераў, там, на полі, усё было проста, а тут мог я ўратаваць палову маіх пабрацімцаў, але дзеля гэтага мусіў асудзіць на пагібель другую палову, а яны ж таксама падымалі людзей на паўстанне, а цяпер кармілі са мною астрожных вошай і чакалі блізкае смерці.

А было так. Адвячоркам, акурат Сымон Варона показку расказваў, як цыган спавядаўся, адчыніліся ў нашай каморы дзверы, і той паручнік з крывым носам, што да нас прыстаўлены быў, з парога, быццам ерыхонская труба, раве: «Карпач, пся костка! Князь Геранім да сябе патрабуе!»

Ну, я з пабрацімцамі на выпадак, калі ўжо на гэтым свеце не пабачымся, абняўся, і павялі мяне ў княжыя пакоі. У замку яшчэ нас нейкі шляхціч у даламане з лісінаю падбойкаю запыніў. Усё гразіўся, што хутка яны і самога Вашчылу зловяць і над валам за яйцы падвесяць, а потым у жаўнера паходню выхапіў і хацеў мне бараду падпаліць, але паручнік не даў — відаць, баяўся, што князь не пахваліць, калі ад мяне, нібыта ад смаленага вепрука, смярдзець будзе.

Гаманіць са мною князь Геранім пачаў лагодна і не па-польску, а па-наску, па-беларусінску, і амаль не заікаўся, а значыцца, пад добраю чаркай быў — я ў гэтым, столькі гадоў сялянскія суплікі* да яго возячы, добра ўжо кеміў. Але ведаў я і тое, што клёку ў яго мосці віно ніколі не замуціць, хоць бы і цэлую балею выжлукціў.

— Ну што, певень галагуцкі? — пытаецца.— Усё ты да мяне на гасціны ездзіў, а цяпер я да цябе заявіўся.

А сам у чугаі з паўлінавымі пёрамі на канапцы сядзіць, а праўдзівей, не на канапцы, а, быццам кот, на

* Скаргі.

каленях у выляжанкі сваёй прымайстрыўся. Кучаравая такая ды ўкормленая, бельмачкамі асавелымі на яго бліскае і ручкай па плеху гладзіць. Гады два, як я яго мосці не бачыў. Яшчэ і трыццаці князю не стукнула, а ўжо болей на старога, чымся на маладога, выдаваў. Плех на ўсю голаў, твар ці то ад віна, ці то ад хваробы якой, нібы сакавіцкі снег, раздруз, адно вочы тыя ж засталіся, гэткія гострыя, што, здаецца, парэзацца аб іх можна. Не, думаю, не проста так князь паручніка па мяне паслаў.

— Прыпазнілася твая мосць,— адказваю,— а то б ужо праз твае рэбры авечкі сена цягалі.

А ён не гневаецца, а рагоча і дзеўку сваю ад задавалення шчыкае.

— Складна кажаш, гарматнік! Люблю цябе за розум, далібог, люблю. А два разумныя чалавекі і старгавацца могуць, га? Да таго ж калі даўнія знаёмцы. А мы з табой, Карпач, ужо, пэўна, гадоў з дваццаць знаемся. З тае пары, як ты матачцы маёй незабыўнай першую супліку ад крычаўскіх мужыкоў прынёс. Ці памятаеш? Я, хоць і малы тады быў, добра цябе запомніў.

— Гэта,— пытаюся,— калі твая княская мосць ката́ пад сталом душыла?

— Вось-вось! — узрадаваўся.— А ты, жаласная душа, у мяне таго ката адабраў.

Тут ад ягонае весялосці зло пачало мяне разбіраць.

— Гэта,— кажу,— відаць, тады твая мосць на катах вучылася, каб потым людзей гэтак хапаць.

А князь:

— Ай, малойча, ай, люблю! І за розум люблю, і за смеласць!

Я тады праз тое, што ніяк змікіціць не мог, куды ён гаворку верне, зусім зазлаваў.

— А ведаеш,— пытаюся,— што таго разу, калі ты з ката́ дух выпусціў, я тваёй княскай мосці матку ў лапці абуў?

Ну і распавёў, як насіў тую супліку на дзяржаўцаў* Валкавіцкіх. Тыя, скуралупы, за два гады з Крычаўскага староства сто тысяч злотых звыш інвента-

* Арандатараў.

роў выбілі і сабе ў кішэню паклалі. Княгіня тады пры мне універсал да дзяржаўцаў пісала і дужа на іх гразілася. Не ведала дабрадзейка наша, што вучыў я некалі ў брацкай школе трывій з квадрывіем*, хоць і не давучыўся. Каб ведала, не тыцкала б у той універсал пальцам з пярсцёнкам, бо не гразьбу слала Валкавіцкім, а загадвала прыслаць ёй медавухі і журавінавага сочыва. Хацела мяне вакол пальца абкруціць, ды сама дулю з макам з'ела, таму што вазіў я потым ейны універсал па вёсках і чытаў не пра сочыва, а пра тое, што загадвае нам княгіня на бунт супроць дзяржаўцаў падымацца і пра тое ёй хутчэй адпісваць.

Князь выслухаў і ажно нагамі затупаў:

— Ай, малойча! Ай, матуля незабыўная!

А тады раптам паважны зрабіўся і з каленяў у сваёй выляжанкі злез.

— Досыць,— кажа,— гарматнік, а то за смешачкамі справу не зладзім. Што там пра цябе ў выраку напісана? На па́лю?

— На па́лю,— адказваю.

— А не хочацца, мусіць, га?

І яму, маўляў, таксама мяне на смерць пасылаць не хочацца. І нядорага ён у мяне за маю галаву папросіць. Сказаў і нешта са шкапіка цягне. Глянуў я, а гэта нібыта той сшытак, у які кушняроў сын Кузьма паводле Вашчылавага загаду ўсё пра нашае паўстанне запісваў.

І праўда, разгарнуў князь сшытак і чытае: «Пісаў Кузьма, Стэсеў сын».

— Ой,— крычыць,— ратуйце мяне! Як жа гэтыя крамзолі звацца будуць? Можа, Евангелле ад Кузьмы? Га-га-га! А хто тады за Хрыста быў? Васька Вашчыла? Чаму ж ён за вас на крыж не пайшоў? Добранькі Хрыстосік! Сам пяты падмазаў, а сваё дабро на Украіну яшчэ загадзя перавёз. Усё наадварот. Той за людзей смерць прыняў, а за гэтага вы прымеце.

— Не за яго прымем,— кажу,— а за тое, што волі хацелі. Не было б Вашчылы, іншы знайшоўся б.

* Цыклы навучальных дысцыплін у сярэднявечных беларускіх школах: трывій — граматыка, рыторыка, дыялектыка; квадрывій — арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка.

І няхай твая мосць не блюзнерыць і Хрыста з Вашчылам не раўнуе. Чалавек гэты не святы і ў Бога не болей за нас з табой веруе, але што помніць яго даўжэй за тваю мосць будуць, тут я табе галаву на калодку пакласці магу. Дзеля гэтага Кузьма свой дыярыуш і пісаў, а праўдзівей, не дыярыуш, а гісторыю, бо пісана яна на памятку ўнукам нашым.

А князь зноў ад рогату заходзіцца:

— Герадот новы знайшоўся! Га-га-га!

Хто гэты Герадот быў, я не ведаў, хоць імя такое як быццам некалі і чуў. Таму пра Герадота я пярэчыць не стаў, але кажу:

— Няхай твая мосць дужа не цешыцца, таму што Кузьма ў табары пад Царковішчамі сваю гісторыю яшчэ ў адзін сшытак спісаў, і ён цяпер разам з Кузьмою далёка.

Радзівіл жа выскаляецца: не далей Кузьма за пекла, а што перапісаў — таксама яму, князю, на захаванне пакінуў. І са шкапіка яшчэ адзін сшытак цягне. Зірнуў я: той самы, у рудых корках. Такая тады лютасць за сэрца ўзяла, што князь, як вочы на мяне падняў, так пістолю з-за пояса і выцягнуў.

— Ой,— кажу,— прычакае твая мосць, калі Вашчыла вернецца.

А ён пістолю ў руцэ круціць і:

— Я, Карпач, хачу, каб і ты ягонага другога прышэсця дачакаўся. І цана мая танная. Гэтыя вось крамзолі,— на Кузьмовыя сшыткі ківае,— мы на посмех нашым нашчадкам схаваем, а ты новую гісторыю складзеш. Напішаш, як добра вам пад маёй уладаю жылося. А потым, маўляў, прыйшлі з-за кардона бунтаўнікі, а я вас, сірот, у міласэрнасці сваёй бараніў, і вы самі гэтых бунтаўнікоў закардонных маім жаўнерам лавіць і страляць памагалі. А року ад нараджэння Сына Божага 1744, напішаш, было ў месце Крычаўскім вялікае свята, бо пакараў князь Радзівіл разбойнікаў з памагатымі, а тых, хто за праўду стаяў,— усіх узнагародзіў. І ніколі вы ў такім шчасці не жылі, бо не бачыў яшчэ свет валадара мудрэйшага і справядлівейшага, ніж Геранім Радзівіл.

А пасля, значыцца, я, Іван Карпач, імя сваё падпісаць мушу, каб і мяне побач з яго княскай мосцю гадоў праз трыста ці праз паўтысячы ўзгадвалі як чалавека да ягонай вяльможнасці набліжанага.

Паслухаў я і кажу:

— Няхай твая мосць выбачае, я ж з табой і сёння на адным полі сраць не сяду, а ты хочаш, каб праз трыста гадоў у цябе ў сябруках хадзіў.

Ён жа як быццам слоў маіх і не чуе. Поўную, значыцца, ён мне волю, як перапішу, дае. Захачу — з усім скарбам у Масковію ад'ехаць магу, адпускае.

— А што я там,— пытаюся,— не бачыў? Як той казаў, на Падоллю пірагі па коллю, а мы прыйшлі ды скулля знайшлі. Тут хоць лусту хлебную чым прысаліць маем, а там у людзей і солі няма. Якога ліха мне туды падавацца, калі стуль да нас уцякаюць. Ды там,— кажу,— калі пра Пятрову дачку, што на троне сядзіць, ці пра немчыка, якога яна сабе на замену выпісала, калі пра іх слова не тое вымавіш, язык вырвуць і — у Сібір. А калі молішся не так, як патрыярх Нікан загадаў, дык цябе нават з магілы дастануць і сабакам на пажыву кінуць. Лепей ужо я ў сваю зямлю лягу, хоць і шмат на ёй поскудзі поўзае.

Ды толькі князю мае словы, што сценцы гарох. Няволіць не будзе, адно каб Кузьмовы сшыткі перапісаў, а там, калі ў Масковію не хачу, магу пры яго мосці як у Бога за пазухай жыць.

— Хочаш,— пытаецца,— кожную ноч новую дзеўку пасылаць буду? — У яго, маўляў, гарэм не горай, як у турэцкага падзішаха. А калі ахвота, і са шляхцянкамі пазабаўляцца можна.

— Хочаш, яе хоць сёння бяры? — І на выляжанку сваю паказвае, а тая зубы прадае, бо, відаць, анічога па-наску не цяміць.

Князь да яе як быццам па-нямецку загаварыў, і яна, сучка юрлівая, да яго цягнецца, не ведае, што ён хвілю таму мне яе аддаць хацеў. Не разумеў я спярша, штó яны там гергеталі, аж раптам скрывілася гэтая немачка, нібыта ад благога паветра, і, чую, ужо на лаціне балбоча: маргарытас антэ поркас. Гэта значыць — перлы

перад свіннямі сыпаць. Я, праўду сказаць, кнігу пасля школы ў руках трымаў нячаста, але з тузін розных лацінскіх прамудрасцей, што некалі нам манах Ясафат з базыльянаў на памяць вучыць загадваў, у галаве на ўсё жыццё зачапіліся. Ну, я глуздамі варухнуў і кажу:

— Не са свінняў мы, а з крычаўскіх гарматнікаў, якім яшчэ сам кароль Сцяпан Батура вольнасці вялікія даў і якія маскоўскіх людзей пушкарскай справе навучалі. І на лаціне мы тваёй бл...й мосці таксама сказаць сёе-тое агораем. Нон бэнэ про тота лібэртас,— кажу,— вэндытур аўра.

Не прадавайце, значыцца, волі ні за якое золата.

Яны з князем вачыма лыпаюць, а ў мяне сэрца ад радасці скача, што гэтак усё спрытна атрымалася. Вось табе, княжа, мой адказ. А цяпер загадай назад у астрог весці, пайду да Абрама на пачостку збірацца.

Радзівіл з твару пацямнеў і з пістоляю гуляе. Ну, думаю, калі стрэліць зараз, дык і зусім добра, не трэба будзе пудзілам на пáлі тырчаць. Не ведала яшчэ мая душа, якія ёй пакуты пражыць наканавана. Так лёгка зрабілася, нібы памерці — гэта як Сож улетку пераплысці.

Вось у тую хвіліну ён і сказаў:

— Слухай, Карпач, а калі загадаю пяць тваіх сяброў-баламутаў памілаваць, тады мы з табой піва зварым?

А потым:

— Бяры яшчэ трох. Няхай якраз палова будзе.

І тут душа мая пахіснулася, а князь, гэта ўбачыўшы, пяро схапіў і прыспешвае: давай яму імёны хутчэй, каго я паслязаўтра з пáлі ды з шыбеніцы зняць хачу.

— Восем жывых душ,— кажа,— у твае рукі аддаю. На ўсе чатыры бакі пойдзеце. Хочаце — ціха жывіце, хочаце — на Сеч падавайцеся або тут, у старостве, зноў казаччыну заводзьце. Думай, Карпач!

Не ведаў я, што рабіць, і, каб час выгадаць, папрасіў княжага дазволу ў пабрацімцаў сваіх у астрозе спытацца.

— Ты што, гарматнік,— рагоча,— з глузду з'ехаў? Як ты ў іх пытацца будзеш? Хто з вас жыць хоча, а каму гэты свет агоркнуў?

Праўду князь казаў. Але як гэта, думаю, адных уратаваць, а другіх на смерць асудзіць? Я ж не Бог, а чалавек грэшны, ніхто мне такой улады не даваў.

— Як жа я,— пытаюся,— у вочы іхнім сіротам і ўдовам глядзець буду — тых, каго на смерць выраку?

— А навошта,— князь кажа,— ім у вочы глядзець? У маярат, у Белую, забяру. Там у мяне, гарматнік, інфантэрыі шэсць тысяч, ды гусарыя з кавалерыяй, ды аддзел гран-мушкецёраў, як у французскага караля. Генералам зраблю або над артылерыяй пастаўлю.

— А сумленне? — пытаюся.

А князь:

— Ды дзе яно? Бачыў ты яго калі-небудзь ці, можа, рукамі мацаў?

У яго, маўляў, лёкай адзін ёсць, дык ён, лёкай гэты, хваліцца любіць, што за сваё сумленне сем козаў купіў.

— А я табе, Карпач,— смяецца,— лепшую цану даю — жыццё. І не адно, а разам з тваім цэлыя дзевяць жыццяў.— І зноў за пяро: давай яму ў рэскрыпт імёны.

— Няўжо твая мосць думае,— адказваю,— што з такім цяжарам на душы жыць можна? Ды гэтыя пабрацімцы мае неўратаваныя не тое што ў Белай — на краі свету да мяне кожную ноч прыходзіць будуць.

Задумаўся князь на хвіліну і на немачку сваю прыцыкнуў, якая зноў нешта гергетаць пачала.

— Добра, гарматнік,— гаворыць,— калі ўжо ў цябе душа такая далікатная, можаш не восем, а дзевяць сваіх баламутаў ратаваць. Скеміў? Гэты дзевяты на тваё месца стане, а ты — на ягонае.

Мучыўся я, быццам той падарожны каля баечнага каменя, ад якога сцежкі разыходзяцца. І такая роспач узяла, што хоць ваўком вый, хоць крыкам крычы, ды не дакрычышся ні да кога і сам гэтую сцежку выбіраць мусіш. А князь, каб на ім шэрсць курэла, навылёт бачыць, што ў мяне ў душы робіцца. Прабегся па залі і зноў да немачкі сваёй кучаравай на калені, як кот марцовы, ускочыў.

— Падумай,— кажа,— Карпач. Або перапішаш, або ўсіх — на той свет. Тэрцыум нон датур — калі такі ты ў нас вучоны, што і лаціну ведаеш. Ідзі. Ноч табе на роздум.

Вярнуўся я ў камору і ў сваім куце на салому паваліўся, бо выснажаны быў, як пасля самага лютага катавання. Усе вакол сабраліся, і Сымон Варона пытаецца: «Зноў над жарам падвешвалі?» — «Горай»,— кажу і замаўчаў, не мог ім нічога сказаць. І яны, пабрацімцы мае, якія мяне першым пасля Вашчылы прызнавалі, таксама маўчалі, усё роўна як ведалі, штó мне Радзівіл сказаў, ведалі, што, калі будзе на тое мая воля, магу з кожных двух аднаму жыццё пакінуць. Каторыя нават бліжэй пераселі, нібы нагадвалі, каб часам на іх не забыўся. Абвёў я іх усіх вачыма і чую: сэрца разрываецца.

Розныя сярод пабрацімцаў маіх людзі былі. Двое ці трое заўсёды скрыва на мяне пазіралі, бо не маглі ў розум узяць, чаго я дамагчыся хачу. У кублах, маўляў, сала з каптуром, шасткі ад шынак ды кілбас ломяцца, і ў полі, і ў хляве ўсё родзіць, плодзіць і зводу не ведае. І млын з фолюшам мае, і прывілеі ў іх, у Карпачоў, ад караля, і бурмістрам абраны. Яму што — мала? Іхняя праўда: і млын меў, і ў свіронках мышы ад голаду не здыхалі, і ў склепе грыбоў ды сочыва хапала. Але як такому, што не кожны дзень хлеб меў, давядзеш: не той ва ўсім гэтым смак, калі на сваёй спрадвечнай зямлі ты быццам прымак жывеш, ніякай улады не маючы? Калі нават мову, на якой нашы законы пісаныя, у нас забралі, і ў магістратах, і ў судах усё спрэс па-польску. Хіба лёгка галоднаму ўтлумачыць: тое мне трэба, што ў кубле на зіму не засоліш? Нашаму народу Бог гэтую зямлю даў, значыцца, і ўлада нашая тут быць мусіць. Яшчэ калі мяне на свеце не было, дзед мой Зміцер ды бацька Ілля з крычаўскімі мяшчанамі жаўнераў харугвы Рыгора Агінскага, харунжага Вялікага Княства Літоўскага, што ў старостве на пастоі была, стралялі і шчупакоў імі ў Сажы кармілі. Відаць, такой пячаткаю вальналюбнай уся наша радзіна пазначана...

Быў сярод тых шаснаццаці, што разам са мною смерці чакалі, і аднайменнік мой Іван Крывуля. Калі мы прыступам на Крычаўскі замак пайшлі, ён адзін трох грэнадзёраў у рукапашнай паклаў. Але, пэўна, такая ўжо натура ў чалавека паганая, што найперш я не пра смеласць ягоную падумаў, а пра тое, што ён

пяць гадоў таму ў мяне трыста злотых пазычыў і дагэтуль не аддаў. Ды хіба ж мог я яго за гэтыя злотыя на смерць асудзіць?

А яшчэ сядзеў у каморы чалавек, што адбіў у мяне калісьці дзяўчыну і сабе за жонку ўзяў. Але ж не магу я чалавека праз тое губіць, што на жонку ягоную грэшным чынам і цяпер паглядаў, асабліва як Домна мая, гаротніца, лёгачнай пошасці не здужала?

Ну і такія там былі, што без дай прычыны не надта мяне ганаравалі, і я іхнюю нялюбасць чуў і сам не дужа да іх гарнуўся. Аднак каб за гэта смерцю караць... Не было б мне тады даравання ні перад Богам, ні перад самім сабою.

Не мог я іх на скон асудзіць, а набралася гэтых пабрацімцаў маіх акурат восем. Дык што ж тады выходзіць: іх ратаваць, а тых, што да сэрца бліжэй,— на шыбеніцу? Васіль Вецер самога ад смерці збавіў, калі пад замкавым валам мяне гусары абкружылі і вязаць пачалі. Сымон Варона — во ўжо вясёлая душа, пэўна, і на шыбеніцы показку раскажа — сусед, у паўстанні ад першага дня. З Андрэем Косткам на адной вуліцы раслі. Ігнат Малунёнак тры месяцы ў асеці хаваў, калі дзяржаўцы Іцкавічы хоць з-пад зямлі мяне дастаць загадалі і душу выняць.

Каго ратаваць, Божа? І схіляўся я ўжо да таго, каб княжую цану прыняць. Няхай, думаў, хоць палова нас ацалее, хоць жменька зярнят будзе на новую вясну сеяць. Паснулі пабрацімцы даўно, а я ўсё лічыў ды рахаваў і так і гэтак. Забыўся і на холад, і на вошай са скочкамі, ні храпу не чую, ні духу цяжкога ад цэбра — быццам не на прэлай саломе пад кажушком кручуся, а на высознай гары стаю і вакол адно морак непрасвяцімы.

І раптам нібы зорка ў гэтым мораку запалілася. Скажу ўсё пабрацімцам! Хачу, маўляў, каб палова з нас дзеля нашай крэўнай справы з астрога выйшла. А каму жыць, каму паміраць — няхай Бог рассудзіць! Хто кароткую саломіну выцягне — бывай, братка, а хто даўгую — на волю пойдзе. І сам разам з усімі канава́цца буду. Ну а тыя, каму жыць выпадзе, зноў

людзей падымуць і за ўсё паквітаюцца. І з Радзівілам, і са сваімі здрайцамі.

Не паспеў я думку гэтую дадумаць, як перад вачыма Саўка Маўчун мільгануўся. Вось па кім па першым вяроўка плача! Праўду кажуць: хто ціха ходзіць, той густа месіць. Замясіў Маўчун на нашай крыві сабе пірог, ды хутка падавіцца. Але вось жа дзіва якое: цешыцца мая душа мусіла, што хутка знойдзем мы свайму пабрацімцу былому асінавы сук, аж не — успомніў пра Саўку, і адразу нейкі кіпцюрык сэрца шкрабануў, а па радасці расколінка прабегла. Аднак не зважаў я на гэта, а ўсё думаў, як мы зноў мяшчан і валашчан на князя падымем, і пэўны чамусьці быў, што сам даўгую саломіну выцягну.

Так няўзнак і заснуў, і сасніўся мне сон, нібыта косім мы з Маўчуном у нас на Лашнеўскім поплаве, а якой парою — не зразумець: ці то вечар позні, але нешта ноч не надыходзіць, ці то світанак, ды ніяк сонца не падымецца. Косім мы ў гэтым дзіўным сутонні, Саўка паперадзе касой махае, а я з сілы выбіваюся і ўсё адно дастаць яго не магу. А ён яшчэ касу мянціць спыніцца і смяецца. Праўда, не здзекліва, а быццам лагодна, як свайму. Дайшоў Саўка ўжо да краю поплаву і новы пракос мне насустрач пачаў. Параўняліся мы, вынялі з-за халяваў мянташкі, пачалі косы гастрыць. І тады ён да мяне: «Давай,— кажа,— косамі мяняцца».— «Давай»,— адказваю, а сам радуюся: ну, цяпер ад яго не адстану. Памяняліся, і сапраўды стаў я сажань за сажнем даганяць. Прыстоіў касу падмянташыць, ацёр яе травою і бачу: каса Саўкава ў крыві. Ну, думаю, качанё падлезла ці іншы які птах трапіўся. Яшчэ раз выцер — усё адно кроў на касе. Я зноў выціраць, а кроў з самога жалеза кроплямі выступае. Такі мяне страх апанаваў, што рукі здранцвелі і няма змогі гэтую страшную касу ў кустоўе закінуць. Зірнуў я на Саўку, а ён ужо не ў кашулі косіць, а ў чырвоным кунтушы і з шабляю на баку. І тады толькі ўспомніў я там, у сне, хто такі гэты Саўка. Хачу ягоную касу крывавую ад рук адарваць, а яна — быццам прырасла.

Тут пад сваім кажушком і прахапіўся. Сон зляцеў, і такая туга навалілася, што радасці ды палёгкі, з якімі засынаў, ні каліва нават на самым донцы не засталося. Думаў я пра гэты дзівосны сон — і чым болей думаў, тым болей разумеў, што нездарма да мяне Саўка Маўчун прыходзіў, нездарма.

Быў гэты Саўка халоп шляхціча Галынскага і, як паўстанне пачалося, падняў свайго пана на сахор проста пасярод двара, а потым да нас падаўся. Ваяваў смела ды яшчэ з дубу гарматы рабіў: хоць яны адно раз стрэліць маглі, але службу нам саслужылі добрую. Каб гэткіх гарматаў паболей, можа, і ўзялі б мы Крычаўскі замак. А так палкоўнік Пястжэцкі пад замкам паўтысячы нашых людзей паклаў, а блізу сотні ў палон забраў і на смерць засудзіў: палову павесіць, а другую — на па́лю. А сталася, што акурат тымі днямі крычаўскі містр* вепрука біў ды руку пашкодзіў. Палкоўнік і абвясціў, што, калі хто з бунтаўшчыкоў містра заменіць, таму ён жыццё пакіне. Як абвясціў, так Саўка і вызваўся. Без малога сотню палонных з душой разлучыў і так палкоўніку Пястжэцкаму спадабаўся, што загадаў той старому містру сорак бізуноў даць і з пасады далоў, а містрам Саўку паставіў.

А распавёў гэта клікун** магістрацкі, што прыбег з Крычава да нас пад Царковішчы. Прынёс клікун з сабою ратушную кнігу з усімі мескімі выдаткамі, і прачыталі мы ў той кнізе, што купіў магістрат новаму містру сукна чырвонага сем локцяў і чвэрць на кунтуш і палатна на жупан і на порткі дзесяць локцяў, а яшчэ шапку каралеўскую з баранком, боты і пас вішнёвы, і за ўсё разам з шабляю заплочана 50 залатых і 20 асьмакоў. Кузьма па Вашчылавым наказе ўсё гэта таксама ў свой сшытак спісаў.

Думаў я неадчэпна пра Саўку і разгадаць спрабаваў, чаму ён у сне смяяўся гэтак лагодна і касу мне аддаў. І раптам пачуліся мне зноў князевы абяцанкі, і не проста пачуліся, а адмыслова неяк — быццам скрозь смех Саўкаў. І тады нібыта ўпала з маіх вачэй

* Кат.

** Вартаўнік.

заслона, і скалануўся я, бо адкрылася мне сапраўдная княжая цана, і зразумеў, што калі прыму яе,— не Саўку, а мяне першага на асінавым суку вешаць трэба.

Не мог я ўжо болей у тую ноч заснуць — ляжаў, і ўсё жыццё маё перад вачыма праходзіла.

Вось першую супліку ў Нясвіж нясу. Тады не разумеў яшчэ, што Радзівілаў з дзяржаўцамі адзін чорт маляваў, думаў: заступяцца, абароняць. Хутка тую праўду раскусіў, ды ўсё адно вазіў ад староства суплікі, каб князь хоць трохі дзяржаўцам хвост прышчаміў, бо яны ягоную авечку ўжо не толькі стрыглі так, што скуры кавалак адхапіць маглі, але жыўцом рэзаць пачыналі. А пры братах Іцкавічах зусім няўсцерп зрабілася.

Усплыло на памяць, як першы раз да іх у рукі трапіў. Ляжу на козлах у катоўні, а абапал яны, Гдаль са Шмуйлам, у лапсердаках стаяць і вірламі бліскаюць. «Гэта табе, робак, за супліку, што ў Мір вазіў! А гэта — што да князя ў Гародню чэрці цябе насілі! А гэта — што з Крычава з'ехаў і сярод быдла мужыцкага атайбаваўся, каб бунты супроць нас заводзіць! А гэта табе, Карпач, за атаманства тваё!»

Гдаль:

— Выбілі мы з вас мільён злотых і яшчэ столькі выб'ем.

А Шмуйла:

— А з цябе, гой, душу дастанем.

Гдаль:

— Супакойся, Карпач, а то жонка ў цябе маладая ды прыгожая, дзеткі ў цябе малыя...

А Шмуйла:

— Супакойся, гой, а то, бывае, з'ядуць дзеткі не тое ці ў рэчку купацца пабягуць і з каменя ў вір аступяцца...

Я, зубы сцяўшы, каб не стагнаць, бізуны лічу: дзевяноста, сто, сто дваццаць...

А Гдаль:

— Камісараў княскіх табе захацелася! Ды мы за тысячу талераў любога камісара разам з вантробамі купім!

І куплялі. А то, бывала, заміж княскіх сваіх, пад-

стаўных камісараў пасылалі, як таго Шыманскага, што дзвесце тысяч квіткоў за сплочаны чынш сабраў і — як у ваду, а Іцкавічы давай зноў гэты чынш спаганяць. Ну, а трапіцца сярод княскіх камісараў чалавек, у якога сумленне яшчэ не выпетрала, дык такую варту дзяржаўцы паставяць: не тое чалавек — кот не праточыцца. Аднак я любую варту прайсці мог. Добра аднойчы з Іцкавічаў пасмяяўся, калі разбілі яны дзеля такога камісара піўную бочку, а стуль не піва ў кухлі палілося, а я з суплікаю вылез. Але адпомсцілі яны мне так, што самаму лютаму ворагу не пажадаеш.

Доўга я ў тую астрожную ноч пад бярэзінай стаяў, на якой Кацярынка на сваёй касе вісела. Пайшла з малым Тамашом у суніцы, а назад я сваю дачушку, пасінелую ўжо, на руках прынёс. Тамашок тады ад Гдалевых людзей у моху пад вываратнем уратаваўся, ды з таго дня яму, сыну майму адзінаму, мову заняло...

Усе мае сорак гадоў у памяці прайшлі, да тых дзён, як падняліся і вёскі, і буды, і гуты, і ардашні, як усё староства за косы, за цапы ды за рушніцы схапілася, бо не пасеялі людзі ўвосень азіміну — не мелі, чым сеяць,— а ўвесну пракацілася пагудка, што зноў князь Геранім дзяржанне Іцкавічам дакляруе, а значыцца, аддае нас на страшныя здзекі і пагібель. А што з тае пары прычынілася — у Кузьмы ў ягонай гісторыі было, якую князь Геранім на свой капыл перапісаць хоча.

Відаць, і яго мосці ў тую ноч мулка спалася, бо толькі саган з ранішняю поліўкаю нам у камору прыцягнулі, так следам і паручнік усунуўся.

Князь у тым самым чугаі з паўлінавымі пёрамі мяне сустрэў, адно на свой плех сызвалоснік нацубіў, як немцы носяць, і выляжанка пры ім новая — худая ды чарнявая. Як мяне ўбачыў, адпіхнуў яе і — да пахолка: хутчэй ягонаму дарагому госцю віна найлепшага і дзічыны. Не паспеў я рот раскрыць, а пахолак ужо смажанага цецерука на тацы валачэ і гусак з віном. А я і ўчора не вячэраў, і сёння астрожнай поліўкі пасёрбаць не паспеў. Ну, думаю, княжа, няхай твая душа, а маё чэрава пацешацца. Прыбраў я гэтага цецерука за малінку, віном запіў і за сняданак дзякую. А яго мосць усміхаецца і да мяне паперу і каламар залаты з атрамантам падсоўвае.

— Ну,— кажа,— гарматнік, будзем з табой нашу гісторыю дзеля нашчадкаў пісаць.

Некалі, значыцца, яе прачытаюць і ў Крычаве перад ратушай помнік яму каменны ці з мосенжу паставяць, як у іншых краінах даўно робіцца. І твар у яго такі, нібы ён ужо на гэты помнік дзівіцца.

Тут я яму дулю пад нос і закруціў.

— Вось табе,— кажу,— твая мосць, гісторыя.

І з другога боку дулю:

— А вось табе помнік.

Князь спярша на мяне вырачыўся і маўчыць, быццам у яго язык завязаўся. А потым:

— Ты што, певень галагуцкі, блёкату наеўся?! Пішы, а то заўтра на па́лю палезеш! — І пістолю сваю з-за пояса рве.

А я:

— Няхай твая мосць страляе. Сытаму ды хмельнаму паміраць — чыстая радасць.

Тады ён губу закусіў і пістолю назад заторкнуў.

— Пішы,— кажа.— Усіх выпушчу. Усіх шаснаццаць, каб твая душа далікатная не мучылася. Толькі болей да маіх рук не трапляйцеся! Пішы: року ад нараджэння Сына Божага 1744... Усе на волю пойдзеце!

— Ды не,— адказваю,— не на таго твая мосць нарвалася. Калі я гэтую гісторыю перапішу, містр твой Саўка Маўчун супроць мяне анёлкам будзе. Ён жа толькі жыццё ў жывых адбірае, а ты хочаш, каб я ва ўсіх сваіх пабрацімцаў — і ў жывых, і ў мёртвых — гонар адабраў! Ды мяне пасля гэтага сама зямля не прыме. У нас жа не засталося ўжо нічога, апрача гонару. Апрача таго, што памятаем яшчэ, што не бязродныя і ўбогія, што і пад Грунвальдам, і пад Воршаю ворагаў білі. Не,— кажу,— княжа, д'яблаву меціну ты на мяне не паставіш. Памру заўтра з пабрацімцамі маімі, каб памяталі пра нас дзеці нашыя і дзецям сваіх дзяцей гэтую памяць перадалі. Дасць Бог, і Кузьмову гісторыю яны некалі знойдуць, і ўсю праўду пра паўстанне і пра тыя здзекі, што ты, адлюдак, чыніў, прачытаюць.

Ён Кузьмовы сшыткі са шкапіка выхапіў і — у камін.

— Вось там іх дзеці тваіх дзяцей знойдуць!

І сызвалоснік свой з плеху сарваў ды таксама — у агонь.

— Запомні,— крычыць,— праведнік! Пакуль наша на гэтай зямлі ўлада, па нашым загадзе і гісторыю вам пісаць будуць. Захочам — чорную ноч ясным днём абвесцім, захочам — ворагаў вашых вашымі ж дабрадзеямі зробім. І вы, рабакі, ужо праз паўсотню гадоў адно тое помніць будзеце, што нам выгадна. Яшчэ ка́там сваім помнікі паставіце. Ты пісаць не хочаш — іншы знойдзецца. Ды ў мяне пад рукою тысяча такіх, што за адно маё слова ласкавае матку вядзьмаркай, а бацьку антыхрыстам назавуць.

— Во яны,— адказваю,— няхай табе тваю гісторыю і пішуць.

А ён:

— Э, не, гарматнік, занадта ўсё проста будзе...

А потым як бы спахапіўся:

— Напішуць. І дзеля нашчадкаў, і дзеля тых, што цяпер жывуць, сёе-тое напісаць могуць. Такое, што і смерцю не адмыешся, усё адно з д'яблавым таўром на той свет пойдзеш.

— Крыві,— кажу,— людзі болей, чымся атраманту, вераць.

А ён:

— Э, не, Карпач. Людзі пісанаму слову верыць прывыклі. Загадаю вось напісаць, што гэта ты за тысячу злотых маіх жаўнераў пад Царковішчы патайна прывёў... Ты прывёў, а я, паводле старога звычаю, здраду прыняў, а здрадніка — на па́лю... Вось тады і пагледзімо, крыві ці атраманту паверацъ.

— Не баюся,— адказваю,— бо перад Богам і перад народам душа чыстая застанецца.

А князь:

— Бог, Карпач, высока, а народ... Народу насраць на цябе! Ты што, накарміў яго, народ гэты, ці гарэлкаю напаіў, каб усе ўпокат ляжалі? Адно што заўтра людзей пацешыш, як над местам закукарэкаеш. А каб даўжэй кукарэкаў, загадаю цябе не ў сподні на па́лю садзіць, а ў кажуху ды ў валёнках. Любуйся на народ, і народ няхай на цябе любуецца. А я прыйду ў рай цябе праводзіць. Глядзі толькі, не ўзнясіся зарана.

На гэтым гамонка і скончылася.

Думаў, з лёгкім сэрцам у астрог вяртацца буду, ажно на душы — хоць грушы сушы.

І не паспелі жаўнеры мяне назад прывесці, а паручнік наш крыванос па Сымона Варону прыбег. Той нам показку распавядаў, як пана квасам частавалі. Выпіў, значыцца, пан глячок і пытаецца, ці многа яшчэ такой смакаты... Тут Сымона і забралі.

Прыйшоў ён назад вясёлы, сеў на сваё месца і, быццам нічога ніякага, адтуль, дзе спыніўся, далей показку вядзе: «А Міхаська да пана: авой, паночку, многа. Учора ў квас пацук уваліўся, дык, як мама даставаць лазіла, ёй яшчэ па пуп было».

Паручнік, у дзвярах стоячы, таксама даслухаў і Васіля Ветра да князя павёў, нібыта за тое, што Васіль гучней ад усіх рагатаў. Але я ўжо здагадаўся, што тут да чаго. І Варона, і Вецер некалі са мной разам у брацкай базыльянскай школе вучыліся. Выходзіць, цяпер і за іх Радзівіл узяўся. Я сам у Вароны пытацца нічога не стаў, а хто запытаўся, тым ён толькі рукою махнуў: снедаць, значыцца, князю сумна было, ну а ён, Сымон, з тузін показак яму распавёў, ды такіх, што яго мосць ажно падавілася.

Сказаў — і бліжэй да каганца ў косці гуляць сеў: болей, маўляў, і гаманіць няма пра што.

Ветра даўжэй не было, і не сам назад прыйшоў, а жаўнеры на руках прынеслі і, як мех, у кут кінулі. Збіты Васіль быў на горкі яблык, але сэрца маё ўзрадавалася, бо зразумеў я, што гэтым разам яго мосць адно аблізнулася.

Трэцяга, пад самую ноч, Андрэя Костку ўзялі. Паміж нас яшчэ трое пісьменныя былі, ды пасля Косткі нікога ўжо не чапалі. Затое пачостку нам ад князя Гераніма далі, каб ён сам гэтак кожны дзень частаваўся. Прынеслі два гайдукі рэшаты з булкамі і рагочуць:

— Во вам, баламутам, яго княская мосць булак са-

лодкіх з разынкамі пасылае, каб у апошнюю ноч спалася лепей!

Узялі мы па булцы, адкусілі і жуём. А булкі і праўда смачныя — і салодкія, і цёплыя. Ямо, і тут нехта са святлейшага кута гукае:

— Хлопцы, а хлопцы, а разынкі княжыя з вусамі!

Прыгледзеўся я — і праўда: замест разынак прусакі ў булцы. Шалее, мусіць, князь Геранім, што не выходзіць па-ягонаму.

Так наша апошняя ноч і надышла. Доўга мае пабрацімцы не засыналі, кожны з боку на бок круціўся і пра сваё думаў. Звечара яшчэ Сымон Варона ніяк угамавацца не мог, пакуль не закрычалі на яго: «Абрыдзеў ты, Сымон, з гэтымі показкамі! Ты на свеце адзін душою свой век звекаваў, табе ні чорта здумаць, а нам жонак з дзеткамі ўзгадаць трэба ды перад смерцю за іх памаліцца».

Мне таксама Домна мая, нябожчыца, успомнілася ды Кацярынка, Гдалевымі людзьмі замучаная, і падумалася, што калі праўду ў царкве пра той свет кажуць, дык, можа, заўтра я з імі і пабачуся. Як той казаў, няма ліха без дабра. А потым — ажно слёзы накруціліся — пра сына, пра Тамаша, падумаў, які пасля таго страху ў лесе ўжо пяць гадоў адно мыкае, а слова вымавіць не можа. Як ён нямком жыць будзе?

І зноў думкі да Сымона Вароны і да Андрэя Косткі павярнулі. Калі Андрэя да князя вадзілі, значыцца, і Варона і Вецер згоды сваёй не далі. Ды і Костка даць не мог, не з такіх ён. Пад Царковішчамі двух родных Андрэевых братоў княскія казакі ў яго на вачах дзідамі закалолі, і за кожнага ён перад палонам паквітацца паспеў. Не, не з такіх.

Да таго ж дайшла да астрога чутка, што гусары ягоную жонку на гвалт узялі і ўпяцёх цешыліся.

Але ўсё роўна нейкі цень на маёй душы ляжаў, бо калі чалавек не на полі, не навідавоку ва ўсіх, а адзін на адзін з тым ворагам, што ў ім самім сядзіць, застаецца, тады стакроць чалавеку цяжэй. Не стрываў я, гукнуў шэптам Андрэя. Не азваўся ён, ды гэтак ціха ў тым кутку зрабілася, што зразумеў я: не спіць, а

гаварыць не хоча. Затое Варона голас падаў, хоць здавалася: гэты ўжо трэція сны бачыць.

— Што,— пытаюся,— Сымон? Не спіцца?

— Ды не,— адказвае.— Спіцца. Гэта я з табой адтуль, са сну, гаманю. Хочаш, магу і показку табе адтуль збаяць?

— Не трэба,— кажу,— спі далей.

Васіль Вецер, чую, стагнаў, стагнаў ды і захроп, а гэтыя двое, як і я, без сну ляжаць. Можа, і ім тую самую цану Радзівіл прызначыў і ноч на роздум пакінуў? Можа, і яны цяпер мучацца: каго ратаваць? — а пра тое, чым за гэтыя жыцці ўратаваныя заплаціць трэба, не думаюць?

Зноў я Андрэя паклікаў, і зноў ён перамаўчаў. Тады да Вароны зашаптаў, але і той гэтым разам не азваўся. І разважыў я так, што ўсё адно здрайцу словам не запыніш, а моцнай душы праўда сама адкрыцца мусіць, і памаліўся, каб даў Бог іхнім душам моцы. Аднак самому, чую, гэтае моцы не стае, бо заварушылася ў душы падумка: а ці захочуць мяне, Карпача, сябрукі мае ўратаваць, калі на тое іхняя воля будзе? Абагнаўся я ад такой падумкі ганебнай, а тут новая ў голаў лезе: а як захочуць? Няўжо жыццё, чужой здрадаю купленае, прыму? Ну а калі ўсё ж дзверы адчыняць ды скажуць: ідзі на чатыры бакі — тады што рабіць?..

Адно пад раніцу мяне сон адужаў, і прыснілася, што мы з Сымонам і з Андрэем у Сажы целяшом купаемся і, як некалі, ракаў на плыткаводдзі ловім. І чуем: кліча нас нехта. Глядзім, а гэта князь Геранім у чоўне плыве і тую немачку кучаравую на каленях трымае. «Гэй, вы,— крычыць,— баламуты! Усіх на волю адпускаю!» Закрычалі і мы штосьці, але што — не паспеў я пачуць, бо загрымелі астрожныя дзверы, і ўжо стаяў на парозе паручнік з паходняй, а за ім жаўнеры тоўпіліся.

Пачалі мы да смерці рыхтавацца, ажно паручнік аднаму Андрэю Костку збірацца загадаў. Зірнуў я Андрэю ў вочы, і Сымон Варона на яго пільна паглядзеў, і Васіль Вецер на саломе прыўзняўся. Пабрацімец жа наш вачэй не адвёў і ўсім нам на ростань усміхнуўся гэтак лёгенька.

А потым доўга мы не чакалі. Андрэя назад не вялі, ды замест яго сам палкоўнік Пястжэцкі, боўдзіла вусаты, з хеўраю сваёй у камору заявіўся, і новы крычаўскі містр, былы наш сябрук Саўка Маўчун, за іхнімі спінамі аціраўся, акурат такі, як ва ўчарашнюю ноч мне прымроіўся — у кунтушы чырвоным, у шапцы з баранком і з шабляю на баку. Палкоўнік указ княжы чытаць стаў, і паводле гэтага ўказу я, Сымон Варона, Васіль Вецер і Ігнат Малунёнак, што калісьці мяне ў асеці хаваў, а таксама яшчэ чацвёра нашых мусілі сёння памерці, а астатнім васьмярым і самому Костку загадваў Радзівіл чакаць і на ягоную літасць спадзявацца.

Мы з Варонам пераглянуліся і ўсё дарэшты зразумелі. У першую хвілю я ўсцешыўся нават, што памерці наканавана, а не дзячыць за жыццё Косткавай здрадзе. Але адразу сэрца сціснулася: а як жа пабрацімцы мае, тыя, якіх Радзівіл на волю адпусціць? Так і не ўведаюць, якой цаною за іхняе жыццё заплочана? А палкоўнік ужо рукою махнуў, каб мы васьмёра выходзілі.

І тады я кашулю на грудзях ірвануў і да тых, што княскай міласці чакаць заставаліся, закрычаў:

— Браты мае! Слова вам перад смерцю мовіць хачу! Прадаў нас Костка! І вас, і нас, што на смерць зараз пойдзем, і тых, што пад замкам ды пад Царковішчамі палеглі, і тых, каму Саўка Маўчун галовы сцяў, і тых, што па лясах і за кардонам уратаваліся! Усіх прадаў! Ведаеце вы, што па Вашчылавым загадзе Кузьма, Стэсеў сын, усё пра паўстанне запісваў, каб праўда пра нас да ўнукаў і праўнукаў дайшла. Дык ведайце, што князь гэтую праўду спаліў, а Костка яе па-новаму перапісаць згадзіўся! Ведайце, што ён Радзівіла родным бацькам нашым і абаронцам назаве і правы ягоныя на нашу спрадвечную зямлю пацвердзіць! За гэта князь вас на волю і адпускае!

Палкоўнік ачомаўся і да мяне:

— Маўчаць, ваўчынае мяса!

І да жаўнераў:

— Вязаць яго!

— Браты мае! — крычу.— Гонар у нас адбіраюць. Апошняе...

Скруцілі мяне і ў рот саломы напхалі. А Навум Буян, з тых васьмярых, якім чакаць загадана было, і пытаецца, нібыта я яму адказаць магу:

— А можа, брэшаш ты, Карпач? Хочаш, каб весялей паміраць было? Каб усім кагалам на той свет пайшлі?

Мыкаю я, а палкоўнік і хеўра ягоная бакі рогатам ірвуць. Аж раптам Сымон Варона кажух скінуў і закрычаў, што святую праўду я кажу. Яго, Варону, князь таксама спакушаў.

— Памрэм, браты, разам,— у грудзі сябе ўдарыў,— а гонару не прадамо!

І Сымону саломай рот заторкнулі, а Навум:

— Бач ты, раскрычаліся!..

Але ўжо з сумневам гэтак прамовіў.

Тут Васіль Вецер кашулю на сабе задраў і спінаю да нас павярнуўся.

— Глядзіце, браты! — А спіна ў яго спаласаваная, ажно глядзець страшна.— Глядзіце! Гэта за тое, што сказаў князю: хоць у сраку цалуй, а хлусню па тваім указе пісаць не буду. Праўду Карпач кажа! Памрэм усе, а гонару не прадамо! Няхай кроў наша Косткаву хлусню пераважыць!

Накінуліся на Васіля жаўнеры і тварам да падлогі прыціснулі.

— Выводзьце! — палкоўнік камандуе.

І ў гэтую хвілю Навум:

— Браты,— крычыць,— веру я Карпачу! Прадаў нас Костка! Не хачу з д'яблавай пячаткаю жыць!

І ўслед за ім яшчэ пабрацімцы мае з тых Косткавых ратаванцаў закрычалі, што разам з намі на смерць пойдуць. Пэўна ж, паміраць, калі воля бліснула, ніхто не хацеў, але цяпер і іхнія душы акрылі. Палкоўніка такое дзіва ўзяло, што вус сабе на палец накруціў, а што далей чыніць — не ведае. Паслаў паручніка да князя. Крываносы ўмомант і назад.

— Ну, ваўчынае мяса,— нагой палкоўнік тупнуў,— няхай па-вашаму будзе. Усім у пекла захацелася — лезьце!

Сымон, Ветра за плечы абняўшы, каб той ісці мог, першы да дзвярэй пайшоў.

— Дазволь, пане палкоўнік,— каля Пястжэцкага прыстоіў,— показку табе на адвітанне расказаць.

— Ну што там у цябе, ваўчынае мяса, за показка?

— А такая, няхай пан выбачае, показка, што спаў адзін чалавек тры дні і тры ночы, пакуль яго швагра не ўстурыў. Ну, кажа, і паспаў ты, братка! А ён яму: от галава! Ці ж той свет пад бокам? А хіба ж ты на тым свеце быў? Анягож! І ў раі быў, і па пекле пахадзіў. А што ж там у пекле? А не бойся, швагра, нашых там нікога не бачыў.

Сымон замаўчаў, а Пястжэцкі не вытрымаў ды пытаецца:

— Ну і каго ён там, ваўчынае мяса, бачыў?

А Сымон:

— Няхай пан палкоўнік выбачае, адных чыста палкоўнікаў! Паўнюткае пекла!

...Была гэта апошняя Сымонава показка, бо адкацілася на пляцы перад ратушай галава ягоная на снег, а ўслед за ёю і Ігната Малунёнка галава, і Івана Крывулі, што некалі ў мяне грошы пазычыў і аддаць не паспеў. І ў кожнага Саўка Маўчун перад тым, як сякеру з-за пляча апусціць ці пятлю зашмаргнуць на шыі, даравання прасіў. Усе адварочваліся, адзін Сымон у вочы яму глянуў.

— Дарую, калі следам за намі Костку на той свет адправіш!

Махнуў Саўка астатні раз сякерай, а тады нас да па́ляў павялі...

Гэй, Васіль Вецер! Гэй, Стэсь Бочка! Гэй, Навум Буян! Адляцелі і ад іх душы, люты мароз хутчэй за па́лю забіваў. Усе мае пабрацімцы адышлі, адзін я яшчэ за жыццё чапляўся, бо спраўдзіў князь абяцанне — пасадзілі мяне на па́лю, каб мучыўся даўжэй, у кажуху ды ў валёнках. Але і мне мала заставалася, мароз пад апранаху лез, і ад холаду боль гэты нясцерпны, што мае вантробы рваў і вочы раз-пораз цемраю асланяў, ужо адпускаў пакрысе, толькі думка не адпускала: ці пераважыць кроў наша Косткаву хлусню? Ці не забудуцца ўнукі, якія мы пакуты за волю прымалі?

А Саўку Маўчуну і гіцлям ягоным усё спачыну не

было. З людзьмі ўправіліся — узяліся звон з Параскевы Пятніцы смерцю караць за тое, што званіў, калі мы на замак прыступам ішлі. Язык звону вырвалі, шчокі алебардамі пасеклі і да палонкі пацягнулі, каб давеку безгалосы на дне ляжаў.

Тым часам людзі па хатах грэцца разышліся. А за імі і казакі, што вакол нас, дзіды скрыжаваўшы, стаялі, у карчму пацягнуліся. Цяпер, хто прыпазніўся, зусім блізка да па́ляў падысці мог. І падыходзілі, і кожнаму казаў я: глядзі!

Глядзі, баба з рэшатам кнышоў! Глядзі, хлопча! І ты, чалавек лёзны ў лапленым кабяняку, таксама глядзі! Не кожны дзень крычаўскіх бурмістраў на па́лю саджаюць! Глядзіце ўсе! Смейцеся, плачце, ды не забывайце! Глядзі і ты, груба́я! Потым сыну раскажаш, як мы памерлі. Можа, і ён захоча некалі гаспадаром на сваёй зямлі быць. А не сын, дык унук. Глядзі, запамінай!

І думаў я скрозь боль свой, што такі, пэўна, на гэтай зямлі няпісаны закон: каб людзі не забыліся, што яны ўсё ж людзі, а не рабакі, мусіць нехта ісці на вогнішча, на вісельню, на па́лю. І калі тыя, за каго ён смерць прымае, глядзяць на ягоныя пакуты з радасцю, як глядзелі калісьці на Хрыста на Галгофе, усё роўна нельга іх ненавідзець, а трэба верыць, што не за быдла паміраеш, а за людзей. Усё роўна трэба любіць іх — хаця б за тое, што прадоўжаць род чалавечы, і праз дваццаць ці праз сто гадоў будзе на гэтым месцы паміраць перад натоўпам яшчэ нехта.

І тады, калі ўжо болю нізвання не чуў, калі толькі холад застаўся, убачыў я, што ідзе да мяне князь Геранім у гарнастаевым футры, а за ім палкоўнік Пястжэцкі з астатнім почтам. Пад самую па́лю толькі Радзівіл з палкоўнікам падышлі. Палкоўнік вус на палец накруціў і маўчыць, а князь рагоча:

— Ну што, Карпач, не ўзнёсся яшчэ? Відаць, і на небе дурні не трэба. Ты вось варон палохаеш, а твой сябрук вашу гісторыю перапісвае. Цешыцца, што сябе і яшчэ восем душ ад смерці збавіў. Што глядзіш? Няхай піша. Напіша, тады мы яго сюды і прывядзём. А подпіс твой паставіць. Чуеш, гарматнік? Твой!

Хацеў адказаць яму, што звон крычаўскі ў рацэ ўтапіць можна, а памяць людскую не ўтопіш. Не патоне яна, пакуль хоць адна жывая душа на нашай зямлі волі хоча. Хацеў адказаць так, ды не здолеў, бо мароз ужо ў мяне мову адабраў.

А Радзівіл, нібыта думкі мае прачытаўшы, уніз, на бераг, зірнуў, дзе Саўка Маўчун каля звона завіхаўся, і кажа:

— Глядзі, Карпач! Вашымі ж рукамі ў вас і жыццё, і гонар адбіраем. Было так і будзе давеку!

Павярнуўся і пайшоў. І такая мяне роспач узяла, што пачаў я смерць клікаць, хоць яна і без таго зусім блізка стаяла.

Ужо не мог я нават рукой варухнуць, ужо ад холаду думкі адна за адной заміралі, і ўвесь я быццам у лядовую брылу ўмёрз.

Апошняя думка ў гэтым лёдзе кволілася — пра сына. Чаму Тамаш, нямко мой родны, развітацца не прыйшоў? Няўжо знелюбіў бацьку? Няўжо пракляў за Кацярынку і за безгалосасць сваю? Няўжо на тым усе нашыя пакуты і скончацца, што нас — на па́лю ды на шыбеніцу, а дзяцей нашых нямымі зробяць і ненавідзець нас навучаць?

Пачула смерць, што клічу яе, і прыйшла. І ў астатнюю хвіліну — не ведаю, што гэта было: ява ці мроя — убачыў я ўнізе свайго Тамаша. «Сынок! — закрычаў яму.— Сынок!» Але не было ўжо ў мяне мовы, адно вусны ледзь-ледзь варухнуліся. І ў яго, у сына, бачу, таксама вусны варушацца, ён, нямко мой, таксама крычыць нешта, а я пачуць не магу.

І тады абняў Тамаш па́лю, на якой я канаў, упаў на калені і закалаціўся ў сваім бязгучным крыку. І тады лёд, што душыў мяне, а можа, не лёд, а сам купал нябесны раскалоўся, і пачуў я:

— Та-тка-а!!!

1987

Каханак яе вялікасці

Вадзіму Лабковічу

Першы раз гэта здарылася вось тут, на мядзведжай шкуры, якая зараз лашчыць яе босыя ногі. Згадка адгукаецца прыемным скразнячком паміж выпушчаных на волю грудзей і салодкім паколваннем у зацвярдзелых смочках.

Мядзведзь быў велізарны: амаль чорная, з бурымі падпалінамі шкура займае ўсю прастору ад алькова да вакна, за якім — толькі высокая пасля апошніх залеваў Дзвіна. Учора рака ўзбунтавалася, за нейкую гадзіну ўзарвала вышэй Полацка наведзены дзеля яе, імператрыцы, мост, і генерал-губернатар распарадзіўся знайсці надзейную шлюпку.

Яна бярэ з талеркі чырванабокі яблык, які, колькі сябе памятае, нязменна з'ядае перад сном, і згаладала ўпіваецца ў яго зубамі. Толькі пятая гадзіна, але імператрыца ведае: ужо не засне, бо цела перапоўненае не стомаю, а пенлівай, як шампанскае, лёгкасцю, што хутка вяртае вастрыню і свежасць успрымання. Ужо даўно развіднела, аднак яна чамусьці не спяшаецца тушыць амаль празрыстыя агеньчыкі свечак, быццам іх жывая прысутнасць тут, у спальні, яшчэ дзеля нечага патрэбная.

Імператрыца спрабуе акрэсліць свой унутраны краявід. Ён сугучны заваконнаму: тая ж ціхая раніца і бяссонная, там-сям яшчэ захінутая пасмамі туману плынь успамінаў пра зусім блізкае і пра задаўненае, але раптам вернутае прыхамаццю памяці.

Ёй падабаецца думка, што прэлюдыяй гэтае ночы сталася навальніца, якая шалела над горадам у першы полацкі вечар.

Наогул, усе баўленыя тут дні зліліся для яе ў адзін — доўгі дзень, што папярэднічаў сённяшняй шчаслівай ночы, якая дазвання сцерла вобразы і адчуванні астатніх полацкіх начэй. Імператрыцы не належыць так думаць, але зараз яна думае менавіта так.

Хіба гэта не ўчора яна ўязджала ў горад пад мелодыі аркестра, што граў на ўзведзенай у яе гонар трыумфальнай браме, і пад салют з расстаўленых на гарадскіх валах гарматаў? Яна ехала праз шчодрую цеплыню травеньскага вечара, праз залітыя белай, ружовай і жаўтлявай квеценню сады, праз шматгалоссе званоў і натоўпы яе падданых, якім кланялася са сваёй пазлачонай карэты з адчыненымі вокнамі. Наперадзе на раскошна прыбраных конях гарцавала найбольш знакамітая полацкая шляхта, за ёю — паштмайстар з паштальёнамі і пікінёры пры поўным парадзе. За брамаю абапал вуліцы стаялі ў святочных строях рамесніцкія цэхі са сцягамі і барабанамі, а на пляцы перад прысутнымі месцамі чакала чынавенства ў белых камзолах і чырвоных з белымі гузікамі каптанах з палевым падбоем...

Падзеі трох прысвечаных Полацку дзён яе падарожжа ўзнікалі перад вачыма, нібы стракатыя каляровыя малюнкі з дзіцячай кніжкі пра іншыя краіны і народы, якую яна чытала тады, калі яшчэ гаварыла і сніла сны па-нямецку.

Сабор святога Стэфана, дзе айцы-езуіты падрыхтавалі ёй пышна аздоблены трон... Седзячы на ім, яна ўпершыню ў жыцці слухала каталіцкае набажэнства і назірала ўрачыстую працэсію са спевамі Te Deum, пасля чаго граф Чарнышоў адрэкамендаваў ёй ордэнскіх навіцыяў*...

Увечары быў маскарад, і ўвесь горад — рынак, вуліцы, манастыры — ззяў ілюмінацыяй. Перад езуіцкім саборам — чатыры залітыя залатым святлом драўляныя піраміды, роўныя вышынёю самому храму, а пад яе вокнамі — пятая піраміда з агністым надпісам «Страх ворагаў, апірышча сяброў, любоў падданых»...

І зноў у калейдаскоп уражанняў урываецца ноч.

Ён быў не надта шчодры на кампліменты; пасля традыцыйных галантных формулаў ягоны позірк спыніўся на шкуры каля алькова, і ён нечакана, быццам толькі што вярнуўся з лесу і ні пра што іншае

* Навіцый — новапрыняты ў манаскі ордэн.

гаварыць проста не можа, узяўся расказваць пра паляванне на мядзведзяў.

Навошта ёй, імператрыцы і жанчыне, было ведаць, што тут, у прыдзвінскіх лясах, вядуцца тры пароды гэтага звера — мурашнікі, аўсянікі ды сцярвятнікі — і што, калі за аблаву здабываюць меней чым пяць мядзведзяў, гэта лічыцца няўдачаю? Якім ветрам яму ў галаву магло занесці бязглуздую думку, нібы ёй будзе цікава чуць, што мядзведзяў не толькі абкружаюць у асочаным мярлозе, але яшчэ і ловяць сілом або жалезнымі пасткамі ў атворах борцяў, калі, прасунуўшы галаву да пчол, ласун ужо не можа выцягнуць яе назад?

Але ён, гэты ліцвін, гэты полацкі паляўнічы, не памыліўся: ёй напраўду зрабілася цікава, і яна, імператрыца, гатовая была слухаць далей — як на дно адмысловай яміны ставяць місу з разведзеным гарэлкаю мёдам і прываблены смачным пахам мішка адважна «бярэ чарку», а потым соладка засынае і робіцца лёгкай здабычаю.

Ягоны густы, з утульнай хрыпкаю голас зачароўваў, абуджаў у глыбінях свядомасці штосьці таемнае, неспасцігальнае, першабытна-спрадвечнае. Такія галасы, пэўна, былі ў ведзьмароў, што выклікалі, як яна чытала ў старых хроніках, бясконцыя дажджы, калі дзвесце гадоў таму Полацк трымаў у аблозе вялікі князь і кароль Стэфан Баторы...

У нейкі момант яе душа паўстала; ёй захацелася скінуць мярэжку чараў і ўзяць размову ў свае рукі, але...

Але ёй на памяць недарэмна прыйшлі ведзьмары: наступнае хвілі ягоныя вочы робяцца ўтрапёнымі і яна, не паспеўшы запярэчыць яму ні словам, ні рухам, апынаецца ў дужых руках, якія ашчадна, аднак з катэгарычнай уладнасцю пераносяць яе з алькова на неспадзявана мяккую шкуру, а яшчэ праз тры ўдары сэрца ён ужо авалодвае ёю цалкам, перакульвае ў вір жарсці, азарту і шаленства, якія, відаць, можна параўнаць адно з тымі, што кіпяць у мужчынскай душы на паляванні.

Шкура пахне зверам, аднекуль з зялёных нетраў даносяцца гукі ражкоў і сабачы брэх, дзікія лесавыя пахі зліваюцца з хмельнай водарнасцю ягонага по-

ту... Яна заплюшчваецца, і ў якімсьці кутку яе розуму ўспыхвае вар'яцкая думка, што гэты ліцвін насамрэч здолеў ператварыць іх, сябе і яе, у мядзведзя і мядзведзіцу. Каб пазбыцца наслання, яна расплюшчвае вочы, бачыць у святле кандэлябра свае белыя рукі і хоча засмяяцца з недарэчных страхаў, ды смех захрасае ў горле абарваным птушыным клёкатам, бо яе, імператрыцу, даганяе і накрывае з галавою хваля, што цягне за сабой, прымушае вырывацца, крычаць і нарэшце — застагнаць у шчаслівай бездапаможнасці, захлынуцца радасцю. Не, не радасцю, а нязмерна складанейшым пачуццём, падобным да кароткатэрміновае смерці, да імклівай экспедыцыі ў нябыт.

Яна любіць вяртацца з такога падарожжа не адразу. Тая самая хваля, ужо спакойная і лагодная, павінна прынесці яе назад і непрыкметна адступіць, знікнуць, як вымуштраваная пакаёўка, знайшоўшы яе раскунежанаму целу прытульнае месца на пустэльным беразе гукаў, адчуванняў і дотыкаў, з якіх народзіцца, набываючы плоць і кроў, ненадоўга пакінуты свет.

Тут, у старасвецкім драўляным палацыку над Дзвіной, дзе яна спынілася, адмовіўшыся ад вільготных пакояў дарабленага — гэта ў яе імперыі старая завядзёнка — у апошні дзень мураванага палаца на рынку, усё атрымалася іначай.

Ёй не ўдалося падпарадкаваць гэтага ведзьмара свайму рытму і змусіць яго перажыць зліццё з абсалютам уадначас з ёю. Полацкі паляўнічы не наталіўся, ім кіравала ранейшая неўтаймоўная жарсць, і ён не адпусціў яе ў жаданую ціхую гавань. Ён толькі напачатку дазволіў ёй, імператрыцы, аддацца той хвалі, а ў астатняе імгненне ўтрымаў і зрабіў сваёй пахолкаю, хутка вяртаючы жаданне ёй самой.

Гэты ліцвін прымусіў яе спярша легчы на стол, потым укленчыць на падлозе і зноў падняцца. Ягоныя рукі, вусны, язык упэўнена і бессаромна блукалі па ўсім яе целе; досыць было апусціць павекі, каб здалося, што яна маркітуецца з некалькімі мужчынамі адначасова. Ён абуджаў пакрыёмую, таемную прагу, што дрэмле ў сутарэннях свядомасці кожнае жанчыны і можа так ніколі і не вырвацца з вязніцы,— прагу цалкам, да апошняе часцінкі трапіць у абладу мужчынскае сілы, адчуць гвалт над сабою, ператварыцца ў адаліску, у рабыню.

Ён абыходзіўся з ёю ўсё больш бесцырымонна, але ад гэтага жаданне ставала адно вастрэйшым, заваладваючы ёю ад карэньчыкаў валасоў да пазногцяў. Ён рабіў ёй балюча, ды боль не выклікаў пратэсту, а ўпырскваў у вены новую порцыю таго хмелю, які яна ставіла непараўнальна вышэй за любы іншы напой.

Яна, імператрыца, паслухмяна і ўдзячна выконвала ўсе ягоныя прамоўленыя і непрамоўленыя загады. Мужчына загадваў, і яна цалавала цвёрдыя гаркавыя смочкі яго налітых жалезнай сілаю грудзей. Мужчына загадваў, і яна кусала і грызла іх, чуючы, як ён распальваецца яшчэ болей. Мужчына загадваў, і яна паварочвалася тварам да начной ракі і клала локці на падваконне...

Яна зноў і зноў стагнала ад асалоды, а потым... потым ён змусіў яе зрабіць тое, што ўжо шмат гадоў яна рабіла адно тады, калі хацела сама... Толькі тады яна, выснажаная, як загнаная аленіха, здолела вызваліцца і самнамбулічна дабрысці да ложка. Але ў ім, у полацкім паляўнічым, выкіпела не ўся жарсць, і ён здагнаў яе, імператрыцу, і яшчэ раз паслаў ёй хвалю, што аглушае і збівае з ног...

Нарэшце і ён выцягнуўся побач — як звер, што адарваўся ад пагоні і цяпер мае права перавесці дыханне і наталіць смагу з цёмнай лясной рачулкі.

Яны пілі бардоскае, якое ўвачавідкі вяртала сілы, і маўчалі...

Імператрыца адчыняе вакно і, упусціўшы ў пакой ручаіну вогкай ранішняй свежасці, глядзіць на раку. На тым баку ўжо вынырнулі з туману жоўтыя муры бернардзінскага кляштара. Вада ўзмацняе гукі, і зарэчных пеўняў чуваць так, быццам іхні хор уладкаваўся адразу за вартоўняй з гвардзейцамі.

Там, за Дзвіной, іншая дзяржава.

Дзяржава, якая належыць таму, хто калісьці ўмеў дарыць ёй амаль такія ж шалёныя, дзівосныя ночы.

Таму, без каго яна — як і ён без яе — няздольная была вытрымаць да вечара. Таму, хто, не будучы мастаком, пакінуў нашчадкам яе найдасканалейшы партрэт. Ён увасобіў яе аблічча ў словах, і калі на гэтым свеце ёсць каханне, ягоным пяром кіравала менавіта яно.

Ужо колькі гадоў яна не разлучаецца з яго падарункам — мініяцюрнай, пераплеценай у зялёны кітайскі ядваб кніжкай-нататнікам. Каб уваскрасіць у памяці тыя натхнёныя радкі, ёй не трэба гартаць старонкі з залатым адлівам. Імператрыца ведае свой занатаваны былым каханкам партрэт як «Ойча наш». «Яна брунетка з неверагодна белаю скурай. Бровы ў яе чорныя і вельмі доўгія, нос грэцкі, рот як быццам кліча да пацалунка, рост можна назваць высокім, талія тонкая, лёгкая хада, мілагучны голас і вясёлы, як і характар, смех. Яна лёгка пераходзіць ад гарэзлівай гульні да сур'ёзнай табліцы лічбаў, якія яе зусім не палохаюць...»

Імператрыцы здаецца, што дзякуючы полацкаму ведзьмару сёння яна выглядае гэтаксама, як і ў дні, калі яе вобраз увекавечыў Станіслаў Аўгуст. Але яна гасіць імкненне падысці да люстра ў багатай асадзе, у якім магла б паўстаць на поўны рост, як на палотнах прыдворных жывапісцаў.

Там, на далёкім беразе прамінулых з таго часу дваццаці гадоў, яна была яшчэ вялікай князёўнаю, а ён — усяго толькі паслом Саксоніі і Рэчы Паспалітай, напачатку нават не паслом, а сакратаром пасольства.

Яго не было побач тады, у чэрвені 1762-га, калі яна наперадзе верных ёй палкоў ехала верхам у гвардзейскім мундзіры старога пятроўскага крою і ў капелюшы з зялёнай дубовай галінкаю ў Пецяргоф, куды ў той самы дзень мусіў прыехаць імператар, якому лёс адлічваў апошнія дні. Яго, Станіслава Аўгуста, не было з ёю ў яе зорны час, калі яна кіравалася насустрач фартуне, каб ужо заўтра ўрачыста ўступіць у Пецярбург. Побач былі княгіня Дашкава, граф Мікіта Панін, браты Рыгор і Аляксей Арловы, гэтыя куміры моладзі, непераўзыдзеныя майстры наладжваць на сталічных ускраінах кулачныя баі да смерці...

З тых, хто дзеля яе ўзыходжання на трон рызыкаваў кар'ераю і жыццём, яна не забыла нікога. Мікіта Панін атрымаў Калегію замежных спраў. Кацярыну Дашкаву яна паставіла на чале Акадэміі навук. Рыгор Арлоў ужо праз нейкі год стаў генерал-фельдцэхмейстарам...

Яна ўзнагародзіла кожнага, але найдаражэйшы падарунак быў прызначаны яму. Найвышэй узляцеў ён, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Праз два гады яна ўмяшалася ў змаганне Чартарыйскіх з Патоцкімі і зрабіла яго каралём і вялікім князем літоўскім, уладаром Рэчы Паспалітай.

Імператрыца адчувае на твары ўсмешку. Хтосьці з замежных зласліўцаў падлічыў, што яна заявілася ў Расею, маючы ўсяго тры сукенкі, паўтузіна кашуляў і столькі ж насовак. Ну, дапусцім, сукенак было ў яе гардэробе на пару болей, але сутнасці гэта не мяняе. Цяпер яна — гаспадыня найвялікшай у свеце дзяржавы, і яе імперыя няўхільна прырастае новымі і новымі землямі. Восем гадоў таму яна адрэзала сабе ад краіны былога каханка Інфлянты і абшар да Дзвіны, Друці і Дняпра.

Ён, Станіслаў Аўгуст, дастаткова разумны, каб усведамляць, што былое каханне — не аргумент у мастацтве палітыкі. Але дыпламаты паведамляюць, нібыта надзеі ў яго наіўным сэрцы не пагаслі, а толькі прыцярушаныя попелам...

Яна не можа стрымаць смеху. Кожнаму цвярозаму палітыку відавочна, што гэтая мяжа — часовая. Зусім хутка галасістыя зарэчныя пеўні будуць і на тым баку Дзвіны будзіць яе падданых.

Ніколі дагэтуль імперыя не была такой магутнаю, а яна, яе ўладарка, такой шанаванаю ў свеце. Ёй пісаў Вальтэр. З ёю лічыць за гонар ліставацца Дэні Дзідро. Праўда, яе славуты французскі карэспандэнт паўсюль бачыць дэспатызм і марыць пра канстытуцыю, а пад старасць і наогул, кажуць, шыецца ў рэспубліканцы. Колькі гадоў назад, прыехаўшы ў Расею, ён угаворваў яе, імператрыцу, скасаваць прыгон. Ха-ха-ха...

Крыху пазабаўляўшыся ўспамінамі, яна пераходзіць да думак больш паважных.

Усё, што прапануюць такія разумнікі,— гэта лекі для Еўропы. А тут пачынаецца іншы кантынент, іншы свет. Петрарка ўжо складаў санеты, Батычэлі маляваў «Вясну», а тут па гарадах і вёсках скакалі, збіраючы даніну, ханскія баскакі.

Не, у Беларусі баскакаў не было, але тое ўжо не істотна, бо яна прырасціла гэтую зямлю да свайго кантынента.

Там, у Еўропе, яны з іхняй «Энцыклапедыяй» і рэспубліканскімі ідэямі, відаць, так ніколі і не здолеюць уцяміць, што яе падданым энцыклапедыі і канстытуцыі будуць не патрэбныя яшчэ не адно стагоддзе.

Нейкі прастадушны французік, хтосьці з вучняў Дзідро, прыслаў ёй, самай арыстакратычнай з еўрапейскіх імператрыц, ліст з просьбаю падараваць на знак спачування вальтэр'янскім ідэям свой партрэт.

Яна весела смяецца.

Месье Дзідро яна ўдзячная не за такіх вучняў, а за іншае. У адзін цудоўны дзень ён парэкамендаваў яе паслу ў Парыжы скульптара Фальканэ. Яшчэ год ці два, і першы расейскі імператар уздыбіць масянжовага каня над Нявой, назаўжды ўвекавечыўшы і яе, Кацярыну Другую.

Тут, недалёка ад палаца, што даў сёння прытулак яе шчаслівай ночы, ёй паказалі мураванку — два ляпныя геніі над уваходам,— дзе спыняўся Пётр. Трэба прызнаць, што ў Полацку ён мог бы паводзіцца і больш абачліва.

Гэтае забойства вікарыя з уніяцкімі манахамі... У Сафійскім саборы ды яшчэ ў час прычасця... Колькі непажаданых размоў пры еўрапейскіх дварах... І потым — парахавое сховішча ў саборных сутарэннях...

Можа, ведаючы, што праз семдзесят пяць гадоў яна атрымае ад полацкіх базыльянаў запрашэнне наведаць адбудаваны сабор, імператар трымаўся б больш дальнабачна. Учора яна палічыла за лепшае ўхіліцца ад візіту, не забыўшыся — яна тонка ўсміхаецца — разыграць пры гэтым сцэну незадаволенасці праваслаўнымі манахамі з Богаяўленскай царквы, якія, ведама ж, зусім выпадкова зацягнулі набажэнства...

Не дзіўна, што ён, полацкі паляўнічы, таксама ўспомніў Пятра. Зрэшты, ёй чамусьці не надта хочацца згадваць іх начную размову.

Настоеная на пахах і водарах ночы світальная свежасць запаўняе спальню, і імператрыца накідвае на плечы стары ўтульны шлафрок, што памятае шмат яе вандровак і таямніц.

Ранішні даклад яшчэ далёка, і яна сядае да бюро, каб напісаць сыну. Добра распісанае пяро лётае па паперы з такой самай вясёлай лёгкасцю, як некалі ў дзяцінстве яна, ловячы расшпіленым футэркам вецер, лётала на галандскіх каньках па замерзлай сажалцы.

«Паміж вокнамі маімі і Польшчаю адна толькі не вельмі шырокая Дзвіна... З таго часу, як я тут, заўсёды куртаг. Безліч мужчын і жанчын найвышэйшага палёту, што прыехалі з Польшчы. Паўсюль стужкі блакітныя ды чырвоныя і духоўныя асобы ўсялякага крою. Учора я была ў езуітаў і ўражаная іх бляскам. Усе астатнія каталіцкія ордэны ў параўнанні з імі — свінні. Адно толькі шкада, што гэтыя людзі не танцуюць. У іх тут найраскашнейшая царква. Ах, якія сярод іх трапляюцца круцельскія фізіяноміі!..»

Так, яе імперыя — гэта не Еўропа, а зусім іншы мацярык, але менавіта ёй, Кацярыне,— нявызнаныя шляхі твае, Госпадзе! — служыць забаронены папам Кліментам XIV ва ўсім каталіцкім свеце ордэн езуітаў.

Яна адкладае ўбок пяро, і перад яе вачыма праносіцца цэлая ненапісаная пакуль кніга, вартая таленту выбітнага раманіста.

Тады, калі двухгаловы арол распасцёр крылы над новымі губернямі, яна загадала графу Чарнышову і ўдзень і ўначы сачыць за езуітамі, як за найбольш падступным каталіцкім ордэнам. Хіба магла яна ўявіць, што рэляцыі з генерал-губернатарскай канцылярыі будуць штораз выклікаць у яе не трывогу, а захапленне? Што полацкія езуіты першымі складуць ёй прысягу і адслужаць у саборы святога Стэфана літургію ў гонар яе імянінаў?..

Яна паставіла сабе на службу магутны ордэн і сімпатыі многіх новых падданых-каталікаў. Яна, не

трацячы ні рубля, захавала на далучаных землях езуіцкія школы і калегіумы, праграмы якіх, прынамсі, на стагоддзе апярэджваюць любую расейскую школу,— не дзіва, што знакамітыя фаміліі з абедзвюх яе сталіц пачынаюць аддаваць дзяцей у навучанне не куды-небудзь, а ў Полацк, дзе Таварыства Ісуса мае найстаражытнейшы на гэтых землях калегіум.

Яна абвяла вакол пальца самога папу, высачыўшы ягоных агентаў, што меліся публічна абвясціць у Полацку пастанову пра забарону ордэна, і цяпер на ўсе ўшчуванні і пагрозы з Ватыкана полацкія езуіты, сціпла апусціўшы вочы, адказваюць, што дзеля выканання загадаў з Рыма яны гатовыя ахвяраваць нават уласным жыццём, але гэтага не дазваляюць ім свецкія расейскія ўлады.

Яна дазволіла адчыніць у Полацку навіцыят, а гэта значыць, што яе памежны горад зрабіўся сусветнай сталіцаю Таварыства Ісуса. Вестка пра тое разляцелася па Еўропе і дасягнула Новага Свету. Рэктар калегіума казаў учора ў прамове, што берагі Дзвіны замянілі ордэну берагі Тыбра.

Цяпер сюды, пад абарону праваслаўнай імператрыцы, атрымаўшы ў расейскага пасланніка ў Вене пашпарты, едуць адукаваныя сябры ордэна з Італіі і Францыі, Нямеччыны і Швейцарыі... На абедзе — стол быў накрыты на сто кувертаў — ёй адрэкамендавалі двух прафесараў Сарбоны і амерыканскага мільянера, які перасек акіян і дзесятак краін, каб ахвяраваць ордэну свае мільёны.

Там быў яшчэ фацэтны італіец, які пасля другой змены страў дэкламаваў уласную элегію да рыб ракі Палаты, што побач з яе палацам зліваецца з Дзвіною...

Не, на абедзе паляўнічага не было. Яна ўпершыню ўбачыла яго на балі, дзе ўчарашняга вечара танцавала паўтысячы гасцей.

Яна ніколі не залічала сябе ў прыхільніцы баляў і ўжо даўно не дазваляла сабе з галавою акунацца ў легкадумны вір музыкі, шампанскага, фальшывых усмешак і навылёт хлуслівых прызнанняў і камплімментаў.

Каб не марнаваць часу, яна, як зазвычай, даручыла вачам выбраць аб'ект назірання. Спачатку аб'ектаў аказалася адразу два: князь Пацёмкін і падобны да Гамлета Ланской, якога ў Пецярбургу яна, хаваючы ад прыдворных дам і ашчаджаючы для сябе, здаралася, днямі трымала пад замком. Князь не быў бы самім сабой, каб не ведаў, хто шаптаў ёй у мінулую ноч «зоренька» — так, выконваючы ейнае жаданне, мусілі называць яе ўсе фаварыты.

Князя як быццам магнэзам цягнула да Ланскога: ён колькі разоў здымаў з тацы два келіхі, загаворваў з маладым канкурэнтам, і аднойчы яна, імператрыца, здолела ўбачыць ці, праўдзівей, праз усю залю адчуць тую ледзяную ўсмешачку, што празмяілася па князевых вуснах, на імгненне прыадкрыўшы бездань ягонае нянавісці. Перад тым як пераключыць увагу на беларускага афіцыяла Паслоўскага, яна спакойна падсумавала: не будзе нічога дзіўнага, калі неяк увечары пецярбургскі Гамлет бесклапотна вып'е келіх таго віна, якое каштуюць толькі раз.

Ксёндз Паслоўскі заняў пазіцыю каля высокіх вокнаў, за якімі на ілюмінацыйнай вежы быў вытканы агнямі яе, Кацярынін, партрэт. Да афіцыяла па чарзе падыходзілі ваявода берасцейскі Ян Зыберг, полацкі кашталян Фадзей Жаба, скарбовы пісар літоўскі Юллян Шчыт, ваявода люблінскі Ігнацы Твардоўскі... Пра што маглі гутарыць з афіцыялам гэтыя фанабэрлівыя палякі і ліцвіны? Можа, усе разам атрымалі ад папы новы загад паўплываць на непакорлівы ордэн? Няхай афіцыял раскажа ім пра кіслую міну апошняга пасланага з Варшавы нунцыем Аркеці сакрэтнага агента, што не паспеў ступіць па дзвінскім беразе і двух крокаў, як з туману выйшаў сам полацкі гараднічы са сваімі людзьмі, якія ветліва пасадзілі няпрошанага візітанта назад у човен і паабяцалі, што наступнага разу давядзецца вяртацца наўплаў.

Твардоўскага змяніў стараста інфлянцкі Язэп Плятэр, а таго — кашталян троцкі Андрэй Агінскі... Яна засталася задаволенаю, што беспамылкова памятае, хто ёсць хто ў гэтай жывой мазаіцы твараў, але разам

з тым адзначыла, што ніхто з суразмоўцаў ксяндза Паслоўскага так і не павярнуўся тварам да вокнаў, у якіх ззяў яе партрэт у атачэнні гербаў галоўных гарадоў імперыі. Яна ўжо мелася палічыць падкрэсленую няўвагу палітычнай дэманстрацыяй, як яе позірк спыніўся на гнуткай, яна сказала б, празмерна гнуткай постаці Станіслава Панятоўскага, пляменніка і цёзкі караля і вялікага князя. *Апошняга* караля і вялікага князя,— думаючы пра былога фаварыта, дадавала яна ўжо не адзін год.

Аднак інтэрас у яе выклікаў не сам пляменнік — асоба, ствараючы якую Госпад відавочна адпачываў, хоць, зрэшты, і падкінуў ёй за картачны столік неблагога партнёра. Яна весела злавіла сябе на тым, што прагна разглядвае ягонага спадарожніка.

З гэтае хвілі яе ўжо не цікавілі ні бестурботны Гамлет з развар'яваным князем Пацёмкіным, ні чарада ліцвінаў і палякаў, што, як восы вакол спелае грушы, круціліся каля афіцыяла (яны дачакаюцца часу, калі яе партрэт будуць аздабляць гербы і іхніх гарадоў), ні цэлы рой маладых іншаземцаў-езуітаў, што размаўлялі адначасова на чатырох ці пяці мовах, з цыркавой лёгкасцю пераскокваючы з французскай на лаціну і з нямецкай на ангельскую.

Ён выглядаў на паўгалавы вышэйшым за Ланскога і, відаць, пражыў на свеце ці не ўдвая болей за яго, што між тым ані не адбілася на па-маладому станістай постаці. Яна, імператрыца, была пэўная, што ў яго на галаве не парык, а ўласныя, густыя і нават на позірк шорсткія валасы, якія ёй у мужчын нязменна падабаліся. На ягоным выштукаваным без лішняга мудрагельства твары ляжала пячатка адлучанасці. Яна зразумела, што гэты мужчына, як і яна сама, не паддаўся святочнай мітусні і застаецца ў яе віхуры сам-насам з сабою.

Ёй захацелася ўбачыць яго зблізку, пачуць ягоны голас, даведацца, якія ў яго вочы. Губернскі маршалак Корф, што не адыходзіўся ад яе далей чым на тры крокі, схіліўшыся да вуха, патлумачыў: былы земскі суддзя Полацкага ваяводства Каспар Буйніцкі, нашчадак старажытнага тутэйшага роду, удавец і заўзяты паляўнічы.

Маршалак зрабіў знак, і праз хвіліну радавіты ліцвін стаяў перад ёю.

З валасамі яна не памылілася: густыя, цёмна-каштанавыя, ледзь-ледзь кранутыя плацінавай сівізной, яны — вядомае яшчэ старажытным грэкам сведчанне пароды — розніліся з жарай барадой і гэткага ж колеру вусамі геданіста. Літая постаць дыхала спакойнай, утаймаванаю сілай. Выразны, буйны, але ў класічных межах, нос паведамляў пра цвёрдасць характару. Аднак першае, што яна ўбачыла, калі ён ці не занадта лёгкім паклонам павітаўся з ёю, былі зусім маладыя зялёныя вочы, якія то цямнелі і ўвачавідкі рабіліся карымі, то зноў святлелі амаль да колеру травеньскае лістоты, але незалежна ад гэткіх хуткіх зменаў у іх, не гаснучы, гралі небяспечныя агеньчыкі.

Так, ужо тады, на балі, ягоная блізкасць павеяла на яе небяспекаю. І ўадначас яна, імператрыца, адчула сілу ягонага мужчынскага прыцягнення, сілу, якую яна ўмела цаніць, як ніхто.

Яна ўжо ведала, хто прашэпча ёй сёння «зоренька».

Але тут яна памылілася: ён, хоць і быў папярэджаны пра асвечанае традыцыяй імператрыцына жаданне, не назваў яе так ні разу.

Яна адно зараз асэнсоўвае гэта, і адкрыццё аніяк нельга назваць прыемным. Уквеленасць увасабляецца ў тонкім звоне камара, які мерыцца паснедаць, апусціўшыся ёй на шыю.

Імператрыца выводзіць камара з гульні, але ёй здаецца, што прыкры звон у спальні не сціхае. Каб адпрэчыць замарачэнне, яна вяртаецца да ліста сыну.

«Жыхарства тут самае разнастайнае: вельмі часта побач жывуць праваслаўныя, каталікі, уніяты, габрэі, рускія, палякі, чухонцы, немцы, курляндцы, карацей, не ўбачыш двух сялянаў, каб тыя былі аднолькава апранутыя і правільна гаварылі на адной мове; змяшэнне плямёнаў і моваў нагадвае Вавілонскае стоўпатварэнне...»

Ёй узгадваецца дарога з Пецярбурга: натоўпы святочна прыбраных прыгонных рабоў з хлебам-соллю, карагоды баб з іхнімі простанароднымі песнямі... Часам, каб пацешыць ёй вока, усцяж гасцінца ставілі

бутафорскія вёскі-дэкарацыі: багатыя чыстыя хаты, каровы з вялізнымі вымямі, што нязменна абуджалі ў яе жаданне...

Адзін з мазілак-бутафораў сагграваў яе на апошнім начлезе перад Беларуссю. Яна спакусілася ягоным грэнадзёрскім ростам і паставаю, але ў ложку вонкавыя мужчынскія вартасці таксама ператварыліся ў бутафорыю. «Грэнадзёр» відочна баяўся яе, мітусіўся, у самы недарэчны момант ні з пушчы ні з поля кінуўся дзякаваць за ўказ, што дазваляў мастакам вольна заходзіць у народныя лазні, каб вывучаць чалавечае цела на жывых мадэлях. «А сёння, бацюхна, на гасударыні натуру спасцігаць будзеш»,— засмяялася яна і бесцырымонна ўзяла яго за прычыннае месца. Ды ўсе старанні натхніць бутафора скончыліся канфузам, і яна мусіла пасылаць па Ланскога.

Імператрыца пераводзіць позірк на алькоў, і яе вочы затуманьваюцца.

Другі раз ён, полацкі вядзьмак і паляўнічы, авалодаў ёю вось там, на ложку, абрынуўшы на яе піраміду падушак і падушачак. І зноў яго ласкі нагадвалі ласкі дзікага звера. Зноў штосьці лясное, нéтравае таілася ў руках, што блукалі па яе целе, не ведаючы аніякіх забаронаў. Яна не назвала б свае адчуванні прыемнымі, але прыхаваная трывога, што пульсавала ў іх лабірынтах, несла з сабою непаўторную слодыч.

Гаспадаром з першага імгнення блізкасці, як і раней, быў ён, і ў нейкую хвілю яе ўжо тады ўтнула здагадка, што ён апынуўся ў спальні не па волі яе, імператрыцы, а згодна з уласным, не зусім зразумелым ёй планам... Але ён быў геніяльным каханкам, і тое, што адбывалася сярод раскіданых падушак, ужо не пакідала месца думкам, якія імкліва адносіла ўдалеч паводка асалоды.

Яны гаварылі па-французску, аднак у ложку ў яго вырваліся словы на іншай мове. Гэта была не польская, а мова яго дзяцінства, гэтых прыдзвінскіх лугоў і пушчаў. Прамоўленыя на ёй словы нарадзіла не пяшчота, не цеплыня. У іх, як і ва ўсім тым, што ён рабіў з яе целам, гучала ўладная грубасць, якая між

тым заставалася непакаранаю, бо ўваходзіла ў правілы гульні, якія яна, імператрыца, прымала не вымушана, а з усцехаю, цалкам падпарадкоўваючыся ягонай уладзе, яго дыханню і яго мужчынскаму crescendo.

Ейную свядомасць толькі злёгку зачапіла крылом зайздрасць да тых, каго ён любіў да яе і каго будзе любіць пасля.

Ён і яна ўскрыкнулі адначасова.

Потым яны ляжалі ў празрыстай, прапахлай іх любоўю цемры і размаўлялі.

Размова атрымалася нядоўгаю, але ў імператрыцы такое ўражанне, што яны прагаварылі цэлую ноч.

Яска ўквеленасці, што ўспыхнула, калі яна згадала ўпартае нежаданне ліцвіна назваць яе «зоренькой», не гасла, а наадварот — разгаралася і асвятляла падзеі прамінулае ночы ўжо крыху іншым святлом.

Тады, у прыліве жаночае ўдзячнасці, яна запусціла пальцы ў гушчар ягоных кудзераў, кудлаціла іх і дрымотна думала, як добра было б узяць полацкага паляўнічага з сабою ў дарогу: можа, да Магілёва, дзе яе чакала сустрэча з аўстрыйскім імператарам Іосіфам, а можа, і далей, у Пецярбург... Прамоўленыя ёю словы сталіся вынікам не асэнсаванага рашэння, а толькі працягам адчуванняў напоўненага шчаслівай стомаю цела, але яна, імператрыца, не выключае, што раніцой словы-мроі маглі — цікава было б паназіраць за Пацёмкіным і кампаніяй — увасобіцца ў яву.

«Хадзі да мяне на службу, ліцвін. Я вазьму цябе ў сталіцу».

Яна вяртала сабе становішча гаспадыні, але голас яшчэ быў афарбаваны цеплынёю, і зараз з гэтае прычыны яна чуе ніякаватасць.

Адказам стаўся смех — вясёлы, здаецца, шчыры і густы, як і валасы яго гаспадара.

Толькі адсмяяўшыся, ён сказаў «не».

«Я ўмею быць шчодрай...»

Ён меў адвагу перапыніць яе.

«Ваша вялікасць, магчыма, тое, што я скажу, будзе смешным ужо для вас.— Голас ліцвіна зрабіўся непрыемна сур'ёзным, у ім не ацалела ні іскрынкі сме-

ху.— Сентыментальны юнак памёр ува мне так даўно, што я ўжо не памятаю, на якой ростані аплакваў яго. Але гэтаксама даўно я зразумеў, што не змагу жыць без гэтае зямлі. Без Дзвіны, без маіх лясоў, без магільных скляпоў нашага роду. Без таго, што той чуллівы юнак называў радзімай...»

«Цяпер і назаўсёды гэта частка маёй дзяржавы,— суха адказала яна.— Для тваіх дзяцей і ўнукаў радзімаю будзе ўжо Расея».

І зноў спальня пачула смех, але іншы: у ім гучала не толькі адмаўленне.

«Ваша вялікасць, няўжо вы насамрэч уяўляеце, што ўсё гэтак проста? Душа не можа ў адну цудоўную раніцу прачнуцца падданаю іншай дзяржавы».

«Ёсць розныя душы, ліцвін. Як ты ведаеш, шляхта, што прынесла мне прысягу, атрымала поўныя правы расейскага дваранства».

«Калі чалавека пазбаўляюць шляхецтва, ён не перастае быць шляхцічам».

«Ты павінен зразумець, што і тыя землі,— яна паказала на вакно, за якім плыла начная рака,— таксама будуць належаць Расеі. Праз год ці праз дзесяць — для гісторыі гэта імгненне. Людзі народзяцца, а землі — не. Я хачу, каб нашы ўнукі былі аднолькава рускімі і жылі, як родныя...»

Яна не заўважыла, калі перайшла на расейскую мову. Ён працягваў адказваць па-французску.

«Няўжо, вы думаеце, можна забыць...»

«Усё,— абсекла яна,— усё трэба забыць, ліцвін. Забыць дзеля міру, спакою і любові».

«Дзеля любові...»

Ён паўтарыў апошнія словы, як рэха, і пацягнуўся да яе.

Цяпер яна чула ў ім не толькі грымучую сумесь звера і паляўнічага. Яе пачуццё не паспела акрэсліцца ў думку, проста яна, імператрыца, ужо ведала, што — незалежна ад таго, ці прысягнуў ліцвін расейскаму трону — ён не быў яе падданым. Яна адчувала ў ім небяспеку, і гэта адно мацней распальвала яе. Напэўна, штосьці падобнае адчуваў і ён — вядзьмак, паляўнічы, вораг...

А можа, думаецца імператрыцы зараз, ёю кіравала ілюзія? Можа, блізкасць была неўсвядомлена абраная як галоўны аргумент у неспадзяванай спрэчцы, што пагражала стаць каламутным сном іхняе бяссоннае ночы?

Яна не пярэчыла, калі ён рашуча сцягваў яе з ложка на падлогу. Вусны і рукі паляўнічага зноў ператвараліся ў дзесяткі вуснаў і рук, якія абдымалі і лашчылі яе беспамылкова і таленавіта, але ў яе істоце нараджаўся пратэст. З такой адлучана-халоднай жарсцю, з такім самым майстэрствам ён мог бы любіць недзе пад стогам якую-небудзь шляхцянку з пасагам з дзесяці прыгонных душ. І ўсё ж жаданне перамагала, і не шляхцянка, а яна, імператрыца, мусіла таймаваць сябе, адтэрміноўваць імклівае набліжэнне таго моманту, калі, ужо незалежна ад яе волі, з грудзей вырвецца вызвалены шчаслівы стогн...

Блізкасць сталася не фіналам, як яна спадзявалася, а ўсяго пярэрваю ў размове, нітку якой ён звязаў адразу, як толькі яны прылеглі на ложак,— быццам проста на нейкі час пакідаў спальню і вось вярнуўся.

«Ваша вялікасць, у мяне двое сыноў, і я сумняваюся, што ў іх кароткая памяць...»

«Памяць, ліцвін, аблудная, а гісторыя — заўсёды хлуслівая. Ты ведаеш, ёсць безліч азначэнняў навукі Кліо. Мне даспадобы вось гэтае: кніга, якую пішуць пераможцы».

Ён азваўся не адразу.

«Яшчэ гісторыю называюць плоццю часу. Яна ўмее супраціўляцца. Яна можа быць зброяй».

Ёй праглася хутчэй скончыць размову, што з кожнай хвілінаю рабілася ўсё больш няўтульнаю, і разам з тым яна ведала, што трэба дагаворваць да канца.

«Людзі ва ўсе часы хочуць, каб ім паўтаралі прыгожыя казкі...»

Ён зноў памарудзіў з адказам, аднак засталося ўражанне, што яму няцяжка знайсці патрэбныя словы, проста ён лічыць, што ўсё ўжо сказана раней.

«Так, хочуць. Але не ўсе. Будуць і тыя, хто не захоча верыць казкам».

«Іх заўсёды будзе меншасць, ліцвін».

Гэтым разам ён зрэагаваў імгненна.

«Але яны заўсёды будуць, ваша вялікасць. Як бы вам ці мне ні хацелася іншага. І яны ніколі не пагодзяцца з лёсам, які абралі не самі. Ніколі, ваша вялікасць».

У ягоным голасе ёй прымроіўся сум. Аднак, седзячы пры бюро над няскончаным лістом, яна разумее, што памылілася.

Трэці раз паляўнічы смяяўся, калі яна запыталася, якую ўзнагароду ён хацеў бы атрымаць на памяць пра сённяшнюю ноч: гэты збудаваны адмыслова дзеля яе прыезду палацык, грошы, пярсцёнак з дыяментам?..

Ён хутка абарваў смех.

Яму будзе досыць успамінаў пра шчасце дзяліць ложак з імператрыцаю.

Яна не ўзялася б сцвярджаць, што шчырасць гэтых слоў была разбаўленая нечым іншым, аднак якраз пасля іх яна і вырашыла застацца сам-насам з сабою...

Сонца даўно ўзышло. Гадзіннік паведамляў, што да ранішняга дакладу менш за гадзіну, а на восем раніцы прызначаны ад'езд.

Імператрыца перачытвае ліст да сына і застаецца незадаволенай. Ды часу што-небудзь дадаваць няма: у спальню вось-вось увойдуць слугі.

Канчаткова развітваючыся з ноччу і пачынаючы дзень, яна падыходзіць да вакна. На Дзвіне, бліжэй да «польскага» боку, з'яўляецца рыбацкая лодка.

Нейкі момант імператрыца чуецца самотнай і стамлёнаю. Але яна з дзяцінства асвоіла навуку не папускацца хвілінам слабасці, калі жыццё раптам выдае марнай мітрэнгаю.

Страпянуўшыся, як вялікая птушка, яна вяртаецца да бюро і ставіць на лісце дату: 22 траўня 1780 года.

Час выклікаць слуг. Аздоблены двума купідончыкамі званок-лілея стаіць на кансолі каля высокіх цяжкіх дзвярэй. Імператрыца бярэ яго, і яе рука замірае.

Пад лілеяй ляжыць срэбны сыгнет.

Яна ставіць званок і разглядвае знаходку. Ювелір быў не з горшых: конны рыцар на пячатцы захаваў усе дэталі — ад астрогаў да шасціканцовага крыжа

на тарчы. Сумневаў наконт уладальніка сыгнета ў яе не ўзнікае.

Дык, значыць, адмовіўшыся ад яе падарунка, ад яе платы за ноч, ён, гэты мяшанец, гэты шляхціч-вядзьмак, меў смеласць і нахабства заплаціць ёй самой...

З глыбіняў яе «я» ўсплывае пякучае цёмнае жаданне пакараць, паказаць ліцвіну яго сапраўднае месца, давесці, што ён, няхай сабе ягонаму роду хоць тысяча гадоў, усяго толькі кузурка. Такіх, як ён, і яшчэ больш радавітых у яе ў імперыі нялічаныя тысячы, і кожнаму ў любы дзень лёс па яе волі можа ўсміхнуцца, а можа і...

Там, у Рэчы Паспалітай, яны прывыклі да беспакаранасці...

Яна, як пацеркі, перабірае найбольш вытанчаныя пакаранні і раптам імпэтна бярэ пазалочаную лілею і звоніць.

На ранішнім дакладзе, выслухоўваючы сабраныя пра горад і намесніцтва звесткі, яна дазваляе сабе быць не надта ўважлівай.

Жыта каштуе ад рубля да паўтара рубля за чвэрць... Пуд сена — меней за дзесяць капеек... Мяса — дзве капейкі за фунт...

Усё значна таннейшае, чым ва ўнутраных губернях, адзначае яна і ўспамінае, якія мядзведзі водзяцца ў полацкіх лясах.

Мяшчане ўсім задаволеныя, але скардзяцца на адсутнасць медных грошай і недахоп залатых ды срэбных манет на размен асігнацыяў...

Не забыць распарадзіцца забраць тую мядзведжую шкуру з сабой...

Каменныя магазіны пад збожжа гатовыя, шпіталі будуюцца, жабракі сабраныя ў багадзельні...

Трыста рублёў яна дае на жабракоў...

Ён быў такі салодкі...

Пяцьсот рублёў на праваслаўны Богаяўленскі манастыр...

А потым салёны...

Недабор падаткаў складае ўсяго дваццаць рублёў...

Такія ночы нячаста выпадаюць і ў імператрыц...

Сто рублёў на гарадскія школы...

«Людзі хочуць, каб ім паўтаралі прыгожыя казкі...»

Адганяючы сон, імператрыца трэ ўказальнымі пальцамі скроні і абмахваецца вахлікам.

У намесніцтве спакойна, няма ніводнага калодніка...

«Кніга, якую пішуць пераможцы...»

Пяць чырвонцаў на багадзельні...

«Маé сыны не забудуць...»

Дрымота адступае, і яна дыктуе сакратару першы сённяшні ўказ: зрабіць ва ўсіх далучаных гарадах вопісы ўмацаванняў з мэтаю іх паляпшэння.

Сёння ўначы ён не быў яе падданым. Такія, як ён, не стануць падданымі ніколі.

Роўна а восьмай імператрыца выходзіць з пакояў на палацавы ганак. Гарадскія цэхі са сцягамі, мяшчанства і габрэі ўжо стаяць усцяж вуліцы да самай трыумфальнай брамы. Звоняць званы. Гарматы даюць першы развітальны залп.

Імператрыцы мусяць быць велікадушнымі.

Яна абводзіць вачыма натоўп прыдворных, шляхты і іншаземцаў. Каспар Буйніцкі — каб успомніць яго імя, ёй не трэба намагацца.

Яго няма.

Яна сядае ў экіпаж і развітальна ўзмахвае рукой. Да першай паштовай станцыі будзе час падрамаць.

За тры дні яблыневая квецень у садах амаль асыпалася.

Што ён сказаў на адвітанне?

«Ваша вялікасць, зычу вам жыць і цараваць доўга».

Націск на слове «доўга». Што ён можа значыць?

Перад сваім пажаданнем ён гаварыў пра тых, што ніколі не пагодзяцца з лёсам, які выбралі не самі.

«Ніколі, ваша вялікасць».

Значыць... Значыць, цараваць доўга, каб пераканацца... Дажыць да таго, калі яны возьмуцца за зброю...

Дзякуй, ліцвін. Яна сапраўды будзе жыць доўга. Яна перажыве былога каханка, якога звалі Станіславам Аўгустам. Куранты гісторыі хутка сыграюць ягонай дзяржаве рэквіем.

Яе, расейскую імператрыцу, будзе вітаць званамі і гарматамі Вільня. А іхні герб, той, што на сыгнеце, які ляжыць у яе ў кішэні, яна пакіне яму, ліцвіну-паляўнічаму, упрыдачу да яго крозаў. Але гэта будзе адно герб горада. Замест ранейшага, магдэбургскага, з караблём у блакітным полі на срэбнай вадзе...

Сон чамусьці не ідзе.

А тут яшчэ прыдарожны маёнтак уніяцкіх арцыбіскупаў і каля брамы — сам уладыка полацкі, назола з антычным імем Ясон і смешным прозвішчам Юнаша-Смагаржэўскі.

Цяпер адкруціцца ад візіту да уніятаў не ўдасца.

Паклоны, ліслівыя ўсмешкі. А што за імі? Якія думкі спеюць за лбамі гэтых грэка-католікаў, што збудавалі пры браме дзве падобныя да мінарэтаў вежы і абнеслі рэзідэнцыю свайго ўладыкі мурам з дванаццаццю капліцамі, чые вокны болей выдаюць на амбразуры?

Навошта ім гэтая фартэцыя?

Арцыбіскуп, адрозна ад праваслаўных архірэяў, у тым ліку і сталічных, бездакорна гаворыць па-французску, што яе таксама раздражняе.

Яны ідуць да сажалкі з зялёнымі берагамі і блакітнай альтанкаю на выспе, куды перакінуты зграбны масток.

Імператрыцы знячэўку шчымліва-востра хочацца дадому, у Пецярбург.

Цестачкі да кавы зусім свежыя.

Альтанка, дзе сабраны стол, над самай вадою, адкуль яе, імператрыцу, незварушна разглядваюць залатыя рыбкі. Не рыбкі, а ўкормленыя рыбіны, кожная з якіх узброеная пачварна вялікімі вачыма-тэлескопамі.

Адразу ад берага глыбока, што ёй таксама не падабаецца, бо нагадвае пра раскіданы паводкаю мост і неабходнасць перапраўляцца цераз Дзвіну ў шлюпцы.

Але ў гэтай глыбіні ёсць і выгода: імператрыца апускае руку за парэнчу, і арцыбіскуп не заўважае, як бліскае на сонцы срэбны пярсцёнак з пячаткаю і як рыбіны ўважліва праводзяць яго лупатымі вачыма.

1998

Пакуль не згасла свечка

Сцяпану Александровічу

Хлопчык мой! Дарагі Ежы!

Здарылася амаль неверагоднае. Я зноў магу сказаць табе: «Добры дзень!»

Хачу верыць, што ён для цябе сапраўды добры. Я так даўно ў турме, што мне часам здаецца, быццам на волі ўжо нікога няма. Толькі пра цябе я ніколі так не думаю.

У гэтыя хвіліны я спрабую ўявіць, дзе ты цяпер, чым займаешся. Калі зімовыя вакацыі не скончыліся, ты, напэўна, дома, у нашым ціхім кутку, дзе так часта вандруе мая душа. Бачу, як ты лётаеш на каньках па сажалцы, што за бераставымі прысадамі. Бачу, як ты, яшчэ расчырванелы ад марозу, сядзіш каля грубкі на плеценай канапцы з кнігаю на каленях. Мне хочацца зірнуць паўзверх твайго пляча: якая гэта кніга? Можа, том Плутарха з вашай бібліятэкі? Твая маці пісала мне ў Парыж, што ты захапіўся гісторыяй...

З якім пачуццём чытаеш ты мае першыя радкі? Бадай, я згодны на любое, апрача страху.

Вырашай сам, ці варта паказваць гэты ліст маці, бацьку ці дзядзьку Канстанціну. Ты ведаеш іхнія адносіны да мяне пасля арышту. Але не будзем надта сурова судзіць іх: цяжка знайсці чалавека, якому сваяцтва з дзяржаўным злачынцам прынесла б радасць. Лепш за ўсё — спалі гэты ліст. Тады сумленне маё будзе спакойнае.

Наогул маім адрасатам не шанцуе. Ліст да маёй сястры, а тваёй маці, сваё кароткае падарожжа закончыў у следчай справе. Нядаўна з літасцівага дазволу я пісаў да яго вялікасці. Здавалася, я быў сама добранамернасць (хіба што дазволіў сабе сказаць на адрас вялікасці два-тры словы, якія не рызыкну паўтарыць тут), але наш самадзержац таксама не дачакаўся вестачкі ад аднаго са сваіх удзячных падданых.

І ўсё ж я жыву вераю, што ты прачытаеш гэты ліст. Ён пойдзе іншым шляхам. Мне выпала шчаслівая карта, Ежы. Сярод турэмшчыкаў з'явіўся наглядчык з незацверджанай дубейкаўскай шляхты, з тых самых Дубеек, што на паўдарозе паміж стольным Нясвіжам і маім маёнткам.

Калі бачыш гэтага чалавека ўпершыню, міжволі прыгадваюцца гісторыі пра ведзьмакоў і атручальнікаў, аднак у яго ў грудзях б'ецца шляхетнае сэрца.

— Пане,— ціха загаварыў ён да мяне аднойчы, паставіўшы на падваконец турэмную вячэру,— я памог бы вам уцячы, ды вы ўжо не дойдзеце і да дзвярэй. Што я магу зрабіць дзеля вас?

Спачатку я вагаўся, але калі ён сказаў, што ягоны бацька ваяваў пад штандарамі Касцюшкі, я даверыўся яму.

У яго вялікая сям'я, а я меў сто рублёў срэбрам: іх пераслаў нядаўна твой дзядзька Канстанцін (ці не ў якасці кампенсацыі за тое, што быў занадта гаваркі на допытах?). Урэшце мне ўдалося пераканаць свайго дабрадзея, што мне грошы ўжо не прыдадуцца, а павялічваць прыбыткі пана каменданта і ягонай хеўры я не імкнуся.

— Вашы грошы будуць апякаць мае рукі,— сказаў ён.

Я вельмі разлічваю на яго, бо нам з табою шмат аб чым трэба пагутарыць.

На Усходзе я чуў ад аднаго мудраца: калі хочаш доўга жыць, як мага часцей глядзі на зялёную траву, на цякучую ваду і на прыгожых жанчын.

Паўтара года я пазбаўлены ўсяго гэтага. Ці не таму я так хутка выпраўлюся ў апошняе падарожжа?

Не, гэта не пра мяне сказана: «Felix opportune mortis» — «Шчаслівы, хто памірае ў час», але, далібог, сёння я ў добрым гуморы. Я стаў такой важнай птушкай, што мяне баяцца генералы. Аб маім лёсе рупяцца шэф жандараў, галоўнакамандуючы дзейнага войска і нават сам Нерон*, з якім я так няўдала спрабаваў наладзіць ліставанне.

* Так Незабытоўскі называў у сваіх лістах цара Мікалая I.

Тут, у Вільні, ужо атрымаўшы прагонныя, другі тыдзень сядзіць сталічны фельд'егер, каб суправадзіць мяне ў слаўны горад Табольск. Кат павінен зламаць над маёй галавой шпагу, затым мяне чакаюць пазбаўленне маёмасных правоў і сібірскія капальні. Так у нашай імперыі судзяць самых небяспечных дзяржаўных злачынцаў. Ну як, табе яшчэ не захацелася схавацца пад ложак, як у той калядны вечар, калі я апрануўся ў мядзведзя?

Толькі гэтым разам кат, відаць, застанецца без працы (вядома, ненадоўга), а бравага фельд'егера пецярбургскія прыяцелі павіншуюць з хуткім вяртаннем. Суддзі адмералі мне дваццаць гадоў катаргі, аднак і цяпер ім не ўдасца пацерці рукі, бо ў мяне засталося не дваццаць гадоў, а ў лепшым разе дваццаць дзён.

Але для такой размовы мне проста неабходна ўявіць свайго візаві. Мы развіталіся, калі табе было ўсяго дзесяць летаў і зім, і пакуль я падарожнічаў з Еўропы ў Афрыку, а потым з кута ў кут маёй каморы (восем з паловаю крокаў), ты неўпрыкмет ператварыўся з хлопчыка ў юнака.

У маіх вандраваннях прыга́ды аб табе былі самым дарагім, што я меў. Вольнаю хвілінай я асцярожна перабіраў іх, як калекцыянер бясконца разглядвае каштоўныя камяні са свайго збору. Вось гэты апал — той Вялікдзень, калі ты гасцяваў у мяне і мы з табой і фурманам Янкам наладзілі наезд на мой маёнтак. Заміж пісталетаў у нас былі петарды і ляскоткі, у цябе адклеіліся вялізныя чорныя вусы, а пан Янушэўскі, высакародна кінуўшы жонку, скочыў у брычку і з перапуду ледзьве не загнаў коней. А вось гэты гранат — дзень, калі мы знайшлі ў архіве пірацкую мапу з пазначаным на ёй скарбам. Апоўначы мы адкапалі каля стайні зусім новы гаршчок з пяццю залатымі. «Вуйку Олесь,— шаптаў ты,— а піраты будуць нам помсціць, так?..» Прабач, я раблюся сентыментальным. Напэўна, гэта туга па сыне, якога ў мяне ніколі не будзе.

Паўсюль ты быў маім невідочным спадарожнікам, у любы момант я мог выклікаць з памяці дзесяцігадовага гарэзніка з каштанавымі кудзеркамі і ў запэцканых зелянінаю нагавічках, якога лёкай толькі што зняў з бераста. Такім і яшчэ крыху незадаволеным, што цябе адарвалі ад вывучэння грачыных гнёздаў, ты быў у дзень нашай апошняй сустрэчы, калі ля ганка стаяў мой шасцярык. Але аднойчы я зрабіў не вельмі прыемнае адкрыццё. Я зразумеў, што такога цябе ўжо даўно няма. І вось тут адбылося нешта цікавае...

Неяк у часы студэнцтва я ехаў з Дэрпта праз Пецярбург і ў доме, дзе спыніўся, убачыў некалькі карцін Аляшкевіча*. Мяне вельмі ўзрушыў адзін партрэт — дама ў блакітнай сукенцы з галінкаю лаўра ў руцэ і побач з ёю дзеці: дзве дзяўчыны і два юнакі. Уражанне было моцнае і свежае, аднак найглыбей чамусьці запаў у памяць адзін з юнакоў, злёгку кучаравы, амаль круглатвары, з разумнымі вачыма і пячаткаю летуценнасці на ўсім абліччы. Памятаю, я адразу падумаў: з такога ніколі не вырасце нягоднік. І вось праз шмат гадоў, спрабуючы ўявіць цябе, я раптам убачыў не мілае дзіця ў брудных штоніках, а таго летуценнага юнака ў гафтаванай кашулі з вялікім адкладным каўняром. Мо калі-небудзь ты зможаш спраўдзіць, ці нашмат памылілася маё ўяўленне, але для мяне ты застанешся такім да астатняй хвіліны.

А зараз сядай бліжэй, вось сюды, на край майго ложка, і я гатовы адказваць на твае пытанні. Прадбачу, што іх нямала і некаторыя ўжо маглі пачуць твая маці ці дзядзька Канстанцін. Баюся, што іх адказы знаходзяцца прыкладна на такой самай адлегласці ад ісціны, як мой Нясвіж ад Парыжа.

Даруй, Ежы! Я зусім забыўся на свой партрэт, а ты ж, пэўна, таксама хочаш бачыць свайго вуйка. У мяне барада ў пояс, расчасаныя пяцярнёй брудныя валасы да плячэй, вочы... Не, лепей папрасі ў маці дагератып, які я прыслаў вам з Францыі (маю падазрэнне, што цяпер ён ляжыць у патайным прыскрынку бюро), і паглядзі на паважнага маладога чалавека з прычоскаю a la Sultan Mahmoud. Ён даволі саманадзейна трымае ў руцэ гусінае пяро, а локцем абапёрся на стосік арку-

* Язэп Аляшкевіч (1777–1830) — беларускі жывапісец.

шаў. На драпіроўцы можна разабраць слова «Liberte»* — дагератыпіст быў заўзяты рэспубліканец.

Лепей уяўляй мяне такім...

Цяпер я цалкам да паслуг васпана. Чытаю ў тваіх сініх вачах галоўнае пытанне: як я апынуўся ў адзіночнай турэмнай каморы?

О, у абвінавачанні шмат пунктаў, аднак іх пералікам я займуся трошкі пазней.

Адзін разумны чалавек сказаў, што ў Расеі два праваднікі: язык — да Кіева, а пяро — да Шлісельбурга. Гэта адказ на тваё першае пытанне, бо турма ў віленскіх дамініканскіх мурах мала чым розніцца ад шлісельбургскіх казематаў. Прынамсі, выйсці адсюль не менш цяжка.

— Падсудны Незабытоўскі! Вы абвінавачваецеся ў тым, што... Пункт першы: ганьбавалі спосаб кіравання ў імперыі. Пункт другі: дзікімі лаянкамі зневажалі гасудара імператара і іншых асобаў дома Раманавых, як «ныне здравствующих», так і «почивших в Бозе». Пункт трэці: заклікалі да стварэння таемных таварыстваў і паўстання жыхароў усіх плямён, станаў і веравызнанняў. Пункт чацвёрты: выяўлялі зацятую варожасць да манархіі і любоў да рэспублікі. Пункт пяты... Але досыць.

Ну як, нябожа, нагнаў на цябе страху? Відаць, не надта, бо ў тваіх вачах толькі паболела цікавасці. Якім чынам я трапіў у рукі нашых доблесных жандараў? Між іншым, гэта сапраўды вельмі займальная і не менш павучальная гісторыя.

Ты, магчыма, чуў, што я напісаў нейкія крамольныя кнігі. Гэта праўда, твой вуек з разраду людзей, якія адважваюцца давяраць паперы свае сумневы і нават імкнуцца пашыраць іх сярод суайчыннікаў. Я аўтар сямі кніг, яны выходзілі ў Вільні і ў Парыжы.

— Але ніхто не ведае літаратара Аляксандра Незабытоўскага...— зусім слушна зазначаеш ты.

У адказ я мог бы сказаць, што не шукаў славы, а толькі хацеў прынесці хоць каліва карысці нашай па-

* Свабода *(фр.)*.

кутнай зямлі. Праўда, тады я быў бы няшчыры. Homo sum... Я чалавек... Я марыў аб вядомасці. У тваім вяку за адну бяссонную ноч я напісаў параўнальны жыццяпіс Напалеона і Аляксандра Македонскага.

Усё жыццё я ўтаймоўваў прагу славы. Я пераконваў сябе, што не магу ні дня быць шчаслівы, пакуль няшчасная мая Айчына. І ўсё ж было багата дзён, калі я забываў пра гэта і адчуваў сябе шчаслівым. Я быў малады, Ежы! Але аднойчы, каб адолець свой непамерны гонар, я даў сабе абяцанне, што ніводную маю кнігу не будзе аздабляць маё імя. І я не парушыў слова.

Мае першыя драмы былі надрукаваныя ў Вільні з дазволу цэнзуры. Зрэшты, Шэкспір спакойны за свае лаўры: вялікага драматурга з мяне не выйшла. Суцяшаюся тым, што мае літаратурныя экзерсісы ўсё ж нечага вартыя. Не кожны літаратар атрымлівае ў якасці ганарару дваццаць гадоў катаргі.

Я стрымаў слова, хоць гэта і далося мне з пакутамі. Колькі сіл адабрала выданне рамана! Спачатку друкары не хацелі набіраць тэкст, потым крывадушная і баязлівая зграя парыжскіх гандляроў кнігамі адмовілася купіць раман, напалохаўшыся ягонай назвы. «Мары пра славу, каханне і свабоду»? Крый Божа!

Як я чакаў у Мадрыдзе паштовы дыліжанс, з якім адправілі маю кнігу! І вось два тамы ў мяне ў руках, і разам з усцехаю — разуменне, што, апроч двух-трох сяброў, ніхто на свеце не ведае і наўрад ці калі-небудзь даведаецца імя аўтара. Гаркаватая радасць.

Цяпер ты ведаеш, што я ехаў за мяжу не толькі лекаваць сухотку.

Дарэчы, вярнуўшыся памяццю ў тую пару́, хачу цябе крыху развесяліць. Генерал-губернатар двойчы клаў пад сукно мае прашэнні аб выдачы замежнага пашпарта. Ніякіх падстаў для падазрэнняў у яго не было. Тады чаму? Калі здагадаешся — аддаю дамаскую шаблю з маёй гасцёўні.

Аднаго разу ў Вільні ў нас з губернатарам прычынілася векапомная сустрэча. Уяві такі малюнак. Баль у князя R. Я вяду свецкую размову з дамамі і раптам заўважаю, як усе вакол мяне праглынаюць языкі і са

страхам утароплiваюцца на нешта за маёй спiнай. Азiраюся — i што? Сам яснавяльможны пан Мiрковiч. Вочы па яблыку, шчокi i левая нага трасуцца.

— Как вы смели, сударь, явиться в таком виде?! Я сам, сам, сам остригу вас!

У губернатара ёсць цудоўная звычка тупаць нагамi. Князёўне зрабiлася млосна. I тут я шаркаю ножкай i гэтак ветлiва адказваю:

— Да вашых паслуг, пане цырульнiк...

Вось табе, Ежы, выдатны ўзор таго, якiя людзi займаюць у нашай iмперыi дзяржаўныя пасады.

Пасмейся, хлопчык мой, пасмейся, табе так пасуе смех...

Як у нас кажуць, зiмовы дзень, што ў вераб'я дзюба. Час запальваць свечку. Ты не разумееш, Ежы, якая гэта раскоша — свечка. Уявi сабе дванаццаць, чатырнаццаць, шаснаццаць гадзiн цемры са шкрабаннем у кутах, ад якога цемра робiцца яшчэ больш глухою. Уявi бясконцую ноч, калi пачынае здавацца, што ўжо нiколi не развiднее. А самае жахлiвае, што можна заснуць i прачнуцца па-ранейшаму ў цемрыве, не ведаючы, доўжыцца вечар цi ўжо блiзка раница. Тады нараджаецца адчуванне, што цябе проста не iснуе, што ты памёр або яшчэ не паспеў нарадзiцца. Такiмi хвiлiнамi даходзiш да таго, што шалёна радуешся, пачуўшы крокi вартавога, бо яны, прынамсi, нагадваюць, што ты ў гэтым свеце не адзiны, што ёсць не толькi морак, але й цьмяны, аплецены павуцiннем лiхтар у калiдоры... Аднак цяпер я — Крэз! Камендант нарэшце дазволiў перадаць мне шэсць фунтаў свечак. Цэлых шэсць фунтаў, Ежы!

Ну вось, свечка ўжо гарыць, робячы маё жытло такiм утульным, i мы можам працягваць размову.

Ты, вядома, хочаш пачуць аб маiх прыгодах i ў цывiлiзаваных краiнах, i ў краях, не вельмi кранутых сумнеўнымi выгодамi нашага часу. Не, у палон да канiбалаў я не трапiў, затое басконскiя разбойнiкi тры днi трымалi мяне ў пячоры, чакаючы выкупу. Калi застанецца час, неадменна раскажу пра гэта, а пакуль у нас ёсць больш важлiвыя тэмы.

Давай перанясёмся з табою на паўтара года назад. Сядай у маю каляску! Яе верх падняты, i цёплы вецер абвявае нашы твары. Гэта вецер вяртання. Конi бягуць па дарогах Галiцыi, а ў думках я пад'язджаю да Клецка, я ўжо бачу з Ляхоўскай гары нашу дуброву i ялiны смалiцкiх* прысадаў, ужо ўзбягаю на ганак...

I раптам сэрца сцiскае трывога. Я зноў у Галiцыi. Шыбенiца на местачковым пляцы. Спаленая вёска. Мы з Рыгорам ехалi па мясцiнах, дзе летась лiлася кроў. Аўстрыйцы спярша дазволiлi сялянам граiць шляхецкiя атрады, а потым прыйшлi iмперскiя войскi... Божа, калi ўжо i тут, i ў нас паны рэвалюцыянеры даўмеюцца, што перамагчы без сялянскiх косаў гэтаксама проста, як спляжыць дуб без сякеры?! Калi б у 1794-м цi ў 1830-м** нашы хлопы атрымалi зямлю i волю...

Аўстрыйскiя жандары трапляслiся нам лiтаральна на кожным кроку, усё паказвала, што на тым баку мяжы iхнiх блакiтнамундзiрных сваякоў з расейскай палiтычнай паляцыi будзе не меней. Мой неспакой перадаўся i Рыгору.

— Глядзiце, пане Волесь, каб не пад'елi мы з вамi верашчакi,— паўтараў ён ледзь не пры кожнай сустрэчы з гэтымi панамi.

У апошнiм аўстрыйскiм мястэчку Бродах я затрымаўся. Трэба было нешта рабiць з кнiгамi i рукапiсамi. Хоць яны i былi ананiмныя, усё адно везцi iх у Расею легальна азначала б самахоць садзiцца ў турму. Заставалася дамова з кантрабандыстамi, а хачу табе сказаць, што гэтым паважным рамяством там не займаюцца хiба што немаўляты. Цэлы дзень я шукаў сярод тых мазурыкаў фiзiяномiю, якая выклiкала б у мяне давер, i кожны спрабаваў мне нешта збыць. Прызнаюся, што не ўтрымаўся i купiў-такi лiты слуцкi пояс, якi праз тыдзень прысвоiў зухаваты палiцэйскi прыстаў.

Увечары ў бродаўскiм шынку да майго стала асцярожлiва падсеў чарнявы парабак, што адразу прый-

* У вёсцы Смалiчы (цяпер Нясвiжскi раён) быў маёнтак А. Незабытоўскага.

** Маюцца на ўвазе паўстанне Тадэвуша Касцюшкi i паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Беларусi i Лiтве.

шоўся мне да душы нейкім наіўным дзіцячым паглядам. Я не стаў таргавацца, а накінуў да яго цаны пяць фларынаў.

Назаўтра мы пераехалі мяжу. Перад расейскім шлагбаумам караннік спатыкнуўся. Рыгор спалатнеў і пачаў утрапёна жагнацца. Афіцэр варты звярнуў на гэта ўвагу, і я мусіў растлумачыць Рыгоравы паводзіны прылівам патрыятызму.

— У такія хвіліны,— з піетэтам сказаў я,— кожны расейскі падданы перажывае нешта падобнае.

Афіцэр ветліва згадзіўся і ўзяўся трэсці мае саквы.

Ніякай крамолы там не было, і мытню я пакінуў, бесклапотна насвіствaючы пад няўхвальнымі позіркамі Рыгора «Вэндруй, дзяўчына»...

Ад'ехаўшы дзесятак вёрстаў, мы спыніліся ў павятовым гарадку. Астатні багаж павінен быў прыбыць уначы.

На чацвёрты дзень чакання за нейкую гадзіну мне тройчы трапіў на вока вяртлявы чалавечак у зашмальцаваным лапсердаку. Цяпер толькі дурань мог сумнявацца, што мы з Рыгорам сапраўды пад'елі верашчакі.

Я не ведаў, што губернатар падпісаў ужо загад аб маім арышце. Мех з кантрабандай...

Прабач, Ежы, на сёння я развітваюся з табой. Старшы наглядчык загадаў гасіць святло. Аказваецца, вязні, прынамсі палітычныя, павінны такой парою спаць. Цяпер каля шасці вечара. Вось і ўся ўсцеха ад маіх свечак...

Заходзь, хлопчык мой, заходзь. Я так рады зноў бачыць цябе ў сваім самотным прытулку.

Учора я забыўся абмаляваць яго. Акрамя чатырох сцен, у мяне ёсць тапчагі і кульгавае крэсла, якое паставілі, калі хвароба больш не дазволіла мне ўставаць. Наогул, ужо цэлы тыдзень я жыву, як ангельскі лорд. Замест голых дошак у мяне пярына і дзве пуховыя падушкі. На мне ядвабны шлафрок, а каля тапчагаў стаіць пара чаравікаў, у якіх я нікуды не схаджу. Дарэчы, ад мяне толькі што пайшоў турэмны капелан. Ён прыносіў навіну, што Бог пачуў маю просьбу і мне вярнулі права на штодзённы шпацыр. Le bon Dieu envoye toujours des culottes a ceaux, qui n'ont pas de derriere*.

Яшчэ ў мяне ёсць пыльнае вакенца ў глыбокай нішы. Раніцой на падвоканні звінелі сініцы, значыцца, маразы прыціснуць яшчэ мацней. Буду маліцца, каб не замерз атрамант і пяро не зрабілася бездапаможным. Цікава, ці чуваць на небе малітвы атэістаў?

Краты на вакенцы ты бачыш і сам.

У адзіночнай каморы, без кніг, без паперы і пёраў, якія з'явіліся ў мяне толькі днямі, розум заўжды павінен мець нейкі занятак, інакш ён трапіць у палон да хімераў. На шчасце, ніякім турэмшчыкам яшчэ не ўдавалася закратаваць акно памяці. Таму мая цэля амаль ніколі не бывала бязлюднай. Я часта гутарыў з філаматамі**. Міцкевіч чытаў мне тут «Пана Тадэвуша». А часам робіцца цесна, і я зноў выпраўляюся падарожнічаць. У мяне багаты выбар. Бой быкоў у Кадысе. Калізей, які нагадвае, што ўсе імперыі раней ці пазней развальваюцца. Аднак ведаеш, Ежы, ужо даўно я найбольш люблю блукаць па смаліцкіх ваколіцах. Люблю сесці пад мэндлік і пагаманіць з людзьмі, якія ніколі не прачытаюць маіх кніг і наўрад ці зразумеюць, дзеля чаго я жыў на свеце. Ды хіба з гэтае прычыны я маю права любіць іх меней?

Днямі я сустрэў у такіх блуканнях маю няньку Хіму з Лявонавічаў. Адгадай, аб чым я папрасіў яе? Зноў расказаць мне казку пра цмока-трыгалова, што вартуе каралеўскі скарб. Каб ты быў меншы, хлопчык мой, я пасадзіў бы цябе зараз на калені, і ты таксама слухаў бы Хіміны казкі. Але ты ўжо дарослы, і ўчора мы спыніліся на загадзе аб маім арышце.

Той чарнявы кантрабандыст з бродаўскага шынка быў чалавекам мясцовага прыстава, а ў маім мяху разам з кнігамі і рукапісамі ляжала частка фамільнага архіва. Былі там і лісты на імя нейкага Аляксандра Незабытоўскага.

* Міласэрны Госпад заўсёды дае штаны тым, у каго няма зада (*фр.*).

** Таемнае студэнцкае таварыства ў Віленскім універсітэце. У 1823 г. было разгромленае царскімі ўладамі.

Напачатку следства вёў штабс-капітан Мілер. Не ведаю, дзеля чаго — каб выклікаць мяне на шчырасць ці каб пачуць пікантныя прызнанні ў адказ — гэты rondelet* сібарыт на допытах апавядаў пра свае поспехі ў жанчын.

Вось ён пускае блакітныя кольцы духмянага дыму ад дарагой цыгары, і яго ленаваты мяккі барытон гучыць зусім лагодна:

— Аляксандр Хрыстафоравіч, ну няўжо вы верыце, што ўсталяваны ў Расеі лад можна змяніць? Яшчэ ніколі манархія не была такой моцнай. Мне здаецца, вы паводзілі сябе проста несур'ёзна. Навошта вам рэвалюцыя? Хіба людзям нашага з вамі кола закрытыя якія-небудзь магчымасці паўнакроўнага жыцця?.. Вы хацелі, каб такія магчымасці былі ў кожнага? Але, згадзіцеся, тады іх не будзе мець ніхто...

Спрачацца з ім — усё роўна што прасіць ваўка не есці мяса, і таму я лічу за лепшае адмоўчвацца.

— Дарагі Аляксандр Хрыстафоравіч...

Ён знаходзіць прыемнасць у тым, каб лішні раз назваць мяне на свой капыл, відаць, здагадваючыся, што ў мяне згаданае імя выклікае не самыя лепшыя пачуцці: не вялікі гонар быць аднайменнікам пана Бенкендорфа.

— Дарагі Аляксандр Хрыстафоравіч, да чаго прывяло вас ваша, мякка кажучы, неспакойнае пяро? Вы, адзін з самых багатых памешчыкаў павета, чалавек, звыклы да раскошы, бавіце час у сырой халоднай каморы. І гэта з вашым здароўем. Грубая ежа, нямытае адзенне, прабачце, насякомыя... Нават толькі дзеля захавання чалавечай годнасці я на вашым месцы зрабіў бы ўсё магчымае, каб аблегчыць свой лёс. Ужо адно прызнанне віны...

Але ў нас са штабс-капітанам былі розныя ўяўленні пра чалавечую годнасць і спосабы яе захавання.

Перамогі над віленскімі дáмамі відавочна даваліся Мілеру лягчэй, чым над палітычнымі злачынцамі, і наша знаёмства не здоўжылася.

* Кругленькі, пульхненькі *(фр.)*.

Наступнага следчага прызначыў сам генерал-фельдмаршал Паскевіч, граф Эрыванскі, святлейшы князь Варшаўскі і прочая і прочая. Пра гэтага пана Явецкага варта пагаварыць трохі падрабязней.

Калі Rondelet, нягледзячы на ўсе свае спагадныя словы, ставіўся да мяне, па сутнасці, абсалютна абыякава (і за гэта я яму па-свойму ўдзячны), дык стацкі саветнік Явецкі шчыра любіў мяне. Так-так, любіў. Пратэжэ генерал-фельдмаршала любіў мяне за тое, што я так своечасова падвярнуўся яму для новага кроку ўгору. Ад стацкага саветніка да сапраўднага стацкага, ад св. Ганны з каронай да св. Уладзіміра. Напэўна, нешта падобнае адчувае да сваёй ахвяры кат, калі ведае, што пасля смерці асуджанага зможа пагрэць рукі. Хто асмеліцца назваць пачуццё ката няшчырым?

У дужках заўважу, што як літаратар я буду пану Явецкаму давеку ўдзячны. Такога адданага і ўважлівага чытача не меў, пэўна, і сам пан Бальзак.

Я хутка адчуў яго любоў і тады паставіў сабе за мэту: зрабіць усё, каб следчы знелюбіў мяне, каб я стаўся на ягоным шляху прыступкаю не ўгору, а ўніз.

Не трэба вялікага таленту, каб здагадацца параўнаць почыркі ў маім прашэнні аб паездцы за мяжу і ў захопленых жандарамі рукапісах. Да таго ж у мемуарах я імкнуўся быць зусім праўдзівым, і следству было вельмі проста суаднесці ананімныя мемуары з жыццём нясвіжскага памешчыка Незабытоўскага. Карацей, Явецкаму мроілася, што не сёння, дык заўтра ён пачуе маё поўнае прызнанне і будзе трыумфатарам. Сапраўды, яго доказы было немагчыма абвергнуць.

Затое, Ежы, іх можна было не прызнаваць.

Уяві сабе гнуткага смуглявага мужчыну гадоў на сорак, які нечым нагадвае цыркавога артыста. На ім бездакорны светла-шэры сурдут, пашыты ў найлепшага варшаўскага краўца, на гальштуку бялее вялікая перліна, і наогул ён пакідае прыемнае ўражанне чалавека, задаволенага сабою і іншымі.

Сёння Явецкі яўна ў гуморы, а ў такія дні за сталом яму не сядзіцца.

— Ну-с, пане Незабытоўскі,— весела гаворыць ён, пахаджаючы па кабінеце,— раніцою я скончыў чытаць адзін надзіва займальны раман пад назваю... гм... «Мары пра славу, каханне і свабоду». Спадзяюся, з гэтае прычыны размова ў нас атрымаецца больш змястоўная, чым мінулым разам.

— Мне заўсёды цікава пагаварыць з чалавекам, які чытае кнігі,— адклікаюся я.

— А яшчэ цікавей звесці знаёмства з чалавекам, які іх піша, ці не так?

— Каго пан следчы мае на ўвазе?

— У вашай някемлівасці сапраўды няма межаў. Але вернемся да справы. У нас цяпер тысяча восемсот сорак восьмы год. Такім чынам, да прадказанай вамі рэвалюцыі застаюцца лічаныя гады, калі не месяцы...

— Не зусім разумею вас, пане следчы. Аб якім прадказанні ідзе гаворка? Мяне ніколі не вабіла роля аракула.

— Аб вашым, пане Незабытоўскі.— Сашчапіўшы за спінаю дагледжаныя кароткія рукі, ён працягвае мераць кабінет. Ход гутаркі яму пакуль відочна даспадобы.— Я гавару аб прароцтве, якое вы робіце ў сваім рамане.

— Але я ніколі не пісаў раманаў. Прызнаюся, нават лісты да сяброў даюцца мне з цяжкасцю.

— Тым не менш почырк рукапісу,— ён ківае на дзве пульхныя тэчкі на стале, — супадае з почыркам вашага дзённіка.

— На жаль, пана следчага ўвялі ў зман. У мяне няма звычкі заводзіць дзённікі.

— Цудоўна, цудоўна...— Явецкага не так проста вывесці з яго настрою.— А што васпан скажа наконт гэтага аркушыка паперы? Між іншым, на ім пералічваюцца назвы раздзелаў памянёнага рамана. І, між іншым, аркушык я знайшоў у вашай спальні. У следчай практыцы гэта называецца рэчавым доказам.

— Вы ўжо дабраліся да маёй спальні? Віншую, віншую... Значыцца, на думку пана следчага, я склаў змест невядомага мне рамана? Прабачце, але гэта пярэчыць элементарнай логіцы.

Шэры сурдут на імгненне застывае, а потым сядае за свой засланы зялёным сукном стол.

— Тады як вы растлумачыце з'яўленне паперкі ў вашым маёнтку?

— Васпан жа дзеля нечага лётаў такімі маразамі за дзвесце вёрст у мае Смалічы...

Ён адкідваецца ў крэсла — яшчэ адзін знак, што яго настрой мяняецца. У сувязі з гэтым у мяне мільгае бяскрыўдная ідэя.

— Прабачце, пане следчы... Раман, пра які вы гаворыце, заняў у размове такое вялікае месца, што я насмелюся прасіць вас хоць у двух словах акрэсліць яго сюжэт і ідэю.

— З вялікай прыемнасцю, пане падследны,— адказвае шэры сурдут з іроніяй, якая сведчыць, што птушка трапіла ў маё сіло.— У рамане апісваецца жыццё ў заходніх губернях пасля перамогі нейкай, з дазволу сказаць, народнай рэвалюцыі. Вядомы вам, напэўна, сэр Томас Мор мусіць недзе там, на Парнасе, пасунуцца, каб даць месца аўтару новай утопіі. Толькі яго фантазія, на вялікі жаль, скіраваная не на ўдасканаленне жыцця дзяржавы, а на падрыў яе святых асноў. Вось ідэя гэтага *невядомага* вам рамана. Вы задаволілі цікавасць?

— Збольшага. Аднак, пане следчы, дазвольце заўважыць, што ў вашых паводзінах ёсць пэўная дзіўнасць. Спярша вы безапеляцыйна заявілі, што раман напісаў я, а потым згадзіліся расказаць аўтару яго сюжэт. Вы не адчуваеце тут супярэчнасці?

Рабаціністы пісарчук, які, чакаючы паказанняў, ловіць мух, пакутліва моршчыцца, каб не засмяяцца. Следчы ўспыхвае, як дэвотка ад скаромнага слова, і колер сурдута падкрэслівае малінавую чырвань яго твару. Мінае не менш хвіліны, перш чым ён здольны весці допыт далей.

— В таком случае...— Явецкі імкнецца гаварыць па-расейску лепей за прыроднага русака, але ў раздражненні ў яго непазбежна вынырвае аднекуль польскі акцэнт, і гэта толькі прыспорвае пану следчаму зласлівасці.— У такім разе, міласцівы гасудар, я

таксама адзначу адну дзіўнасць. У нататках нейкага падарожніка ёсць згадка, што па Егіпце ён вандраваў у турэцкім уборы. А сярод вашых рэчаў, адпраўленых у Смалічы пасля арышту, знайшлі дакладна такі ўбор. Вось шаравары, вось зялёны турбан, вось такія самыя похвы з зорачкамі...

Ён выкладвае трафеі з шуфляды на стол, які робіцца падобны да прылаўка дзе-небудзь на ўсходнім базары.

— На вашу думку, усё гэта з'явілася ў маёнтку таксама ў выніку майго візіту?

— Цалкам магчыма.

Пісарчук у кутку прыкусвае губу і адварочваецца да сцяны...

Зразумей мяне правільна, Ежы. Я не строю з сябе героя, я проста хачу пераканаць цябе, што нават у самым цяжкім, невыносна цяжкім становішчы, калі ўжо, здаецца, няма і не можа быць ніякага выйсця, у чалавека абавязкова застаецца магчымасць змагання.

Чую тваё пытанне:

— А дзеля чаго, вуйку, ты вёў гэтае змаганне? Ці не разумней было б прызнаць неабвержныя факты?

Ты кажаш, што тады яны, прынамсі, пакінулі б мяне ў спакоі і не цягалі на бясконцыя допыты. А ведаеш, якую шалёную радасць чуў Мікалай, калі пасля Сенацкага пляца сябры расейскіх таварыстваў давалі паказанні? Мы з табой не маем права папракаць гэтых пакутнікаў, але я ні за якую ўзнагароду не згадзіўся б падараваць падобную радасць «рыцарам» з Трэцяга аддзялення. Лёс даў мне выпадак паказаць стаўпам прастола іх бяссілле, і адмовіцца ад такога шанцу было б злачынствам перад сумленнем.

І потым, допыты падабаліся мне. Не рабі круглых вачэй — сапраўды падабаліся. Не толькі таму, што я бачыў перад сабой ворагаў і мог з імі змагацца. Наглядчыкам і канваірам забаранілі са мною размаўляць, і допыты сталі адзінаю ніткай сувязі са знешнім светам. Тут я мог уведаць хоць кроплю з таго, што чыніцца па-за межамі маёй клеткі. Часам я чакаў допыту, як вандроўнік у пустэльні чакае ратавальнага глытка цёплай вады з амаль пустой біклажкі.

Аднойчы новы ўжо следчы, відаць, маючы на мэце давесці мне, які лёс чакае любое паўстанне, паведаміў, што ў Вене быў мяцеж, але войскі імператара ўзялі горад.

— Думаю, у Вугоршчыне ім будзе цяжэй,— ва ўладзе нейкага натхнення заўважыў я, хоць насамрэч не меў аніякага ўяўлення аб тым, што адбываецца цяпер у Вугоршчыне.

— Разгром вугорцаў — справа самай блізкай будучыні,— адчаканіў чапурысты следчы.— Тым больш імператар Франц Іосіф звярнуўся па дапамогу да нашага гасудара.

— Значыцца, у Вугоршчыне таксама рэвалюцыя?! — Я не мог дый не хацеў хаваць радасці.

— Але ў Расеі мы яе не дапусцім, пане Незабытоўскі.

Праз колькі дзён я неспадзявана змог выкарыстаць навіну. На мяне заманулася паглядзець усяму сінкліту. Я кажу пра Віленскую следчую камісію. Напачатку яе старшыня Чаваці — яўны вугорац і прозвішчам і абліччам — дзеля праформы пацікавіўся, якія пытанні ёсць у падследнага. Тады я і спытаў, штó пан падпалкоўнік адчувае ў дні, калі яго браты па крыві ваююць за свабоду. Трэба было бачыць, як ён ускочыў з крэсла. Дарэчы, той допыт фактычна пачаўся і скончыўся маім пытаннем.

Ты змеціў, Ежы, што ў палове папярэдняй старонкі літары раптам пачалі падскокваць і напаўзаць адна на адну, нібы іх выводзіла чужая рука, а потым зноў выраўняліся. Я дапісаў тую старонку цяпер, а тады, учора, знячэўку праваліўся ў нейкі нязвычны сон, дзе мая свядомасць растала, як сняжынка на нечай далоні. Нам з табой пашанцавала: на варце быў якраз мой дабрадзей. Ён забраў спісаныя аркушы, а апошні схаваў у мяне на грудзях. Сёння я распароў край пярыны, і на будучае мы дамовіліся, што тут будзе наша схоўка.

Маё глухое забыццё было так падобнае да смерці... Затое зараз, быццам у адплату, я чую прыліў сіл, напэўна, здолеў бы нават падняцца і зрабіць колькі кро-

каў. Але не буду рызыкаваць, бо павінен закончыць ліст. Суткі нябыту — папярэджанне, што трэба спяшацца.

Яшчэ два словы пра следства. Пан Явецкі вярнуўся ў Варшаву залагоджваць нездаволенага патрона. Справу перадалі ў ваенны суд, я адмовіўся даваць паказанні, і абвінаваўчы акт стаўся адначасна прысудам. Што-што, а судзіць у нашай імперыі ўмеюць. Аднак хопіць пра гэта.

Дык вось, Ежы, сёння я прачнуўся з дзіўным адчуваннем, што ў сне рака часу зрабіла плаўны паварот і я зноў трапіў у блаславёную пару дзяцінства. Я ляжаў з заплюшчанымі вачыма і быў дванаццацігадовым хлопчыкам, што часта прахопліваўся сярод ночы ад нейкай шчымлівай радасці. За вокнамі пансіённага дартуара гуляў вецер, сябры спалі, а я ляжаў пад цёплаю коўдрай і думаў, што мне наканавана незвычайнае, не такое, як у іншых, жыццё. Я не разумеў і не мог разумець, у чым яго незвычайнасць, трагічным ці шчаслівым яно будзе, але я і не прагнуў такога разумення — было дастаткова радасці, ад якой замірала душа.

Сёння я зноў перажываў тыя хвіліны. І раптам час абрынуўся на мяне шалёным вятрыскам, і за адно імгненне пранесліся ўсе астатнія гады.

Я адплюшчыў вочы: на цёмнай сцяне зімовы ранак ужо накрэсліў акенца з кратамі. Дапусцім немагчымае, падумаў я. Той хлопчык у хвілю шчаснага бяссоння ўбачыў вязніцу і сябе самога на гэтых тапчагах. Як бы ён жыў далей?..

Мне здаецца, у кожнага чалавека быў ці яшчэ будзе дзень, гадзіна або адзін момант, пра якія мы можам узгадаць часам толькі праз шмат гадоў, а мо і зусім не ўзгадаем, але менавіта ад іх і пачынаецца, па сутнасці, наша жыццё.

У Італіі я быў знаёмы з невідушчым жабраком. Вінчэнца — так звалі гэтага старога, якому не было і сарака,— распавёў мне сваю гісторыю. У маленстве, гуляючы ў руінах замка, ён міжволі стаў сведкам расстрэлу. Каля абымшэлай сцяны аўстрыйскія салдаты расстрэльвалі трох італьянцаў. Самы малады з іх

перад залпам крыкнуў: «Перадайце маёй маці, што я нікога не выдаў!»

Вінчэнца рыхтаваўся атрымаць спадчыну ад дзядзькі-банкіра і стаць добрапрыстойным буржуа. Замест гэтага ў няпоўныя пятнаццаць ён стаў карбанарыем. Сляпым яго зрабілі аўстрыйскія астрогі.

Такі дзень ёсць і ў мяне. Мне было сем ці восем гадоў, якраз той век, калі чалавек яшчэ неўміручы і жыве ў суладнасці з усім светам. Я гойсаў па маёнтку і забег на псярню пагуляць са сваім сетэрам. Ежы, тое, што я ўбачыў, і цяпер стаіць уваччу. На псярні секлі прыгоннага хлопа. Ён быў распнуты на шырокай лаве, і па спаласаваных рамёнах бег тонкі чырвоны струмок.

Колькі разоў я чуў потым свіст таго бізуна і бачыў прывязанае да нахілёнай лавы маладое цела! Сон паўтараўся шмат разоў, нібы нехта дбаў, каб я заўсёды памятаў той дзень і чорныя ад болю і нянавісці вочы таго чалавека... Ён ненавідзеў і мяне, дагледжанага паніча, які ў жаху знерухомеў на парозе.

Можа, цяпер я заслужыў ягонае дараванне?

Я пабадзяўся па свеце, Ежы, але нідзе не бачыў большага здзеку з чалавечае годнасці, чым у гэтай імперыі. За самае мізэрнае непаслушэнства чыноўніка — на гаўптвахту, студэнта — у салдаты. Гэта, так бы мовіць, свабодных падданых. А што казаць пра рабоў?

Ты не чуў, як аднаму тамбоўскаму памешчыку прыйшло ў галаву пажыць турэцкім пашою? Завёў сабе сераль з трыма дзесяткамі прыгожых сялянак, выпісаў аднекуль еўнухаў, а вёску пачаў пераварочваць у магаметанства. Дзякаваць Богу, суседзі падалі скаргу ў сінод.

А ў нашых губернях хіба нашмат лепей?

Уніятаў у праваслаўе перахрысцілі з-пад палкі. Неяк зайшоў я на казань у царкву — трохі з цікаўнасці, трохі з ахвоты пацвяліць прававерных каталікаў. Паслухаў бы ты, як святар распінаўся, даводзячы, што пад царом нашаму мужыку вальней жывецца, чым пад каралём. Я ледзьве сам не паверыў. А адзін з гэтых ашчасліўленых мужыкоў потым на цвінтары другому кажа: «Даўней хаця ў салдаты не бралі, а

цяперака Петрачка майго на дваццаць гадоў у рэкруты павялі. Толькі на небе з сынком і ўбачымся».

Ежы, ужо два разы свой дзень анёла я сустракаў у няволі. Восенню мне споўніцца трыццаць... Прабач, я агавары́ўся... Я не ўбачу не толькі восені, але і гэтай вясны.

Трыццаць гадоў... Здаецца, у такім вяку ўзышоў на эшафот смаленскі шляхціч Кахоўскі. Той самы, што на Сенацкай плошчы ці не адзіны з паўстанцаў адважыўся націснуць на курок. Столькі ж было Канарскаму* і Францішку Савічу**. Спадзяюся, ты ведаеш гэтыя імёны.

Герой — не той, хто зрабіў больш, чым іншыя. Герой — той, хто зрабіў усё, што мог. Таму я не магу назваць сваё жыццё незвычайным. Што я паспеў? Напісаў праект вызвалення сялян і не паспеў даць вольную ўласным прыгонным. Склаў план чыну нелегальнага таварыства і не паспеў заснаваць яго. Марыў узяць у рукі зброю, а цяпер ледзьве трымаю пяро...

І ўсё ж, Ежы, я без сораму зірну ў вочы хлопчыку, што прачынаўся сярод ночы ў пансіённай спальні.

Уяўляю, як дзесьці паміж дэсертам і вістам узнікае размова пра маю асобу і нехта, прыкрываючы далонню позех, падрахоўвае: «Я не разумею, панове, дзеля чаго пражыта жыццё...» Ежы, я веру, што ты змог бы...

Хлопчык мой, я пішу пасля доўгага перапынку. Тры дні і тры ночы мяне як быццам не існавала. Прадчуваю, што наступны раз магу ўжо не вярнуцца з гэтага чорнага прадоння, а мне яшчэ трэба сказаць табе нешта важнае.

У мяне эйфарыя, але розум мой ясны. Менш за ўсё я хачу, каб ты бачыў у лісце штосьці ментарскае. Сёння ў мяне зноў быў капелан. Я адмовіўся ад споведзі.

* Сымон Канарскі (1808–1839) — чынны ўдзельнік паўстання 1830–1831 гг. Расстраляны ў Вільні.

** Францішак Савіч (1815–1845) — беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат, паэт і публіцыст. У Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі арганізаваў «Дэмакратычнае таварыства», якое працягвала ідэі філаматаў. Арыштаваны і высланы ў салдаты на Каўказ.

Калі хочаш, лічы ўсю нашу размову споведдзю табе.

Ежы, не перапыняй мяне і даруй, калі сёння ў маіх словах не будзе паслядоўнасці, да якой ты прывык.

Памяць пераносіць мяне ў спякотны паўднёвы дзень. Мы са слугой адпачывалі ў халадку платана каля таверны. Побач спявалі некалькі маладых італьянцаў. Не магу пахваліцца дасканалым веданнем італьянскай, але ўпэўнены, што жандары не ўхвалілі б песні. Яна была пра падарожніка, які марыць вярнуцца дадому, ды яго зямля ў няволі, і толькі птушкі там свабодныя.

Цяжка вытлумачыць, што адбылося са мною ў той момант. Я пачуў раптам зусім іншую песню. Я ведаў яе, але ніколі не лічыў сваёй. А цяпер мне здавалася, што я не змагу далей жыць, калі не заспяваю яе, песню, якую пяюць у нас простыя людзі.

— Рыгор, ты ведаеш такую песню? — страшэнна хвалюючыся, я напеў яму першыя словы.

— Анягож, паночку,— уразіўся ён.— У нас яе ўсе ведаюць.

— Спявай, Рыгор!

І мы спявалі, Ежы. Магчыма, гэта былі найлепшыя хвіліны майго жыцця, хвіліны, за якія не шкода аддаць гады.

Сакол, сакол,
Высока лятаў,
Высока лятаў,
А што ж ты відаў?
Ой, відаў, відаў
Зялёна жыта,
А ў тым жыце
Казака забіта.
Забітага, несхаронена,
Ой, парасла трава
Скрозь рабёрачкі,
Ой, адкіпела кроў
Кругом сэрданька.
Прыляцелі, ой,
Да тры пташачкі,
Тры пташачкі —

Родны сёстрачкі.
Адна пташачка
Села ў ножанькі,
Друга пташачка —
У галованькі,
А трэцяя —
Каля сэрданька...

Я не заўважыў, як італьянцы абступілі нас.

— Grazia,— падзякаваў гаспадар таверны.— Мне невядома, якога народа гэта песня, але вы спявалі душой.

Сэрца так часта апярэджвае наш розум... Менавіта тады я ўпершыню засумняваўся: хто я?

Пасля я шмат думаў пра гэта. Я прыгадваў, як у варшаўскім пансіёне сябры кпілі з майго працяжнага вымаўлення, успамінаў, як выкладчык гісторыі заўсёды казаў пра вялікую Польшчу, быццам нашай зямлі проста не існавала. Я ўжо не мог заставацца спакойным, калі на нас глядзелі звысаку, калі гэтыя пыхлівыя паны велягурыста разважалі аб сваёй гістарычнай місіі. У такіх выпадках я пытаўся, а што рабіў бы пад Грунвальдам кароль Ягайла, калі б наш Вітаўт не прывёў свае сорак палкоў?

Мы называем сябе ліцвінамі, але з вуснаў аднаго чалавека я чуў і іншае слова — беларусы. Ты не ўяўляеш, як бы я хацеў пагутарыць з ім цяпер. Калі не памыляюся, яго прозвішча было Марцінкевіч. Тады ён служыў у Менску, а я ў канцылярыі ігуменскага маршалка. Памятаю, на губернскім з'ездзе з пана Марцінкевіча пасміхаліся, што світка яму бліжэй да душы, чым сурдут. Ён пісаў вершы на сялянскай гаворцы. Чамусьці я пэўны, што, калі ён не пакінуў свайго занятку, ты пра гэтага чалавека яшчэ пачуеш.

Памятаю, за сталом ён сказаў тост «папросту» і была бура рогату.

Следчы Явецкі рабіў мне вочныя стаўкі з фурманам Янкам і слугамі з маёнтка. Якімі вачыма глядзелі яны на мяне, калі я таксама загаварыў на іхняй мове! Відаць, падумалі, што пан крануўся з розуму.

А пан проста зразумеў, што ён адной з імі крыві, што ў яго ёсць свой народ, а без гэтага чалавек падобны да матылька, якога нясе вецер...

Ежы, хлопчык мой, свечка дагарае, а дацягнуцца да новай сам я не змагу.

Я хачу, каб ты запомніў: нельга служыць чалавецтву, не служачы свайму народу...

Свечка пагасла. Пішу гэтыя словы ў цемры. Можа, заўтра мы яшчэ сустрэнемся, але я баюся пайсці, не развітаўшыся.

Дай мне тваю руку, Ежы!..

1985

Пяць мужчын у леснічоўцы

*Gloria victis!**

Травеньская навальніца нацешылася маладой сілай і пакацілася над пушчаю далей, але дождж па-ранейшаму шамацеў так заўзята, што ў ягоным шуме дазвання раставала таканне старых ходзікаў. У цеснаватай леснічоўцы было сутонна і плаваў слабы пах мяты і яшчэ нейкіх сухіх зёлак, што пучкамі віселі на шастку ў цёмным надпеччы. Падраная падушка з натрушаным на прыпеку пер'ем і луснуты гаршчок-спарыш у прыдзверным куце казалі воку, што гаспадары чамусьці пакінулі сваё жытло і калі вернуцца — невядома.

Аднак цяпер людзі тут былі. Двух зусім маладых і двух старэйшых мужчын у аднолькавых шэрых світках без шнуроў і ў высокіх, да каленяў, ботах з першага погляду можна было прыняць за паляўнічых. Здавалася, яны ад раніцы гойсалі па лесе, і цяпер пушча ласкава падаравала ім схоўню ад залевы.

Але гэта былі не паляўнічыя.

Каля халоднай печы стаялі ў пірамідзе чатыры штуцэры вайсковага ўзору, з якімі не ходзяць на лесавую зверыну, а за поясам кожны з чацвярых меў рэвальвер або пісталет.

Трое мужчын прымайстрыліся збоч вокнаў, куды раз-пораз кідалі насцярожаныя позіркі; чацвёрты тварам дагары ляжаў на бурносе, пасланым на палку каля глухой сцяны. Яго правая рука была на тальмаху.

Апроч таго, у леснічоўцы быў пяты, і ён ужо ні на каліва не выдаваў на паляўнічага, бо на ім ладна сядзеў цёмна-зялёны мундзір з чырвонымі пагонамі капітана імператарскай арміі.

Пяты быў палонны.

* Слава пераможаным! *(лац.)*

Мужчыны маўчалі, і хоць кожны з іх маўчаў на свой лад, можна было з пэўнасцю сказаць, што думаюць яны цяпер пра адно.

Нейкую пару гадзін назад шырокі ўтравелы падворак леснічоўкі быў повен чалавечых галасоў і конскага гігатання. Потым гоман аціх, і перад калодзежным зрубам замёр шыхт узброеных людзей. На абымшэлым зрубе вісеў на кароткай дзідзе, апускаючыся краем да самага долу, абцёрханы бела-чырвоны сцяг. Людзі па чарзе выходзілі, цалавалі яго — хто стоячы, хто на каленях — і знікалі за стаўбурамі змрачнаватых вячыстых ялін, што цесна абсталі галявіну. Адны, перш чым ступіць пад шаты лесу, яшчэ прыпыняліся і крычалі на адвітанне нейкія астатнія словы, другія не азіраліся і толькі наддавалі кроку або паганялі коней...

Тыдзень таму аддзел інсургентаў цёмнаю ноччу ўвайшоў у павятовы гарадок Горы-Горкі на ўсходзе Беларусі. На пляцы ўжо чакалі колькі дзесяткаў студэнтаў тамтэйшага земляробчага інстытута. Тыя, у каго не было зброі, атрымалі стрэльбы і штуцэры.

Знячэўленая каманда ўнутранай варты супраціўлялася адчайна, але нядоўга. Паўстанцы ўзялі цэйхгаўз, казармы і скарбоўню і без ніводнага стрэлу занялі інстытут. Даўжэй за ўсіх адстрэльваўся з вокнаў кватэры начальнік варты, але на досвітку, які прыспешвала паланіца пажараў, стралянина заціхла і ўвесь горад апынуўся ў руках у інсургентаў.

Камандаваў паўстанцамі высакалобы цёмна-русы чалавек у канфедэратцы, з навіслымі над вузкімі вачыма брывамі і прычасанымі данізу вусамі. Ён меў блізу сарака гадоў, адно плячо трымаў вышэй другога і адзываўся на мяно Тапор. Пад хмурным ранішнім небам ён сказаў прамову перад рэдкім натоўпам сабраных на пляц перапалоханых месцічаў. Пяць-шэсць чалавек у адзенні службоўцаў марна спрабавалі наладзіць авацыю. Тапор перасмыкнуў плячыма, саскочыў з параконкі, на якой стаяў, і аддаў аддзелу загад рыхтавацца да выступу.

Неўзабаве мяшчане, што сядзелі па хатах, цікуючы на вуліцу праз фіранкавыя візэрункі і шчыліны

неадшчэпленых аканіцаў, зноў пачулі стрэлы. Паўстанцы аддавалі вайсковую пашану сваім забітым. Іх хавалі пад маладымі бярэзінамі на высокім рачным беразе. Часу збіваць труны не ставала, і сяброў па зброі аддалі зямлі загорнутымі ў рэквізаваныя персідскія дываны.

Надвечар, пакінуўшы цяжкапараненых у інстытуцкім дартуары, інсургенты на лёгкіх фурманках і забраных на конскім заводзе рысаках вырушылі з горада па дарозе на Крычаў. Тапор вёў свае сто пяцьдзесят шабляў і стрэльбаў на злучэнне з атрадам Касы́. Паўстанцы мелі загад захапіць магілёўскі артылерыйскі парк і прабівацца на захад.

Узяцце Горак было іх першым і апошнім поспехам.

За шэсць дзён, палячы паперы валасных праўленняў, валячы тэлеграфныя слупы і затрымліваючы пошту, аддзел прайшоў палявымі і лясными дарогамі болей за сотню вёрст. У кожнай вёсцы паўстанцы збіралі сялян і чыталі маніфест аб надзяленні зямлёй і скасаванні паншчыны. Але з дня ў дзень гэты паход усё больш нагадваў кружлянне аточанага лаўцамі звера. Аршанскі і крычаўскі атрады ўжо былі разбітыя, і камандзір аршанцаў Будзіловіч чакаў у фартэцы расстрэлу. Па наваколлі яшчэ насіліся чуткі, што пад рукою ў Тапара ледзьве не паўтысячы ўзброеных да зубоў людзей, з суседняй Смаленшчыны яшчэ ляцелі ў сталіцу панічныя тэлеграмы аб прысылцы дадатковых войскаў, але кінутыя супраць аддзела чатыры рэгулярныя роты і два дзесяткі казакоў з гарматаю шчыльней і шчыльней сціскалі кальцо. Каб адрэзаць мяцежнікам шлях за Дняпро, усе паромы і чаўны былі пераведзеныя на правы бераг і пры іх стаялі сялянскія варты. За спайманне паўстанца са зброяй мужыкі атрымлівалі ад бацюхны-цара пяць рублёў, за бяззбройнага — тры.

Учора на світанні, пусціўшы карнікаў па падманным следзе, Тапор пераправіўся цераз Проню і спаліў за сабою паром. Аднак надзея на тое, што аддзел прарвецца ў менскія лясы, пагасла ўжо і ў самых адважных сэрцах.

Сёння каля гэтае леснічоўкі Тапор, сапраўднага імя якога не ведаў, пэўна, нават ягоны ад'ютант, звярнуўся да інсургентаў з кароткім словам. Ён гаварыў сечанымі, дарэшты зразумелымі фразамі без усякае патэтыкі. Змагацца цяпер да апошняга — значыць зрабіць паслугу царскім генералам. Паўстанцы мусяць ратаваць сябе дзеля далейшага служэння справе. Выйсці з акружэння можна толькі невялікімі купкамі. Хто не адчувае ў сабе рашучасці працягваць змагання, няхай здаецца ўладам. Тыя, што складуць зброю не пазней чым паслязаўтра, трапяць пад абвешчаную ўрадам амністыю. У роўным камандзіравым голасе не было ні разгубленасці, ні паняверкі. Так мог гаварыць чалавек, які даастачы выканаў абавязак перад сваімі людзьмі і можа памерці або жыць далей з чыстым сумленнем.

Пасля роспуску аддзела каля леснічоўкі, на якую напаўзала чорная з жаўтлявым падчарэўем навальнічная хмара, разам з Тапаром застаўся ягоны ад'ютант Здзіслаў Міткевіч і яшчэ двое: вольны слухач земляробчага інстытута Сокалаў з прастрэленаю рукой і камандзір ужо няіснага першага плутона* студэнт Восіп Антановіч. Яны апынуліся заадно не таму, што сябравалі. Калі не лічыць прыяцельскіх дачыненняў камандзіра і ад'ютанта, гэтыя чацвёра былі проста таварышы па зброі. Іх аб'яднала, можа, і не ўсвядомленая яшчэ на ўсю глыбіню думка, што, пакуль яны разам, працягвае жыць аддзел. Была і іншая прычына — палонны афіцэр, ад якога ні на крок не адыходзіўся Антановіч. Капітана артылерыі Крыніцкага ўзялі ўначы на паштовай станцыі пасля шалёнай перастрэлкі, у якой адзін паўстанец быў забіты напавал, а другому куля трапіла ў жывот, і яго давялося пакінуць у доме ў станцыйнага наглядчыка. Лёс палоннага, які не атрымаў ані драпіны, дагэтуль заставаўся нявырашаны.

Крануты ржою ківач невядома кім заведзеных ходзікаў няўтомна адкройваў ад неабдымнасці часу

* Узвода.

імгненне за імгненнем, збіраў іх у цяглыя хвіліны, а дождж і не думаў сціхаць. Ён паліваў саламяныя стрэхі пустога хлява і адрыны, ля якой прыткнулася кінутая паўстанцамі фурманка, мыў чорнае голле пасаджанага пры хаце дубка, што, не даючы веры першаму цяплу, не спяшаўся выпускаць лісце з пупышак, прыпляскваў да зямлі малады дзьмухавіннік. Неба над леснічоўкаю было цяжкое і беспрасветнае. У такія вось хвіліны, пад такім небам, людзей апаноўваюць самыя змрочныя і безнадзейныя думкі. Пагатоў калі побач ходзіць смерць, а па аднаго яна можа прыйсці зусім хутка, бо ён біўся супраць чацвярых астатніх і забіў іх паплечніка, а можа, і двух, таму што паранены ў жывот таксама мог памерці.

Маўчанне зрабілася гнятлівым і фізічна адчувальным. Каб парушыць нясцерпную вусціш, нехта павінен быў зараз штосьці ўчыніць ці проста прамовіць слова. Відаць, вастрэй ад усіх адчуў гэтую неабходнасць ад'ютант Міткевіч, прысадзісты гарбаносы чалавек з рудымі бакамі ды барадою і нявыспаным тварам. Першыя за паўгадзіны словы сказаў, хоць і быў маўкліўцам, менавіта ён.

— Мне згадаўся мой дзед па кудзелі. Стары любіў паўтараць, што ў любым становішчы найперш трэба пад'есці.

Тапор з лёгкаю ўсмешкай кіўнуў, і ад'ютант адчыніў дарожны куфэрак. Ён раскінуў на краі шчарбатага стала сурвэтку, і на ёй з'явіліся чорныя сухары, кавалак саланіны і аплеценая раменьчыкамі біклажка. Бадай, адно цяпер яны ўспомнілі, што ў іх ад раніцы не было ў роце ні макулінкі. Усе скінулі здранцвенне і неяк пажвавелі, толькі палонны па-ранейшаму абыякава сядзеў на адзіным у хаце крэсле, зробленым з нязграбнаю прэтэнзіяй на панскасць. Але калі Тапор рукою запрасіў яго да стала, палонны таксама нібы ачуўся і без угавораў падсеў бліжэй.

Камандзір і ад'ютант адпілі з біклажкі седзячы і без слоў. Калі чарга дайшла да Антановіча, ён ускочыў і, трохі тэатральна ўзняўшы руку з біклажкаю, выгукнуў: «За адраджэнне Айчыны!» Гэта быў высокі, па-дзявочаму танклявы юнак з мяккімі рысамі безбародага твару. Калі б не вішнёвая радзімая пляма амаль на ўсю правую шчаку, ён, бясспрэчна, лічыўся б прыгажуном. Антановіч піў, закінуўшы русую галаву, на тонкай шыі перакочваўся востры коўцік.

— Вы забыліся, што мы не на банкеце,— заўважыў камандзір, калі юнак адарваўся ад біклажкі.

Чыстая смуглявая шчака Антановіча ўспыхнула, але ён перамаўчаў і перадаў біклажку параненаму. Той нязграбна ўзяў яе здароваю рукой і адно памачыў вусны. Бацькі параненага, дваццаць гадоў таму ахрысціўшы сына Апалонам, яўна спудлавалі. Ягоны непрыгожы шырокі твар з рэдкімі, быццам вышчыпанымі, вусікамі і цельпукаватае цела настолькі не адпавядалі імю, што яно ўспрымалася амаль як насмешка. Толькі вочы Сокалава былі надзіва гожыя глыбокаю сінечай, у якой свяціліся дабрыня і спагада.

Тапор цераз стол падаў біклажку палоннаму.

— Няхай жыве хрысціянская міласэрнасць,— з іроніяй прамовіў той.— Чалавека накормяць, напояць, а потым...

Ён не дагаварыў.

Капітану Крыніцкаму было за трыццаць. Ён насіў кароткую стрыжку і меў абсівераны валявы твар з адкрытым паглядам карых вачэй і цвёрдымі вуснамі пад цёмнаю шчотачкай вусоў. Здавалася, ён раскаяўся ў сваіх словах, бо хрумстаў сухаром крыху збянтэжана. Антановіч кідаў на палоннага касыя позіркі, якія не абяцалі нічога добрага. Сокалаў пазіраў на капітана са спачуваннем, а расчытаць пачуцці Тапара і ад'ютанта на іхніх непарушных тварах было немагчыма.

Пасля падмацунку паранены заняў ранейшае месца на бурносе, Тапор і ад'ютант вярнуліся да вокнаў, а студэнт прываліўся плячыма да сцяны і задрамаў. Сон сцёр з ягонага аблічча змрочнасць, пульхнаватыя вусны кранула дзіцячая ўсмешка.

Грымець зноў пачало бліжэй: навальніца вярталася. Знячэўку пярун раздзёр роўны шум дажджу недзе зусім побач, і Антановіч здрыгануўся і расплю-

шчыў вочы. Юнак адразу ўспомніў, дзе ён, і ўсмешка пагасла, як кволае цяпельца пад парывам ветру.

— Ведаеце, што мне прыснілася? — са зласлівай маркотаю спытаў ён пасля нядоўгага маўчання.— Тое, што здарылася роўна год назад.

— Не сказаў бы, што мы ўсё зразумелі,— не адрываючыся ад свайго занятку, азваўся камандзір, які чысціў на каленях рэвальвер.

— Я ведаю, грамадзянін* Тапор, вам будзе смешна. Але мне хочацца гаварыць пра гэта. Я буду расказваць і смяяцца разам з вамі,— з нейкім хваравітым імпэтам працягваў юнак.— Дык вось, год таму, якраз такой парою, мы наладзілі фэст з манеўрамі. Які быў час, панове! Сабраліся ў фальварку за дзве вярсты ад горада. Спачатку спявалі гімны, казалі прамовы. Потым практыкаваліся ў стральбе. Здагадайцеся, якія ў нас былі мішэні?

Антановіч абвёў таварышаў ганарлівым позіркам.

— Расейскія гербы. Мы стралялі ў расейскія гербы. Таму, хто за пяцьдзесят крокаў трапіў арлу з двух стрэлаў у абедзве галавы, панна Гелена падносіла келіх свянцонай вады. Панна Гелена таксама страляла разам з намі...

Пачуўшы гэтае імя, Сокалаў заварушыўся, ямчэй уладкоўваючы параненую руку. Палонны заўважыў яго рух і глянуў на Сокалава з цікавасцю.

— А потым феерверк...— Студэнт на момант заплюшчыў вочы.— Але самае вясёлае было пасля. Па дарозе дамоў знайшлі на ўскраіне паркан сажняў на пятнаццаць, далі залп і ў адзін міг узялі гэтую фартэцу прыступам. Уяўляеце? І тут быццам з-пад зямлі з'яўляецца гэты пісклявы таўстун Іверсон, наш наглядчык. «Вы нем'едленно дольшны разойтис! Иначе вы испортите себе фсю сфою шизнь!» Пакуль ён абяцаў нам самыя страшэнныя пакаранні ад імя дырэкцыі, мы яшчэ цярпелі. Аднак калі стаў гразіцца ад імя гасудара імператара, ужо не стрывалі. Вы калінебудзь бачылі, як вядуць у хлеў натурыстага маркача? Конча цягнуў яго за гальштук, а я паганяў дручком... Праз два месяцы прыехала следчая камісія, але сведкаў не знайшлося, і гер наглядчык застаўся пры сваіх казырах. Які быў фэст, панове! Хай бы ён доўжыўся вечнасць...

— Хай бы вечнасцю стаў дзень, калі горад быў нашым,— падаў голас паранены.

— Вы памятаеце, як нас прымалі ў прафесара Жабенкі? — жвава падтрымаў яго студэнт.— Як панна Гелена з сястрой танцавалі нам польку...

— Я мяркую, ваш Іверсон ужо данёс і на іх,— зазначыў Тапор.

— Усяго пяць дзён таму! Няўжо толькі пяць дзён? — Антановіч нібыта не чуў апошніх камандзіравых слоў.— Гэты ўздым, і перамога, і думкі, што ўсё яшчэ наперадзе... Пяць дзён... А цяпер?..

— Жыццё не любіць летуценнікаў, грамадзянін Антановіч. Яно жорсткае да іх.— Камандзір скончыў чысціць рэвальвер і звыклым рухам заткнуў яго за пояс.— Я не супраць таго, каб вы займаліся прыемнымі ўспамінамі, але ўлічыце, што мы не адны.

Студэнтаў позірк упёрся ў палоннага і загарэўся непрыхаванай нянавісцю.

— Грамадзянін Тапор, я не разумею, чаму вы дагэтуль не загадалі... У нас ёсць права помсты, і я...

Сустрэўшы ўладны пагляд камандзіра, ён асекся, аднак яго гарачая кроў утаймоўвалася неахвотна.

— І ўсё ж мы недарэмна ўзяліся за зброю. Недарэмна! — зноў загаварыў Антановіч праз хвіліну. Ён імкнуўся пераканаць, відаць, не столькі таварышаў, як сябе самога.— Мы замацавалі крывёю межы будучай Айчыны!

— Паны з жонду былі б задаволеныя вамі,— сказаў камандзір.

— Нашы войскі ўзялі горад! — з выклікам адказаў Антановіч, і паранены з ухвалаю кіўнуў яму.

— Магу толькі паўтарыць свае папярэднія словы,— стамлёна прамовіў Тапор.— Зрэшты, я не вінавачу вас. У вашым вяку чалавек адгукаецца на прыгожыя заклікі хутчэй, чым на голас уласнага розуму.

* Форма звароту ў паўстанцаў 1863–1864 гг.

— Мяне прывялі да ўдзелу ў інсурэкцыі* перакананні, а не прыгожыя заклікі.— Антановіч падняўся і пачаў нервова хадзіць ад стала да дзвярэй і назад.— І не якія-небудзь іншыя прычыны...

— Якія іншыя? — зацікавіўся камандзір.

Паранены чамусьці насцярожыўся.

— Якія? Вы чулі, як трапіў у атрад Арліцкі? Цяпер я магу адкрыць яго таямніцу. Аднойчы на біваку мы разгаварыліся, і ён прызнаўся, што нявеста запатрабавала ад яго доказаў смеласці.

— Bravo! Bravo! — шчыра засмяяўся палонны.— Каханне як аснова палітычных поглядаў, або як пазбавіцца ад жаніха. Панове, вы дазволіце мне далучыцца да размовы? Можаце лічыць гэта маім апошнім жаданнем.

Ён гаварыў вясёлым бесклапотным тонам, які дазваляў прыняць ягоныя словы за жарт.

— Ніхто не мае права адмовіць чалавеку ў апошнім жаданні,— прымаючы тон палоннага, адказаў Тапор.

— Між іншым,— заўважыў ад'ютант, звяртаючыся да Антановіча,— Арліцкі браў цэйхгаўз так, нібыта ўсё жыццё толькі тым і займаўся, што браў цэйхгаўзы.

Студэнтавы вусны скрывіла пагардлівая ўсмешка.

— Мне заўсёды здавалася, што ён у любы момант можа перабегчы ад нас на баль да Беклямішава.

Словы юнака прыглушыў удар грому, але палонны пачуў іх.

— Пане Антановіч, вы згадалі тут імя губернатара. Вам вядома, дзе яго дастойнасць зрабіў сабе кар'еру?

— У паліцыі,— пазіраючы не на Крыніцкага, а некуды ўбок, адазваўся юнак.

— А ці вядома вам, што ў маладыя гады ён маліўся на Фур'е і праходзіў па справе Петрашэўскага?.. Вось што робіць час з гарачымі галовамі...

Студэнт спыніўся насупроць палоннага і паклаў руку на рэвальвер.

— Гэта падобна на здзек...— з пагрозаю прамовіў ён.

— Грамадзянін Антановіч!

— Грамадзянін Тапор? — рэзка павярнуўся студэнт.

* У паўстанні.

— Што яшчэ вы маеце нам паведаміць? — спакойна запытаў Тапор.

— Што... што, нягледзячы ні на што, мы пераможам!

У гэтым хлапчукоўскім выбрыку было нешта настолькі адчайнае і чуллівае, што халодныя камандзіравы вочы пацяплелі.

— Магчыма,— з нечаканай мяккасцю сказаў ён.— Але не тут. Тут у нас нічога не атрымаецца. C'est une affaire flambée*. Мужыкі вераць у цара і не вераць нам, а без мужыкоў мы — нішто. І ў дадатак паны з Віленскага жонду скасавалі ўсе акты «чырвоных». Калі хто-небудзь з гэтых «рэвалюцыянераў» трапіць мне да рук, даю вам слова павесіць яго на першым прыдатным суку.

— У Касы́ было дваццаць хлопаў,— сказаў Антановіч.

— А дзе яны падзеліся праз два дні? — суха спытаў Тапор.

— Успомніце,— не здаваўся юнак,— як вы чыталі маніфест у царкве і хлопы цалавалі вам рукі...

— А ўвечары таго ж дня папярэдзілі казацкія раз'езды,— сумна ўсміхнуўся камандзір.— Мужыкі хочуць, каб зямля належала ім, а такога паўстання нашы паны баяцца, як чорт крыжа. Тут увесь іхні патрыятызм імгненна сходзіць на бзік. Учора яны сплочвалі доўг перад Радзімай тым, што бадзяліся па маёнтках у канфедэратках і падымалі тосты...— Зірнуўшы на худую спіну Антановіча, які па-ранейшаму мераў леснічоўку, ён не скончыў фразу.— А сёння садзяцца і пішуць такія вось лісты.

Тапор выцягнуў з кішэні разарваны канверт.

— Знайшоў у мяху з перахопленай поштай,— растлумачыў ён і з грэбліваю грымасаю пачаў чытаць:

— «Приставу третьего стана Пуцилло К. Е. Вчерашнего дня, возвратившись домой из губернского города Могилева, нашел я у себя там людей, которые разграбили мой дом и, собрав крестьян, объявили им какую-то противозаконную свободу. А за тем покорнейше

* Гіблая справа *(фр.)*.

прошу ваше благородие...» І гэтак далей. Подпіс: «Помещик Август Минкевич».

Студэнт плюнуў у качарэжнік.

— Але ёсць іншыя! — ударыў ён далонню па стале.

— З намі лепшыя людзі імперыі.— Паранены сеў і спусціў з палка ногі. На ягоным непрыгожым твары выступіў румянак.

Палонны павярнуўся да яго і насмешліва сказаў:

— Мяркуючы па вашым вымаўленні, прынамсі, аднаго з гэтых людзей мы маем шчасце бачыць.

— З паўстаннем салідарныя многія мае адназемцы. Вось...— Леваю рукой Сокалаў няўклюдна разгарнуў на калене складзены ў колькі столак пакамечаны аркуш.— Вось... Гэтая адозва хадзіла нядаўна ў Аршанскім гарнізоне.

Палонны як быццам нечаму ўзрадаваўся. Ён падышоў да Сокалава і зазірнуў у паперыну.

— «Солдаты и офицеры, не обагряйте рук своих...» Так-так...

Пад цяжкім позіркам Антановіча Крыніцкі вярнуўся на сваё крэсла, але на твары ў яго засталося незразумелае ажыўленне.

— Маю паведаміць, што мне гэты... дакумент вядомы. Калі вы дазволіце, панове...

Ён скасіўся на Тапара, і той у згодзе нахіліў голаў.

— Дык вось. Месяца паўтара таму да нашага палкоўніка Мухіна заявіліся феерверкер і двое шараговых з дакладна такой пракламацыяй, якую вы, пане студэнт... прабачце, пане інсургент, трымаеце ў руках і якая выклікае ў вас такі імпэт. Толькі не падумайце, што салдаты прыйшлі агітаваць палкоўніка. Яны прыйшлі данесці. Гэта так уласціва людзям, панове.— Палонны ўсміхнуўся нейкаю цьмянай усмешкай.— Яны сказалі, што пракламацыю даў ім на вуліцы разам з залатоўкаю чалавек у белым паўкажушку. Натуральна, залатоўка паспела ўжо бясследна знікнуць.

Палкоўнік даставіў адозву разам з прыкметамі таго чалавека гараднічаму, дарэчы, свайму добраму прыяцелю. Праз яго мы потым і даведаліся пра далейшыя падзеі. За вечар і ноч паліцыя, як і трэба было чакаць, нікога не знайшла, а раніцою гараднічы ўспомніў, што сам бачыў на вуліцы гэтага чалавека ў паўкажушку. Гараднічы нават ведаў яго. Гэта быў... тут, панове, я раблю нотабена... гэта быў нейкі пісар сёмай акругі шляхоў зносін Мечыслаў Савініч, што прыехаў на гасціны з Магілёва. А ў Воршы таксама пісарам служыць у казначэйстве ягоны родны брат. Гараднічы выклікае гэтага аршанскага пісара, і той пацвярджае, што ў брата сапраўды ёсць белы паўкажушок. А ўжо праз чвэртку гадзіны (заўважце, панове, колькі часу спатрэбілася чалавеку, каб наважыцца загубіць іншага), праз чвэртку гадзіны ва ўправу прыбег і сам гэты Мечыслаў Савініч. Прыбег і стаў дапытвацца ў гараднічага, ці не падазрае яго той у зламыснасці. І, між іншым, заявіў, што, калі атрымае пасведчанне, што невінаваты, адкрые сапраўднага злачынцу і ўкажа, дзе яго можна злавіць.

Чацвёра мужчын слухалі надзіва ўважліва.

— Мы з вамі, панове, цудоўна разумеем, што ніякага пасведчання аб невінаватасці ніхто атрымаць не можа,— працягваў палонны.— Хаця б з тае прычыны, што такіх пасведчанняў, так бы мовіць, проста не існуе ў прыродзе. Гэта самае і растлумачыў яму гараднічы. Але Савініч заяўляе, што, пазнаёміўшыся днямі з аўтарам пракламацый у цукроўні, з самых першых слоў западозрыў яго і вырашыў падтрымаць знаёмства выключна з мэтаю данесці ў паліцыю. Ён настолькі ўвайшоў у ролю, што пачаў ужо не прасіць, а патрабаваць паперу аб тым, што першым зрабіў данос. Але гараднічы не дурань і цану збіць умее. Ён заўважыў, што данесці можна і не займаючыся ўручэннем пракламацый салдатам. На гэтым таргі скончыліся, і Савініч абвясціў, што чалавек з адозвамі пешшу накіраваўся ў Віцебск. Савініч выказаў гатоўнасць асабіста ўдзельнічаць у пагоні і выехаў з двума паліцэйскімі на паштовых конях. На шостай ці сёмай вярсце яны здагналі чалавека, у якога быў пісталет і пачак пракламацый... Цяпер яго чакае катарга.

— Мярзотнік...— працадзіў Антановіч.— Страляць такіх.

Палонны падняў брыво.

— Каго вы маеце на ўвазе?

— Вашага Савініча!

— Наконт мярзотніка цалкам з вамі згодны. Але мой ён у такой самай меры, як і ваш, пане інсургент.

Зноў гакнуў і рассыпаўся сухім трэскам пярун.

— Дзеля чаго вы расказалі нам гэту гісторыю? — калі аціхлі грымоты, пацікавіўся камандзір.

— Каб спытаць, як вы збіраліся перамагчы з такімі патрыётамі, як Савініч.

— І толькі? — Тапор кінуў на палоннага хуткі позірк. Іх пагляды на імгненне сустрэліся і разляцеліся, быццам більярдавыя шары пасля ўдару спрактыкаванага гульца.

Палонны сцвярджальна кіўнуў. У куточках яго цвёрдых сціснутых вуснаў нібыта затаілася ўсмешка, але ў паўзмроку леснічоўкі гэта магло проста здавацца.

— Колькі б нягоднікаў ні было сярод якога-небудзь народа, я веру, што сумленных людзей у яго ўсё адно больш,— сказаў паранены.— Я... мы ўсе... хацелі б мець за сумленнага чалавека і вас.

Антановіч, пратэстуючы, махнуў рукой.

— Паберажыце сілы, пане Сокалаў,— з'едліва прамовіў палонны.— Паверце, у вас нічога не атрымаецца.— Ён кпліва ўсміхнуўся.— Хаця, шчыра кажучы, я менш здзівіўся б, убачыўшы паміж інсургентаў сябе, а не вас. Вы, рускі чалавек, дваранін... Што прывяло вас сюды? Таксама капрыз нейкай легкадумніцы?..— Здавалася, Крыніцкі хацеў прадоўжыць сваю думку, але чамусьці стрымаўся.

— Калі паўстанне пераможа, гэта будзе спрыяць вызваленню і маёй Радзімы,— ломкім голасам сказаў паранены.

— Вы пачынаеце займацца сафістыкай. Ваш народ і ваша Радзіма свабодныя.

— Народ, які пануе над іншымі, не можа быць свабодным. Ён разбэшчваецца і жыве ў духоўным рабстве.

Вузкія вочы Тапара як быццам расплюшчыліся шырэй і цяпер глядзелі на Сокалава з усцешлівым здзіўленнем.

— Вы ведаеце, што вас будуць судзіць значна больш сурова, чым шмат каго з вашых таварышаў? — пасля цяглай пярэрвы спытаў палонны.

— Mon siège est fait*,— Сокалаў у абладзе хвалявання тузануў параненаю рукой і зморшчыўся ад болю.— Я не ведаю, які лёс нас чакае, але мяне не пакідае адчуванне, што гэтыя некалькі дзён — галоўныя дні майго жыцця. Чалавек павінен нечым апраўдаць свой прыход на зямлю...

З-за спіны ў палоннага Антановіч рабіў Сокалаву знакі, якія выказвалі захапленне.

— Вы яшчэ вельмі малады...— У голасе ў Крыніцкага ўжо не было з'едлівасці, а чулася штосьці іншае: ці то шкадаванне, ці то незразумелы смутак.

— Не ўсё можна вытлумачыць гадáмі, пане капітан,— адказаў за параненага Тапор.

Сокалаў працягваў моршчыцца і ніяк не мог прымасціцца лацвей. Міткевіч адарваўся ад акна, кіўком загадаў студэнту заняць ягонае месца і, памацаўшы ў параненага развярэджаную руку, пачаў рабіць перавязку.

— Ніхто ў такі дождж сюды не сунецца.— Антановіч павярнуўся да вакна спінай і сачыў за ўмелымі рухамі ад'ютанта.

— У каго засталася корпія? — спытаў Міткевіч, з асцярогаю адкручваючы рудую ад закарэлай крыві рэшту бінта.

Студэнт падхапіўся і дастаў з паходнае кайстры невялікі пакунак. Словы, якія ён сказаў пры гэтым, былі неабавязковыя, але не сказаць іх ён, відаць, не мог.

— Гэтую корпію шчыпала панна Гелена...

Засяроджанасць на твары ў параненага раптам змянілася разгубленасцю, аднак ён хутка авалодаў сабой. Міткевіч паклаў на рану свежай корпіі і стаў бінтаваць. Скончыўшы, ён разарваў край бінта зубамі і завязаў акуратны вузельчык.

— Баліць? — запытаўся ён і, не чакаючы адказу, прынёс са стала біклажку.

* Я зрабіў свой выбар *(фр.)*.

У няпаленай хаце было халаднавата, і гэтым разам паранены зрабіў колькі глыткоў. Ён адразу закашляўся, і Міткевіч асцярожліва пастукаў далонню яму па рамёнах. Ад'ютант перадаў біклажку камандзіру. Той адмоўна пакруціў галавой. У вачах у Антановіча, зусім як у хлапчука, што збіраецца выкінуць коніка, заскакалі чорцікі, але не вясёлыя, а змрочныя і зацятыя. Атрымаўшы біклажку, ён баўтануў яе і з выклікам абвясціў:

— За нашу вялікую Айчыну ў межах семдзесят другога года!

— Здаецца, я ўжо тлумачыў вам, што мы не на банкеце.— У спакойным голасе Тапара з'явіліся ноткі ўкведенасці.— У мяне склалася ўражанне, што мы з вамі ваюем за розныя мэты. Я супраць выключных правоў шляхты. Я за тое, каб даць мужыкам зямлю і сапраўдную волю. А без гэтага на адраджэнне Айчыны яны, прабачце, хацелі...

— Як вы...— задыхнуўся Антановіч.— Як вы можаце?

— Магу. Хаця б таму, што дзеля гэтага адраджэння зрабіў больш, чым вы, грамадзянін былы камандзір першага плутона. Дарэчы, я спадзяюся, вы не будзеце ўслед за некаторымі пераконваць мяне, што сяляне тых вёсак, праз якія мы праходзілі, належаць да польскага племені?

— Значыцца, вы з паноў сепаратыстаў?! З тых, што знайшлі сабе гэтую Беларусь і ўхапіліся за яе, як тапелец за трэску. Я чуў, нехта з іх нават выдае на сялянскай гаворцы газету.

— А чаму вас так устурбавала, што нехта друкуе газету зразумелаю мужыкам моваю?

— Таму што цяпер, як ніколі, трэба аб'яднацца пад адным сцягам. Сярод нашых былі такія, што хадзілі вучыць па-мужыцку ў патайнай школцы*. Я заўсёды казаў, што гэта памылка. Будучыня для тутэйшага народа толькі ў зліцці з намі.— Студэнт рашуча размахваў біклажкаю.

* У Горках напярэдадні паўстання існавала нелегальная беларуская школа, дзе выкладалі студэнты земляробчага інстытута.

— Чаму? — У голасе ў Тапара ўжо не чулася раздражнення. Ён быў па-сапраўднаму захоплены спрэчкай.

— Хаця б таму, што... Скажыце, дзе іх паэты? Дзе гісторыкі? Палітыкі?.. У іх нікога няма.

Вузкія карыя вочы Тапара загарэліся вясёлай злосцю.

— Грамадзянін Антановіч, вы выпадкова не чулі пра спосаб, якім можна даказаць, што органы слыху ў павукоў знаходзяцца на нагах?

— ?!

— Павука садзяць на стол і загадваюць бегчы. Ён бяжыць. Тады яму адрываюць ногі і зноў кажуць: «Бяжы!» Ён не можа. Адсюль робіцца выснова, што вушы ў павука на нагах.

— Я не зусім разумею...— насцярожана азваўся юнак.

— Той самы прынцып доказу, грамадзянін Антановіч. Спачатку мове цэлага народа пакідаюць правы толькі ў сялянскай хаце, а потым разводзяць рукамі: маўляў, гэты народ няздатны стварыць літаратуру. Спярша адбіраюць у яго гісторыю, прымушаюць забыць мінулае, якім мог бы ганарыцца любы еўрапейскі народ, а потым пытаюцца: дзе яго гісторыкі?..

— Bravo! — падаў голас палонны.— Баюся, вашаму юнаму сябру няма чаго запярэчыць.

— Вас можна павіншаваць, грамадзянін Тапор,— з'едліва сказаў Антановіч.— У вас з'явіўся паслядоўнік.

Тапор, пакінуўшы гэтыя словы без адказу, загаварыў:

— Пане Крыніцкі, я разумею, чаму вы слухалі нас так пільна.

— Калі вы маеце на ўвазе маё паходжанне, вы не памыліліся. Я з карэннай полацкай шляхты. Аднак, пане Тапор, я не хачу, каб у вас заставаліся нейкія ілюзіі. Гонар мне даражэйшы за жыццё. І потым, калі б я нават не быў звязаны прысягаю і спачуваў вашым поглядам, не ў маіх правілах увязвацца ў безнадзейныя справы.

— Якія справы вы называеце безнадзейнымі? — рэзка спытаў Тапор.

— Тыя, што не пакідаюць па сабе нічога, апрача

крыві і сірот,— не менш рэзка адказаў палонны.— Можа, вам і вашым сябрам апошняе і неістотна, а ў мяне двое дзяцей, за якіх я нясу адказнасць перад Богам і самім сабой.

— У яго іх чацвёра,— Тапор паказаў на ад'ютанта.

Палонны знячэўку сумеўся. Ён быў падобны цяпер на чалавека, які перажывае сваю віну. Магло падацца, што капітан ведаў, колькі дзяцей у Міткевіча. Праз хвіліну ён узяў сябе ў рукі, і ўсё ж голас у палоннага гучаў ужо не так упэўнена.

— Калі я не памыляюся, пане Тапор, вы самі надоечы прызналі, што прайгралі сваю гульню.

— Я буду з вамі спрачацца, пане капітан!

— Мне здаецца, апошняе слова ў спрэчцы ўсё адно застанецца за вамі.

Злавесны сэнс сказанага змусіў параненага зноў сесці. Ён правёў вачыма па хаце, шукаючы нейкай падтрымкі, і спыніў позірк на ходзіках, гіра якіх апусцілася амаль да самае падлогі. У вачах у Сокалава мільганула роспач. Антановіч, наадварот, неяк паарлеў. Толькі ад'ютант нічым не выяўляў сваіх пачуццяў, быццам гаворка ішла аб рэчах, якія яго зусім не датычылі.

— Я буду з вамі спрачацца,— паўтарыў Тапор.— Так, цяпер наша змаганне найверагодней скончыцца паразаю. Але гэта не азначае, што яно скончыцца нічым. Частцы людзей ва ўсе часы было ўласціва ўвязвацца ў так званыя безнадзейныя справы. Калі б не гэтыя людзі, мы з вамі сядзелі б сёння не тут, а дзенебудзь каля самавара, бавячы час за размоваю, чаму нехта атрымаў чарговы чын, а ў некага выйшла затрымка. Мы былі б добранадзейныя падданыя імперыі, шчаслівыя шчасцем сытай жывёлы. Вы разумееце, пра што я кажу? Пра тое, што называецца ідэаламі. Я ўпэўнены: калі б не героі Касцюшкі, калі б не паўстанне трыццатага года, не існавала б ні сённяшняга мяне, ні маіх людзей. І вас, капітан,— таксама.— Тапор яшчэ вышэй падняў правае плячо.— Ідэалы жывыя, пакуль яны жывуць у сэрцах. Калі яны застануцца толькі ў старых кнігах, яны памруць. Кнігі

можна схаваць у сховішчах, куды нельга даступіцца, а можна проста спаліць. Каб ідэалы жылі, трэба, каб за іх нехта гінуў. Такі закон. А таму — Gloria victis! Хай і цяпер мы не пераможам, але ўрэшце людзі пачнуць разумець, што яны не статак, а народ.— Тапор сціснуў пальцы ў кулак.— Народ! У яго ўжо ёсць імя і калі-небудзь з'явіцца годнасць.

— Шукайце для сваіх казаняў бязвусых хлопчыкаў,— са злосцю абазваўся палонны.— Са мной у вас нічога не атрымаецца. Найлепшае, што вы можаце зрабіць,— не цягнуць час, а расстраляць мяне, pour encourager les autres*.

Антановіч наблізіўся да камандзіра і нешта шапнуў. Тапор перамаўчаў. Яго нізкія бровы навіслі над вачыма яшчэ ніжэй.

За вокнамі шапацеў дождж. Палонны, закінуўшы нагу за нагу, з абыякавым выглядам пазіраў на ходзікі. На іх было без пяці пяць. Сокалаў імкнуўся сустрэцца вачыма з Тапаром, але той унурыўся ў пыльны кут.

Стрэлкі ходзікаў паказалі пяць. Палонны раптам устаў.

— Пане Тапор, мне трэба канваір.

Антановіч ускочыў з лавы. Тапор з ад'ютантам абмяняліся хуткімі позіркамі, і Міткевіч таксама падняўся.

— Пайду я,— запярэчыў Антановіч і зрабіў крок да дзвярэй. Ён быў бледны як смерць.

— Не,— сказаў ад'ютант.

— Я! — крыкнуў студэнт.

З абраза над сталом дакорліва глядзелі на людзей валошкавыя вочы Міколы Цудатворца.

— Камандзір першага плутона! — Ад хвосткіх слоў Тапара юнак міжволі выцягнуўся.— Пойдзе Міткевіч. Гэта загад.

Антановіч закусіў губу і адвярнуўся да вакна. Ягоныя плечы біла дрыготка.

Калі дзверы зачыніліся, паранены лёг тварам да сцяны. Тапор з Антановічам сачылі, як палонны і ад'ю-

* Каб узбадзёрыць іншых *(фр.)*.

тант, які трымаўся крокі на тры ззаду, прайшлі пад дажджом паўз студню і схаваліся за рогам адрыны.

Праз нейкую хвіліну ў небе грымнула і амаль адразу загрымела зноў.

Паранены ўздрыгнуў і сеў. Боль у сініх вачах зрабіў спалатнелы твар трагічна прыгожым.

— Ходзікі...— пачаў і не скончыў Сокалаў.

Камандзір скасіў вока на застылы ківач і, тарганўшы вышэйшым плячом, не адказаў. Студэнт нервова глядзеў у вакно. Нарэшце на сцежцы з'явіўся Міткевіч. Ён ішоў адзін.

— Я разумею, на вайне трэба быць жорсткім,— нібыта баючыся цішы, загаварыў паранены.— Але як гэта страшна... Калі чалавек хаваўся разам з табой ад дажджу і еў твае сухары...

— Не забывай, што ён забіў Дамарацкага і параніў Кончу,— адрывіста сказаў Антановіч.

Ляпнулі дзверы сянец, на парозе стаяў Міткевіч. Ён меў выгляд чалавека, якога кагадзе з галавой акунулі ў ваду. З барады крапала, з навылёт прамяклай світкі ўмомант набегла вялікая лужына. Не кажучы ані слова, ад'ютант прагна прыклаўся да біклажкі. Антановіч таксама маўчаў, але было відаць, што яго грызе нейкая неадчэпная думка. Яму рупіла нешта спытаць, аднак ён марудзіў, як быццам гэтае нешта было надзвычай важлівым і ад яго вельмі шмат залежала. І ўсё ж Антановіч адважыўся:

— Ён... адчуваў?

Міткевіч, няўцямна паглядзеўшы на юнака, адказаў не адразу.

— Хіба вы не зразумелі, што ён сам не хацеў цягнуць? — Ад'ютант скінуў цяжкую світку і пачаў сцягваць боты.

— Ён што-небудзь казаў вам? — працягваў Антановіч.

— Не.

— Мне здалося, вы стралялі якраз тады, калі грымеў гром? — дапытваўся студэнт.

— Я не хачу гаварыць пра гэта,— адгукнуўся Міткевіч, пазіраючы ў акно.

— Чаму? — падазрона спытаў Антановіч.

Ад'ютант змоўчаў. Антановіч з хвіліну вагаўся і раптам імкліва выйшаў у дзверы.

— Зараз будзе бура,— прамовіў Міткевіч.

Тапор ледзь прыкметна ўсміхнуўся. Сокалаў здагадаўся, забыўшыся на параненую руку, усхапіўся з палка і ўзбуджана забегаў па хаце. Ад'ютант змеціў, што ходзікі стаяць, спраўдзіў час па сваім «бурэ» і, падцягнуўшы гіру, пусціў ківач.

Антановіч уварваўся ў леснічоўку як віхор.

— Цела няма! Вы адпусцілі яго! — З перакошаным тварам і рэвальверам у руцэ ён кінуўся на Міткевіча.

Ад'ютант няўлоўным рухам выбіў з рук у юнака зброю і прыціснуў рэвальвер нагой. Яны, абодва мокрыя да ніткі, з наліплымі на лбы валасамі, стаялі адзін супраць другога і цяжка дыхалі.

— Я меў... у вас... прытулак і хлеб,— задыхаючыся, гаварыў студэнт.— Я любіў вас за мужнасць, за тое, што вашы грошы былі грашыма паўстання. Я да апошняга верыў, што вы... А вы аказаліся нягоднікам, пане Міткевіч... Я магу плюнуць вам у вочы. Грамадзянін Тапор, загадайце арыштаваць вашага ад'ютанта!

— У чым вы яго абвінавачваеце? — з непраніклівым тварам спытаў камандзір.

— У тым, што ён адпусціў на волю свайго даўняга прыяцеля капітана Крыніцкага.

— Як?! — ускінуўся паранены.

— Я быў прыняты ў ягоным доме,— студэнт з пагардаю кіўнуў на Міткевіча,— і няраз сустракаў там Крыніцкага, чуў яго імя. Я адчуваў, адчуваў, але я спадзяваўся да апошняй хвіліны... Толькі таму я змаўчаў і дазволіў ісці яму. Якая наіўнасць!..

— Грамадзянін Міткевіч, гэта праўда?— звонкім голасам запытаў паранены.

— Так, мы былі знаёмыя,— вытрымаўшы ягоны позірк, адказаў ад'ютант.

— Вы чуеце? Чуеце? — павярнуўся Антановіч да камандзіра.

— Я ведаў гэта.

— Вы хочаце сказаць, што здагадаліся?

— Не, я ведаў гэта з самага пачатку.

— Значыцца, вы... таксама спадзяваліся, што...— у голасе ў юнака жыла надзея.

Тапор пахітаў галавой.

— Тады чаму вы загадалі ісці яму?

— Дазвольце мне не адказваць на ваша пытанне. Калі-небудзь вы зразумееце самі.

— Гэта здрада! — закрычаў Антановіч.— Здрада! Здрада! — Ён быў страшны. Радзімая пляма на шчацэ зрабілася попельнай.

— Апамятайся, Восіп,— загаварыў Сокалаў.— Гэта абсурд.

Студэнт павёў вакол няўцямнымі, амаль вар'яцкімі вачыма, бяссіла апусціўся на лаўку і, абхапіўшы голаў рукамі, заплакаў.

— Ён страляў у нас... Ён забіў Дамарацкага...— вырывалася ў яго скрозь усхліпы.— Мы разам раслі... Яны не шкадуюць нас, а мы... Я павінен быў забіць яго... Хоць аднаго ворага... Хоць аднаго...

— Удзел у паўстанні вымяраецца не колькасцю забітых,— прамовіў Тапор. Ён глядзеў на юнака са спагадаю.

Плечы ў Антановіча трэсліся. Гэтае відовішча было для параненага невыносным, і ён не вытрымаў:

— Восіп! Панне Гелене было б сорамна за цябе.

Нягучныя словы падзейнічалі адразу.

— Што ты сказаў? Якое права ты маеш згадваць тут гэтае імя?

— Яно дарагое і мне,— мякка адказаў Сокалаў.

— Што?! — Студэнт ускінуўся на ногі. Ён ужо не плакаў.

— Утаймуй сваю недарэчную рэўнасць,— з лёгкім сумам адазваўся паранены.

— Я хачу, каб ты выказаўся ясней!

— Восіп, мы не адны.

— Я патрабую!

— Ну добра,— пакутліва чырванеючы, сказаў Сокалаў.— Я... прызнаўся панне Гелене... у сваіх пачуццях.

— Вось як! — пагрозліва прамовіў Антановіч.

Тапор з ад'ютантам глядзелі кожны ў сваё вакно.

— Я рады, што ты супакоіўся,— сказаў Сокалаў.

— Я супакоюся толькі тады, калі ты скажаш мне ўсё.

— Няўжо ты не разумееш? Восіп, ты павінен быць варты яе кахання.

Антановіч падбег да параненага і імпэтна пацалаваў яго. Збянтэжаны і разгублены, не ведаючы, што рабіць, ён прысеў поруч з Сокалавым на палок.

У запанавалай цішыні з'явіўся нейкі новы гук. Гэта было таканне ходзікаў. Дождж высільваўся, неба ўжо не грымела.

Тапор* разгарнуў на стале мапу.

— Будзем прабірацца ў Магілёў,— сказаў ён пасля роздуму.— У бліжэйшым маёнтку зменім адзенне. З Магілёва — на захад, туды, дзе паўстанне працягваецца.

За вокнамі пасвятлела, на небе з'явіліся акраўкі блакіту.

— Апроч таго,— прамовіў камандзір,— у нас ёсць прычына зрабіць у Магілёве візіт нейкаму пісару Савінічу. Вы чуеце, грамадзянін Антановіч? Калі вы будзеце настойваць, мы, бадай што, даручым гэты візіт вам.

Студэнт кіўнуў стрымана, але ў ягоных вачах была ўдзячнасць.

— Трэба ісці,— сказаў камандзір.

Чацвёра мужчын падняліся і разабралі з піраміды зброю.

1985

* З тае прычыны, што інсургенты, якія сталі героямі гэтай гісторыі,— рэальныя асобы і названыя тут сапраўднымі імёнамі, неабходна заўважыць, што пад мянушкаю Тапор хаваў сваё імя адзін з прадстаўнікоў «чырвонага» крыла паўстання, на той час вайсковы начальнік Магілёўскага ваяводства Людвік Звяждоўскі (1825–1864).

Рандэву на манеўрах

— Божа мой, пані Людвіка, ну як вы маглі падумаць... Ну няўжо ў вас сапраўды такое жорсткае сэрца? Што мне зрабіць, каб зноў убачыць, як вы ўсміхаецеся? Кажу, як на споведзі: я бязгрэшны, але дзеля вашае ўсмешкі я гатовы стаць на калені. Што?! О богі! Як да вас магла прыйсці такая думка? Пасля ўсяго, што было ўчора... Хіба мне гэта прыснілася? А калі нават і прыснілася, вы бачылі той самы сон. Вы таксама былі ў эдэме...

Пані Людвіка, дарагая мая... Буду размаўляць з вамі вось так, на каленях... Ну проста сабраліся ў палкавога камандзіра... Яго вялікасць зацвердзіў загад на двух афіцэраў... Некалькі келіхаў шампанскага за сяброўскім сталом... Ну так, я спазніўся, я крыху падшафэ... Mea culpa, mea maxima culpa*. Але, пані Людвіка, няўжо вы не разумееце, што прычына ў іншым...

О, называй меня безумным! Назови
Чем хочешь; в этот миг я разумом слабею
И в сердце чувствую такой прилив любви,
Что не могу молчать, не стану, не умею!

Божа мой, ну, вядома, праўда! Ды я кожную хвіліну дзякую небу за тое, што паслала мне вас. Страшна нават уявіць, што мог бы не трапіць на гэтыя манеўры, застацца ў сталіцы... Нарэшце вы ўсміхнуліся. У вас такая мілая ўсмешка, яна нагадвае мне ўсмешку маёй мамы.

Падымаюся, падымаюся... Вядома, не... Хіба можна адмовіцца ад *вашага* запрашэння? Дый, сказаць па шчырасці, цэлы дзень у роце, апрача шампанскага, ні расінкі.

* Мой грэх, мой страшэнны грэх (*лац.*).

Які стол! Пані Людвіка, зараз я зноў укленчу. У гэтай іпастасі вы таксама геній. Пры чым тут кухар? Ніякі кухар не здатны скласці такое меню. А гэта і ёсць славутыя вушкі з грыбамі, якія вы абяцалі?.. Не, сядайце насупраць, каб можна было кожнае імгненне абдымаць вас вачыма. Даруйце мне гэтую экзальтаванасць. Вы ведаеце, што ў шампанскага тут алібі...

Я болен, я влюблен; но, мучась и любя,—
О, слушай! О, пойми! — я страсти не скрываю...

Мальвазіі? У такім разе прашу ваш лафітнік. З вашага дазволу — я чаго-небудзь мацнейшага... А гэта, калі не памыляюся, той самы паштэт з рыжыкамі. Геніяльна!

Першы тост — за вас! За вас і за цудоўны месяц, які ў нас наперадзе! О, пані Людвіка, не мучце мяне! Я кажу пра наш *першы* месяц. Ну хіба мы ўчора пра ўсё не дамовіліся? На Каляды прыедзеце да мяне ў першапрастольную... Вядома, найперш да сына. Як цудоўна, што вы адправілі яго ў пансіён менавіта ў Маскву! Пазнаёмлю вас з maman, зімою яна заўсёды ў сталіцы. Паездзім па тэатрах... У Малым з'явілася летась дзяўчынка, якой прарочаць вялікую будучыню. Марыя... Марыя Ярмолава... Не, актрысы існуюць для мяне цяпер толькі на сцэне... Заручыны можна абвясціць на Вялікдзень. Улетку — абавязкова ў Крым, там, каля Ялты, у maman маленькі ўтульны дамок. Прынамсі, месяц ён будзе належаць нам. Такі, ведаеце, асколак мусульманскага раю. Татары, сонечнае крымскае віно... Будзем засынаць раніцай пад шум прыбою... За вас!

О, дзякую! Неадменна і паболей. Такі зваблівы пах! Як гэта называецца? Ма-чан-ка? Дзікунская назва! І з гэтае прычыны яна яшчэ смачнейшая. Калі дазволіце, глыток мальвазіі...

Ведаеце, пані Людвіка, здараецца, што ўвосень позна ўвечары ці ўначы едзеш кудысьці — мокры, пануры, агорнуты безнадзейнасцю,— і здаецца, што вось так, у цемры, будзеш ехаць бясконца, і ноч гэтая ніколі

не скончыцца, і наперадзе ў цябе толькі імжа, гразкая дарога, голыя палі і безнадзейнасць...

І раптам, ужо тады, калі ўпакорыўся лёсу і гэтай дарозе з яе вечнай, усёабдымнай самотай, тады наперадзе, недзе за мокрымі прысадамі,— агні, цёплыя светлыя вокны, жаночы смех... Вы разумееце?..

У псіхолагаў ёсць такі выраз — déjà vu*... О, ну што вы! Я не магу вас пакрыўдзіць — ні словам, ні нават думкай. Я хачу сказаць: тое, што цяпер адбываецца, ужо жыло ўва мне як светлая надзея. Не толькі вы, вашы цудоўныя валасы, вашы вочы, рукі, радзімка на мочцы маленькага вушка... Мне здаецца, і гэты вось камін, і клавесін, і гравюра — так, Міцкевіч, я пазнаў — і гадзіннік... Яны таксама жылі ў маёй памяці яшчэ за шмат гадоў да нашае сустрэчы.

Я раблюся сентыментальны... Даруйце, дарагая, я не пытаюся, што здарылася з вашым мужам, чаму вы так рана засталіся адны... Паверце, хто б ён ні быў, я паважаю яго, бо калісьці вы даверылі яму свой лёс. Але я не хачу нічога ведаць. Я не хачу, каб паміж намі нехта быў. Нават у мінулым.

Дзякую, з вялікім задавальненнем. Усё, да чаго дакранулася ваша рука... Я паўтараюся, але я сапраўды не веру свайму шчасцю. Тут, у гэтым мядзведжым кутку, дзе да рэстарацыі, да цырульні, да... Даруйце, дарагая, гэта я цытую нашага штабс-капітана Пішчыкава, у яго свой набор прыкметаў цывілізацыі.

Напэўна, я замучыў вас прызнаннямі. Я і сам адчуваю, што, калі гэтыя словы паўтараеш, яны губляюць свой залаты запас. Буду паўтараць іх моўчкі. Усё роўна, пра што б ні гаварыў з жанчынаю, якую... Вы разумееце... Будзем проста размаўляць і глядзець адно на аднаго.

Кропельку лікёру? А я, з вашага дазволу, пакаштую амброзію з таго залацістага графінчыка. Між іншым, згаданы штабс-капітан Пішчыкаў мае унікальны талент. Пераняць любы почырк яму гэтаксама лёгка, як мне выпіць гэты кілішак. Неяк на вучэннях

* Тое, што ўжо бачыў *(фр.)*.

пад Вязьмай Пішчыкаў, уявіце, напісаў почыркам палкавога камандзіра загад... Дзякую, проста цуд... Выбачайце, на чым я спыніўся? А, загад... Загад быў такі: што б там ні было даставіць з павятовага горада і здаць пад распіску штабс-капітану Пішчыкаву тузін шампанскага. А напярэдадні мы ў тым гарадку добра-такі павесяліліся, так што, па нашых разліках, ні ў адной з дзвюх тамтэйшых рэстарацый не магло ацалець ні пляшкі боскага напою. І што вы думаеце? Прапаршчык, якому ўручылі загад,— вядома, навічок, толькі з кадэцкага корпуса,— ледзь не загнаў каня, але шампанскае здабыў. Потым, калі ўсё раскрылася, запатрабаваў ад Пішчыкава сатысфакцыі, і справа была на валасок ад дуэлі...

Цудоўны паштэт! А яшчэ быў пацешны выпадак... Адзін наш таварыш... Увогуле, афіцэр такога дапускаць не павінен, але ён быў зусім юны, даруем яму... Дык вось, у яго спатканне з дамай сэрца, прычым не проста спатканне, а такое, калі ўсё можа вырашыцца, а ён праз сваю маладосць ад хвалявання так выпіў, што не толькі не здольны з'явіцца сам — нават чырканць колькі слоў. Тады мы ўсе разам ствараем ну проста геніяльны ліст, а Пішчыкаў перапісвае... вядома, почыркам нашага закаханага...

Я не стаміў вас, дарагая? Але ж вы памятаеце: пра што б я ні казаў вам, усё роўна...

І вось назаўтра ў той дамы — не тое каб хоць нейкая крыўда... Яна перажывае нешта незямное, яна гатовая ехаць за абраннікам на край свету...

Дарэчы, яны пажаніліся і шчаслівыя. Мастацтва творыць дзівосы.

Зрэшты, забаўных гісторый, дзе замешаны талент нашага Пішчыкава,— безліч. Аднойчы яго унікальныя здольнасці прыдаліся нават у справе дзяржаўнай. У час мяцяжу... Не-не, не буду стамляць вас, пані Людвіка, тым больш — гісторыя не з самых вясёлых... Што вас здзівіла? Так, дарагая, у гэтым краі я не першы раз. Дзесяць гадоў таму... З вашага дазволу... Няма слоў!.. Тут, дарагая, засталася мая маладосць. Тут я пачуў песню кулі... не той, якую выпускаеш па

мішэні на стрэльбішчы,— той, якую выпусцілі па табе самім. Тут пахаваў сябра па корпусе. Нашы ложкі стаялі ў дартуары побач. Але не будзем пра гэта. Сёння я хачу казаць вам толькі нешта вясёлае і пяшчотнае, каб бясконца бачыць вашу ўсмешку. Не памятаю, калі мне было так цудоўна і лёгка, як зараз... N'est-ce pas, que nous serons heureux*. Мне хочацца чытаць вам вершы. Вам падабаецца Фет? Я бачыў у вашай бібліятэцы яго томік... Не, дарагая, Фет не можа не падабацца. Міцкевіч? А я люблю Фета... Можа, таму, што ён таксама афіцэр...

Какое счастие: и ночь и мы одни!..

Вы ведаеце, пані Людвіка, мы з ім знаёмыя, нават пілі на брудэршафт. А сустрэліся пры вельмі цікавых акалічнасцях. Уявіце сабе... Яшчэ кропельку? З вялікай прыемнасцю. Ваш лафітнік... А было так. Уявіце сабе... Пра што? А, зноў Пішчыкаў... Далібог, я пачынаю раўнаваць. Дзесяць гадоў таму? Паверце, дарагая, маё знаёмства з Фетам — гэта больш забаўна. Аднаго разу ў Маскве... Ну, калі вам так хочацца... Ваша жаданне — закон.

Дык вось, аднаго разу — калі гэта вас так зацікавіла — Пішчыкаву давялося перапісваць лісты мяцежнікаў. Думаю, іх дзеці павінны багаслаўляць яго. Ён справіўся з загадам бліскуча. Не, я не памыліўся, менавіта з загадам.

Пані Людвіка, пашкадуйце мой настрой, у такі вечар у мяне няма аніякай ахвоты вяртацца ў тыя гады. Край заміраны і дае трону верных слуг. Падзякуем за гэта Усявышняму. Хіба змаглі б мы з вамі, дарагая, сустрэцца, калі б... Я ўсё ж раскажу вам, як мы пазнаёміліся з Фетам. Вы ведаеце, ён служыў у кавалерыі...

Пані Людвіка, даруйце, але вы мяне здзіўляеце... Вядома, чытанне чужой карэспандэнцыі пярэчыць этычным і іншым нормам цывілізаванага свету. Але, пані Людвіка, я ўсё ж пастараўся б пазбегнуць такіх слоў... Ёсць сітуацыі, калі...

* Мы будзем шчаслівыя, праўда (*фр.*).

Вы настойваеце? Ну, зразумела, гэта былі лісты не простых мяцежнікаў... Але... Тады, калі дваране ўжо падпісвалі вернападданніцкія адрасы гасудару імператару, трое ас... гэтыя трое...

Добра, пані Людвіка. Шчыра кажучы, я ўражаны, але я не магу вам адмовіць. Хачу толькі, каб вы зразумелі: ішла вайна... Быў загад самога начальніка краю яго сіяцельства Мураўёва, няхай будзе яму зямля пухам. Да Міхаіла Мікалаевіча можна, вядома, ставіцца па-рознаму, але я перакананы, што не прызнаваць яго дзяржаўнай мудрасці могуць адно недалёкія людзі. Калі б не яго розум і воля... Гэта разумелі ўсе. Нават Някрасаў са сваёй нястомнай, з дазволу сказаць, сатырычнай музай, нават гэты ці то ліберал, ці то рэвалюцыянер прысвяціў яго сіяцельству оду. Між іншым, даволі бяздарную.

Бокал заздравный поднимая,
Еще раз выпить нам пора
Здоровье миротворца края!
Так много ж лет ему. Ура! —

і гэтак далей.

Мне выпаў гонар сустракацца з графам і слухаць яго прамову перад дэлегатамі мясцовага дваранства. Я добра запомніў ягоныя словы: *Забудзьце наіўныя летуценні і мары, панове, і памятайце, што калі вы не станеце тут па сваіх думках і пачуццях адданыя расейскаму трону, вы будзеце іншаземцамі і павінны пакінуць край.*

Асмелюся выказаць надзею, што гэтыя словы блізкія і вам... Блізкія сваёй мудрасцю. Ваш сын, якому я мару замяніць бацьку, вучыцца ў пансіёне ў Маскве, а не ў Варшаве. Не магу не адзначыць разумнасці вашага рашэння. Не, ну што вы... Дазвольце вас запэўніць, гэтыя друкаваныя аб'явы на грамадскіх будынках і канторах — *Размаўляць толькі па-расейску!* — у культурнага чалавека яны не могуць выклікаць нічога, апроч абурэння. Упэўнены, што яго сіяцельства не ўхваліў бы такіх абразлівых забаронаў. Міхаіл Мікалаевіч быў мудры чалавек. Ён

лічыў, што адна школа — зразумела, расейская — зробіць больш за цэлую армію.

Дарагая, мы загаварылі з вамі на тэмы, якія, далібог, дрэнна стасуюцца з нашым вечарам і з маімі пачуццямі. Можа, нарэшце...

Што было ў тых лістах?.. Пані Людвіка, ну што маглі пісаць фанатыкі, якія насмеліліся кінуць выклік гасудару імператару, а значыцца, і самому Богу? Замест таго каб перадаць бацькам і каханым словы пяшчоты і любові, яны, стоячы ўжо на краі... Нават у такім становішчы яны спрабавалі падтрымліваць ідэі мяцяжу. Прапускаючы такія лісты, мы, па сутнасці, самі рыхтавалі б новых бунтаўшчыкоў...

Ну, калі вы настойваеце... Я ўжо, здаецца, казаў, іх было трое. Адзін з лістоў я асабліва запомніў, бо ён, як высветлілася,— уявіце сабе — быў напісаны польскімі літарамі на гаворцы тутэйшых мужыкоў. Гэтаксама, як выдаваў свае падбухторніцкія лісткі так званы камісар Гарадзенскай губерні Вікенцій... Вікенцій... Зрэшты, сутнасць не ў прозвішчы, якое раней ці пазней, але непазбежна забываюць. І вось аўтар таго, так бы мовіць, мужыцкага ліста патрабаваў ад жонкі выхаваць сына патрыётам... Іду ў заклад, што вы памыляецеся... не вялікай Польшчы, а, з дазволу сказаць, нейкай Бе-ла-ру-сі... Гэтыя мясцовыя сепаратысты — на шчасце, іх у прыродзе, прынамсі, з гэтага боку Урала, відаць, ужо не засталося — вельмі небяспечныя. У тым сэнсе, што Расеі для выканання яе высокай гістарычнай місіі яшчэ адзін, да таго ж штучна створаны народ зусім не патрэбны. Лішні народ — лішнія праблемы.

З вашага дазволу... Вам таксама? З задавальненнем...

І вось што, калі мы ўжо так шчыра гаворым, цікава. Уявіце сабе, пані Людвіка. Пішчыкаў, гэты не абцяжараны прынцыпамі цынік, спачатку адмаўляўся... адмаўляўся пусціць у ход свой талент, спасылаючыся на... А! Думаю, гэта была звычайная прыхамаць. Але загад ёсць загад.

Вы не памыліліся... Лісты, тыя, што меркавалася адправіць замест арыгіналаў, былі ўжо недзе падрыхтаваныя; здаецца, я не памылюся, калі скажу, што ў канцылярыі ў яго сіяцельства. Заставалася толькі перапісаць іх адпаведным почыркам. Вядома... Нашы падапечныя пісалі, што зрабілі фатальную памылку... прызнаюць усю марнасць і непатрэбнасць барацьбы... заслугоўваюць самага суровага пакарання. Давалі наказы блізкім — захоўваць вернасць гасудару, выхаваць у такім духу дзяцей... Зразумела, усе тры лісты былі перапісаныя па-польску...

Калі дазволіце, яшчэ глыток...

Не, пошце вырашылі не давяраць. Усе лісты адрасатам даставілі афіцэры. Скажу шчыра, сярод іх быў і я. Асмелюся паўтарыць, я лічу гэта маральным. Трэба глядзець наперад... Няўжо вы хацелі б, каб некалі ваш сын таксама кінуў сям'ю на вырак лёсу і пайшоў у лес?.. Вось бачыце... Так, уручыў асабіста... Магу вас запэўніць, талент Пішчыкава зрабіў яшчэ адзін цуд.

Пані Людвіка, мне здалося, што вы... Вам блага?.. Дзякаваць Богу... Можа, вады?.. Добра, але ў такім разе я дазваляю вам толькі маленькі глыток. Мне не падабаецца колер вашага твару.

Можа, нарэшце пакінем гэтую тэму?.. Што было з тымі трыма? Пані Людвіка... Вы настойваеце? Ну добра... калі вы настойваеце... У вайны свае законы. Страшныя законы, пані Людвіка. Гэтыя людзі ведалі, на што ішлі...

Што з вамі?! Божа, наш вечар так цудоўна пачаўся...

Што вы сказалі?! Як вы загадаеце разумець вашы словы? Мадам! Як вы сабе дазваляеце гаварыць з расейскім афіцэрам?! Як вы смееце?!

1989

Далёка да вясны

Аляксандр павінен памерці. Ён памрэ, а разам з ім памрэм і мы, яго ворагі і забойцы.

Чалавек адклаў вечнае пяро і задумаўся.

За вакном яшчэ быў змрок, але дзесьці ўжо нараджаўся новы дзень. Першы дзень вясны, падумаў чалавек.

У гэтую ноч ён крыху нечакана для сябе самога спаў моцна і нічога не сніў, хоць прахапіўся вельмі рана. Сёння ён меў шмат клопатаў, куды болей, чым у звычайны чалавечы дзень, і першы з іх быў вось гэты — пяро і аркуш паперы, на якім застануцца ягоныя думкі.

У пакоі, увесь абсталюнак якога складаўся з вузкага, як труна, ложка, незасланага стала пры вакне і крэсла, было зімна, але чалавек не адчуваў холаду. Ягоны позірк адарваўся ад вакна і слізгануў па стале. Побач з газавай лямпай стаяла вялікая талерка з грубай парцаляны, на ёй чарнела горка попелу ад спаленых увечары папераў. Чалавек адчыніў фортку, вытрас попел у досвітную цямрэчу і паставіў талерку на падваконне. Парадак на стальніцы спадабаўся яму, але, каб зноў узяцца за пяро, чалавеку яшчэ нечага не хапала.

Ён узяў лямпу і падышоў да невялікага авальнага партрэта, што вісеў на голай сцяне над ложкам. З пажоўклай фатаграфіі глядзела маладая жанчына ў белай сукні. Яны былі надзіва падобныя: чалавек, што стаяў перад партрэтам, таксама меў не больш за дваццаць пяць гадоў, у яго быў такі самы высокі чысты лоб і ўважлівы пагляд з-пад тонкіх броваў, такі самы ўпэўнены і прыгожы малюнак вуснаў...

Ён зняў фатаграфію, і ягоны твар перасмыкнула: ад святла па сцяне разбягаліся прусакі. Узяўшы з падваконня кнігу, ён на хвілю затрымаў яе ў руках — гэта быў інстытуцкі падручнік фізікі, потым паставіў кнігу «хаткай» і прыладзіў партрэт так, каб сустракаць матчын позірк.

Было чуваць, як наверсе ўжо затупала, ставячы самавар, прыслуга. Ён яшчэ некалькі імгненняў памарудзіў, а потым схіліўся над сталом. Пяро лёгка, нібы чалавек пісаў звычайны ліст, забегала па паперы.

Не перачытваючы, ён паклаў ліст у кішэню сурдута і адразу пачаў апранацца.

Рэзка ляпнулі дзверы параднага. Чалавек, праводзячы вачыма лёгкі вазок з бесклапотным, яшчэ начным жаночым смехам, з насалодаю ўдыхнуў марознае паветра, наставіў каўнер падношанага зімовага паліто і рушыў па пустэльнай вуліцы.

У конусах святла пад ліхтарнямі вецер круціў рэдкія сухія сняжынкі. Цераз вуліцу паўзлі белыя вужакі дуйкі. Чалавек здзівіўся, што яму цёпла ў не надта ўгрэўнай апратцы. Першы дзень вясны, зноў падумаў ён і сам сабе ўсміхнуўся.

Жаночы смех з санак, што схаваліся за паваротаю, яшчэ звінеў у вушах, і яму згадаўся іншы, грудны і ціхі, як галубінае буркаванне, смех Юлі, а на памяць усплыла ўся нядаўняя паездка дахаты. Бадай, толькі цяпер, на прадзьмутай вятрыскам вуліцы, ён па-сапраўднаму даў веры, што тыя тры дні не прымроіліся яму, а папраўдзе былі.

Усё гэта было. І перамеценая завеяй вечаровая дарога з густымі ценямі ад сумётаў, і пырханне акрытага гунькаю дэраша, і прыхільнае маўчанне знаёмага мужыка, што няраз падвозіў яго, яшчэ гімназіста, ад станцыі. А потым — сонная, занесеная снегам да самых стрэх вёска, і маёнтак, і дзверы, што дыхнулі прытульным цяплом, і ўсцешана-недаверны Юлін ускрык.

Пакуль падносілі чарку возніку і хапатліва збіралі на стол у гасцёўні, ён адчыніў валізку з пецярбургскімі гасцінцамі: памаранчамі і рахат-лукумам для ласухі Юлі і скрыначкай гаванскіх цыгар — бацьку. Сястра няўзнак падкралася ззаду і, паклаўшы падбародак яму на плячо, з пералівамі ў голасе спытала:

— Ой, Ігнась, і хто табе так хораша склаў валізку? Напэўна, нейкая панна?

— Так, панна. У мяне шмат добрых паненак ёсць,— жартам адказаў ён.

— Не веру! — тупнула ножкай Юля.— Толькі адна.

Яшчэ перад адыходам цягніка, на сталічным вакзале, няўважліва слухаючы ў купэ суседа, які, задыхаючыся ад патрыятызму, чытаў газетнае паведамленне, што генерал Скобелеў узяў апошні форт тэкінцаў у Закаспійскім стэпе, Ігнат наважыў забыць, што яго чакае, і жыць гэтыя тры дні бестурботна і шчасліва, як тады, калі прыязджаў дахаты з гімназіі. Ён не надта верыў, што з ягонае задумы нешта атрымаецца, але, як ні дзіўна, часам яму сапраўды ўдавалася забыцца на ўсё і пачуць сябе бесклапотным. Відаць, сама душа ведала, што гэтыя тры дні патрэбны яму менавіта такімі, каб потым ён быў даастатку моцны і не зрабіў аніводнае памылкі.

Жаданая шчасная бесклапотнасць агортвала яго ўранні, калі ён прачынаўся на старой, знаёмай з маленства пярыне і сцішана глядзеў на марозныя візэрункі на шыбах. У тыя хвіліны згадвалася нешта светлае і неацэннае — дзяўчынка-падлетак, з якой яны на куццю няўмела і, відаць, абое ўпершыню ў жыцці цалаваліся ў халодных сенцах, вандроўны катрыншчык-паляк, якога бацька прытуліў у маёнтку на цэлы месяц, і ледзь не штовечар яны ўдвух — катрынка і скрыпка — давалі хатнія канцэрты для ўсёй ваколіцы. Ён перагортваў у ложку «Шляхціча Завальню»*, і схаваныя ў гэтым томіку задаўненыя дзіцячыя страхі, цмок з пеўневага яйка і вядзьмарка Белая Сарока, здаваліся яму больш рэальнымі, чым назіранні за царскімі выездамі або лекцыі аб дынамітных прыладах.

Перад полуднем, паглядаючы на старую кухарку Тэклю, якая слугавала за сталом, ён весела дэкламаваў на памяць:

* «Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» — кніга аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Яна Баршчэўскага.

І з пастаялкай жур сцюдзёны,
А з кашы сала аж цякло,
Ды і гусяціны смажонай
Уволю ўсім багом было.
Як унясла ж на стол каўбасы,
Бліны аўсяны ў рашаце,
Аж слінкі пацяклі ў Тараса
І забурчэла ў жываце...

Побач з самотнай постаццю ранняга прахожага спыніўся рамізнік. Але чалавек адмоўна махнуў рукой. Ён яшчэ меў часу пабыць сам-насам са сваімі прыга́дамі, з самым, можа, дарагім, што ў яго цяпер заставалася.

Юля, улюбёная сястра. Яна так і не здагадалася... Яна раскладвала пасля вячэры пасьянс, а ён маленькімі глыткамі піў завараную на баркуне гарбату.

— Што кажуць карты? — знешне бестурботна, але з нейкай лёгкаю трывогай спытаў ён.

— Што хутка тваё вянчанне,— пачырванеўшы, адказала сястра.— Я ўяўляю, як ты цяпер жывеш там, у Пецярбурзе,— мройліва працягвала яна.— Увесь дзень займаешся навукай, а ўвечары... Увечары вы з ёю едзеце ў тэатр. Напэўна, вы бываеце на балях. Уяўляю, як ты вядзеш яе пад руку цераз залу, абое такія маладыя, прыгожыя...

— Паваражы сабе,— мякка спыніў ён сястру, пазіраючы на тонкія чорныя абадкі сваіх пазногцяў, так і не адмытыя сляды доўгай работы са шрыфтамі. Яна даведаецца пра ўсё, але няхай гэта будзе не цяпер, думаў ён. Ігнат не хацеў, проста не мог разбурыць створаны яе фантазіяй свет, у якім ён нібыта жыў. У гэтым свеце не было месца нелегальнай друкарні, арыштам, пакаранням смерцю на досвітку.

— Паваражы сабе,— паўтарыў ён.

У тыя тры дні ён чуўся добра і з бацькам, хоць яны ніколі не былі блізкія. Ігнат змеціў, што пасля матчынай смерці гэты цяжкі, часам нават дэспатычны чалавек хутка ссівеў і страціў усю нядаўнюю ўпэўненасць. Седзячы за сталом, бацька часта кідаў па-

тайны позірк на такі самы, як і ва ўбогім сынавым жытле, авальны партрэт і потым доўга працірaў насоўкаю пенснэ. Гэта кранала Ігната і прымушала дараваць бацьку яго неразуменне, ягоныя былыя папрокі, што сын, найлепшы вучань Беластоцкай рэальнай гімназіі, забіў сабе галаву хімерамі і можа наклікаць бяду на ўсю радзіну Грынявіцкіх. Ігнату хацелася, каб бацька не ведаў, што сын паўгода таму выключаны з інстытута, і ён старанна пераводзіў усе рызыкоўныя размовы на падзеі ў Грынявічах і наваколлі. Бацька нічога не заўважаў, ахвотна і неяк мітусліва адказваў на нішчымныя пытанні і нараджаў у сынавай душы яшчэ большае шкадаванне.

Але ўсё было, відаць, не так проста.

У апошні вечар ён папрасіў бацьку сыграць на скрыпцы, і той знячэўку зайграў паланез, прысвечаны Касцюшку. Ужо назаўтра, у цягніку, калі за вакном купэ праносіліся аблітыя нежывым месяцавым святлом аснежаныя беларускія лясы і ў ім зноў загучала, паланіўшы душу, урачыстая і журботная мелодыя паланеза, Ігната апякла раптоўная думка: «Няўжо бацька здагадаўся?..»

Тае начы ў яго быў прыступ паняверкі, яму ўявілася, што край ужо немагчыма абудзіць, што ўсе надзеі згарэлі ў полымі апошняга паўстання і застаўся толькі халодны попел. «Ці не паспяшаліся мы назваць гэты люд нацыяй? — думаў ён.— Хочам заявіць аб ягоных правах, назвалі будучы часопіс «Гоманам»*, але ці загамоніць беларускі люд, ці паўстане? А мо зноў, як пачнецца паўстанне, будзе выдаваць змагароў, вязаць інсургентаў?..»

Ачуўшыся ад успамінаў, Грынявіцкі зразумеў, што ўжо некалькі хвілін стаіць перад патрэбным яму будынкам на Цялежнай. Як і дамоўлена, у вакне быў відзён вазон з геранню. Кішанёвы гадзіннік паказваў без пяці восем.

* «Гоман» — нелегальны гектаграфічны часопіс, орган беларускай фракцыі таварыства «Народная воля», які пачаў выходзіць праз тры гады пасля апісаных падзей.

Ён прыйшоў першы і, хоць раней не верыў у прыкметы, падумаў, што гэта добры знак. Добры не ў звычайным, а ў ягоным, толькі ягоным разуменні.

Услед за Ігнатам па адным з'явіліся і трое астатніх. Павітаўшыся, яны замаўчалі, і, бадай, маўчанне гэтае было больш шчырым, чым нейкая магчымая размова.

Двое засталіся ў вітальні, уладкаваўшыся каля дзвярэй на засланай зялёным аксамітам кушэтцы. Трэці, высокі бландзін з поўным тварам і даўгімі, зачасанымі назад валасамі, якому не набегла яшчэ і дваццаці, прайшоў у другі пакой, да Грынявіцкага, і на Ігнатаву душу адразу лёг ужо звыклы цень. Ён пераконваў сябе, што мусіць насамперш паважаць гэтага хлопца, самага маладога між імі, за згоду ахвяраваць жыццём, пераконваў, што сваімі думкамі абражае яго, аднак быў пэўны, што на месцы Выканаўчага камітэта ён выбраў бы чацвёртым іншага. У паводзінах маладзёна яго штосьці насцярожвала. Нават зараз Ігнат убачыў знарочыстасць у тым, што хлопец гартаў узятую з этажэркі «Ниву». Але гэта была не непрыязнасць, а трывога. Кінуць бомбу не так ужо і цяжка, думаў Ігнат. Неймаверна цяжэй да канца застацца чалавекам. Як ён будзе паводзіць сябе, калі трапіць у рукі жандараў? Ці не возьме верх над усім інстынкт самазахавання, ці не захлісне душу жаданне жыць, выжыць любой цаной? А там умеюць зламаць слабога, там умеюць правесці душу праз усе кругі здрады і потым, пакінуўшы ад чалавека адну абалонку, выкінуць яго на сметнік.

Намаганнем волі Грынявіцкі абарваў свае думкі.

Дзесьці, яшчэ схаванае камяніцамі вялізнага горада, узышло сонца. Дзесьці спяшалася сюды Соф'я. Дзесьці чакалі сённяшняга выбуху таварышы. Яны пачуюць яго, пачуюць і ў сталіцы, і ў самых аддаленых кутах імперыі. Выбух будзе напамінкам усім тыранам, будзе помстаю за ягоны абылганы, зняважаны народ.

З нейкай пільнаю ўвагай разглядаючы герань, якая зацвітала на вакне ружовымі кветкамі, Грынявіцкі злавіў сябе на тым, што ў ягонай свядомасці гучаць радкі з ранішняга ліста. Было такое адчуванне, быц-

цам нехта дастаў запавет з кішэні і чытае яго ўголас, і ён, Ігнат, прагна слухае.

«Што будзе далей?.. Я баюся... мяне палохае думка, што наперадзе яшчэ шмат дарагіх ахвяр. Апошняя смяротная бітва, я веру, ужо недалёка. Яна залье палі і нівы крывёю, але гісторыя сведчыць, што раскошнае дрэва свабоды патрабуе чалавечых жыццяў. Я не буду жыць ніводнага дня, ніводнае гадзіны ў светлы час перамогі, калі народы імперыі стануць вольныя... Лёс асудзіў мяне, але гэта неабходна. Гэта неабходна дзеля тых, хто прыйдзе пасля нас...»

Ён баяўся пачуць хоць водцень фальшу ці няшчырасці, ды не пачуў іх, і з гэтае хвіліны запавет належаў ужо не яму, а тым, хто застанецца.

Соф'я з'явілася каля дзевяці, калі яны пачалі хвалявацца; ён пазнаў хуткі стукат яе абцасаў у калідоры. Пры сустрэчы ён зазвычай цалаваў ёй руку. Соф'і гэта ніколі не падабалася, але яна кожны раз з грымаскаю незадавальнення ўсё ж цярпела ягоную цырымоннасць і дазваляла крануць вуснамі свае пальцы. Грынявіцкі не збіраўся адступаць ад завядзёнкі і сёння, аднак выгляд Соф'і спыніў яго. Бледная і змарнелая, з хваравітым бляскам у вачах і плямамі нездаровага румянцу на шчоках, яна паставіла важкі клунак на стол і задыхана села.

— Андрэя*... арыштавалі...— выдыхнула яна і закрыла далонямі твар.

Ігнат змусіў сябе застацца на месцы. Спакойна, загадаў ён сабе. Спакойна.

Праз хвіліну Соф'я паднялася і, знаёмым рухам скінуўшы з галавы хустку, загаварыла сваім звычайным нягучным голасам:

— Нашы тэхнікі зрабілі толькі палову бомбаў, па адной на кожнага. На большае не хапіла часу.

Яе на момант перапыніў прыход рослага мужчыны з чорнаю барадой. Побач з клункам Пяроўскай ён

* Андрэй Жалябаў разам з Соф'яй Пяроўскай уваходзіў у склад кіраўніцтва «Народнай волі» і непасрэдна ўзначальваў падрыхтоўку да пакарання смерцю Аляксандра II, якое адбылося 1 сакавіка 1881 г.

асцярожна апусціў свой і аднымі вачыма сумнавата ўсміхнуўся Ігнату. Гэта быў кіраўнік групы тэхнікаў Кібальчыч.

— У вас не будзе бомбаў для абароны,— гаварыла Соф'я.— І запасных на выпадак няўдачы таксама не будзе.

Яна абвяла мужчын вачыма. Кібальчыч вінавата ўтупіўся ў падлогу, аднак Грынявіцкі ведаў, што і Кібальчыч, і зямляк-магілёвец Рыгор Ісаеў, усе тэхнікі зрабілі што маглі, і нават болей.

Соф'я затрымала спакойны пагляд на Ігнаце, і ён уразіўся, як гэтая маленькая жанчына валодае сабой пасля арышту каханага. Толькі хвіліну слабасці, адну хвіліну дазволіла яна сабе, каб зноў стаць такой, якою ён яе ведаў. Ён ніколі, мо таму, што яшчэ ніколі не кахаў, не прызнаваў вяршэнства жанчыны, а ёй гатовы быў падпарадкоўвацца з радасцю.

— Памятайце, што мы павінны лічыць гэта не толькі абавязкам, але і гонарам партыі,— сказала Соф'я, не адводзячы позірку, нібыта знайшла ў вачах у Грынявіцкага падтрымку свайму спакою і мужнасці.

— Мы гатовы,— трохі паспешліва адказаў ён. Паспешліва — бо баяўся, што першы загаворыць маладзён і яны пачуюць нейкія непатрэбныя і напышлівыя словы.

Соф'я ўзяла аловак і ўпэўнена накідала план. Усе абступілі стол.

— Што на Малой Садовай? — злёгку картавячы «л» і нават зараз саромеючыся гэтага, запытаў Грынявіцкі.

— Там ужо чакаюць,— адказала Соф'я, але яе паведамленне не змагло пахіснуць ягонага ранейшага прадчування, нават не прадчування, а амаль упэўненасці, невытлумачальнае ўпэўненасці, што ўсё вырашыць не міна ў падкопе на Садовай, а яны чацвёра, праўдзівей, не чацвёра, а толькі адзін з іх.

— Калі выбух будзе няўдалы, цар, найверагодней, накіруецца вось сюды,— Соф'я паказала алоўкам,— на Манежны пляц. Тут самае небяспечнае і адказнае месца. Міхаіл Іванавіч*,— падняла яна вочы на Ігната,— кіраўніцтва партыі лічыць...

* Канспірацыйная мянушка Грынявіцкага.

— Можаце не працягваць,— сказаў ён.— Ваш выбар супадае з маім.

Перад адыходам, калі ўсё ўжо было дамоўлена і ён трымаў пад пахаю загорнутую ў белую сурвэтку бомбу, падобную нечым на невялікі камяк снегу, Ігнатаў позірк зноў спыніўся на вазоне з ружовай геранню. Абапал вазона стаялі на падваконцы дзве абвязаныя паркалёвымі хусткамі бляшанкі з дынамітам. Невыразная думка, што мільганула ў яго раней, раптам набыла бязлітасную акрэсленасць. Ён зразумеў, што гэта яго апошнія кветкі, і падумаў: як, напэўна, здзівілася б Соф'я, даведаўшыся, што ў гэтую хвіліну ён шкадуе, што больш не ўбачыць ні сціплых здрыжнічак, якіх так багата на поплаве за Грынявічамі, ні сваіх улюбёных канвалій. Шкадаванне па канваліях было такое моцнае, што на імгненне ён адчуў іхні тонкі лесавы водар.

Цяпер, на пляцы, гэтая шкадоба і ўся размова на Цялежнай ужо былі далёкія і адлучаныя ад яго. Яны засталіся за нейкаю крэскаю, тамсама, дзе перад гэтым ён пакінуў запавет і прыга́ды пра дом.

Ігнат выняў з кішэні гадзіннік. Вялікая стрэлка набліжалася да малой, каб сустрэцца з ёю на лічбе 12. Надыходзіў час, калі цар меў звычай выязджаць у манеж на агляд гвардыі. Занятак, варты такога дзяржаўнага дзеяча, як імператар. Чаго яшчэ чакаць ад чалавека, з малых гадоў прывучанага да пляц-парадаў, ад салдафона, які бачыць у падданых полк, а ў Айчыне — казарму?

У дні, калі Ігнат з таварышамі сачыў за царскімі выездамі, ён шмат разоў спрабаваў пранікнуць думкаю ў свядомасць імператара, пад гэты лоб з залысінамі, што часам мільгаў у прыцемненым вкне карэты. Ён ніколі не мог знайсці там нічога больш істотнага, чым боязь бунту і багавейлівасць перад дзядзькам, германскім імператарам. Грынявіцкі часта шукаў у сабе нянавісць да цара і не знаходзіў яе. Ён ненавідзеў не Аляксандра, а ўсё тое, што стаяла за ягоным абліччам. Ды зрэдчас Ігнат адчуваў, што насуперак сваёй волі ў далёкім цёмным кутку свядомасці ён на нейкае каліва яшчэ застаецца падданым гасудара імператара. Ведаў: гэта не стрымае яго, аднак канчаткова пазбыцца рэшткаў ганебнага пачуцця ён здолее толькі тады, у тую самую хвіліну.

Першасакавіцкае сонца марна намагалася сагрэць зямлю, але ранішні віскуцень угамаваўся, і на пляцы зрабілася даволі людна, можна было не хваляваццa.

Непадалёк маладая дама ў сабаліным футэрку карміла галубоў. Каля зграбных санак пачціва стаяў фурман з гаспадынінай муфтаю і пульхным пірагом на срэбным сподзе.

Мераючы пляц няспешнымі крокамі дробнага сталічнага службоўца, які выйшаў на нядзельны шпацыр, Ігнат зрабіў выснову, што думаць у гэтыя хвіліны пра цара — раскоша, якую ён ужо не можа сабе дазволіць.

Яму ўзбегла на памяць, як даўно, у гімназічныя гады, яго ўразіла смерць іхняга выкладчыка славеснасці. Той застрэліўся праз няшчаснае каханне, і Ігнату некалькі дзён не давала спакою пытанне: што думае і адчувае чалавек перад смерцю і што такое сама смерць?

Вось ты і маеш магчымасць даць сабе самы поўны адказ, падумаў ён.

Успомнілася, што яшчэ не развітаўся з сябрамі. Праўдзівей, ён увесь час памятаў пра гэта, але ўсё адкладваў і адкладваў, каб быць з імі ў апошнія хвіліны, і цяпер, яшчэ раз зірнуўшы на гадзіннік, зразумеў, што пара́.

Першы быў Жалябаў, і ўся Ігнатава істота абурылася супроць думкі, што ён больш не ўбачыць шырокай барады і зусім дзіцячай Андрэевай усмешкі, не пачуе ягонага голасу. Ён з пяшчотай падумаў, што нават цяпер, арыштаваны, Андрэй дапамагае ім. Міністр унутраных спраў ужо, несумненна, даклаў цару, што галоўны змоўшчык схоплены, а значыць, самая вялікая небяспека для яго вялікасці мінулася...

Было паўгадзіны на першую. «Ну давай абдымемся і з табой, дарагі ты наш вынаходнік і філосаф». Ігнат убачыў меланхалічныя вочы Кібальчыча і падумаў, што заўсёдны спакой гэтага маўклівага летуценнага хахла — вынік не толькі ягонай сілы волі, але

найперш — сілы думкі. Ён ніколі не пасміхаўся з сябравай мары аб паветранай лодцы. Узгадалася, як Кібальчыч нешта крэсліў дубчыкам на снезе, нават тады, калі яны ездзілі за Смольны манастыр выпрабоўваць бомбы. «Няхай лёс бароніць цябе дзеля навукі...»

Ігнату падумалася, што цяпер ён ведае, што такое смерць: глухая чорная сцяна, якая назаўсёды аддзяляе ад сяброў.

Ён убачыў сябе ў сырнай лаўцы, адкуль вялі падкоп пад Малую Садовую. Яны, зняможаныя так, што рукі і ногі, усё цела рабіліся чужымі і ўжо амаль не падпарадкоўваліся розуму, выпаўзлі з падкопу і паваліліся на скрынкі са свежай зямлёй. Гэта тады адзін з іх, фарсісты флоцкі афіцэр, улюбёнец жанчын, на якога некаторыя ў арганізацыі глядзелі з насцярогаю, сказаў ім: «Я не тэарэтык, я не займаюся разважаннямі. Але я адчуваю, што жыць без барацьбы цяпер проста няварта, занадта брыдка. У Расеі няма чым дыхаць, паветра няма...»

Было каля гадзіны дня. Царскі экіпаж мусіў з'явіцца з хвіліны на хвіліну. Ігнат напята глядзеў усцяж вуліцы, але замест карэты з казацкім эскортам заўважыў Соф'ю. Яна махнула белай насоўкаю, і гэта быў знак, што іхняе чаканне марнае: цар паехаў іншымі вуліцамі, і два пуды дынаміту ў падкопе ўжо непатрэбныя.

Ігнат быў рады і ўадначас крыху разгублены, што лёс падараваў яму яшчэ нейкую гадзіну, бо не чакаў адтэрміноўкі і не ведаў, чым гэты час запоўніць. Таму ён усцешыўся, калі Соф'я загадала сабрацца ў цукерні насупраць Гасцінага двара і чакаць, пакуль скончыцца развод гвардыі. Ён ужо даўно забыўся, што магчымасць заняцца такой простай і звычайнай чалавечаю справай, як яда, можа прынесці гэткую радасць. Адчуваючы на каленях важкасць бомбы, Ігнат з'еў усю порцыю гарачых піражкоў з гарбатаю і здзівіўся, што таварышы пакінулі свае талеркі некранутымі і пазіраюць на яго з захапленнем. Мусіць, яны, нават Соф'я, зайздросцяць ягонай вытрымцы. «Каб жа вы ведалі, што я проста галодны з учарашняга вечара».

Цукерня месцілася ў падвальным памяшканні, і, падняўшы вочы ўгору, можна было назіраць у невялікіх запыленых вокнах бясконцую чараду чалавечых ног, што спяшаліся па Неўскім.

На Кацярынінскім канале, куды яны пойдуць цяпер, і ў нядзелю зазвычай пустэльна. Значыць, непатрэбных ахвяр не будзе. Памруць толькі тыя, хто павінен памерці.

Яны выйшлі з цукерні па адным і сышліся ўжо на канале. Набліжаючыся да свайго месца, Ігнат сустрэўся з Соф'яй і ўсміхнуўся ёй ледзь прыкметнаю ўсмешкай. «Яна так ніколі і не даведаецца, што я...»

Ён не памыліўся: на набярэжнай было бязлюдна, адно вартаўнікі падмяталі панель каля саду і водбліз Тэатральнага моста маячыла пара постацяў, яўна агенты паліцыі. Пакунак з бомбай быў невялікі і няцяжкі, не болей пяці фунтаў, але яго нельга было схаваць у кішэню, і пільнаму воку шпегаў ён мог здацца падазроным. Таму Грынявіцкі вырашыў не шпацыраваць па набярэжнай і, прыхінуўшыся спінаю да парапета, застаўся на месцы.

Уся ягоная разважнасць паступова некуды знікала, і душу браў у ледзяныя рукі страх. Яму здалося, што бомба, гэтыя шкляныя трубачкі з сернай кіслатой, кнаты, выбуховы жэлацін, ужо сталі часткаю ягонага цела, што кроў па яго жылах гоніць ужо не чалавечае сэрца, а бляшанка са смяротным змесцівам. Розум на момант ператварыўся ў лядачы човен сярод хваляў страху. Але адно на момант.

Ігнат ачуўся, і з гэтае хвіліны ўсе ягоныя пачуцці абвастрыліся. Свет зрабіўся больш відочны, больш чутны і адчувальны. Грынявіцкі з прагнаю цікавасцю ўбачыў чыстае і халоднае, але нечым няўлоўным ужо вясновае неба над горадам. Унізе, на лёдзе, сварыліся вароны. Разам з іхнім га́ласам гучалі, аднак кожны паасобку, дзесяткі іншых гукаў. Ён узяў з парэнчаў жменю свежага снегу і стаў есці яго, як некалі ў маленстве. Свет здаўся яму суладным і дасканалым, і тае ж хвілі да яго даляцела цоканне капытоў.

Спярша Ігнат пачуў яго нейкім таемным нутра-

ным слыхам, бо сапраўды чуць царскі экіпаж яшчэ не мог. Але цоканне набліжалася. Вось яно зрабілася цішэйшае — гэта на павароце ад Міхайлаўскага тэатра на канал фурман прытрымаў коней, і яны ішлі ступою. І зноў, ужо гучна, капыты ўдарылі па зледзянелым бруку.

На набярэжнай коні імператарскага экіпажа пайшлі буйной рыссю, і казакі з эскорту ўзялі наўскач. Карэта абагнала ўзвод юнкераў. Цару аддалі чэсць два сустрэчныя праабражэнцы. Экіпаж быў зусім блізка і даганяў малодшага з чатырох бамбістаў. У Грынявіцкага яшчэ паспела мільгануць трывога, як карэта зраўнялася з маладзёнам.

Тое, што адбывалася далей, было Ігнату такое знаёмае, быццам ён неаднойчы бачыў усё ў сне. Маладзён павярнуўся тварам да экіпажа і кінуў пад ногі рысакам бомбу. Паветра скалануў выбух, як ад залпу дзесятка гарматаў. Трое казакоў зваліліся з коней, угару паднялося густое воблака снегу. Зазвінелі разбітыя шыбы будынкаў на тым баку канала.

Праз некалькі імгненняў чалавека, які кінуў бомбу, ужо трымалі паліцэйскія і казакі, да іх беглі праабражэнцы з юнкерамі.

З пашчапанага экіпажа выйшаў цар.

— Схвачен ли преступник? — данёсся зычны голас Аляксандра.

Ігнат адчуў, што і яму, і цару ратунку ўжо няма.

Сэрца адлічвала секунды. Ён знайшоў вачыма Соф'ю на тым беразе канала і, адарваўшыся ад парапета, паволі рушыў наперад.

Чорная сцяна была побач, але ён не баяўся. Грынявіцкі адчуваў Соф'ін позірк, адчуваў яе думкі і думкі тых, што чакалі на канспірацыйных кватэрах ці ў хваляванні хадзілі па вуліцах; ад кожнага з іх цягнуліся да яго невідочныя нітачкі, якія не дазвалялі яму спыніцца і якія ён павінен быў абарваць другім выбухам.

Заставалася крокаў дзесяць. Усё засланіў цароў твар з густымі бакенбардамі. Грынявіцкі яшчэ раз з палёгкаю пераканаўся, што не адчувае да гэтага чалавека нічога, акрамя абыякавасці. Цар быў бы для

яго пустым месцам, каб за позіркам трохі пукатых вачэй не было крыві, не было сотняў павешаных і забітых у турмах, не было здратаванай, укрыжаванай Радзімы.

Ён стаяў ужо амаль поруч з царом.

Грынявіцкі адчуў, як нешта здарылася з часам. Час нібыта спыніўся, а можа, паплыў у адваротны бок, ператварыўшы гаману натоўпу ў гулкую цішыню, і ў ёй загучаў паланез.

Грынявіцкі са спакойнай рашучасцю зрабіў апошні крок і ўскінуў рукі з бомбай над галавой...

«Схвачен ли преступник? Схвачен ли преступник?» Над ім схіліўся твар з бакенбардамі. Але бакенбарды ўвачавідкі знікалі, вусы і валасы імператара сівелі, а пукатыя вочы ператвараліся ў шкельцы пенснэ, і ён чуў бацькаў голас:

«Памятай, ты — гонар гімназіі. Твае здольнасці забяспечаць табе выдатную кар'еру і праславяць наш род».

Бацькава аблічча пачынала зыбацца, як адбітак у вадзяным люстэрку, якое крануў вецер, і раставала ў прасторы, саступаючы месца даме, што карміла на Манежнай галубоў. Пільней прыгледзеўшыся да яе, ён змеціў, што гэта не жанчына, а самы малады з іхняе чацвёркі, і вусаты фурман са сподам — у сапраўднасці не фурман, а жандарскі палкоўнік, і на сподзе ў яго ляжыць не пірог, а бомба. Бледныя пульхныя вусны маладзёна крывіліся і шапталі: «Я хачу жыць... Жыць хачу...», палкоўнік усміхаўся, а ён, Ігнат, у роспачы крычаў маладзёну: «Не смей! Не смей!»

Новыя і новыя малюнкі нараджаліся ў ягонай свядомасці і знікалі: адны паступова, нібыта іх развейваў вецер, другія гаслі, як гасне ад подзьмуху агеньчык свечкі, і ў бязладдзі гэтых малюнкаў скрозь гармідар гукаў і слоў чыстым струмком праточваўся аднекуль, то мацнеючы, то амаль прападаючы, журлівы голас бацькавай скрыпкі...

У гэты самы час у прапахлай карболкаю палаце прыдворнага шпіталя немалады прафесар чытаў медыцынскі акт:

— Дастаўлены ў непрытомным стане... На лбе шмат кроватачывых ранак. Правае вока неадчувальнае да святла...

— Прабачце, пане прафесар, я не медык,— спыніў чытанне следчы ў цывільным, які неадлучна сядзеў пры ложку.— Мяне цікавіць іншае. Скажыце, яго можна хоць на хвіліну вярнуць да прытомнасці?

— Гэта можа цяпер толькі Бог.

— Я чую ў вашых словах спагаду, пане прафесар,— бескалёрным голасам прамовіў следчы, вывучаючы мыскі чаравікаў.

— Толькі як медыка да пацыента,— крыху паспешліва сказаў прафесар і пасля кароткага маўчання дадаў: — Для мяне ён найперш безнадзейны хворы.

— Для ўсіх нас ён найперш царазабойца, чалавек, які падняў руку на свяшчэнную асобу гасудара.— Следчы гаварыў з тым самым, што і раней, застылым выразам на чыста голеным твары, але ў голасе прарэзаліся металёвыя інтанацыі.

Сівы прафесар, адвёўшы вочы, глядзеў на схаванага пад бінтамі незварушнага чалавека.

Грынявіцкі быў у падкопе пад Малой Садовай. У задушлівым сутарэнні, ледзь асветленым мігатлівай лямпаю, было цесна і сыра, як у магільным склепе. На нейкі міг яму прымроілася, што гэта сапраўды склеп, і ён спалохаўся, але адразу згледзеў у прыцемку сяброў, усю іхнюю змену, і супакоіўся. Прамоклая, перапэцканая зямлёю сарочка ліпнула да цела, пот выядаў вочы, мучыла страшэнная смага, але ён капаў і капаў, не дазваляючы сабе перапынку. Гэта быў ужо не падкоп пад вуліцу: шляху назад не было, іх заваліла, прыціснула зямлёй, і яны адчайна прабіваліся з завалу ўгару, да святла, да паветра і вады. Ён ведаў, што засталося зусім мала, можа, некалькі ўзмахаў рыдлёўкі, і прыйдзе вызваленне. З астатніх сіл Ігнат сек непадатную зямлю над галавой, і вось зверху пасыпалася каменне, глыжы і жвір, і ён убачыў атвор.

Але замест сонечнага святла ў атворы быў нечы чыста выгалены твар.

— Імя... Скажыце мне ваша імя...— ласкава, амаль пяшчотна прасіў голас, які належаў гэтаму твару.

Ён памятаў сваё імя і, узрадаваны, што памятае, хацеў выгукнуць: «Грынявіцкі», ды за ласкавасцю голасу хавалася нешта іншае, і ён паспеў утаймаваць крык, што быў гатовы ўжо сарвацца з вуснаў.

— Імя... Мне трэба толькі імя... Імя! — паўтараў голас, і ўніклівая ласкавасць пераходзіла ў стылую зласлівасць.

Грынявіцкі нарэшце зразумеў, дзе ён і хто з ім гаворыць. Але разам з вяртаннем свядомасці ў яго зраненае цела, у кожную клетку безліччу гострых кіпцюроў упіўся звер нечалавечага болю.

— Імя! Імя! — ускочыўшы на ногі, крычаў следчы.

Боль раздзіраў на тысячу кавалкаў, і адзіным збавеннем было новае забыццё, але да Ігната яшчэ цягнуліся нітачкі, якія ён адчуваў перад выбухам на канале, і, перш чым абарвацца ў бездань, ён паспеў пачуць свой голас:

— Не... ведаю...

Боль адразу выпусціў са сваіх лапаў, ды голены твар у атворы не знікаў, і Грынявіцкі замахнуўся на яго рыдлёўкаю, што зноў апынулася ў руках.

Атвор засыпала зямлёю, і ён разграбаў яе — спачатку рыдлёўкай, а потым, дарэшты змогшыся, рукамі, і апошнія кроплі моцы падтрымлівала ў ім веданне, што ён не самотны, што недзе побач прабіваюцца да святла іншыя.

У той момант, калі сонечныя промні пырснулі Грынявіцкаму ў вочы, следчы страпянуўся і запытальна паглядзеў на прафесара. Доктар моўчкі нахіліў сівую галаву.

1985

Мой радавод да пятага калена, або Спроба пазбегнуць выгнання

— Пишешь, писатель...— перш чым папрасіць чырвонец, спачувальна кажа сусед, аглядаючы мой стол.

Суседаў позірк спыняецца на томе «Витебской старины».

— Сотни на две потянет? — пытаецца ён.

Я дастаю партманетку і працягваю яму грошы.

— Обижаешь, писатель,— гаворыць сусед і глядзіць чырвонец на святло.

— Уберите Ленина с денег! — раптам цытуе ён ранняга А. Вазнясенскага і бесцырымонна плюхаецца ў мой фатэль.

На стале стосік аркушаў, на верхнім я паспеў ужо напісаць назву.

— Мой ра-да-вод...— слібізуе сусед, засунуўшы нос у мае паперы.— Все по-белорусскому. Вчера, между прочим, по телеку тебя смотрел. Агитируешь... Все равно народ за вами не пойдет.

Ён на ўсялякі выпадак хавае чырвонец у кішэню і кажа далей:

— Понял, писатель? Но пасаран, как говорил товарищ Альенде, вечная ему память. Ну ладно, не обижайся. Мой ра-да-вод да пя-та-га ка-ле-на... Это как понимать — до пятого колена? Про что?

— Пра генеалогію,— адказваю я.

— Ну, ты даешь, старичок! — чамусьці радуецца сусед.— Ее ж у мужиков не бывает.

Ён на хвіліну задумваецца і ў выніку нейкіх загадкавых меркаванняў ухваляе мой намер:

— А в общем, давно пора тебе что-нибудь такое, для народа, соорудить.

Ён расказвае мне барадатую показку пра жанчыну, гінеколага і сантэхніка, а потым яшчэ адну показку пра гінеколага і двух грузінаў, і да мяне даходзіць, што сусед яўна пераблытаў генеалогію з гінекалогіяй. На дадатак ён выцягвае з кішэні і, натхняючы мяне на стварэнне новага літаратурна-мастацкага твора, вахлікам раскладвае на стале калоду парнаграфічных картаў.

Нарэшце мы развітваемся, і я выпісваю з аднае выдадзенае на пачатку нашага стагоддзя кнігі падкрэсленыя калісьці, можа, яшчэ за праклятым царызмам, словы: «Мелі тыя крывічы звычай: калі дасягаў у іх юнак паўналецця, мусіў ён, каб назвацца мужчынам, пераплысці хуткую ды глыбокую раку, упалявацъ тура або мядзведзя, раскласці ў залеву вогнішча, а таксама распавесці суродзічам аб продках сваіх да пятага калена... Калі ж не ведаў ён роду свайго, дык падлягаў выгнанню, бо ўважалася, што род ягоны, а значыцца, і зямля бацькоўская яму не дарагія і можа ступіць ён на шлях здрады».

Побач, на палях, яшчэ відаць накіданае алоўкам і ўжо амаль сцёртае часам дрэва нейчага радаводу.

Як вы ўжо зразумелі, на нешта падобнае падбіла гэтая кніга і мяне.

Няхай даруе мне стрыечная бабуля Грыпінка, што чытала «Чорную магію», умела спыняць кроў, заўсёды заходзіла ў хату да мае роднае бабулі акурат тады, калі мы сядалі за стол і бралі ў рукі лыжкі, лекавала людзей і худобу зёлкамі і сем гадоў сядзела ў сталінскіх лагерах — пэўна, усё ж не за антысавецкую і контрэвалюцыйную дзейнасць, а сапраўды за знахарства. Зрэшты, нядаўна я чытаў кнігу пра лекавыя расліны Беларусі, якая пачынаецца са слоў: «Коммунистическая партия проявляет неуклонную заботу о здоровье советских людей». Хто ведае, мо бабулі Грыпінцы інкрымінавалі якраз тое, што, збіраючы свае зёлкі, яна насмелілася клапаціцца аб тым, аб чым мела права клапаціцца адна толькі камуністычная партыя?

Няхай даруе мне мой засакрэчаны стрыечны дзед Рыгор, які меў нейкае і, відаць, даволі блізкае дачыненне да касмічных палётаў, бо слаў нам пасылкі з чорнай ікрой і чырвонаю рыбай, а аднаго разу, калі гасцяваў у вёсцы, саламяную страху бабулінае хаты ледзь-

ве не раскідаў вайсковы верталёт, прысланы па дзеда з найбліжэйшага аэрадрома.

Няхай даруе мне дзядзька Язэп, які нават прыблізна не ведаў свайго дня нараджэння, а таму, не ўважаючы на ўсе жончыны захады, штовечар хадзіў падвясёлены, абсалютна слушна зазначаючы, што, магчыма, акурат сёння ён і нарадзіўся.

Даруйце мне, усе мае родзічы, якіх згадаю адно мімаходзь або не згадаю зусім. Каб канчаткова не заблытацца ў галінах і адгалінаваннях радаводнага дрэва — пагатоў, спадзявацца ўнікнуць лірычных і нелірычных адхіленняў ад такое тэмы ўсё адно наіўна,— буду весці гаворку аб непасрэдных сваіх продках па бацьку і маці, або, як казалі даўней, па мячы і па кудзелі. Апрача таго, іншая метода будзе непазбежна нагадваць хітрамудрую спробу схавацца ад адказнасці, заблытаць суддзяў і пазбегнуць выгнання.

І яшчэ адна заўвага. У цывілізаваным свеце, калі вядомы заснавальнік роду ці, прынамсі, нехта са знакамітых продкаў, радаводнае дрэва, як і належыць, малююць з каранёў. У нас жа сем дзесяцігоддзяў гэтыя карані нястомна выкарчоўвалі, бо трэба было ведаць не продкаў, а нешта іншае. Напрыклад, чарадзейныя цытаткі з класікаў або галоўныя задачы пяцігодак. За няведанне — слова ў слова — адной з гэтых задач рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта Сікорскі ў 1970-я гады на бал знізіў мне адзнаку на экзамене па навуцы пад назваю «Гісторыя КПСС», а на дзяржаўным экзамене па яшчэ больш захапляльнай дысцыпліне — «Навуковым камунізме», калі я, ужо маючы сумны досвед і марачы атрымліваць стыпендыю, ведаў усе фармулёўкі і галоўныя задачы пяцігодак так, што яны ад зубоў адскоквалі, прафесар Круцько знізіў мне адзнаку ўжо адразу на два балы, «потому что вы, молодой человек, во все это совершенно не верите». Бедны прафесар Круцько, няўжо ён верыў?

Такім чынам, недзе пачынаюць з каранёў, а ў нас атрымліваецца нешта адваротнае: мусім пачынаць генеалагічнае дрэва з сучка на нейкай з ягоных галінаў і ўжо адтуль спрабаваць дапясці каранёў.

Мая маці Марыя паходзіць з сялянаў вёскі Капысіца, заснаванае ў невядомым годзе задаўненага стагоддзя за тры вярсты ад Дняпра на рэчцы Вілейцы: маці ў гэтай рэчцы некалі ледзь не ўтапілася, а я навучыўся ў ёй плаваць, і ўжо гадоў дваццаць, як там не ўтопіцца нават кацянё. Карацей, жыць стала лепей, жыць стала весялей.

Мяркуючы па назве, матчыну вёску заснавалі перасяленцы з паблізнага мястэчка Копысь, вядомага ўжо амаль тысячу гадоў, з той самай Копысі, што была сталіцаю беларускіх кафляроў-цаніннікаў (яшчэ на пачатку XX стагоддзя тут было дваццаць кафляных заводаў, дасёння ацалеў толькі адзін), якіх маскоўскія цары выводзілі ў палон аздабляць грубкі ў сваіх задушлівых палацах.

Зусім побач з Копыссю, дзе маці скончыла школу, за колькі гадоў да вайны аблюбаваў сабе месца на летнік Янка Купала. Адзін з самых частых маміных успамінаў дзяцінства: народны паэт Беларусі Купала — ведама ж, несусветна багаты! — купляючы на копыскім рыначку грыбы, заўзята таргуецца за кожную капейчыну з прыгожымі тамтэйшымі габрэечкамі.

Мамін выпускны баль прыпаў на апошні мірны вечар, калі можна назваць мірам тое, што тады чынілася ў краіне. Даведаўшыся аб пачатку вайны, мама надзела на сябе ўсе свае тры сукенкі.

У Капысіцы стаяў гарнізон напалову з немцаў, напалову з фінаў. Маці прыгадвае, што, параўнаўча з фінамі, немцы выдавалі хоць і ворагамі, але не такімі страшнымі. Асабліва фольксдойчэ Пауль, які добра гаварыў па-расейску, папярэджваў вёску, калі будуць забіраць каровы або вывозіць моладзь у Нямеччыну, паведамляў што трэба партызанам і паказваў маёй маці пасведчанне сябра падпольнай антыфашыстоўскае арганізацыі. Таму, калі вечарамі акупанты, седзячы па хатах, пілі шнапс і спявалі пад губны гармонік свае песні, Пауль не баяўся хадзіць на вячоркі і танцаваць з нашымі дзяўчатамі. Пэўна, дзякуючы яму ў Капысіцы дагэтуль памятаюць прыпеўкі на нямецка-беларускай трасянцы.

Варум ду гойтэ не прыйшоў?
Іх цябе чакала.
Унд васэр з неба паліла,
Я дамоў адна пайшла.

Падчас вячорак з лесу нярэдка прыходзілі партызаны. Яны таксама танцавалі, курылі з Паулем на ганку і частавалі яго самагонкаю. Аднойчы яны прыйшлі і, няўдала робячы выгляд, што аніколі раней з Паулем не сустракаліся, вывелі яго з хаты і проста за хлявом застрэлілі. Нейкі асабіст, на загад якога гэта рабілася, яўна запісаў раніцою ў зводку, што народнымі мсціўцамі знішчаны яшчэ адзін захопнік.

Калі я ад'язджаў пасля школы са свайго Полацка паступаць на гістарычны факультэт Беларускага (адно па назве) універсітэта, маці, згадаўшы маладосць, з не ўласцівай ёй чуллівасцю сказала:

— Матэматыкаў будуць зваць піфагорамі, а вас — герадотамі...

Па вайне яна, закрэсліваючы ў падручніках імёны «ворагаў народа», галадуючы і мерзнучы ў інтэрнацкай стадоліне, дзе па двое на вузкіх салдацкіх ложках «вальтом» спалі два дзесяткі дзяўчат, скончыла гістарычны факультэт педінстытута. Яна ўсё жыццё выкладала ў школе гісторыю, магчыма, так ніколі і не задумаўшыся, штó яна выкладае і штó зрабілі з гэтаю навукаю нашы афіцыйныя герадоты.

Як вы заўважылі, аднаўляючы радавод, я не збіраюся маляваць грунтоўных партрэтаў. Я свядома не лезу ў прыцемныя спіжарні памяці, а занатоўваю тое, што не трэба ўзгадваць, бо яно памяталася заўсёды, увесь час было як бы ў зялёным коле святла ад лямпы, што гарыць увечары на маім стале. Мне здаецца, менавіта ў россыпе такіх незабыўных драбніц ды фактаў і можна разгледзець чалавечую сутнасць дзейных асобаў майго невялікага даследавання. Пры гэтым я цудоўна ўсведамляю рызыку дарэшты скепсіць дачыненні са сваякамі, ужо і цяпер моцна сапсаваныя маімі пісаннямі.

Мой бацька Аляксей — сялянскі сын з вёсачкі Стэцава, што схавалася ў яшчэ не павысяканых лясах Сенненскага раёна Віцебскае вобласці, між іншым, на той дзень, калі я пішу гэтыя радкі, апошняе ў Беларусі вобласці, дзе яшчэ не плоцяць чарнобыльскіх дамавінных рублёў.

Бацька паспеў адбыць перад вайною тэрміновую службу ў Адэсе, да якой назаўсёды захаваў у сваёй суровай душы прытоеную пяшчоту і куды паспеў звазіць мяне, васьмікласніка, за колькі гадоў да свае ранняе смерці. У дом свой вечны ён узяў ордэн Чырвонае Зоркі, медалі «За отвагу», «За боевые заслуги», «За оборону Сталинграда», «За взятие Будапешта» і з паўтузіна тых, якія давалі ўсім, хто быў на фронце, а таксама, напэўна, і ўсім, хто бясстрашна ваяваў з «ворагамі народа» ў тыле.

На здымках ваеннага часу я бачу старшага лейтэнанта Арлова пасля першага і другога раненняў: на вуліцах вугорскае і аўстрыйскае сталіц; у венскай піўніцы з ніштаватым кухлем у руцэ. Ці не гэтае фота натхняла мяне, калі на трэцім курсе мы з сябрам Генадзем Кулажанкам, які бясследна знікне ў Афганістане, стварылі ў нас на гістарычным факультэце Клуб аматараў піва, што, як пазней стала вядома, стукачы з ліку аднакурснікаў абвясцілі ў сваіх сакрэтных рэляцыях нацыяналістычнаю арганізацыяй. Сакратар партбюро роднага факультэта ў часе разбору «справы» глыбакадумна зазначыў: «В Германии тоже все начиналось с пива». Асаблівую злосць выклікала ў выкладчыкаў марксізму-ленінізму створанае намі новае ідэйна-тэарэтычнае «вучэнне» — піваізм.

На адной з фатаграфій бацька сядзіць на лавачцы пад шыльдаю, з якой усміхаецца гумавашчокі мацак з падкручанымі і даўгімі, як у прусака, вусамі. Пакуль бацька пазіраваў перад той цырульняю ў вугорскім горадзе Сегедзе, ягоны сябра зайшоў пагаліцца, і цырульнік-хартыст шырока — ад вуха да вуха — перарэзаў кліенту горла. Бацька не хаваў, што, знайшоўшы ў бакоўцы над поўным крыві тазам сябрава цела, ён разам з патрулём учыніў у цырульні крывавы самасуд.

Атрымаўшы пасля вайны дыплом юрыста, бацька да апошніх дзён працаваў у пракуратуры; з гэтае прычыны ў мамінай вёсцы, дзе я штогод летаваў, усе — і дарослыя і дзеці — называлі мяне не іначай як Пракурорам.

Праца, несумненна, адбілася на бацькавым характары. Ён быў маўклівы, замкнёны ў сабе чалавек, здаецца, без пачуцця гумару і з патаемным жаданнем калі-небудзь пераехаць у Адэсу. За маёй памяццю ён два разы плакаў. Першы — як займаўся інтэрнатам для дзяцей-інвалідаў.

Павесіўшы на фасадзе інтэрната лозунг «Все лучшее — детям!», педагогі на чале з дырэктарам і сакратаром партыйнае арганізацыі (можна ўявіць, як яны праводзілі сходы, прымалі пастановы «в свете решений», а потым дзялілі д'яблаў заробак) бязбожна абкрадалі безабаронных выхаванцаў, трымаючы іх надгаладзь і збываючы налева нават іхнюю ўбогую, аднолькавую на ўсіх, як у турме, апратку.

Другі раз бацька плакаў, калі канаў ад раку і ніяк не мог памерці, бо яго магутнае сэрца, жывучы асобным жыццём, не хацела спыняцца і праз месяц пасля таго, як ён ужо нічога не еў.

У апошнія дні ён гаварыў са мною так, як і я з ім — па-беларуску.

Нібы нешта амаль неверагоднае, я ўспамінаю, што аднаго разу бацька прачытаў мне свой верш. Колькі радкоў з яго я магу ўзгадаць і сёння. Не буду цытаваць іх, бо да літаратуры яны маюць дачыненне прыкладна такое самае, як і шматлікія творы вядомага паэта-лаўрэата М. Мяне ўражвае сам факт: мой бацька пісаў вершы!

Цяпер я перакананы, што гэта быў чалавек значна больш глыбокі і незалежны, чым некалі мне ўяўлялася.

Аднойчы, калі вецер раскідаў похапам зладжаны ў нас на Дзвіне пантонны мост і мы з бацькам стаялі на беразе і глядзелі на людскую мітусню, ён з непранікліывым тварам прамовіў вершаваную фразу са свае маладосці: «Течет вода Кубань-реки, куда велят большевики».

Калі тата быў ужо на Божай пасцелі, я папрасіў, каб ён — калі чалавечае існаванне доўжыцца і *там* — паспрабаваў даць мне нейкі знак, напрыклад, затэлефанаваў бы ў дзень майго нараджэння. Я баяўся, што ён абразіцца, але тата нечакана сустрэў маю просьбу з нейкаю ўсцехаю.

Яму не ўдалося дазваніцца, ды праз колькі тыдняў ён — ужо *адтуль* — дапамог мне ў цяжкія дні.

Гэтыя дні пачаліся з таго, што вахцёрка нашага студэнцкага інтэрната ўвечары паклікала мяне да каменданта, дзе нібыта чакаў бацькаў сябра. Візітант аказаўся чалавекам з невыразным абліччам — з тых, якія праз пяць хвілін пасля сустрэчы надзейна сціраюцца з памяці. Адзінай адметнасцю ягонага твару былі маленькія бясколерныя вочкі-свярдзёлкі (ці, можа, дакладней, іголкі ад шпрыцаў), чые дотыкі-ўколы я адчуваў амаль фізічна. Абколваючы мяне з галавы да пятаў, госць паказаў чырвоную «корачку», з якой вынікала, што сярод бацькавых сяброў пракідаліся і маёры камітэта дзяржбяспекі.

Далей размова адбывалася прыкладна так:

— Орлов?

— Арлоў.

— Владимир Алексеевич?

— Уладзімір Аляксеевіч.

— Родились в Полоцке тогда-то и тогда-то.

З гэтага моманту пытальнікі ў канцы сказаў зніклі.

— Окончили школу в Новополоцке в 1970 году.

— Жили на улице имени такого и такого, в доме номер такой-то, квартира такая-то.

— Мать — Мария Максимовна. Учительница истории.

Мой візаві перайшоў амаль на тэлеграфны стыль. Я ўжо не пацвярджаў, а толькі слухаў чамусьці вядомыя яму звесткі з майго жыцця.

Мне было дваццаць гадоў. Пад матрацам майго панцырнага інтэрнацкага ложка ляжаў зачытаны нумар «Роман-газеты» з «Адным днём Івана Дзянісавіча» толькі што выкінутага з краіны А. Салжаніцына. Насупраць сядзеў не анекдотны (товарищ майор, органи-

зуйте чайку), а самы сапраўдны таварыш маёр, які вёў знаёмы з літаратуры і кінафільмаў класічны допыт.

Апрача думак пра «Івана Дзянісавіча», я ўжо здагадваўся пра сваё галоўнае злачынства. Мае сябры з Наваполацкага політэхнічнага інстытута Вінцэсь Мудроў, Валеры Шлыкаў і сёй-той яшчэ, каго з розных прычынаў я не хачу называць, пачалі выпускаць наогул бяскрыўдны, але беларускамоўны альманах «Блакітны ліхтар», дзе з'явіліся і мае вершаваныя опусы. Некалькі нумароў я прывёз у Менск і трымаў на дне валізы пад ложкам. Я амаль нікому іх не паказваў, ды, як вядома з даўніх і з зусім нядаўніх часоў, дзе двое — там рада, дзе трэці — там здрада. Я яшчэ не ведаў, што на момант размовы з таварышам маёрам данос пра існаванне нашага «Блакітнага ліхтара» ўжо быў напісаны (дарэчы, па-беларуску — потым мне давалі яго пачытаць).

Але гэта зусім іншая гісторыя.

Тым часам допыт працягваўся.

— Отец — Алексей Артемович.

— Так.

— Работает в Новополоцке прокурором.

— Не,— сказаў я.

— Как это «нет»? — не здзівіўся, а абурыўся таварыш маёр.

— Не працуе,— пацвердзіў я, адчуваючы, як пачынаюць слабець ліпуча-халодныя пальцы страху, што сціскалі маю істоту.

— Почему?

— Таму што ён памёр,— адказаў я.

Вочкі-свярдзёлкі замітусіліся і страцілі вастрыню. Таварыш маёр, здавалася, ніяк не мог пагадзіцца з тым, што ягонае ведамства, якое ведала ўсё і ўсіх, магло так элементарна спудлаваць. Аднак ён зразумеў, што такімі рэчамі, як бацькава смерць, не жартуюць, і адразу неяк абвяў. Яшчэ гучалі нейкія пытанні, было папярэджанне, што пра нашую сустрэчу ніхто не павінен ведаць, але ён бачыў, што я ўжо не баюся, і, пэўна, вырашыў «раскалоць» мяне, дачакаўшыся больш зручнага выпадку.

Дзякуй табе, тата, што ты быў тады поруч са мною. Каб ты ведаў, як я шкадую, што не паспеў дасягнуць таго веку, калі мая і твая душы маглі б ператварыцца ў злучаныя між сабою ёмістасці: ты так і застаўся для мяне рэччу ў сабе.

Я нарадзіўся ў таты з мамаю ў год Змяі паводле ўсходняга календара і ў год смерці Сталіна — паводле календара савецкага. Мой дзень нараджэння — у жніўні, значыцца, у сакавіку, калі вялікі правадыр народаў нарэшце выправіўся на той свет, я ўжо існаваў, ды мог не нарадзіцца, бо пасля радыёпаведамлення мама пачулася зусім блага. Свет гінуў, ад роспачы мама ў істэрыцы рвала валасы і надоўга трапіла ў больніцу. Але тым разам савецкая медыцына перамагла (нашы савецкія хворыя — самыя здаровыя хворыя ў свеце!), і, перачакаўшы, відаць, непамысныя для мяне дні задыякальнага знаку Льва, я шчасна нарадзіўся на трэці дзень Паненкі.

Мы жылі ў скарбовым драўляным доме, якога ўжо не існуе. Акурат на месцы нашага дома і саду цяпер Палац культуры вытворчага аб'яднання «Шкловалакно», і, калі ў Полацк прыязджаў беларускі спявак з Амерыкі Данчык, я з сябрамі марна спрабаваў там растлумачыць госцю, што гэта такое — Палац культуры.

Дом быў падзелены перабойкаю на дзве часткі: у адной месціліся народны суд і гарадская пракуратура, у другой — наша двухпакаёвая кватэра. Мой дзіцячы ложак стаяў пры сцяне, за якою былі нежылыя памяшканні. Часам я спалохана прачынаўся сярод ночы і, сцяўшыся пад коўдраю, слухаў, як за сцяною хадзілі, прыцішана гаманілі і чыркалі запалкамі нейкія людзі. Мяне апаноўваў не проста страх, а страх, змешаны з невымоўнаю гідлівасцю; кшталт таго страху я перажыў нядаўна ў лесе, убачыўшы на альховай галіне над галавою клубок вужакаў. А тады, у маленстве, мая пасцель рабілася мокрая ад халоднага поту (а на самым пачатку свядомага жыцця, напэўна, не толькі ад поту), і я, не маючы болей змогі трываць гэтую пакуту, клікаў на паратунак маму. На мой голас заўсёды падыходзіў

тата. Ён гладзіў мяне цяжкай даланёй па галаве, казаў нешта супакойлівае, і я засынаў. Калі праз шмат гадоў, ужо ў студэнцтве, я са смехам узгадаў тыя начныя прыгоды, бацька, не падтрымаўшы жартоўнага тону, сказаў, што там, за сцяною, у гэбістаў было патайнае месца сустрэч з сексотамі, і я спасціг прычыну свайго прасякнутага агідаю дзіцячага страху — я трапляў у магутнае біяполе чалавечае нізасці і подласці. Мне дагэтуль незразумела, чаму бацька не пераставіў ложак да іншае сцяны: няўжо такім чынам гартаваў мяне да будучага жыцця?

Маё маленства смяялася і плакала на старадаўніх, на шчасце, не зруйнаваных дазвання вулачках тысячагадовага Полацка, але пра пошукі скарбаў і лёхаў, што вядуць з полацкіх храмаў на той бок Дзвіны, пра выпрабаванні смеласці на вузенькім гзымсе вакол купала Богаяўленскага сабора, дзе мы пісалі на ржавай блясе імёны дзяўчынак, што нам тады падабаліся, пра сабор святога Стэфана, які ўзнялі ў паветра на нашых дзіцячых вачах (захаваліся дакументы, якія сведчаць, што пасля гарвыканкам выдаткаваў з гарадскога бюджэту 40 тысяч рублёў на «вывоз мусора»),— пра ўсё гэта іншым разам.

У першы клас я пайшоў у 1960 годзе, калі да абяцанага Хрушчовым камунізму заставалася ўсяго дваццаць гадоў і ў сталоўках ужо можна было задарма пад'есці хлеба з гарчыцаю або соллю. Здаецца, якраз у той год у Полацку зачынілі — вядома, па просьбах бацькоў і наогул усіх працоўных — апошнюю беларускую школу.

Не памятаю, каб у нашым тагачасным полацкім жыцці было хоць што-кольвек беларускае. Прыгадваецца адно выкладзенае цэглаю на аблезлым фасадзе двухпавярховае камяніцы і шмат гадоў абсалютна незразумелае мне слова «Лазьня» з дарэформавым мяккім знакам, якое пазней, відаць, таксама па просьбах працоўных, пераклалі на шыльдзе на ўсім зразумелую мову.

Калі я вучыўся ў другім класе, Хрушчоў гаварыў на XXII з'ездзе пра забойства таварыша Кірава і іншыя крывавыя справы Сталіна, што з лагоднаю ўсмешкаю зазіраў з п'едэстала ў вокны нашай 1-й полацкай сталінскай школы. Мы з сябрам Колькам слухалі хрушчоўскі выступ па радыё разам з мамаю ў нас дома. Тады я яшчэ не разумеў, чаму мама слухае з такой увагаю.

У той самы дзень мы з Колькам наважылі адпомсціць за невядомага нам таварыша Кірава: знайшлі мой «Букварь», выдралі адтуль партрэт Іосіфа Вісарыёнавіча, выкалалі яму ржавым цвіком вочы, спалілі партрэт на вогнішчы ў нашым садзе і вырашылі, што назаўсёды расквіталіся з найлепшым сябрам савецкіх дзяцей.

У тую самую восень бульдозер перакуліў і некуды завалок нашага «школьнага» Сталіна. Праўда, п'едэстал стаіць там і сёння, мусіць, недзе паблізу чакае і ягоны былы гаспадар.

Я пішу пра гэта, бо І. В. Сталін — таксама частка майго радаводу, як, зрэшты — хацелі б мы таго ці не,— і кожнага з нас. Хіба не пацвярджае гэта лішні раз, напрыклад, нашая з Колькам помста за таварыша Кірава?

Праз колькі гадоў, класе ў сёмым, я даведаўся, што маю і асабісты рахунак да ўсяго таго, што ўвасабляў чалавек, якога мудры Анры Барбюс назваў некалі Леніным-сёння. Маці паказала мне даведку, якую я захоўваю цяпер сярод самых дарагіх дакументаў.

Верховный суд
Белорусской ССР
4 апреля 1963 г.
г. Минск
5-10

СПРАВКА

Дело по обвинению Денисова Максима Денисовича, 1881 года рождения, пересмотрено Верховным судом БССР 5 февраля 1963 г.

Постановление от 23 марта 1933 г. в отношении Денисова Максима Денисовича отменено и дело за отсутствием состава преступления прекращено.

Денисов М. Д. по данному делу реабилитирован.

Зам. председателя Верховного суда БССР С. Шардыко.

Тираж 10 000.

Да гэтае даведкі мне казалі, што дзед Максім хварэў і проста памёр.

Для ўсіх нас так і засталося загадкаю, якім было тое «данное дело».

Памёр у 1930-я гады і другі мой дзед — Арцём. Наконт ягонага лёсу ніякіх даведак не прыходзіла, але з аднаго з рэдкіх бацькавых аповядаў я запамятаў, што дзед Арцём меў малатарню, а значыцца, і ўсе магчымасці паўтарыць шлях дзеда Максіма.

Тата, тата... Як рана ты пайшоў, і як позна я вылузаўся з вопрадня інфантыльнасці...

На гаспадары малатарні дзеду Арцёму абрываецца мужчынская лінія бацькавага роду. Далей — беспрасветны туман без намёку хоць бы на нейкае сямейнае паданне.

Намагаюся і не магу ўзгадаць аблічча сваёй бабулі па мячы — Просі. У «фамільным архіве» не ацалела, а мо ніколі і не было, ніводнае яе фатаграфіі. Бабуля Прося колькі тыдняў глядзела мяне пасля таго, як, вярнуўшыся аднаго дня дадому, маці ўбачыла зарумзаных мяне з сястрычкаю і прачытала пакінутую на стале цыдулку, з якой вынікала, што нашая нянька, вясковае дзяўчо Паліна, падалася з камсамольскай пуцёўкай уздымаць цалінныя землі. Як хутка высветлілася, тая пуцёўка чамусьці давала Паліне права прыхапіць з сабою маміну кофту і маé з сястрою срэбныя крыжыкі, атрыманыя пасля хрышчэння ў копыскай царкве.

Нанач баба Прося зазвычай апавядала мне відавочна сваю ўласную несканчоную казку пра рыбіную вайну (памятаю, што бабуліна прыхільнасць у гэтай зацятай вайне заўсёды з нейкае прычыны была на баку шчупакоў), а раніцою я почасту знаходзіў пад падушкаю пачачак арабінавых цукерак-смактунчыкаў.

Аднойчы я быў з татам у бабулі Просі ў Стэцаве. Ля ейнае хаты пасвілася каза; проста за парогам пачынаўся лес, і пра лесуна, які шмат разоў «вадзіў» яе, прыходзіў на падворак даіць казу і нават начаваў у хаце пад печчу ў калядныя маразы, бабуля апавядала прыкладна так, як магла б казаць пра суседа, што жыў цераз плот.

Яна памерла, калі я хадзіў у трэці клас. Ужо ў студэнцкія гады разоў колькі я меўся з'ездзіць да бабы Просі на магілу, але ўрэшце так і не сабраўся. Часам я думаю, што спраўджу свой намер, калі здолею ўспомніць бабулін твар.

З другой маёй бабуляю — Аўгінняй — гэтае праблемы ніколі не паўставала. У любы момант я магу лёгка выклікаць у памяці не толькі яе твар, але і голас, хаду, адчуванне ейнае сухой рукі, калі яна вяла мяне з сястрою на поплаў ці на гумнішча, каб пасадзіць на грудок і пачаць свой урок батанікі.

— Гэта здрыжнічкі,— казала бабуля,— гэта яструэц, а вунь, на выжарыне, скрыпень зацвітае. Гэта во драсён, а гэта братаўка...

Калі цяпер я чытаю ў сяго-таго з нашых улаўраных майстроў прыгожага пісьменства пра «іван-чай», «маць-і-мачыху» і «івана-ды-мар'ю», пачынае здавацца, што безліч такіх прыгожых, трапных ды непаўторных назваў беларускіх красак і траваў ведаем ужо адно мы з сястрою.

Баба Аўгіння не сядзела, як яе сястра Грыпінка, за знахарства, ды несумненна таксама мела стасункі з загадкавымі, але наогул прыязнымі да чалавечага роду сіламі. Яна зашэптвала зубы (скрозь гады да мяне даносіцца ейны ціхі, падобны да духмянага шамацення сена ў адрыне шэпт: «Белае карэнне, чорнае каменне, сінія берагі...»), лекавала ячмень (чамусьці парасейску: «Ячмень-ячмень, нá тебе кукиш. Чего себе купишь? Купи себе топорок, руби себя поперек...»), выводзіла мышэй і «кацінную драпу»...

Таемную бабуліну сілу я адчуваю і цяпер, праз трыццаць гадоў пасля яе смерці. Пакутуючы калісьці

ад бяссоння, супроць якога не дапамагаў нават старажытны народны сродак — пакладзеныя ў галовах бурштынавыя пацеркі, неяк уначы я выпадкова (?) узгадаў бабуліны ўрокі: адчуў сваю руку ў ейнай, пачуў яе голас, убачыў змаршчакаваты лагодны твар і серабрыстыя хвалі, што гнаў па высокай траве вятрыска, і — нібы ў якоесьці пухкае прадонне, імгненна праваліўся ў сон. Назаўтра я зноў паспрабаваў гэтыя лекі, і з тае ночы бяссонне мне ўжо не пагражае.

Бабуля часта апавядала, які добры быў да людзей пан з суседняе вёскі, у якога яна служыла ў маладосці пакаёўкаю. Думаю, што гэтыя чуллівыя прыгады можна збольшага вытлумачыць пазнейшым шчаслівым жыццём у калгасе, але нават у самой панскай мянушцы — Брынка — мне, далібог, чуецца нешта прыязна-чалавечае, чаго і з самай вялікаю фантазіяй не скажаш пра ацалелыя ў памяці старых вяскоўцаў мянушкі двух першых старшыняў тамтэйшага калгаса — Раўло і, перапрашаю, Галаслрака.

Неўзабаве пасля рэвалюцыі бабуля Аўгіння ледзь не загінула.

Тады ў капысіцкае наваколле нейкім ветрам занесла цыркавых артыстаў — мусіць, ратаваліся ад чырвоных ці белых з блізкіх Магілёва або Воршы. Адны старыя капысічане згадваюць цяпер, што ў цыркачоў былі мядзведзі, другія гатовыя пабажыцца, што бачылі плявучых вярблюдаў і нават слаоў, але ўсе добра памятаюць, што сярод артыстаў былі зусім маленькія людзі, якіх у Капысіцы дагэтуль называюць словам «місцюкі» (магчыма, яго трэба лічыць адпаведнікам расейскага «лилипуты»).

Гнаны рэвалюцыйнымі віхурамі цырк падаўся далей, а місцюкі наважылі перачакаць пачатак новае эры ў гісторыі чалавецтва ў Капысіцы: набылі кароўку і атабарыліся на пакінутай сядзібе наводшыбе ад вёскі.

Місцюкоў было трое: жонка з мужам ды іхні сын — такога самага росту, але, як казала бабуля, маладзенькі тварам. Кабетка хутка навучылася стоячы даіць карову, а ейны чалавек разам з сынам рапараваў па хатах вупраж ды іншы сялянскі рыштунак. Місцюкі

ціха пражылі ў сваёй хаце два гады, а потым з Копысі прыехалі на конях збройныя людзі, якіх бабуля, успамінаючы тую гісторыю, называла то камісарамі, то люцыпанерамі. Яны вывелі місцюкоў з хаты і забілі ўсіх траіх — не страляючы, а выцяўшы кожнага пісталетнаю рукавяткаю па скроні. «Як зайчыкаў»,— казала баба Аўгіння.

У той дзень яна пасвіла каровы паблізу місцюковае сялібы і, схаваўшыся ў агрэсце, усё бачыла і чула: як маўчаў перад смерцю гаспадар і як прасіліся кабетка з сынам. Бабуля лічыла, што люцыпанеры забілі няшчасных місцюкоў за тое, што знайшлі ў іх *нейкія кнігі*. Гэтыя словы яна так і вымаўляла — курсівам, заўсёды хрысцячыся і азіраючыся на бакі.

Яна закрычала ў агрэсце ад страху, і верхавод коннікаў загадаў, каб не было сведкаў, «шлёпнуць» і яе, аднак бабулю абараніў вусаты матрос, дзякуючы якому (бо мая мама народзіцца толькі праз чатыры гады пасля таго дня) я і займаюся сёння генеалагічнымі росшукамі.

Калі ўспамінаю бабулін аповяд, у памяці заўсёды пракручваецца эпізод з даўняга фільма пра рэвалюцыю. Узброеныя да зубоў чырвонаармейцы трасуць недзе ў Маскве ці ў Петраградзе прафесарскую кватэру. Таленавіта акарыкатураны рэжысёрам і акторам гаспадар, спрабуючы нешта давесці прадстаўнікам рэвалюцыйных масаў, здымае з паліцы кнігу (калі не памыляюся, том Пляханава). Зухаваты, перацягнуты кулямётнымі стужкамі малады начальнік патруля, трымаючы руку на расшпіленай кабуры, весела кажа акулярыстаму прафесару: «Мы ваших книжек не читали и читать не собираемся. Мы Ильичу без книжек верим». Мне ўвесь час здаецца, што пасля размовы прафесара таксама «пустили в распыл».

З тых дзён у душы ў бабулі Аўгінні назаўсёды засеў нязводны страх перад кнігамі. Можа, менавіта таму ў гады «культурнае рэвалюцыі» яна нейкім чынам ухілілася ад ліквідацыі свае непісьменнасці і ўсё жыццё ставіла ў калгасных ведамасцях каструбаватыя крыжыкі. Калі б яна дажыла да сямідзесятых гадоў, яе

перакананасць, што кнігі прыносяць людзям адно няшчасці, магла б толькі ўмацавацца: майму стрыечнаму брату, а ейнаму ўнуку Генусю далі тэрмін (праўда, умоўны) за два тузіны зробленых ім копіяў булгакаўскіх «Роковых яиц».

Бабуля Аўгіння прычынілася і да майго дзіцячага адкрыцця, што наша савецкае радыё кажа няпраўду.

Рэпрадуктар вісеў на слупе каля фермы. А шостай гадзіне раніцы ён прачынаўся і хрыпатым, нібыта з перапою, голасам спяваў:

Союз нерушимый республик свободных
Сплотила навеки великая Русь...

Ад гімна да гімна радыё займалася музычным выхаваннем насельнікаў паблізных хатаў і нястомна паведамляла пра падзеі ў жахлівым капіталістычным свеце і ў краіне, што, не ўважаючы на перабоі з хлебам, шпарка набліжалася да светлае будучыні.

Аднойчы мае вушы злавілі ў радыёэфіры фразу, якая чымсьці збянтэжыла наіўны дзіцячы розум.

— Каждый советский человек,— сказаў рэпрадуктар,— знает имена Толстого и Горького.

Цэлы дзень гэтыя словы мулялі мне, і ўвечары я адважыўся на невялікі сацыялагічны дослед.

— Бабушка,— запытаўся я,— ты знаешь, кто такой Толстой?

— Быў чалавек таўсты, во яму такое мяно і далі,— адказала бабуля.

— А кто такой Горький? — без асаблівае надзеі працягваў я.

— А во, кажуць, горкі, як рэдзька. Або яшчэ — як хрэн, горкі.

— Да нет, бабушка, я о писателях спрашиваю,— са складанымі пачуццямі і да радыё, і да бабулі сказаў я.

— Мая, дзетка, навука малая,— рахмана азвалася баба Аўгіння.— Травы ведаю, а чытаць не навучаная.

Вядома, мне было ніякавата, што яна — такая старая і яшчэ не чула ні пра Талстога, ні пра Горкага, пра якіх я ўжо ведаў у першым класе, а мо і раней. Аднак болей мне рупіла іншае. Атрымлівалася адно

з двух: або бабуля не савецкі чалавек, або радыё хлусіць.

— А ты, бабушка, советский человек? — запытаўся я.

— Як усе, так і я,— адказала бабуля.— І галадавала, і палачкі ў калгасе за працадні палучала.

Я, дарма што малы, і сам разумеў недарэчнасць пытання: усе навокал, у тым ліку і баба Аўгіння, відавочна былі савецкія людзі. Фашыстаў, капіталістаў, гаротных амерыканскіх неграў, якія паміралі ад голаду, а таксама паліцэйскіх і гангстэраў, што палілі цыгары, пілі нейкія «віскі» і казалі «Шеф вами недоволен»,— гэтых і іншых, зазвычай страхалюдных несавецкіх людзей я бачыў адно ў кінафільмах. Адсюль вынікала дзёрзкая ерэтычная выснова, якою я палічыў за лепшае ні з кім не дзяліцца: *нашаму радыё нельга верыць*.

Кажуць, што яшчэ ў самыя змрочныя гады мая ціхмяная бабуля неяк выявіла непахісную цвёрдасць. Прысланы з раёна начальнік, што кватараваў у ейнай хаце, загадаў зняць з покуці абразы.

— Яны ў вас есці не просяць,— адрэзала баба Аўгіння з намёкам.

Добра памятаю, што яна прасіла Бога, каб узяў яе да сябе на пачатку лета, тады, як адцвітаюць дзьмухаўцы і, калі верыць бабулі, зямля гэткая ж мяккая і лёгкая, як дзьмухаўцовы пух. Бабуліна сэрца спынілася, калі яна сядзела на ганку і крышыла карове буракі. Я пабег на поле па цётак. Мяне абурыла, што яны колькі разоў перапытвалі: «Бабушка заснула?», хоць я недвухсэнсоўна сказаў, што яна памерла.

Гэта здарылася першага чэрвеня.

Яшчэ колькі слоў пра бабуліну сувязь з загадкавымі сіламі хачу дадаць у наступных абзацах — своеасаблівым пастскрыптуме, які ўштукоўваю ў аповяд ужо пасля яго першай публікацыі.

Праз тыдзень, як мой радавод з'явіўся ў газеце «Літаратура і мастацтва» (тыя дні былі, як і чакалася, адзначаныя крыўдамі, папрокамі і прэтэнзіямі, што ў больш ці ў менш тактоўнай форме выказвалі мне

сваякі і несваякі — напрыклад, паэт-лаўрэат М.), мы з сястрою павезлі маці ў яе Капысіцу.

Пакінуўшы маму з нашай цёткай Вольгаю на печы ў іхняй роднай хаце, мы пад несціханым дажджом, як заўсёды, занеслі бабулі Аўгінні на магілу жменю цукерак. Якраз на пагосце, нібыта зарадаваўшыся нашым адведзінам, дождж лінуў не раўнуючы як з цэбра, і пакуль мы дабеглі да лазні другой нашай цёткі — Насты, на нас не засталося аніводнай сухой ніткі.

Калісьці ў гэтай лазні я са стрыечнымі сястрычкамі, начытаўшыся ў бабкі Грыпіны «Чорнай магіі», спрабаваў даведацца, *што будзе заўтра*. За хвіліну да поўначы мы, у адпаведнасці з парадамі чарнакніжнікаў, запалілі перад пастаўленым на лазнае вакенца люстэркам свечку, кінулі ў агонь тры белыя шарсцінкі з кацінага хваста і роўна апоўначы, утаропіўшыся ў цьмянае люстэрка і ляскаючы зубамі ад страху, вымавілі патрэбны заклён. Услед за апошнім словам у лазню ўварвалася пройма, свечка з люстэркам паляцелі на дол, а мы кінуліся кулём у разнасцежаныя дзверы. Адбегшыся на добры кіламетр і звёўшы дых, мы з жахам убачылі, што чамусьці ўцяклі з лазні прамютка на могілкі, адкуль пабеглі назад да лазні, баючыся, каб яна не загарэлася ад свечкі. Дарэчы, тае начы ў вёсцы, учадзеўшы, памерлі двое старых.

Тую прыгоду я ўзгадаў ужо ўвечары, узяўшыся гартаць свае нататкі за таўстаногім свойскім сталом з букецікам здрыжнічак на саматканым абрусе. Тады мяне займала ідэя напісаць аповяд пра Напалеона, які ў выгнанні, на востраве Святой Алены, аказваецца, думаў, што мог бы выйграць расейскую кампанію, каб аднавіў незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага. Але замест распрацоўкі сюжэта мяне ў тыя хвіліны апанавалі прыга́ды пра цётчыну лазню, а потым заманулася перачытаць захоплены з сабою радавод тут, у дзедавай хаце. Яна, хата, была найсуровейшым суддзёй мае пісаніны, бо ведала ўсё гэта (і значна болей) і без мяне.

Мама з цёткаю ўжо даўно паснулі. Я сядзеў над разгорнутымі на стальніцы газетнымі старонкамі. Справа і зверху глядзела на мяне з ручнікоў Багародзіца, насупраць было незавешанае начное жнівеньскае вакно з вясёлкавымі ад старасці шыбамі.

Я чытаў, чуючы на сабе не толькі позірк з абраза, але і яшчэ колькі позіркаў немаведама адкуль — напэўна, гэта глядзела на мяне сама хата — чытаў і, калі дайшоў да слоў «таемную бабуліну сілу я адчуваю і цяпер, праз трыццаць гадоў...», якраз у гэтае імгненне з цёмнага вакна вылецела, засыпаўшы друзачкамі падвоканне, шыбіна.

У хаце пачаўся пярэпалах. Але ні ўначы, ні раніцою мы не знайшлі пад вокнамі канцавой цётчынай хаты аніякіх слядоў, аніякага камянюкі ці яшчэ чагонебудзь такога.

Вядома, шкло са старой скрыўленай рамы магло вылецець само сабою. Вядома, зусім выпадкова ў наступныя дні ў сяброў і ў людзей амаль незнаёмых, да якіх я чамусьці заходзіў, мне пачалі трапляцца ў рукі (самі сабою, без аніякіх адмысловых пошукаў) рэдкія кнігі, гравюры і старыя газетныя выцінкі пра жыццё Напалеона на востраве Святой Алены і пра колькі месяцаў, прабытых ім у 1812 годзе ў Беларусі. Вядома, зусім выпадкова маглі прычыніцца і іншыя падзеі, якія я не адважваюся тут згадаць толькі з тае прычыны, што ў адваротным выпадку хтосьці можа параіць мне неадкладна звярнуцца да адпаведнага доктара. Далібог, будзе лепей, калі на гэтым я скончу свой пастскрыптум і вярнуся да радаводу.

Пра свайго мужа, а майго дзеда Максіма бабуля Аўгіння мне ніколі не казала. Зрэшты, тады я быў малы дый не было яшчэ даведкі з дзесяцітысячным (?) накладам, і бабуля, пэўна, лічыла такія размовы небяспечнымі. Пра дзеда я найболей ведаю ад мамы.

У вайну, якую да 1917-га часта называлі Вялікай Айчыннаю, а потым перахрысцілі ў першую імперыялістычную, дзед Максім як чалавек пісьменны (ён выпісваў перад вайною нейкую газету, і мне, вядома, хочацца, каб гэта была «Наша Ніва») даслужыўся да унтэр-афіцэра. Падчас страшных баёў на Нарачы, калі ў 1916 годзе расейскія войскі, дапамагаючы французскім хаўруснікам, пачалі зусім непадрыхтаваны

наступ, дзед трапіў у палон. У Нямеччыне ён працаваў у баўэра і мог пераседзець рэшту вайны на сытных харчах, але разважыў іначай: у адну цёмную ноч паклаў у кайстру два боханы свежага хлеба і праз два месяцы дапяў роднае капысіцкае хаты.

У вёсцы лічылася, што дзед ведае «планэты», і звычайна ніхто не адважваўся раней за яго пачынаць сеяць або жаць. Той жа, хто, не даючы веры дзедавым здольнасцям, кіраваўся сваімі «планэтамі», мог потым наракаць адно на самога сябе. Калі капысічанаў загналі ў калгас, яны, мусіць, усё-такі маючы надзею, што можна будзе неяк жыць і там, выбралі дзеда Максіма за брыгадзіра.

Праз тры гады наш далёкі сваяк, што служыў у раённым Шклове ў НКВД (я прынцыпова супраць «беларусізацыі» і гэтага і іншых падобных скаротаў), папярэдзіў дзеда і ягонага брата Ціхана, калгаснага бухгалтара, што на іх і яшчэ на дзесяць вяскоўцаў прыйшоў данос. Хапун, казаў сваяк, чакаўся вялікі, і калі з'ехаць куды-небудзь на данбаскія шахты ці проста зашыцца месяцы на тры ў лес, усё абыдзецца, бо возьмуць іншых.

Дзед з братам сабраў у сваёй хаце сход тых дванаццаці, чые імёны ўжо перадрукоўвалі машыністкі НКВД. Думкі падзяліліся: адны стаялі на тым, каб ратавацца; дзяды Максім і Ціхан лічылі, што хавацца — значыцца прызнаць, што яны і сапраўды ў нечым вінаватыя. Надзвычай дарагая мне і такая драбніца: на той зборні дзед Максім сказаў, што ўсё адно замест хаванцаў схопяць іншых, якіх ніхто нават не папярэдзіў.

Назаўтра трое «ворагаў народа» падаліся ў лес, а дзевяцера засталіся ў вёсцы, спадзеючыся, што *там* разбяруцца. Людзі верылі, што ўлада, якая ўжо пятнаццаць гадоў называла сябе іхняю, хоць калі-нікалі здатная на справядлівасць.

Па дзеда прыйшлі ў першы дзень 1933-га. Ён сядзеў на палку, плёў рэзгіны і, як запомнілася маме, спяваў:

Што рабіць мне, як мне быць?
Ці пакінуць, ці любіць?

Мама басанож бегла за санямі да аселіцы.

Праз два тыдні бабе Аўгінні і іншым жонкам арыштаваных дазволілі перадаць ім у Шклове харчы і памяняць бялізну. Старую бялізну давялося спаліць, бо яна кішма кішэла вошамі.

Наступнаю звесткаю пра дзеда была ўжо згаданая даведка на шэрым бланку, дзе не знайшлося месца хоць бы на колькі слоў крывадушнага казённага спачування. Чалавека забілі, але няхай вас суцешыць тое, што яго забілі ні за што, невінаватага. Праўда, я маю моцны сумнеў, што тыя, хто падпісваў такія даведкі ў 1960-я гады, і тыя, хто падпісвае іх цяпер, шчыра лічаць такіх, як мой дзед, невінаватымі. Яны сапраўды былі вінаватыя — у тым, што ведалі «планэты», што за царскім часам выпісвалі несавецкую газету, што ім людзі верылі болей, чым розным камісарам і люцыпанерам...

Бабуля Аўгіння сустрэлася з дзедам Максімам на небе за два гады да таго, як дзяржава рабочых і сялян ашчаслівіла нас гэтым бланкавым сведчаннем свае гуманнасці і некалькімі рублямі, якія мама з цёткаю адмовіліся атрымліваць.

Імя даносчыка, што загубіў дзевяць душ, пакінуўшы бязбацькавічамі без малога тры тузіны дзяцей, хутка адкрылася. Гэта быў самы недалужны капысіцкі гаспадар камбедавец Цыбулька.

— Наша горніца з Богам не спорніца! — з дурным гонарам весела казаў ён пра сваю хаціну-развалюху, дзе адно на печы маглі сагрэцца ягоныя вечна галодныя дзеці.

Мамін брат дзядзька Язэп шмат разоў, выпіўшы дзеля смеласці гарэлкі, браў уначы паляўнічую стрэльбу і ішоў помсціцца за бацьку. Бабуля Аўгіння і мама з сёстрамі, галосячы, як па нябожчыку, беглі за дзядзькам да Цыбулькавае развалюхі. Ейны гаспадар спярша аднаго за адным выпускаў на падворак усіх сваіх васьмярых дзяцей, потым жонку, потым выходзіў у сподні сам, і дзядзька Язэп, заплакаўшы ад бяссілля, паварочваў дахаты.

— Усё адно заб'ю! — крычаў ён.

— Няхай, сынок, яго Бог уваб'е,— хрысцячыся, казала бабуля Аўгіння.

Бог не спяшаўся, і Цыбулька пераваліў за дзевяць дзесяткаў. Аднойчы, калі я з вясковаю блазнотаю тоўкся каля крамы, дзе вечна выпівалі і пра штосьці спрачаліся капысіцкія мужчыны, сівенькі падпіты дзядок з чырвонымі слязлівымі вачыма паклікаў мяне пальцам, завёў у краму і купіў грамаў трыста зліплых у суцэльны камяк ірысак. Змеціўшы такі манеўр, адзін з падкрамных пітакоў сурова сказаў мне:

— Выкінь цукеркі! Ён твайго дзеда прадаў!

У тым вяку «прадаць дзеда» значыла прыкладна тое самае, што і «прадаць мяне» — малодшая сястра штодня рабіла гэта, паведамляючы бабулі пра кожны мой вылаз у суседчыны вішні або трускаўкі. Адбегшыся ад крамы, я са смакам з'еў падораныя ірыскі, не чуючы да сівога дзядка анічога, апрача ўдзячнасці. Падумаеш, прадаў нейкага там ніколі не бачанага дзеда!..

Трое капысічанаў, што, не паслухаўшыся дзеда Максіма, схаваліся ад роднае ўлады ў лесе, памарозіліся, але засталіся жывыя. Адзін потым не вярнуўся з вайны, другі ўжо даўно перасяліўся на пагост пад старыя бярэзіны, а з трэцім у апошнія пагасціны на мамінай радзіме мы выпілі пляшку гарэлкі.

— Не паслухаўся нас, Воўка, твой дзед,— казаў ён,— а то б цяпер з намі чарачку ўзяць мог. Здаровы быў Дзянісавіч, як гэта, каб яго халера, рускі багатыр Ілля Мурамец. Неяк на станцыі рэйку да грудзей падняў...

Ад маці бабы Аўгінні — маёй прабабкі Пёклы — засталося толькі гэтае імя, амаль зраўнаваны з зямлёю грудок на кладах і згадка пра тое, што прабабка страшэнна не любіла жоўтых кветак. Затое, хоць і страціўшы ўжо сваё імя, трывала ўвайшла ў няпісаныя дагэтуль аналы нашага роду ейная маці — гэта значыць мая прабабка з дзвюма прыстаўкамі «пра».

Паводле маіх падлікаў, тое лета, у якое пры лесе ля капысіцкіх могілак стаяў цыганскі табар, было яшчэ за першым, царскім, прыгонам.

Цыганяты займаліся экспрапрыяцыяй садавіны і яек. Цыганкі хадзілі па хатах, варажылі па руцэ і на картах, паказвалі розныя штукі: напрыклад, налівалі ваду ў шклянку, перакульвалі яе на далонь, і вада не толькі не вылівалася, але хутка пачынала кіпець — за гэта гледачы мусілі разлічвацца кавалкам сала. Бывалі выпадкі, калі заварожаныя гаспадары выносілі смуглявым гасцям цэлыя кублы, шасткі з кілбасамі або рэшаты яек. Цыганы ж мужчыны, удзень не грэбуючы штукарствам, дачакаўшыся свайго цыганскага сонца, чынна скарачалі ў наваколлі конскае пагалоўе. Адзін з іх сярод гэтых клопатаў і атрымаў ад мае прабабкі нешта больш істотнае, чым рэшата яек.

Кажуць, у такіх выпадках гены наймацней праяўляюцца праз некалькі пакаленняў. Баюся, што гэта праўда. Калі сустракаю цыганоў, душа мая трывожна і ўадначас соладка сціскаецца, і я нібыта чую ў ёй звон крышталёвых келіхаў. Раз-пораз кроў майго безыменнага чарнявага продка ўладна змушае мяне забыцца пра найпільнейшыя турботы і з'ехаць на колькі дзён проста ў свет, начаваць у гатэлях і на вакзалах ці, прынамсі, ад'ехацца на спадарожнай машыне на паўсотні кіламетраў ад горада і, закінуўшы рукі за галаву, да ночы ляжаць недзе пад стогам, сочачы аблокі.

У мяне нядобрае вока: варта мне пільна паглядзець на чалавека, як ён — асабліва калі гэта жанчына — спатыкаецца. Цыганкі ніколі не бяруць з мяне грошай за варажбу. Што да іхніх прароцтваў, яны, нібы змовіўшыся, абяцаюць мне нейкую «наглую» смерць.

Цыганкаю была і тая юная, кучаравая і ўмелая істота, якая зрабіла мяне мужчынам.

Калі я бачу сучасны табар: пасцеленыя паміж вакзальных лавак коўдры, мурзатых дзяцей, маладзёнаў, што проста ў прыцемным кутку могуць адважна маркітавацца, мяне часам перасмыквае, але насуперак усяму вусны ўсё адно шэпчуць немаведама калі і як запалыя ў памяць словы: «Лачо дывэс тумэн, гэ ромалэ!» — «Шчаслівай дарогі вам, цыганы!..»

На цыганскім сучку абломваецца жаночая галіна

мамінага радаводу і застаецца апошняя мая надзея і паратунак — маміны продкі па мячы.

Прадзед Дзяніс, бацька дзеда Максіма, не вярнуўся з апошняе расейска-турэцкае вайны. Калі ў менскім храме Аляксандра Неўскага, што на Вайсковых могілках, я перачытваю імёны беларускіх воінаў 30-й артылерыйскай брыгады і 119-га Каломенскага палка, палеглых 18 ліпеня 1877 года пад Плеўнаю,— «Канониры Іосіфъ Вайшвіло, Іаковъ Чирка... Рядовые Іоаннъ Гунька, Францъ Тваска, Стефанъ Комаръ, Григорій Мурашка, Стефанъ Сысъ...» — зазвычай на імені «Іосіфъ Войничъ» ува мне пачынае звінець струна загадкавага хвалявання. Якая сувязь існуе паміж мною і гэтым Войнічам? Магчыма, ён ваяваў разам з дзедам, спаў з ім побач на балгарскіх камянях, а магчыма...

Хто скажа, штó пераважыць на вагах гонару: смерць за свабоду іншага народа ці жыццё, аддадзенае за вызваленне свае зямлі? І ўсё ж невыказна горка ад таго, што ўжо два стагоддзі, як на першую з гэтых шаляў — за свабоду нашых далёкіх і блізкіх суседзяў — пакладзена беларускіх жыццяў нязмерна болей, чым за свабоду ўласную.

Мой прапрадзед Баўтрамей, народжаны (паводле запісу на некалькіх, дзівам ацалелых старонках царкоўнае кнігі) у 1830 годзе, меў ва ўзросце Хрыста магчымасць абраць другі з двух гэтых шляхоў.

Якраз у тых мясцінах Прыдняпроўя дзейнічаў атрад Ігната Будзіловіча, пазней расстралянага царскімі карнікамі ў Воршы. Звабліва думаць, што Баўтрамей валіў тэлеграфныя слупы, вазіў па вёсках паўстанцкі маніфест чырвоных і з адчаем асуджанага на смерць біўся з казакамі 26 красавіка 1863 года ў няроўным баі пад Пагосцішчамі. Але верагоднасць гэтага досыць малая. Архіўныя дакументы сведчаць, што сярод прыдняпроўскіх беларусаў непараўнана болей было не тых, хто пайшоў пад штандары Касы-Будзіловіча і Тапара — паўстанцкага вайсковага начальніка Магілёўскага ваяводства Людвіка Звяждоўскага, а тых падманутых, што дапамагалі лавіць і забіваць інсургентаў, атрымліваючы ад улады пяць рублёў за жывога і тры за мёртвага.

Мяркуючы па імёнах, якія захаваліся ў матчынай праваслаўнай Капысіцы да сёння — Баўтрамей, Домна, Якуб, Базыль, Цыпрыян,— мае продкі па кудзелі былі, бясспрэчна, уніятамі, або, дакладней, грэка-каталікамі ці каталікамі ўсходняга абраду. Як падлічыў адзін наш паважаны гісторык, напрыканцы XVIII стагоддзя да Уніі належала болей за тры чвэрткі жыхароў Беларусі, у праваслаўі ж заставалася толькі каля шасці працэнтаў. Такім чынам, мае суродзічы слухалі казані, спявалі і гаманілі ў храме са святаром па-беларуску. Яны ані не здагадваліся пра антынародную сутнасць уніяцтва, што пагражала беларусам знікненнем, ад якога іх выратаваў, вядома ж, цар-бацюхна з памагатымі, у 1839 годзе перагнаўшы цэлы народ у расейскае праваслаўе, што вельмі хутка не пакінула ў храмах анічога беларускага.

На памятку пра царкоўнае «ўз'яднанне» на ўказ імператара Мікалая I быў выбіты вялікі медаль з вобразам Спаса Нерукатворнага і надпісам: «Отторгнутые насилием (1596) возсоединены любовію (1859)». Аб гэтай любові мог бы распавесці нам беларускі хлопчык з-пад Горадні, якога, як паведамляў у сваім «Колоколе» Аляксандр Герцэн, хвасталі бізунамі, пакуль на трэцяй сотні ўдараў не прыняў прычасця ад праваслаўнага папа.

Мусіць, нешта ведаў пра тую любоў і мой продак-рыбар, што прыстасаваў царска-праваслаўную рэліквію пад грузіла. Разам з тым няма сумневу, што гэтая «любоў», мэтаю якой было духоўнае заняволенне і перараджэнне нашага народа, дала плён ужо ў наступным пакаленні, дапамагаючы беларускім мужыкам зарабляць у 1863-м крывавыя царскія траякі і пяцёркі.

Я набліжаюся да пачатку XIX стагоддзя, і свечка сямейнага падання, што асвятляе мне шлях, пакрысе ператвараецца ў маленькі агарак. Але перш чым патухнуць, зліўшыся з няпамяццю, яна яшчэ раз успыхвае, вырываючы з цемры апошняе імя — Баўтрамеевага бацькі Цыпрыяна.

Калі адкінуць відавочна легендарныя звесткі пра тое, што Цыпрыян «адбіў у пранцуза самога Кутуза» і пасля быў узяты да яго за кухара, бо рабіў надзіва смачныя, пханыя пальцам кілбасы (прычым генерал-фельдмаршал так яго любіў, што нават вазіў з сабою па тэатрах), дык атрымаецца, што мой прапрапрадзед нарадзіўся недзе паміж першым і другім падзеламі Рэчы Паспалітай. Нашы ўсходнія землі ўжо былі захопленыя Расейскаю імперыяй, і Беларусь, што ніколі не ведала рэкруцкіх набораў (бо Вялікае Княства Літоўскае мела прафесійнае войска), пачала спраўна пастаўляць юнакоў спачатку на пажыццёвую, а потым на мала чым ад яе адрозную 25-гадовую царскую службу. Дарэчы, падчас напалеонаўскага нападу ў расейскім войску служыла, паводле некаторых падлікаў, прыкладна 50 тысяч беларусаў. Не нашмат меней было іх і пад сцягамі французскага імператара.

Што да супольных з генерал-фельдмаршалам паходаў майго продка па тэатрах, дык, можа стацца, згадкі гэтыя не зусім і легендарныя. Ці не захавалася ў іх памяць аб прыгонным тэатры графа Зорыча, якому з 1788 года належаў недалёкі ад Капысіцы павятовы Шклоў? У Зорычавым тэатры наладжваліся паказы алегарычных балетаў з хорамі, міфалагічных пантамім, камедый і трагедый, камічных опер і феерый. Імёны шасці актораў са шклоўскае трупы можна знайсці ў Беларускай энцыклапедыі. Чаму б не ўявіць, што мой продак Цыпрыян трапіў на нейкую з тых камедый або феерый? І ці не ў тыя часы ўзнікла ў матчынай радзіне трывалая прыхільнасць да тэатральнага мастацтва, якую нядаўна пацвердзіў абураны ліст аднае з маіх цётак. «Ты там, дзетка, у сваім Менску,— пісала цётка, па засвоенай у школе завядзёнцы пагарджаючы знакамі прыпынку, якія я расстаўляю толькі цяпер,— схадзі ў ваш тэатр і скажы, што калі прыйшоў чалавек у клуб на пастаноўку прыабшчыцца, як той ваш міністр па цілівізары казаў, к сталічнаму іскуству, дык няхай яго ў клуб пускаюць і ў ботах, і ў кухвайцы, бо ён, чалавек гэты,— тружаніца, і ў клуб адразу з фермы прыйшла, а на ферме ў нас гардзяробаў

нямашака, бо каровы калгасныя могуць з галадухі ўсе нашыя гардзяробы за малінку з'есці».

За прапрапрадзедам Цыпрыянам пачынаецца сцяна непрасвяцімае цемры, у якой бясследна губляюцца карані майго радаводу; пра крону ж, спадзяюся, паклапоцяцца мае сыны і ўнукі, калі, вядома, не ўмяшаецца кашчавая рука Чарнобыля.

Апошняе, пра што, улучыўшы нагоду, хачу тут сказаць,— адкуль у мяне расейскае прозвішча.

Найперш пакаюся, што быў час, калі я зусім паважна меўся перамяніць яго на іншае і нават пачаў падпісваць тым, іншым, свае літаратурныя практыкаванні. На шчасце, Бог утрымаў мяне ад больш рашучых захадаў, і я не зняважыў памяці вядомых і невядомых мне продкаў, якія мелі гэтае прозвішча і большасць якіх, хочацца верыць, належала ўсё ж да людзей сумленных і годных.

Што датычыць самога прозвішча, дык трэба пачаць з таго, што, калі Расея захапіла нашы «исконно русские» землі, Кацярына II, а потым ейны сын Павел I «пожаловали» тут свайму дваранству 208,5 тысячы душ «мужеска полу». Такім чынам, блізу паўмільёна беларусаў сталі прыгоннымі расейскіх памешчыкаў, нібы менавіта ў гэтым была адвечная мара нашага народа, які, паводле афіцыйных герадотаў, ніколі не меў большага клопату, як чакаць з усходу вызваліцеляў. Нават пасля таго, як Іван Грозны вызваліў Полацк ад палачанаў, а ваявода Трубяцкой — Мсціслаў ад мсціслаўцаў. Нават пасля таго, як у сярэдзіне XVII стагоддзя ў вайне з Маскоўскай дзяржавай за няпоўныя пятнаццаць гадоў насельніцтва Беларусі скарацілася ў два разы. Нават пасля таго, як у тым самым стагоддзі былі перапоўненыя палоннымі беларусамі астраханскія нявольніцкія рынкі, дзе «вызваліцелі» прадавалі нашых продкаў у рабства па тры рублі за галаву.

Былы Сенненскі павет, адкуль родам мой бацька, уваходзіў у Магілёўскую губерню, у якой дзесяткі вёсак і тысячы прыгонных атрымаў адзін з фавары-

таў расейскае імператрыцы граф Арлоў. Вядома, часам мяне апаноўвае спакуса вывесці свой радавод менавіта ад яго. Канчаткова не закрэсліваючы і гэтую версію, мушу зазначыць, што, пэўна, усё было больш банальна, бо ў роднай бацькавай вёсцы Арловы жывуць амаль у кожнай хаце. Маю спадзяванне, што сыны парупяцца, каб людзей з гэтым прозвішчам не менела.

Мае бацькі большую частку свайго свядомага жыцця, прынамсі, пасля таго, як пакінулі вёску, на мове сваіх бацькоў не гаварылі. Мае сыны-месцічы, калі былі малыя, пачыналі гаварыць на розных з бацькамі мовах якраз пасля летавання ў вёсцы, дзе іх старанна вучылі «па-гарадскому».

Тут я чамусьці — не сказаць, каб вельмі дарэчы — прыгадваю знаёмага кінарэжысёра, што аднойчы, гады тры таму, на падпітку наракаў на цяжкое жыццё.

— Разумееш, Валодзя, колькі жанчын у мяне было, і хоць бы адна ў ложку слова па-беларуску сказала.

Я суцешыў гаротніка тым, што ўбіраюцца ў сілу працэсы нацыянальнага адраджэння. І не памыліўся. Сустрэўшы мяне днямі (хацелася напісаць: на вуліцы, але буду шчыры — у бары менскага Дома літаратара, там, дзе ўвесь час сядзіць паэт А. Сыс), маэстра з пачуццём, так бы мовіць, нацыянальнага задавальнення ўсцешана паведаміў, што ў ягоныя абдымкі (відаць, паводле тэорыі імавернасці) пачалі ўжо трапляць і нацыянальна свядомыя прадстаўніцы прыўкраснай, як пісаў незабыўны Уладзімір Караткевіч, паловы нашага народа.

На дварэ ўсчынаецца крык, і я падыходжу да вакна. Вакол жоўтае цыстэрны з півам (па-мясцоваму — свінаматка) віруе натоўп (па-мясцоваму — пленум). Мой сусед, ужо яўна і даўно размяняўшы пазычаны чырвонец, адпіхвае ад цыстэрны старога з бітончыкам.

— Подумаешь, удостоверение! У нас у каждого по десять удостоверений! У меня вон дед — герой борьбы за Советскую власть. Врагов народа от справедливого гнева товарища Сталина в ГУЛАГе охранял! А другой дедуля у Булак-Балаховича за наше светлое будущее боролся. Националист проклятый! А ты ко мне со своим удостоверением лезешь. Я тебе русским языком сказал: сховай удостоверение!

Вяртаюся да стала, каб дапісаць апошнія словы.

Мяркуйце самі, як абышліся б са мною продкі-крывічы.

А з вамі, шаноўныя?

Думаю, шанцы ў нас прыкладна аднолькавыя.

А таму — ці не паспрабаваць скласці радавод і вам?

1990

Літаратурна-мастацкае выданне

Уладзімір Арлоў

Каханак яе вялікасці
Гістарычныя апавяданні, эсэ

Карэктар Н. Кучмель
Дызайн С. Ждановіч
Макет Д. Сільвановіч

У афармленні вокладкі выкарастаны
партрэт Уладзіслава Ельскага
нявядомага мастака XIX ст.

Падпісана ў друк 08.04.2004 г. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Друк афсетны. Гарнітура «Schoolbook».
Ум. друк. арк. 9,975. Ул.-выд. арк, 10. Наклад 500 асоб.
Замова № 610.

Выдавец І. П. Логвінаў
220050, г. Менск, пр-т Ф. Скарыны, 19–5.
Ліцэнзія ЛВ № 522 ад 16.04.2002 г.
logvinovpress@mail.ru

Друк ТДА «НоваПрынт»,
220047, г. Менск, вул. Купрэвіча, 2.
Ліцэнзія № 02330/0056647 ад 28.03.2004 г. (№ 62).